M. Z.
N: Beschrei-
bung deß König-
reichs Polen
sampt einverleib-
ten Ländern.

Groß Polē.
Reüssen.
Podolien.
Masuren.
Volynien.
Podlachien.

Klein Polen.
Podlachien.
Samoiten.
Pommerellen.
Dobrinien.

Ulm, in Verlegung Georg Wild Eysens. Aº 1657.

P. Troschel fec

МАРЦІНА ЦАЙЛЕРА

Іншае апісаньне

Каралеўства Польскага / і Вялікага

Княства Літоўскага;

ад

Самых новых польскіх і ін-

шых аўтараў / па новаму / паводле разна-

стайных зямель / сабранае / і ў гэты

сучасны час апублікаванае; як гэта

бачна з уступу.

Пры гэтым

Таксама Прускія – Ліфляндскія – Малдаўскія -

Маскавіцкія – Татарскія / ды іншыя справы

розныя / паводле іх памеру / прыведзеныя

будуць.



Ульм /

У выдавецтве Георга Вільдайзэнса /

У 1657 годзе





Уступ

Як вядома найлітасьціваму чытачу, яшчэ ў 1647 годзе я выдаў Апісаньне Каралеўства Польскага; якое потым было зноўку надрукаванае з дадаткам. Паколькі з таго часу я атрымаў новых польскіх, як напрыклад Simonem Starovolscium[1], Paulum Piasecium[2], Georgium Ossolinskium[3], Autorem Poloniæ Icfensæ, супраць J. Barclajum[4]; Andream de Pilca Corycinium[5]; Andream Maximilianum Fredro[6], Demetrium Sulikovium[7]; Stanislaum a Kobierzickum[8]; Joachimum Pastorium[9]; і розных іншых аўтараў, якія у той час частково былі

---

[1] Шымон Старавольскі (Szymon Starowolski; 1588 – 4.04.1656) – гісторык і палітолаг Рэчы Паспалітай, каталіцкі ксёндз. Нарадзіўся ў м. СтараяВоля (Пружанскі р-н, Палессе). Аўтар амаль 70 гістарычных і паліталягічных працаў, напісаных збольшага на лаціне.

[2] Павал Пясецкі (Paweł Piasecki; 15.10.1579 – 01.08.1649) – сакратар караля Жыгімонта III, аўтар хронікі "Chronica Gestorum In Europa Singularium" (1646).

[3] Князь Ежы Осолінскі (Jerzy Ossoliński; 15.12.1595 – 09.08.1650) – польскі дзяржаўны дзеяч і дыплямат. Падстолі вялікі каронны (1630), маршалак сейма (1631), староста быдгошчскі (з 1633), падскарбі вялікі каронны (1633), ваявода сандомірскі (з 1636), падканцлер каронны (1639 – 1643), канцлер вялікі каронны (1643 – 1650).

[4] Джон Бэрклі, ці Ян Барклай (Joann Barclajus; 28.01.1582 — 15.08.1621) — шатландскі паэт. Найбольш вядомы як аўтар Аргеніды. У сваім іншым творы, Icon Animorum (1614), апісвае норавы эўрапейскіх народаў таго часу.

[5] Андрэй Карыцінскі (Andrzej Koryciński; 1580 – 1652) – польскі дзяржаўны дзеяч, дэпутат трыбунала, войт.

[6] Андрэй Максіміліян Фрэдро (Andrzej Maksymilian Fredro; каля 1620 – 25.04.1679) – польскі публіцыст, філосаф, мараліст, дзяржаўны дзеяч і военачальнік, ваявода падольскі, кашталян львоўскі з 1654 г., староста кросьненскі, сенатар, дэлегат і маршалак сейма з 1652 г.

[7] Ян Дзьмітры Солікоўскі (Jan Dymitr Solikowski; каля 1539 – 27.06.1603) – арцыбіскуп львоўскі (1583 – 1603), сакратар каронны, легат папы Клемента VIII, дыплямат.

[8] Станіслаў Кабежыцкі (Stanisław Kobierzycki; 1600 – 1665) – польскі дзяржаўны дзеяч і гісторык.

[9] Ёахім Пасторы фон Хіртэнберг (Joachim Pastorius; 20.09.1611 – 26.12.1681) – польскі прыдворны гісторык каралей Рэчы Паспалітай Уладзіслава IV і Яна II Казіміра, пісьменьнік, прыдворны лекар.

недасяжныя, часткова таксама яшчэ не надрукаваныя. Таксама ў тыя наступныя гады ў тым Каралеўстве здарыліся вялікія зьмены праз разнастайныя войны, што адбыліся там за той час. Таму маё ўзагаданае ранейшае апісаньне патрабавала вялікага дапаўненьня. І гэта аднак магло бы падацца непрыемнасьцю тым, хто ўжо набыў тое апісаньне; таму я палічыў разумным, пакінуць тое, што ўжо два разы было выдадзенае, без дапаўненьняў; аднак тут стварыць іншым чынам і паводле краін гэтае іншае ды новае і накіраваць яго на цяперашні час: каб тыя, хто ўжо мае ранейшае апісаньне, гэтае маглі проста дадаць да яго і трымаць іх разам. І ў гэтым апошнім будуць таксама прыведзеныя малдаўскія, маскавіцкія, татарскія і шматлікія іншыя справы, якіх няма ў ранейшым апісаньні; каб праз іх яшчэ больш можна было растлумачыць польскія; бо гэтае Каралеўства рэдка мела спакой; і калі вайна спынялася, як адразу за ёй распачыналася новая: і таму цікаўнаму чытачу можа вельмі спадабацца і таксама быць карысным апісаньне польскіх зямель і мясьцін, якія стала сустракаюцца ў іх Relatioнах[10] і новых газэтах, а таксама і дасьледваньне мінулай і актуальнай гісторыі: ён таксама, з цяперашняга, можа даведацца, што прывяло казакаў да наступнай цяжкай вайны; да якой таксама далучылася сялянства Русі; паколькі ў тых данясеньнях не паведамляюцца самі прычыны іх паўстаньня (акрамя рэлігійных); аднак ад некалькіх аўтараў дастаткова вядома, як жорстка трымаюць сялян, якіх ў Польшчы агульна называюць Kmetones, іх шматлікія паны; таксама і сама lib. I de politicâ Hominum societate cap II §6[11] Аарона Аляксандра Олізаропія[12], доктара права і выкладчыка гэтай дысцыпліны ў вышэйшай школе Вільды, ці Vilna, у Літве, не замоўчвае гэтага, але на 153-й старонцы паведамляе; хаця яго, то бок Каралеўства Польскага, сяляне не зьяўляюцца прыгоннымі, але вольнымі людзьмі, як Censiti ці Conditioneles Coloni[13] ў рымлян; якія за гадавы заробак працуюць на ўчастках, і як доўга яны адлічваюць сваім панам пэўную зямельную рэнту, грошы альбо Censum[14], так доўга могуць яны атрымліваць карысьць ад пладоў гэтых участкаў. Але, калі падумаць, як гэтыя няшчасныя людзі (у Каралеўстве Польскім) у шматлікіх паноў пакутуюць на

---

[10] Данясеньнях (лат.)

[11] 1 том "Палітыкі чалавечага грамадства", гл. 11, пар. 6

[12] Аляксандр Аарон Олізароўскі (Aaron Alexander Olizarowski; 1610 – 1659) – выхаванец Полацкага езуіцкага калегіюма, юрыст, прафэсар права ў Віленскім універсітэце.

[13] Ацэнкавыя ці абумоўлены фермеры

[14] Арэнду (лат.)

працах, у якіх цяжкіх павіннасьцях яны жывуць; праз якія не толькі тыя паны, чыі участкі (ці ўладаньні) яны апрацоўваюць, атрымліваюць уладу над іх целам і жыцьцём; але нават кожны шляхціц можа з імі абыходзіцца, як яму пажадаецца. І можна было б цярпець, калі б гэтыя людзі маглі быць забітыя толькі іх панамі, але не кожным; і калі б былі не больш няшчасныя, чым сабакі шляхцюкоў; пры тым, што за забойства сабакі некаторыя людзі часта мусяць расплочвацца. Усе тыдні агульна падзеленыя так, што сяляне 5 альбо 6 дзён займаюцца справамі сваіх паноў; а ў нядзелі і сьвяточныя дні іх чакаюць іх уласныя справы, якія выконваюцца ў пату іх аблічча ў. Шмат хто з паноў, кажа ён, прыкладна 30 год таму (лічыць ад 1650, у якім ён гэта напісаў) абабралі да ніткі сваіх падданых праз невыносныя паборы, і, выдумаўшы нібыта дагавор таварыства са сваімі сялянамі, прымусілі іх штогод аддаваць ім палову ад гандлю мёдам; пры тым аднак яны, паны, не прыкладаюць да гэтага ніякага стараньня і выдаткаў; але гэта ўскладаецца на сялян, якія павінны здабываць пчолаў і ўсё, што да іх належыць; як ён паведамляе са шматлікімі дэталямі. Як аднак там зараз абстаяць справы з гэтым, у польскіх данясеньнях не паведамляецца; і яны самі ў астатнім часта супярэчаць адно аднаму; і месцы, дзе вядзецца вайна, у іх пазначаюцца не аднолькава; і таму гэтыя апісаньні зрабілі мне крыху больш працы. Акрамя таго пазначаныя вышэй, а таксама і іншыя, польскія аўтары, якімі я карыстаўся, пісалі на латыні і называлі землі і месцы на той мове; аднак палякі называюць і вымаўляюць іх на сваёй мове зусім інакш, а немцы яшчэ па-іншаму; таксама і самі польскія аўтары не заўсёды пазначаюць назвы аднолькава; і таму ў іх, як і ў маім ранейшым і цяперашнім апісаньні, яны дагэтуль не зусім адназначныя; тыя аўтары таксама мелі праблемы з наборам; як гэта бачна з далучанных Erratis, ці памылак друку. У Starovolscio ваяводства Juniuladislaviensis Palatinatus было зьмешчана ў Cujau (у якім гарадок Урцэсцье, 6-ці міль ад Таруні, у 1657 годзе часова быў акупіраваны швэдамі); іншымі аднак названа Inosladiensis, а яго сталіца ў Cromero[15] названая Inowladislow, а ў Golnitzio – Inowlocz. Bydgostia, ці Bidgostia, горад, які палякі завуць Bedgosky, а немцы Бромберг, адносіцца часткова, і таксама ў узгаданага Starovolscio, да Cujau і раней пазначанаму

[15] Марцін Кромер (1512 – 23.03.1589) – біскуп вармінскі. Аўтар гістарычнай працы “Аб паходжанні і дзеях палякаў” (1555).

ваяводству, і такім чынам яшчэ да Вялікай Польшчы; іншымі аднак адносіцца да Памор'я: часткова, і таксама паводле агульнага польска табелю зямель, робяць з Bidgostia і Бромберга два месца; таму таксама потым гэтыя месцы сустракаюцца двойчы ніжэй у Вялікай Польшчы і ў Памор'і. Такім чынам Фраўэнштадт, на сілезскай мяжы, лацінскамоўнымі, як я знайшоў, называецца Uschohovia, а палякамі Vuschova; а насамрэч ёсьць адно месца. Аналягічна гарадок Czenstochiã, Чэнстохава, ці Чэнстохаў, паводле лепшага і знакамітага кляштару, што знаходзіцца побач з ім на чыстай гары, часткова дагэтуль завецца Кларэнберг[16] альбо Clarum montem; і гэтак далей, праз што той ці іншы можа заблытацца; як таксама і з-за манет ды падліку ў польскіх гульдэнах, калі ня ведаць, што тры гэтых гульдэна складаюць у нас адзін рэйхсталер. Пра што я тут потым узгадваў дзеля шматлікіх паведамленьняў.

Што адносна тых месцаў, з якімі ад таго часу, як я выдаў з рук гэтае цяперашнее апісаньне, адбыліся нейкія зьмены; таксама часткова і тых, сярод якіх знайшлося больш удакладненьняў, чым тое, што вышэй узгаданы горад Бромберг быў зноўку заняты швэдамі: горад Коніц (які 20-30 Octobris Anno 1656 палякі захапілі з accord, бо цяперашні польскі вялікі канцлер, пан Штэфан фон Пільца Корыцынскі аб'яднаўся з Янам Георгам, князям Анхальта, і іншымі) зноўку адбіты каралём Швэцыі 1-2 студзеня гэтага 1657 году; перад тым аднак у вёсках там паўсюль палякі, што адышлі ад Гданьску, панесьлі ў хрыстовым месяцы вялікія страты праз напад швэдскага палкоўніка фон Ашэнберга: Гданьск моцна пакутуе ад голаду, эпідэмій і г.д.: Дэрпт у Ліфляндыі дакладна захоплены маскавітамі; аднак не вытрымаў Accordу, што выклікалі гараджане: Голуп марна атакаваны палякамі. Замак Грэбін узяты штурмам гданьчанамі і потым спалены: Ловіц адбіты палякамі. Паўц, які замест Гданьску быў спустошаны, зноўку заняты польскімі людзьмі: Шлохаў дагэтуль застаецца за швэдамі. У Таруні, у мінулым годзе, памерла звыш васьмі тысяч чалавек: Тыкочын марна наведвалі літоўцы і жамойты; і шмат іншага было прадпрынята абедзьвюма часткамі: калі нешта яшчэ не было прыведзена ў гэтым друку: то найласкавы чытач можа сам даведаецца пра гэта пры сваёй нагодзе і неістотна continuiрваць нешта новае, што магло адбыцца ў тым ці іншым месцы падчас

[16] Чыстагор'е

цяперашней вайны; бо я лепшым чынам зычу яму дзеля гэтага Боскага Зуступніцтва. Напісана ў Ульме, 30-га лютага, у 1657 годзе.

Марцін Цайлер



Польшча ў старажытнасьці была названая Sarmatia Europæa. Сучасную назву Cromerus выводзіць з Lecho і кажа, што Polaki азначае па паходжаньню тое самае, што і Lechi. Русіны, што належаць да грэцкай рэлігіі, называюць палякаў, бо яны адносяцца да лацінскай царквы, Lachos; і Po Lacku азначае “паводле лацінскага звычая”. Венгры называюць іх Lengel, і таксама Lechel, ад вядомага князя Леха. І Zuerius Boxhornius[17] кажа, in historia universali p. 70, што Польшча нават і сёньня ў туркаў называецца Lechi ці Lechiadæ, а не Poloni.

Philip. Cluverius[18], in Antiqua Germania, і іншыя сцьвярджаюць, што ў старажытнасьці Burii, Lygii, Arii, Manimi, Elysii, Naharvali, Peucini і іншыя нямецкія народы жылі ў Каралеўстве Польскім, адкуль потым часткова самі перасяліліся ў іншыя землі, а часткова былі паступова выгнаныя адтуль Вендамі, ці Venedis. Глядзі маё ранейшае апісаньне гэтага каралеўства, pag. 11 & seq. Autor кніжцы, Polonia defensa, contra Joannem Barclajum &c. intitulirt, кажа, што Bastranæ (якіх узгаданы Cluverius памылкова адносіць да немцаў),

!старонка 2!

Peucini і Venedi займалі землі, дзе цяпер знаходзяцца абедзьве Польшчы і частка чорнай Русі; як гэта можна вывучыць з Strabone[19], Plinio[20] і Tacitio[21]. І менавіта Venedi сядзелі там, дзе цяпер Вялікая Польшча і Прусія, каля вытокаў Вайксэля, альбо Віслы, і працягваліся да мора, адкуль пайшла назва Venedicus Sinus. І ён сцьвярджае, што Illyrii Traces, Bastranæ, Getæ, Sarmatæ былі аднаго паходжаньня, ці роднасьці, і менавіта адасобленымі ад скіфаў народамі; што таксама бачна з мовы. І кажа далей, што ўсе народы, якія знаходзяцца паміж Адрыятычным морам, мяжой

[17] Маркус Зэйрiюс ван Боксхорн (Marcus Zuerius Boxhornii; 28.08.1612 – 3.10.1653) – галандскі лінгвіст, прафэсар Лейдэнскага ўнiверсітэта.

[18] Філіп Клювэр (Philipp Cluver; 1580 – 1623) – нямецкі вучоны які займаўся гістарычнай геаграфіяй.

[19] Страбон (гр. Στράβων; каля 64/63 да н. э. – каля 23/24 н. э.) – грэцкі гісторык і географ. Атрымаў філязофскую адукацыю. Падарожнічаў па Грэцыі, Малой Азіі, Італіі, Эгіпце.

[20] Пліні Старэйшы (Plinius Maior, сапраўднае імя Гай Пліні Сэкунд, Gaius Plinius Secundus; паміж 22 і 24 гадамі н. э. – 24 ці 25.08.79 г. н. э.) – старажытнарымскі пісьменьнік-эрудыт. Найбольш вядомы як аўтар “Натуральнай гісторыі”.

[21] Публі (ці Гай) Карнэлі Тацыт (Publius Cornelius Tacitus, ці Gaius Cornelius Tacitus; сярэдзіна 50-х – каля 120 года) – старажытнарымскі гісторык, адзін з найвядомых пісьменьнікаў антычнасьці.

Macedonia, горадам Эгейскага мора Propontide, Эўксінскім морам, гарой Caucaso і Каспійскім морам, да ракі Obium; і потым ад ракі Эльбы, якая была старажытнай нямецкай мяжой, і ад часткі Тэнаў, у старажытнасьці мелі агульнае паходжаньне; якое большай часткай, за выключэньнем Русіі, ці Русі, і Масквы захавалася ў іх першай мове. Потым немагчыма знайсьці ні ў якога Historico, што туды прыйшлі новыя народа. І відавочна, што тамашнія народы, агульна кажучы, зьяўляюцца Aborigenes, і пасля таго, як яны спачатку занялі гэтую зямлю, наступныя за імі вялі сваё паходжаньне ад іх. Яны карыстаюцца аднак славянскай мовай, вельмі старажытнай, якая ўжо зрабілася іх прыроджанай; і не маюць нічога агульнага са скіфамі,

!старонка 3!

ці татарамі, хаця яны з імі і мяжуюць, і таксама з туркамі, пэрсамі і арабамі (якія цяпер усе зьяўляюцца натуральнымі скіфамі, і карыстаюцца амаль аднолькавай гаворкай, альбо радняцца адны з аднымі праз іх). І ніхто не павінен ісьці за поглядамі продкаў, зьмешваючы сарматаў са скіфамі, і паўсюль у сваіх творах называць усе пражываючыя на поўначы народы скіфамі. Бо, вядома, якімі недасьведчанымі былі продкі адносна апісаньня зямлі, і ў асаблівасьці аднак гэтых краін, наконт якіх яны рабілі неабгрунтаваныя, і, вядома, памылковыя і супярэчлівыя, сцьвярджэньні і перамешвалі іх паміж сабой. І Strabo паведамляе, што грэкі ад суседніх у Азіі скіфаў называлі усе народы, што жывуць на поўначы, Scythas: і тое, што грэкі ў некаторай ступені дасьледвалі, рымляне ўжо потым лічылі дакладна высьветленным. Далей піша ўзгаданы Autor, ён ліча, што вышэй пазначаныя народы мелі ў продкаў адно агульнае імя; якое аднак нам невядомае з-за нядбайнасьці аўтараў. Хаця, калі ён усё разгледзіць, то атрымаецца, што ўвесь гэты народ падзяляецца на славакаў, готаў, сарматаў і рускіх. Імя славянаў было невядомым сярод старажытных аўтараў да таго часу, пакуль яны не пачалі рабіцца славутымі праз свой напад на рымскія правінцыі; і ўпершыню ўзгадваюцца ў Procopius[22] і Jornandes[23]. І пад гэтай назвай, акрамя тых, што перасяліліся ў рымскія землі, трэба разумець у першую чаргу

!старонка 4!

палякаў, ці поляў, якія засталіся на сваёй айчыннай зямлі; як таксама і тых, што падаліся ў Нямеччыну, а менавіта маравы, багемцы, сілезійцы, і ў Памор’е, якія ўсе былі славакамі, альбо Slavones; як гэта шмат было даведзена паўсюль са шматлікімі абгрунтаваньнямі. За імі йдуць Getæ, ці тракійцы, якім прыпісваецца старажытная Panonia з Mæsia, Dacia і з усёй Ілырыйскай паласой; народы, якія аднак асабліва моцна зьмянілі Рымскую Імпэрыю; як таксама і напад гуннаў, скіфскага народу, і розныя эмігранты з Турэцкай Імпэрыі. Гэтыя Getis былі суседзямі сарматам, у якасьці трэцяга

---

[22] Пракопі Кесарыйскі (Procopius; каля 500 – памёр пасьля 562) – візантыйскі позьнеантычны гісторык.

[23] Іардан (Jordanes або Jordanis) – гоцкі гісторык VI ст., сакратар аланскага вайскоўца на службе Усходняй Рымскай імперыі. Галоўнае сачыненне Іардана “De origine actibusque Getarum” (“Аб паходжанні і дзеяннях гетаў”, даведзена да 551 года) утрымлівае таксама кароткія, але каштоўныя звесткі пра славян.

асноўнага народу, чыі ўласныя межы былі наступныя: на поўдні Pontus Euxinus (ці Чорнае мора), гара Caucasus і Каспійскае мора; з усходу рака Rha, якая цяпер называецца Volga, і якая таксама паварочвае на поўнач, атачае амаль усю Sarmatiam і адасабляе апошнюю ад Russia; якая была чацьвёртай і апошняй часткай вышэй пазначанага народу, жыхароў гэтай часткі, альбо зямлі, старажытныя земляапісальнікі называлі Riphaces і Riphæcos, і таксама Roxolanos, сярод якіх знаходзяцца таксама раёны белых русінаў і герцагаў маскоўскіх, як таксама і паўночныя землі да novam Zemblam. Такім чынам узгаданы народ, які ад высакароднай назвы называюць славянскім, не мае нічога

!старонка 5!

агульнага са скіфамі (якіх ён адносіць за мяжу Europæ да тых азіяцкіх народаў) ані ў мове, ані ў звычаях, і таксама ў рэлігіі: і не ідзе далей да аніякай мовы акрамя славянскай; што лёгка распазнае той, хто вымярае гэты вялікі ўчастак ад Адрыятычнага мора да Nova Zembla (гэта славянская, ці вэндская назва, якая азначае Новы край ці зямля). Дагэтуль паведамляў Autor.

Аднак вяртаючыся асабліва да польскай мовы, то з аднаго боку яна цалкам славянская, і Patronymica і Possessiva разам сканчаюцца на Ski: таму гішпанскі ў іх завецца Hiszpanski, а польскі – Polski. Яны карыстаюцца аднак таксама даволі шмат лацінскай і нямецкай мовамі. Частка шляхты і купцы таксама французскай, італьянскай і вянгерскай; асабліва тыя, што жывуць каля Венгрыі. Далей, акрамя саміх палякаў у гэтым каралеўстве жывуць таксама і іншыя народы, і асабліва немцы (глядзі ранейшае апісаньне, p. 42 seq.). Раней тут жыла вялікая колькасьць жыдоў; аднак у гэтыя наступныя гады іх было вельмі шмат зьнішчана. Італьянскія купцы сустракаюцца па большасьці ў Кракаве; шатландцы аднак ходзюць са сваімі таварамі амаль па ўсёй краіне. Маскоўская і багемская мовы, як было пазначана вышэй, маюць радство з польскай.

!старонка 6!

Аднак Каралеўства Польскае са сваімі прыналежнымі правінцыямі працягваецца, як Simon Starovolscius кажа in Polonia, у даўжыню ад 38 gradu да 54, ад летняга захаду да зімовага ўсходу, больш чым на 240 нямецкіх міль; а ў шырыню ад Карпацкіх гор да Усходняга возера, прыкладна 200 міль; з захаду яно аточанае княствам Паморскім: з поўначы пазначаным возерам, ці Балтыйскім альбо Сармацкім морам: з усходу Масквой і скіфскім, ці татарскім Дзікім полем: і нарэшце з поўдню Валахіяй, Венгрыяй і Сілезіяй.

Пазначаны Autor аднак мае на ўвазе восем вялікіх краін, якія пад каралём Sigismundo III[24] лічыліся да Кароны Польскай, а менавіта: 1) абедзьве Польшчы, Вялікую і Малую; 2) Літву; 3) Русь; 4) Прусію; 5) Мазурыю; 6) Жамойцію; 7) Памор’е; 8) Ліфляндыю; пра якія далей будзе расказана падрабязьней.

---

[24] Жыгімонт III Ваза (швэдз. Sigismund Vasa, польск. Zygmunt III Waza; 20.06.1566, Грыпсгольм у Швэцыі – 30.03.1632, Варшава) – кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1587 – 1632), кароль швэдзкі (1592 – 1599, тытулярны кароль да 1632). Заснавальнік фактычнай дынастыі Вазаў у Рэчы Паспалітай.

Paulus Piasecius, Episcopus Præmisliensis, in Chron. gestorum in Europa singularium, кажа, як шмат гадоў на тым баку ад Куявіі, Бары і Брацлаўя, адрэзак усіх гэтых мясьцін ляжаў пустэчай і быў населены толькі дзікімі жывёламі, але хутка, у часы караля Stephani[25], быў ужо запоўнены вёскамі і багатымі на жыхароў мястэчкамі. Таму ўсё, дзе пануе хрысьціянская вера,

!старонка 7!

паміж рэкамі Danasto, ці Tyra, Hyppani і Boristhene, і таксама паводле дамовы з Solymanno, турэцкім імпэратарам, усё да гарадоў Ponti Euxini, ці Чорнага мора, лічыцца польскім. У Bialogrodia (то бок Cromeri Moncastrum, якая ляжыць на другім баку пазначанай ракі Tyræ) і ў Oczakovia Кароне Польскай належаць тэрыторыі Турэцкана мора, якія знаходзяцца паміж імі і далучаюцца да польскіх гарадоў каля ўзгаданага Pontum Euxinum: і землі, якія працягнуліся за Boristhenem на 2, а некаторыя мясьціны на 3 дні падарожжа ў напрамку ракі Tanai і Масквы. І ад гэтай умацаванай і на тым баку Boristhenis разьмешчанай адкрытай зямлі ідзе, ці знаходзіцца, Chersonetus Taurica, якая аточаная з поўдня і ўсходу Ponto Euxino, а з поўначы Mæotiчнымі дрыгвамі (у якія ўпадае рака Tanais, ці Don, якая цячэ з Масквы) ды Bosphoro Cimmerio і займае ў даўжыню, як таксама і ў шырыню, амаль роўна 20 нямецкіх міль: на другім баку ад ракі Tyræ, аднак, ляжыць на поўдні Малдавія, якая агульна ва ўсіх аўтараў узгадваецца таксама пад назвай Валахія, і чые князі раней былі пад апекай Кароны Польскай, цяпер, аднак, захопленыя турэцкім імпэратарам і respectirуюць польскіх каралёў толькі ў якасьці суседзяў,

!старонка 8!

і трымаюць з імі па большасьці добрае сяброўства.

Пасьля вайны, што вялася з Масквой у 1616, 17 і 18 гадах, межы Польшчы і Літвы пашырыліся больш чым на 100 міль у даўжыню і шырыню. Гэта аднак польскія мілі, а як гэта ў нямецкіх, указана ў Polonia defensa, p. 127. Часткова кажуць, аднак, польская міля складае 4 вэльскія; пры гэтым літоўскія, русінскія і падольскія зьяўляюцца крыху большымі: як таксама і нямецкія не ва ўсіх мясьцінах зьяўляюцца аднолькавымі.

Адносна ўрадлівасьці вышэйпазначаных зямель можна ў любы час прачытаць у нашым ранейшым апісаньні, асабліва на ст. 5, 39, 40; як таксама і тое, што тут прыведзена далей у апісаньні ўзгаданых зямель.

Пчалярства ў Польшчы маецца ў дзьвух варыяцыях, хатняе і дзікае, то бок у хаце, альбо ў лясах, і абодва ажыцьцяўляюцца не без стараннага дагляду.

З быкоў у мінулыя гады, перад тым як краіна была гэтак моцна пашкоджаная вайной, штогод на экспарт адпраўлялася да 60 тысяч, акрамя тых, якія спажываліся самім палякамі; як сьведчыць Autor Poloniæ defensæ p.52.

Пра эфектыўнасьць салявых і горных шахтаў будзе казацца ніжэй.

---

[25] Стэфан Баторы (па-польску: Stefan Batory; 27.09.1533, Жыладзішомльё ў Трансыльваніі, цяпер Шымлеў-Сылваніэй, Румынія – 12.12.1586, Горадня) – кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1576 – 1586), князь трансыльванскі (1571 – 1576).

То пазначаныя землі маюць прыгожыя, буйныя і багатыя на рыбу рэкі, як Boristhenem, ці

!старонка 9!

Dnieper, Aprum, ці Wieprz, Tyram, ці Dniestr, Vistulam, ці Віслу, Chrononem, ці Niemen, Hierassum, ці Pruth (якая адасабляе Малдавію ад Падоліі) і яшчэ шмат іншых, некаторыя з якіх будуць названыя тут ніжэй. Хачу тут крыху паведаміць толькі пра ўзгаданы вышэй Boristhene, які цячэ з Масквы, прымае ў сябе шмат вады, вельмі хутка бяжыць, глыбокі, і нарэшце ўліваецца ў Эўксінічнае Мора. Гл. наша ранейшае апісаньне, p. 179 & sec. Ён прабягае 200 нямецкіх міль, і калі ён у 50 мілях ніжэй Кіеўшчыны трапляе ў скалістае месца, што на славянскай мове завецца Porohi, і далей падае ўніз цераз скалы, нібыта па прыступках, то раздзяляецца там разнастайна па паверхні і ўтварае 70 выспаў, якія маюць назву Zaporohi ад узгаданых прыступкаў зьбягаючай уніз вады і таксама ад саміх прыступкаў, бо яны разьмяшчаюцца на саміх гэтых скалістых выступах; то пагэтаму таксама і казакі, якія жывуць на гэтых выспах, называюцца праз іх запарожскімі казакамі.

Што да польскіх традыцый, звычаяў і таму падобнага, то пра гэта я распавядаў у ранейшым апісаньні, p. 44 & seq., 50 & seq. Таму хачу тут напісаць толькі тое, што я потым знайшоў па гэтай тэме ў некаторых новых польскіх аўтараў.

І па-першае, кажа Starovolscius, што не толькі тыя, што належаць да шляхетнага роду, карыстаюцца замежнай

!старонка 10!

тканінай і футрам, але ходзюць апранутыя ў шоўк, пурпур і золата таксама і тыя, што належаць да нізкага і агульнага стану; упрыгожваць коней срэбрам, есьці з срэбнага посуду, аздабляць срэбрам алтары нават у вёсках цяпер стала агульным; таксама прынята прыбіраць сябе срэбрам, золатам, перлінамі і каштоўнымі каменьнямі; і не засталося нічога іншага, як толькі пачаць есьці золата і срэбра. Таму як раз, паміж імі ўспыхвае шмат пастаянных спрэчак; і людзі таксама ўжо больш не так старанна выконваюць вайсковыя абавязкі. І кажа далей, што людзі праз гэта жывуць вельмі велічна, і вялікія паны большую частку сваіх прыбыткаў марнуюць на спецыі і віно. Часткова можна знайсьці такіх, што робяць для сваёй асобы да 60-ці вельмі каштоўных строяў; апранаюць нават сваю прыслугу так сама раскошна; і большую частку сваіх уладаньняў, ці маёмасьці, марнуюць на тое, каб яны маглі хадзіць у атачэньні толькі сваіх высакародна апранутых людзей, як жанчын, так і мужчын. То вялікая раскоша наводзіцца таксама на драўляныя хаты і будынкі, якія аднак ёсьць нішто іншае, як вартыя быць спаленымі прыгожа складзеныя кучы бярвеньня. Хадзіць пешшу, асабліва на далёкія адлегласьці, лічыцца не зусім годным: таму для мужчын і жанчын павінны мецца карэты і вазы з 6 конямі; хаця мужскія асобы больш скачуць верхам, чым едуць.

Польскі біскуп Piasecius паведамляе,

!старонка 11!

калі у 1589 годзе кароль Жыгімонт[26] з дазволу палякаў адправіўся ў Рэвал[27] у Ліфляндыі да свайго пана айца, караля Швэцыі Ёгана[28], зь ім выступілі некаторыя польскія паны з вялікай колькасьцю людзей і сярод іх Крыштаф Радзівіл[29], ваявода Віленскі, з больш чым тысячай асобаў. Калі ж кароль Ёган загадаў забясьпечыць гэтых гасьцей правіянтам, і ўзгаданаму пану Радзівілу было прызначана 2 быка; нехта, аднак, сказаў, што ў яго ж вельмі шмат прыслугі; на гэта спраўнік адказаў, што тады яму трэба было даць такую самую колькасьць коз; паказаўшы гэтым, што швэды былі значна больш эканомныя за палякаў, якія праядалі ўсе прыбыткі і часта праз гэта траплялі ў жабрацкае становішча.

Польская шляхта мусіць мець вопратку абліцаваную сабалінымі кунічым футрам, якая каштуе амаль 2 тысячы талераў. Пры тым адно адзінае футра, якое не мае нават аднаго футу памера, у добрай якасьці каштуе больш за 50 талераў; як піша Autor Poloniæ defensæ.

Сярод іх законаў маецца таксама гэткі: калі нехта трапляе ў апалу і робіцца нягодным, то яму не дазваляецца знаходзіцца ў Каралеўстве; бо інакш ён можа быць безпакарана забіты любым чалавекам. Усе кіраўнікі, у чыі ўладаньні ён трапляе, абавязаныя затрымаць яго і прывесьці яго да сьмяротнага пакараньня. Таксама кароль можа выдаць яму ліст бясьпекі на пэўны

!старонка 12!

тэрмін, у які яму дазваляецца вольна знаходзіцца ў краіне.

Забойства, хаця і караецца проста грашовым штрафам, які аднак прызначаецца судзьдзямі, а злачынец за гэта адпраўляецца ў цяжкую, змрочную і глыбоку вязьніцу, дзе ён павінен сядзець адзін год і паўтара месяца; а калі ён не можа вынесьці гэткага пакараньня і такім чынам, калі заключа дагавор на гэты конт, атрымлівае паслабленьне, то ён усё роўна павінен спаць у турме. І гэткае паслабленьне сьмяротнага пакараньня дапамагае не кожнаму забойцу. Бо тыя, што былі схопленыя на месцы злачынства, як таксама і дарожныя рабаўнікі ды галаварэзы, мусяць пазбаўляцца жыцьця: аднак той, хто застрэліў іншага куляй са ствала, мусіць плаціць падвойны грашовы штраф і сядзець два гады ў зняволенні: як паведамляе Autor Poloniæ defensæ p. 80.

Раней усе appellationes ад ніжніх судоў ішлі да караля. Пры панаванні Stepheni Betorei аднак, былі заснаваныя два прыдворных суда, ці парлямэнта, як яны называюць Tribunalia: адзін у Петрыкаве, для Вялікай Польшчы і Прусіі, і ў Любліне, для Малай Польшчы і Русі; судзьдзі якіх нясуць службу адзін год. Што да зусім цяжкіх злачынстваў, то кароль як і

[26] Жыгімонт Ваза (Sigismund III; 20.06.1566 – 30.04.1632) – кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1587 – 1632), кароль швэдскі (1592 – 1599). Сын караля Швэцыі Юхана III Вазы і Кацярыны Ягелонкі, дачкі Жыгімонта Старога.

[27] Талін (Эстонія).

[28] Юхан III, Ёган (Johan III; 20.12.1537 – 17.11.1592) – швэдскі кароль (1568 – 1592). Сын швэдскага караля Густава Васы і Маргарэты Леянхувуд.

[29] Крыштаф Радзівіл "Пярун" (09.02.1547 – 20.11.1603) – сын Мікалая Радзівіла Рудога, вялікі гетман літоўскі, ваявода віленскі, кашталян троцкі, гетман польны літоўскі, вялікі падчашы літоўскі, староста кокенгаўзенскі, салецкі, жыжморскі, барысаўскі.

раней абмяркоўвае іх з радай на соймах; як разглядае таксама і спрэчкі наконт каралеўскіх сімпатый і гарадоў, якія належаць яму, каралю, асабіста.

!старонка 13!

Да немцаў палякі ставяцца непрыхільна. І польскі біскуп Paulus Piasecius, у сваёй Chronic на 40-м аркушы, адкрыта кажа: Polonia, ды Slavonia totâ gentis naturâ abhorret à studiis & atribus Germanorum & quicquid venit inde, quale illud sit, præter operas mechanicas, sibi noxium reputat & rejicit suspectum[30].

Польскі народ падзяляецца спачатку на шляхетны і агульны стан, а потым на духоўнікаў і сьвецкіх. З абодвух складаецца Рада ўзятая з усіх правінцый, якая дадаецца да караля. Starovolscius прыводзіць яе ў чатырох групах, то бок:

1. Два арцыбіскупа, а менавіта Гнэзенскі і Леонбэрзскі: разам з 15-ю біскупамі: кракаўскім, куяўскім, віленскім, познаньскім, плоцкім,варменскім, пржэмыслскім, жамойкім, кульмскім, хэльмскім, кіеўскім, люцэорыйскім, камянецкім, вендзенскім і смаленскім.

2. Ваяводы, ці 34 Palatinos, Cracoviensem, Posnaniensem, Vilnensem, Sendomiriensem, Calissiensem, Trocensem, Siradiensem, Lanciciensem, Brestensem, Kioviensem, Inoulodislaviensem, Russiæ, Volhyniæ, Podoliæ, Smolenscensem, Lublinensem, Polocensem, Belzensem, Novogrodensem, Plocensem, Vitebsensem, Massoviæ, Podlachiæ, Ravensem, Bresciensem, Culmensem, Mscislaviensem, Marieburg, Braskaviens, Pomeraniæ, Miscens, Bendens, Derpatens, Parnaviens, Czerniechoviens, Capitaneum Samogitiæ.

!старонка 14!

Потым, 3., восемьдзесят сем як вялікіх, так сама і малых Castellanos, як той кракаўскі, які ідзе перад усімі Palatinis і займае наступнае пасьля біскупаў месца сярод сьвецкіх паноў рады. Потым, як ён іх называе па парадку, йдуць Castellanus Vilensis, Trocensis, Posnan, Sendomir, Caliss, Voinicens, Gnesnens, Stradi, Lencici, Samogitæ, Brestens, Kiov, Inouladislav, Leopol, Volhyn, Camenecens, Smolensc, Lublin, Poloc, Belz, Novogrod, Plocens, Vitebsc, Cernens, Podlachiæ, Ravens, Bresci, Culm, Mscislav, Elbing, Braslav, Gedan, Minscens і Czerniechoviensis. І гэтыя называюцца вялікімі, бо яны прыцягваюцца да ўсіх, нават сакрэтных, парадаў з іншымі як духоўнымі, так і сьвецкімі панамі рады, малыя аднак не; да іх адносяцца: Sandecensis, Medirecens, Visliciens, Biensis, Rogosnens, Radomiens, Zavichost, Lendens, Stremens, Zarnov, Malogost, Vielun, Prætnisl, Haliciens, Sanoc, Chelm, Dobrin, Polanecens, Præmeten, Crivinen, Czechoviens, Naclens, Rospiriens, Biechov, Bidgost, Bræsniens, Crusvic, Osvecim, Camenecens, Spicimiri, Inoulodens, Covali, Santoc, Sochaczov, Varsov, Gostin, Visnens, Racionensis, Sieprcens, Visogrod,

[30] Усе народы Польшчы і Славоніі натуральна ня церпюць дасьледваньняў і мастацтва Германіі, і ўсё, што паходзіць ад іх, як яно ёсьць, акрамя механікі, лічуць шкодным і выклікаючым падазронасьць.

Ripinens, Zacrocimensis, Ciechanov, Livens, Slonscens, Lubaczov, Conariens, terræ Lenciciens, Conatiensis, terræ Cujaviensis.

4. За імі йдуць 10 высокіх чыноў

!старонка 15!

каралеўства: вярхоўны маршалак Кароны Польскай; разам з яе прыдворным маршалкам; вярхоўны маршалак Вялікага Княства Літоўскага і яго прыдворны маршалак; канцлер і унтэр-канцлер Кароны Польскай; канцлер і унтэр-канцлер у Літве; і нарэшце польскі і літоўскі скарбнікі.

Palatini, ці ваяводы, зьяўляюцца аднак герцагамі ў сваіх раёнах, а падчас вайны кіруюць войскам, у тых самых сваіх аколіцах.

Castellani аднак, што маюць сваё імя ад замкаў, ці гарадоў, якія прадстаўляе кожны зь іх, адначасова зьяўляюцца Palatinorum леўтэнантамі, таксама кіраўнікамі і прадстаўнікамі шляхты сярод кожнага асобнага Palatinat, ці ваяводства; і ў адным Palatinat часам бывае некалькі кашталянаў.

Што да іншых Officiales, ці чыноў, якія не лічацца сярод паноў рады, то іх маецца тры групы. Такім чынам некаторыя называюцца Officiales усяго Каралеўства ці Вялікага Княства Літоўскага, як Generales войска, Referendarii, чашнікі, старасты, варта і таму падобныя. Іншыя зьяўляюцца каралеўскімі прыдворнымі Officiales, як старэйшы камергер, старэйшы і малодшы стайнікі, кухар, фурман і егер; сакрэтны пісар і таму падобныя. І потым нарэшце Officiales, ці чыны, у

!старонка 16!

правінцыях, ці землях, як Gubernatores, якіх яны завуць Capitaneos; намесьнікі ў гарадах, судзьдзі, мечаносцы, скарбнікі і шмат розных іншых, якія называюцца зямельнымі Officialen. Глядзі маё ранейшае апісаньне, p. 54 & seqq.

Аднак наконт узгаданага вышэй трэба адзначыць, што тыя 150 Senatorn, якія былі там пералічаныя, у наш час часткова адсутнічаюць; бо іх біскупствы, Palatinaты і Castellanii знаходзяцца пад швэдскай і маскавіцкай уладай.

Акрамя таго што арцыбіскуп гнэзенскі ідзе перад усімі іншымі, адзін з Senatorn публічна нясе перад ім крыж, як таксама і маршалскае жазло, калі той ідзе па завулкам і да двара, што азначае каралеўскую прыязнь. Калі ён толькі ўваходзіць, кароль робіць яму насустрач некалькі крокаў і прымае яго стоячы. Калі кароль памёр, то ён зьбірае Сойм і выступае з каралеўскага месца; і таксама пры яго жыцьці, калі ён, кароль, робіць нешта супраць закона, то гэты арцыбіскуп склікае прадстаўнікоў да рады; як Andr. Maximil. Fredro паведамляе in gestis populi Poloni, sub Rege Henrico Valesio.

У астатнім усе вышэй названыя Senatores, ці каралеўскія дарадчыкі, маюць сваё месца і голас на Соймах, якія звычайна праводзяцца ў Варшаве, з-за зручнасьці гэтага месца; туды таксама прыходзяць прадстаўнікі шляхты, ці камітэт, якіх яны называюць краёвымі пасламі

!старонка 17!

і municipales nuncios, якія абіраюцца для гэтага з усіх зямель іншымі шляхцічамі праз вольныя выбары, і якія на гэткіх Соймах прадстаўляюць Democratiam, або ўладу народа, і справядлівасьць, як адначасова і цэхмайстар; яны дапамагаюць закону і таксама трымаюць ў межах каралеўскую ўладу і празмерны аўтарытэт рады; як піша вышэй узгаданы Starovolscius і іншыя.

Хаця герцагі Прускія некалькі разоў рэгістраваліся, бо яны таксама хацелі як пераважны суб'ект Каралеўства мець месца і голас на гэткіх польскіх Соймах, ім аднак адмаўлялі, і герцаг Прускі, як таксама і Курляндскі, і князь Малдаўскі, лічыліся за падданых, альбо Vasallen; хаця з гэтым апошнім цяпер атрымалася зусім іншая справа, як гэта бачна з узгаданага вышэй; таксама і пазначаны Starovolscius піша: Vassali tres præcipui, Dux Prussiæ, Dux Curlandiæ & Princeps Valachiæ. 2 illi hæretici, tertius iste scismaticus, qui vero jam potius Turcam supremum suum Dominum agnoscit & Polonum tantum veneratur & velut potenti vicino, statis temporibus, honoraria mittit[31].

Адносна раней узгаданай шляхты ў Польшчы і Літве, то яна была вельмі вялікай (глядзі наша ранейшае апісаньне, p. 47-48), аднак у наступных войнах надта паменшылася.

Яны ўсе маюць аднолькавую годнасьць, і не
!старонка 18!
глядзяць там, ці ён граф, ці герцаг. Паколькі яно не надае ніякага асаблівага стану, ніхто зь іх не ўздымаецца вышэй за рыцарскі стан, а іншыя са шляхты разглядаюцца толькі як прыналежныя да старажытнага і славутага роду; і той з Радзівілаў, што атрымаў ад Рымскага Імпэратара тытул герцага, мусіў тлумачыць прычыну гэтага; quasi ille morem Reipublicæ anteverteret, unde omnis titula nobilitas exularet[32], кажа прыведзены вышэй Fredro, p. 92, і на наступнай старонцы ён прыводзіць больш пра гэта. Яны захоўваюць таксама і той тытул, як гэта бачна на прыкладзе герцага з Ossolin, ці Ossolinski, які ў 1637 годзе на курфюрсцкім пагадненьні ў Рэгенсбурзе быў зроблены князем Сьв. Рымскай Імпэрыі. Аднак калі імпэратар Максіміліян Першы захацеў узьвесьці польскіх Senatores, якія са сваім каралём Sigismundo прыбылі ў Вену, часткова ў герцагі, а часткова ў графы, то яны выказалі за гэта падзяку імпэратару і засталіся пры сваіх шляхецкіх тытулах; як зноўку паведамляе Fredro.

Імпэрскаму маршалу і старэйшаму канцлеру кароль дае, як паведамляе Piasecius, тытул illustris; што не дазволена больш ніякаму імпэрскаму дарадчыку, акрамя як кашталяну Кракаўскаму, як першаму сярод сьвецкіх паноў рады.

[31] Вассалы трох зямель, герцаг Прускі, герцаг Курляндскі і князь Валахіі. Два гэта ерэтыкі, а трэці ёсьць раскольнік, які адак цяпер больш прызнае Турцыю сваім галоўным уладаром, а Польшчу толькі паважае ў якасьці моцнага суседа, час ад часу выказваючы ім увагу.

[32] Паколькі гэта нібы супярэчыць звычаю Рэспублікі, і адпаведна робіць падобныя шляхецкія тытулы пазаконнымі.

Палякі так высока трымаюць свой шляхецкі стан, што гэты стан вельмі цяжка атрымаць таму, хто нарадзіўся не шляхтай. І чужак, калі ён нават належыць да добрага і высокага шляхетнага роду, мусіць

!старонка 19!

моцна заслужыць перад палякамі, калі ён хоча атрымаць у гэтым народзе шляхетную годнасьць і правы, пасьля агульнага ўхваленьня ўсімі прадстаўнікамі.

Boterus піша, што самы вялікі пан у Польшчы атрымлівае не надта больш за 25 тысяч крон штогадовага прыбытку. Аднак біскуп Piasecius паведамляе, p. 323 ў Janussus, што герцаг Астрожскі[33], кашталян Кракаўскі, які памёр у 1619 годзе без спадкаемцы мужчынскага полу, пакінуў толькі адну дачку, і паводле багацьця быў аднолькавы з рымскім Crasso; у свой час ён за свае ўласныя сродкі ва ўсіх ваенных паходах Каралеўства харчаваў палкі і абавязаў сваю Fideicommis[34]-спадчыну, каб за яе выдаткі ў лагеры Польскай Republic стала знаходзілася 600 узброеных вершнікаў супраць суседніх ворагаў з зямлі Рускіх; што адбываецца і дагэтуль. І ён пакінуў пасьля сябе трыста тысяч вянгерскіх дукатаў наяўнымі грашыма, і вельмі вялікую колькасьць агульнага капіталу, таксама і каштоўных каменьняў, залатых і срэбных хатніх прыбораў, і асобна вялікую колькасьць разнастайных калекцыйных рэчаў. У 1631 (піша ён далей на старонцы 423) адышоў Andreas Lipski[35], біскуп Кракаўскі, пакінуўшы 900 тысяч польскіх гульдэнаў наяўнымі грашыма, акрамя каштоўных хатніх прыбораў і шматлікіх напоўненых засекаў. То Autor Poloniæ defensæ, p. 126 і 127, паведамляе, што яны валодаюць настолькі шматлікімі падобнымі па велічыні спадчыннымі надзеламі, раскіданымі па розным землям каралеўства,

!старонка 20!

што калі іх сабраць разам, то лёгка можа атрымацца плошча ад 20 да 30 міль. Ён ведае шмат тых, якія маюць 100, 200, 300 і больш вёсак, 20 ці нават 30 гарадкоў. Не мала тых, што са сваіх аколіц могуць павесьці тысячу пешых і тысячу конных, у лёгкіх даспехах, якіх называюць Casacos і Dragones, а часткова нават 3 ці 4 тысячы; паміж якімі поле падзелена так, што, калі хоць якая плата будзе дадаеная, яны, калі іх пан загадае, выходзяць на вайну. У Вялікай Польшчы, дзе асабліва актыўна займаюцца жывёлагадоўляй, адзін

---

[33] Януш Астрожскі (каля 1554 – 12 або 13.09.1620) – дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай. Ваявода валынскі (1584 – 593), кашталян кракаўскі (з 1593); стараста багуслаўскі (з 1591), белацаркоўскі (з 1592), чаркаскі і канеўскі (з 1594), пераяслаўскі (з 1604; увайшло ў трыманне ў 1618). Валодаў горадам Дубна і іншымі маёнткамі на Украіне, горадам Тарнаў у Польшчы і інш. Адзін з найбагацейшых магнатаў Рэчы Паспалітай, апошні прадстаўнік мужчынскай лініі роду і першы, што прыняў Берасцейскую унію.

[34] Фідэікоміс (лац. fideicommissum, ад fides – вера, давер, добрасумленнасьць і committo – даручаю) – у нямецкім праве спадчыннае распараджэньне, на падставе якога пэўная маёмасьць, звычайна нерухомая, павінна заставацца ва ўладаньні сям'і, і не перадавацца трэцьцім ліцам, але толькі пераходзіць далей у пэўным парадку права спадчыны. Сама гэтая маёмасьць называлася таксама фідэікоміс, ці маярат.

[35] Андрэй Ліпскі (1572 – 04.09.1631) – каталіцкі і дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, біскуп луцкі (1617 – 1623), куяўскі (1623 – 1630) і кракаўскі (1630 – 1631), падканцлер каронны (1618 – 1620), канцлер вялікі каронны (1620 – 1623), юрыст і гісторык.

пан зімаваў на сваіх надзелах 30 тысяч авец. У Русіі, ці Русі, кажа ён далей на 128 ст., маецца звычай, кожныя сем год забіраць дзесяціну ад усяго быдла падданых; і ён ведае дакладна, што адзін атрымаў дзесяцінай 10 тысяч быкоў. Паколькі яму аднак час, ці чаканне прыбытку, падалося надта доўгім, то ён падзяліў сваю маёмасьць так, што ён кожны год атрымлівае больш за тысячу. Ад рыбалоўлі яны таксама атрымліваюць вялікую карысьць. І хаця рыба танна каштуе, аднак рыбалоў, ці ўласьнік часта мае 10, 15 і нават да 30 тысяч гульдэнаў. Ён таксама дадае, колькі польскія паны трымаюць людзей і рознай чэлядзі, і кажа на 133 старонцы, што ведае аднаго, які па-за вольным табелем штогод дае 5 і 6 тысяч італьянскім музыкам. Часткова яны стала трымаюць пры сябе 100 драгунай, вядома нямецкіх,

!старонка 21!

100 казакаў і 100 венграў пяхоты, якіх яны называюць Haidukos; і менавіта альбо ў якасьці целаахоўнікаў, альбо дзеля велічы. Калі аднак яны выязджаюць да Сойма ці да іншай публічнай службы, то бяруць з сабой у 3 ці 4 разы больш людзей. Часткова яны трымаюць 200, 300 і больш коней. Аднак пра гэта ўжо было крыху сказана вышэй.

Хачу адзначць яшчэ толькі, што шляхта мае сваю годнасьць і славу вышэй за іншыя, атрыманыя ад кіруючых ці грамадскай службы пасад: і што пазашлюбным дзецям ані дазваляецца весьці радавое імя, ані даецца магчымасьць на атрыманьне яшчэ нейкай спадчыны.

Дык з гэтай шляхты складаецца найбольшая вайсковая моц каралеўства, якая на свае грошы, праз трох restes, ці каралеўскі загад, можа быць скліканая разам у месячны тэрмін, з абавязкам служыць каралеўству. Часам склікаецца толькі шляхта адной правінцыі, і падобны сход іх называецца Pospolite. Частка шляхцічаў называецца чвартакамі, бо яны атрымліваюць чвэрць ад каралеўскага прыбытку, і таму перад усімі іншымі мусяць стала знаходзіцца ў гатоўнасьці; што было ўведзена каралём Sigismund. Augustus.

Казакі таксама зьяўляюцца мясцовымі ваярамі, аднак не лічацца сярод шляхты. Глядзі пра іх наша ранейшае апісаньне p. 49 seq. і вышэй пра раку Boristhene; на выспах якой пражывае па большасьці гэты просты, але ў зброі

!старонка 22!

вельмі дасьведчаны народ, і з іх яны робяць рэйды да татараў і туркаў, у астатнім аднак маюць свае хаты, ці дамы і ўчасткі ў Кіеўскіх, Браслаўскіх краях. Яны старанна сочуць, калі татары з нарабаваным зноўку накіроўваюцца дадому, і аднімаюць яго ў іх. Бо гэтыя пазначаныя выспы знаходзяцца ўсяго ў чатырох днях шляху ад вузкага месца Peninsulæ Tauricæ. Хаця калісьці раней яны мелі з татарамі добрае сяброўства. Кароль Стэфан даў ім, Cosacis, замак Techtimirow з яго ваколіцамі, які ляжыць на берагу Boristhenis у 20 нямецкіх мілях ад Кіева; што менавіта там іх старшыні маюць сваю рэзідэнцыю; таксама там павінен знаходзіцца іх арсэнал і ваенныя ўзбраеньні. І маюць яны аднаго палкоўніка, якога ім прызначае кароль; астатніх ваенных чыноў, што могуць знаходзіцца ў пазначаным Techtimirow, яны аднак абіраюць самі. І на ўзгаданых выспах дзеля варты пакідаецца не менш за 2 тысячы чалавек; аднак астатні народ,

узімку, мае дазвол вяртацца ў свае хаты ў польскіх правінцыях. І яны прынесьлі ворагам Польшчы немала шкоды. Бо яны, схіліўшыся, караскаючыся сярод травы пэўнымі сьцежкамі, нябачна атакуць нейкі лагер; без клапот пераплываюць рэкі на бурдюках, ці нават і без іх, паклаўшы зброю на сьпіну,

!старонка 23!

ці таксама трымаюцца за хвост праплываючых коней. Яны карыстаюцца маленькімі караблямі, дзе могуць сядзець 60 чалавек з дастатковым правіянтам, на якіх яны ходзюць па Чорнаму мору і робяць рэйды падчас да Канстантынопаля, плюндруючы там таксама навакольныя мястэчкі і населенныя пункты. Паколькі, аднак, падобныя ўчынкі былі супраць міру, што быў заключаны з туркамі, і таксама паколькі палякі не маглі цярпець іх, казакаў, высокага пад'ёму; то ваявода Koniecpolski[36], за грошы каралеўства, у 1637 годзе загадаў пабудаваць крэпасьць Гудак[37] на месцы, дзе Samara ўпадае ў Boristhenem, каб лепш трымаць іх у межах, і таксама раскідаў іх паміж мястэчкамі Moszni і Cumeychi; і калі яны пасьля бітвы накіраваліся на Borovitz, ён абклаў апошні і перамог яго. Калі аднак у наступным 38-м годзе іх палкоўнік Paulucus[38] супраць дадзенай гарантыі бясьпекі быў абезгалоўлены ў Варшаве, а казакі былі вылішаныя ўсіх вольнасьцей з пазначыным замкам ці мястэчкам Techtimirow, то бок аўтаноміі, што была дадзеная польскімі каралямі; тады яны з вялікай стараннасьцю заняліся сваёй бясьпекай, і калі генэрал Nicolaus Potocki[39] выступіў супраць іх, яны нанесьлі вялікія страты каралеўскаму войску пад мястэчкамі Holtew і Lubnia. Потым зь імі ўсё было ціха, пакуль у 1648-м годзе Bogdanus Chmielnicius[40] з-за вялікай ганьбы, што ён атрымаў ад старшыні яго месцажыхарства ў

!старонка 24!

Corsun, падбухторыў не толькі казакаў, але таксама і сялянства ў Русі, і да таго яшчэ ўзяў на дапамогу татараў; чый бунт і наступныя за ім страты здарыліся праз чыстую неасьцярожнасьць каралеўскіх палкоўнікаў, якія succedirt[41] вышэй пазначанаму Stanislao Coniecpolsky, што памёр 11-га сакавіка 1646-га году; як піша Piasecius.

Гэты Chmielnicius, як распавядае Joachim Pastorius in Bello Scythico-Cosacico, lib. 1 p. 5 & 6, быў не толькі надта дасьведчаным

---

[36] Станіслаў Канецпольскі (Stanisław Koniecpolski; 09.02.1591 – 11.03.1646) – князь Свяшчэннай Рымскай імпэрыі, вялікі каронны гетман Рэчы Паспалітйй (з 1632). Адзін з буйнейшых ваяводаў свайго часу.

[37] Кодак (па польску Kudak) – крэпасьць на правым беразе Дняпра насупраць былога Кодацкага парога. Сама назва "Кодак" у перакладзе з цюркскага азнаве "паселішча на гары".

[38] Паўлюк, вядомы ў гісторыяграфіі пад рознымі імя: Паўлюга, Паўлюс, Паўрус, Палі, Баюн, Бут, а таксама Гуздан Карп Паўлавіч і яшчэ: Паўлюк (Бут) Павал Міхновіч; пакараны сьмерцю ў 1638 – гетман Запарожскіх казакаў, кіраўнік казацкага бунта на Ўкраіне ў 1637 – 1638 гг.

[39] Мікалай Патоцкі (Mikołaj Potocki; 1595 – 20.11.1651) – буйны магнат Рэчы Паспалітай, дзяржаўны і ваенны дзеяч. У 1637 – 1638 гг. кіраваў падаўленьнем казацкага бунта.

[40] Багдан Хмяльніцкі (27.12.1595 – 27.07.1657) – украінскі гетман, дзяржаўны дзеяч і дыплямат.

[41] Прыйшлі на зьмему.

ваяром сярод казакаў, але таксама і высока адукаваным, што для гэтых людзей даволі рэдкая зьява. Таму ён з простага салдата зрабіўся гетманам і паслом казакаў на польскіх соймах і перад каралём, і нарэшце Notarius самаго казацкага войска, якое не мела ніякага дакладнага ліку, аднак у мінулым годзе складалася з 6 тысяч, у складзе палка польскіх ваяводаў, чаго яны раней доўга не хацелі дапушчаць. Потым аднак дасьведчанасьць узгаданага Chmielnicius схіліла караля Uladislaum IV[42] паставіць яго над казацкім войскам, і таму ён таксама павялічыў яго колькасьць. Таму ён зрабіўся ганарлівым, і калі ён, прыкладна з-за межаў свайго надзелу, уступіў у спрэчку з Czaplinscio[43], subpræfecto Coniecpolsciano, то ён вырашыў тую адзіную ганьбу, якую яго прымусілі цярпець,

!старонка 25!

адпомсьціць публічнай шкодай; як ужо вышэй пазначалася, і пра гэта можна шмат чытаць у пазначанага Pastorio: які таксама ўзгадвае вышэй пазначаныя выспы Boristhenis наступнымі словамі: Chmelnicius facilè socios reperit, quibus cum in solitum Cosacorum receptum profugit, ad Insulas scilicet Zaporovianas, quas Boristhenes 50 infra Kioviam milliaribus, per objacentes transversim scopulorum complures gradus (qui in lingua Slavonica Porohi & inde qui ultra hos habitant, cosaci Zaporoviani vocantur) præcipitans & multos hinc alveos divisus, efficit. Piscatui quidem & faciendis in Pontum Euxinum excursibus opportunas, cætera steriles & inhospitas. Cmelnicius Tartaros, qui tum in camporum desertorum solitudinibus hybernabant, prædæ suo more intentos, in societatem traxit[44]. Дагэтуль яго цытата. Неўзабаве пасьля гэтага кароль Uladislaus памёр.

A.M. Fredro кажа, што колькасьць казакаў невядомая, падчас іх бачылі 18, падчас 30 тысяч: Chmelnicius аднак некалькі разоў выводзіў на поле звыш 200 000, калі ён падняў на бунт усю Русь. Паводле газэт, ён памёр восеньню 56-га года, як таксама і яго сын Цімафей[45] (які ажаніўся з малодшай дачкой Малдаўскага князя) раней за яго. Трэба таксама яшчэ паведаміць, што ў Маскве таксама ёсьць казакі, якія называюцца Cosaci Donenses ад ракі Don, ці Tanai, на якой яны жывуць.

!старонка 26!

---

[42] Уладзіслаў Ваза, Уладзіслаў IV (9.06.1595 – 20.05.1648) – кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1632 – 1648), цар маскоўскі (з 1610).

[43] Даніэль Чаплінскі (Daniel Czapliński) – падстараста чыгірынскі, ротмістр войска польскага.

[44] Хмяльніцкі лёгка знайшоў саюзнікаў, якіх ён атрымаў сярод звычайных беглых казакаў, на выспах Запарожскіх, на Дняпры ў 50 мілях па строме ад Кіева, дзе ён падзяляецца скаламі на некалькі ўзроўняў (на славянскй мове – "парогі", і таму тых, хто жыве там, называюць Запарожскімі казакамі) парогаў, у выніку чаго падзяляецца на шматлікія рукавы. Там займаюцца рыбалоўляй і прадпрымаюць рэйды да Чорнага мора, у астатнім гэты край бясплодны і неабжыты. Хмяльніцкі прывабіў на свой бок татараў, што займаліся набегамі ў пустынным краі, абяцаньнем іх звычаёвай здабычы.

[45] Цімафей Хмяльніцкі (каля 1632 – 15.09.1653) – адзін з сыноў Багдана Хмяльніцкага, актыўны ўдзельнік казацкага бунта.

Акрамя мясцовых ваяроў палякі карыстаюцца таксама венграмі і асабліва немцамі. Час ад часу яны таксама наймалі татараў супраць сваіх ворагаў: як пра гэта можна чытаць у Piasecio s. 53, і таксама ў гэты час кароль Ян Казімір[46] карыстаўся імі супраць швэдаў; хаця яны звычайна зьяўляюцца амаль сталымі ворагамі палякаў, і ўжо не настолькі вольныя як раней; пасьля таго як турэцкі імпэратар яшчэ ў 1548-м годзе зрабіў усю Tauricam сваёй правінцыяй, а татар сваімі падданымі. Як яны потым таксама ў 1594-м годзе рушылі з Sniatino, цераз Pocuce, і каля Галіцыі да Stryium, цераз Карпацкія горы, і прыйшлі на дапамогу туркам у Венгрыі: таксама, як паведамляе Fredro на 223 ст., вялікі хан, ці князь скіфаў, мог даслаць туркам орды, ці татараў, колькасьцю больш за сто тысяч вершнікаў; хаця край не такі ўжо і вялікі для падобнай колькасьці, і дзіўна, дзе яны могуць разьмяшчаць усіх палонных, якіх яны толькі з Польшчы выкрадалі на працягу доўгага часу, тады атрымліваецца, што яны прадаюць іх у чужыя землі. У 1211-м хрыстовым годзе яны ўпершыню прыйшлі з ўсходу, ад Гірканскага мора і гары Caucaso, на захад: і першымі, у чый край над Volgam яны ўварваліся, былі Poloucii; што былі імі амаль цалкам зьнішчаныя, і нават іх дапаможнікі, русіны, былі пабітыя ў сражэньні. Потым яны захапілі

!старонка 27!

вялікую частку Europa; аднак з некаторых месцаў былі зноўку прагнаныя. І князь Olgerdus[47] літоўскі ў 1331-м годзе пагнаў іх з усяго краю, то бок ад Кіеўшчыны да Oczakovia і ад Putivilo да вусьця Tanais, і адняў у іх замкі Tarhoviciam, Bialocerkuiam, Suinigrodum і іншыя. Аналягічна былі яны прагнаныя і з Падольля, землі якога Olgerdus падараваў сынам свайго брата Coriathi[48]. Бо яны, татары, не толькі захапілі паля на абодвух баках Boristhenis, якія цяпер называюць Дзікім полем, але таксама праз пастаўленых імі Baskakos, ці намесьнікаў, панавалі Падольлем і рабавалі Volynскія і Kiiovскія раёны.

У 1656-м годзе тагачасны вялікі князь Татарскі прыпісаўся да караля Польшчы Яна Казіміра як хан вялікага Крымскага, Ачакаўскага, Нагаенскага,Перакопскага, Петрасцэнскага, Кірказійскага, Семяцэнскага, Куперацэнскага і інш. войскаў. Аднак, ці ўсе яны прызнавалі яго сваім панам, можна амаль сумнявацца. Акрамя атручанай зброі яны карыстаюцца таксама чарадзействам, і менавіта з яго дапамогай у 1575-м годзе яны непрыкметна для варты захапілі без бою мястэчка Sieniawam у Падольлі, і замак ледзь не трапіў у іх рукі. З туркамі палякі не маюць асабліва ніякіх справаў, таксама і

!старонка 28!

цяпер з іх мірам; і не маюць там пастаянных паслоў.

Наконт іх войнаў трэба адзначыць яшчэ, што яны цягаюць з сабой вельмі вялікі абоз, значна больш чым салдатаў, аднак ніякіх жанчын; той

---

[46] Ян Казімір Ваза (па пол. Jan II Kazimierz Waza; 22.03.1609 – 16.12.1672) – кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1648 – 1668). Апошні кароль і вялікі князь з дынастыі Вазаў.

[47] Альгерд сын Гедзіміна (~1295 – 05.1377) – вялікі князь літоўскі (1345 – 1377).

[48] Карыят, пасьля хрышчэньня Міхаіл (памёр паміж 1358 і 1363) – князь навагрудскі і ваўкавыскі з дынастыі Гедзімінавічаў.

абоз потым хутка з’ядае ўсе запасы, як таксама і лішніх ды бескарысных коней. Таму потым піша іх уласны біскуп, Paulus Piasecius in An. 1634 p. 477, наступнае: Perpetuum malum Castrorum Polonicorum, in quibus si sint decem millia bellatorum, ad minus 50 millia Calonum, totidemque equorum superva caneorum possunt numerari: Honestas tamen in eis es major, quam in cæteris Christianorum Castris; quia nulla scorta circumducunt[49].

Цяпер я падышоў да самаго караля, які прызначаецца выбарамі. Глядзі, што піша Andreas de Pilca, Corycinius, Vislicenзенскі Castellan, у сваёй Perspectiva politica пра спадчыннасьць, і якую шкоду яна прынесла Польскай дзяржаве за 150 год, калі ў Польшчы ўладарыў род Леха, як таксама і Aristocratia, калі войска вялі 12 Palatini. Канешне і каралеўскія сыны, калі яны маюцца, не выключаюцца: аднак не часта адзін зь іх выбіраецца пераемнікам, пакуль жывы бацька. І палякі маюць звычай, не хаваць памерлага караля ў Кракаве раней, чым будзе выбраны новы кароль; і потым каранаваць новага караля на наступны дзень пасьля хаўтураў.

!старонка 29!

Калі ж ня маецца ніякага сына ад памерлага караля, то яны бяруць каралём хутчэй нейкага замежніка, чым кагосьці са сваёй шляхты; чаму яны прыводзяць розныя прычыны; хаця аднак нехта мясцовы лепш ведае становішча краіны і мае большую любоў да Айчызны, чым чужынец. Між тым, пакуль абіраецца кароль, яго месца замяшчае арцыбіскуп Гнэзенскі, як было ўзгадана вышэй. Ён, аднак, не можа раздаваць асобныя пасады, бо гэта належыць толькі каралю.

Калі ж надыходзіць прызначаны вышэй узгаданым арцыбіскупам дзень выбараў, то ўся шляхта, калі пажадае, зьяўляецца на пэўных месцах. Бо з выбарамі справы абстаяць інакш, чым з соймамі, куды шляхта, як паведамлялася вышэй, пасылае толькі краёвых дэлегатаў. А на выбарах караля права голаса маюць таксама гарады Кракаў, Вільня і Гданьск. Увесь сход падзяляецца на розныя ваяводствы, ці Palatinatus, і як дзяржаўныя дарадчыкі, так сама і шляхта накіроўваюцца кожны да сваёго Palatinat; толькі арцыбіскуп застаецца на сваім месцы, бо яму потым, пасьля падліку ўсіх галасоў, належыць агалосіць сваё меркаваньне на гэты конт і адначасова таксама прызначыць караля; і калі спачатку найшаноўны дзяржаўны дарадчык у кожным Palatinat, выслухае сваіх падданых, і іх vota[50] будзе пераданая арцыбіскупу; і ўсе Palatinatus зноўку

!старонка 30!

зьбяруцца і разам абмяркуюць паданыя імі галасы, і калі потым паслы новаабранага караля на каленях прымуць прысягу тым пералічаным пунктам, якіх павінен трымацца кароль, і якія зачытваюцца ім польскім і літоўскім канцлерамі; тады абраны кароль яшчэ раз абвяшчаецца публічна. І

[49] Вечная бяда польскага лагера ў тым, што ў ім на 10 тысяч ваяроў можа налічвацца па меншай меры 50 тысяч абозу, шмат залішніх коней і сабакаў: аднак ён выклікае павагу больш, чым лагеры іншых хрысьціян, бо не мае вакол сябе шлюх.

[50] Галасы (лат.)

калі падобнае ёсьць паблізу ад яго, то яго забіраюць дзяржаўныя дарадчыкі і шляхта і праваджаюць у царкву, і пасьля таго як арцыбіскуп прачытае імшу, кароль падыходзіць да алтару і на каленях прымае тую прысягу, якую яго паслы ад яго імя, як пазначана, прынялі раней, пры гэтым яна зноўку зачытваецца абодвума пазначанымі канцлерамі, чыстым голасам і г.д.

Падчас гэтага маршалы трымаюць скіпетр у сябе, пакуль кароль яшчэ не каранаваны; і таксама пагэтаму ён не можа ані даваць памілаваньне, ані карыстацца каралеўскай пячаткай, ці займацца каралеўскімі абавязкамі. Таму таксама і канцлеры нічога не запячатваюць, але, пасьля таго як яны разьбіваюць Sigilla памерлага караля на яго хаўтурах, то новыя пячаткі яны атрымліваюць ад каранаванага новага караля. Але дакумэнты, асабліва што да прывітальных лістоў да замежных князёў, вырабляюцца між тым пад тытулам “абраны кароль” і запячатваюцца пячаткай, якой ён карыстаўся да выбараў.

!старонка 31!

Калі князь Uladislaus у сьнежні 1632-га ў Варшаве быў абраны каралём, то ў наступным 33-м годзе памерлыя целы караля Жыгімонта і яго другой супружніцы, пані Constantiniæ[51], былі перанесеныя адтуль у Кракаў і там пахаваныя; пасьля чаго 6-га лютага ў тамашняй замкавай царкве быў каранаваны Uladislaus. І пасьля таго, як усе прынялі свае прысягі, таксама і каралеўскія браты пакляліся, што яны жадаюць быць вернымі каралю і каралеўству, пакуль яны валодаюць маёмасьцю і маюць прыхільнасьць у гэтай дзяржаве. Толькі князь Карл Фэрдынант, біскуп Брэслаўскі ў Сілезіі, быў вызвалены ад гэтага, бо ён тады не меў нічога ў каралеўстве, таму ён не быў абавязаны каралю і Republic.

Калі пасьля сьмерці караля Sigismundi Augusti[52], выбіраўся новы кароль, то Русінскія і Падольскія Palatini разам з Castellanis і ўсёй раксаланскай шляхтай прыйшлі ў Gliniano; іншыя аднак супраць звычая сабраліся недзе ў сваіх землях, і потым разам прыбылі ў Варшаву, дзе яны на адкрытым полі (бо ніякі зал ці пакой не мог зьмясьціць гэткі вялікі натоўп) правялі выбары чынам, што быў пазначаны вышэй, а дзяржаўныя дарадчыкі, разам з Vice, ці часовым каралём, альбо Interrege, а менавіта арцыбіскупам Гнэзенскім, з-за іх Authoritet мелі ў цэнтры свой асобны лагер, ці намёт.

!старонка 32!

Што за закон звычайна даецца новым каралям, каб яны пакляліся на ім, піша Andr. Max. Fredro, p. 80 & seqq. gest. populi Poloni, sub Henrico Valesio[53]. Глядзі таксама мае ранейшае апісаньне p. 58-59.

---

[51] Канстанцыя Аўстрыйская (па ням. Constanze von Österreich; 24.12.1588 – 10.07.1631) – эрцгерцагіня Аўстрыйская з роду Габсбургаў, другая жонка караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта III Вазы.

[52] Жыгімонт Аўгуст (Sigismund II; 01.08.1520 – 07.07.1572) – вялікі князь літоўскі (1544 – 1572), кароль польскі (1548 – 1572). Сын Жыгімонта Старога і Боны Сфорца.

[53] Генрых III Валуа, Генрык Валезы (па фр. Henri III; 19.09.1551 – 2.08.1589) – герцаг анжуйскі, кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1574), кароль Францыі (1575 – 1589), апошні прадстаўнік дынастыі Валуа (Ангулемская галіна) на стальцы Францыі. Трэці сын Генрыха II Валуа і Кацярыны Медычы.

Каранацыя новага караля належыць шмат разоў узгаданаму арцыбіскупу Гнэзінскаму. Калі, аднак, пазначаны кароль Henricus Valesius употай зьбег з Польшчы, і частка абрала імпэратара Максіміліяна[54], іншыя, аднак, ваяводу Семіградскага, Стэфана Баторыя, і той абыйшоў імпэратара, то ён быў каранаваны ў Кракаве біскупам з Wladislavia, бо пазначаны арцыбіскуп у той час вёў перамовы з ўзгаданым вышэй імпэратарам.

І хаця Кракаў зьяўляецца месцам каранацыі караля і каралевы, аднак гэтага не заўсёды трымаюцца, як тады каралева Cæcilia Renata[55], першая супружніца караля Uladislai IV, была каранаваная ў Варшаве, а кароль Uladislaus[56], сын караля Jagellonis[57], у Познані, а супружніца караля Alexandri[58], Helena[59], дачка герцага Johannis[60] з Масквы, паколькі яна была грэцкай рэлігіі, наогул не атрымала карону. Мы таксама знаходзім, што кароль Людвіг[61] з Венгрыі толькі пасьля сваёй польскай каранацыі, што адбылася ў 1371-м годзе, зладзіў пышнае пахаваньне каралю Casimiro Magno[62].

Пра каралеўскія прыбыткі можна прачытаць, акрамя іншых, таксама ў пазначанага вышэй Fredro lit. Q.

!старонка 33!

Хачу паведаміць тут толькі, пра што не ўсім вядома, што кароль таксама ў каралеўстве Неапальскам штогод атрымлівае 38086 дукатаў. Бо каралева Bona Sfortia[63], супружніца польскага караля Sigismundi I[64], у 1556-м годзе зноўку вярнулася ў Італію і, акрамя княства Бар і Росані, якія яна

---

[54] Максіміліян II (31.07.1527 – 12.11.1576) – кароль Багеміі (з 1562), кароль Венгрыі і Харватыі (з 1563) і імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі (з 1564). Прадстаўнік дынастыі Габсбургаў.

[55] Цэцылія Рэната Аўстрыйская (па ням. Cäcilia Renata von Österreich; 16.07.1611 – 24.03.1644) – каралева польская і вялікая княжна літоўская, эрцгерцагіня аўстрыйская, першая супружніца караля польскага і вялікага князя літоўскага Ўладзіслава IV.

[56] Уладзіслаў III "Варненчык" (1424 – 1444) – кароль польскі (1434 – 1444) і венгерскі (1440 – 1444), вярхоўны князь літоўскі (1434 – 1440) з дынастыі Ягелонаў. Першы сын Ягайлы і Соф'і Гальшанскай.

[57] Ягайла, у каталіцкім хрышчэнні Уладзіслаў (па пол. Władysław II Jagiełło; 1352[3] – 01.06.1434) – князь віцебскі, вялікі князь літоўскі (1377 – 1392), кароль польскі (1386 – 1434) і вярхоўны князь літоўскі (1392 – 1434). Сын Альгерда і яго другой жонкі, цверскай княжны Юліяніі.

[58] Аляксандр Ягелончык (Ягелон), Аляксандр Казіміравіч (05.08.1461 – 19.08.1506) – вялікі князь літоўскі (1492 – 1506), кароль польскі (1501 – 1506). Сын Казіміра Ягелончыка, унук Ягайлы.

[59] Алена Маскоўская ці Алена Іванаўна (19.05.1476 – 20.01.1513) – дачка вялікага князя маскоўскага Івана III і візантыйскае прынцэсы Сафіі Палеалог. З 1495 жонка вялікага князя літоўскага Аляксандра, з 1501 некаранаваная каралева польская.

[60] Іван III Васільевіч, Іван Вялікі (22.01.1440 – 27.07.1505) – вялікі князь маскоўскі (1462 – 1505).

[61] Людовік Венгерскі, Людвік I Вялікі (Loys, Lajos, Ludwik Węgierski; 05.03.1326 – 11.09.1382) – кароль венгерскі (Лаяш, з 1342 г.), кароль польскі (Людвік, з 17.11.1370 г.).

[62] Казімір III Вялікі (па пол. Kazimierz III Wielki; 30.04.1310 – 5.11.1370) – кароль польскі (1333 – 1370), апошні кароль Польшчы з дынастыі Пястаў.

[63] Бона Сфорца д'Арагона (па іт. Bona Sforza d'Aragona; 02.02.1494 – 19.11.1557) – каралева польская і вялікая княгіня літоўская, другая жонка Жыгімонта I Старога, маці апошняга караля-Ягелона, Жыгімонта II Аўгуста, пры якім была заключана Люблінская унія 1569.

[64] Жыгімонт "Стары" (Sigismund I; 01.01.1467 – 01.04.1548) – вялікі князь літоўскі і кароль польскі (1506 – 1548). Пяты сын Казіміра Ягелончыка, унук Ягайлы.

атрымала ў спадчыну ад свайго пана бацькі Яна Галеацы Сфорцы[65] і пані маці Ізабэлы Арагонскай[66], яна набыла шмат замкаў і штогадовы працэнт каля 430000 неапалітанскіх дукатаў. Аднак ад гэткага заможнага багацьця да яе спадкаемцаў, сына, польскага караля Жыгімонта Аўгуста, і абодвух дачок, каралевы швэдскай і каралевы польскай, жонкі караля Стэфана, трапіла не больш за пазначаныя 38086 неапалітанскіх дукатаў штогадовых працэнтаў разам з крыху меншай хатняй маёмасьцю. Бо як паведамляе польскі біскуп Paulus Piasecius, p. 236 seq., Joannes Laurentius Papagoda[67], які кіраваў усёй маёмасьцю каралевы, напісаў тастамэнт, паводле якога загадвалася выдаць каралю гішпанскаму Barium і Rossanum, а яму самаму, аднак, замак Capurci разам з іншымі шматлікімі падарункамі высокай каштоўнасьці, а ёй, каралеве Bonæ, калі яна 17-га лістапада 1558-га года хацела памерці ў Bario і ўжо не магла больш размаўляць ці разумець, ён трымаў ці падняў галаву дзеля кіўка. Гэтую гісторыю я больше нідзе, наколькі мне вядома, не чытаў.

!старонка 34!

Што польскі кароль можа рабіць, бачна з тых прадпісаных і узгаданых вышэй законаў, ці яго capitulation. Узгаданы біскуп і дзяржаўны дарадчык Piasecius, кажа на 368-й старонца, што каралю забаронена набываць надзелы шляхты ў каралеўстве, ён таксама не можа пакідаць сабе трапіўшы ў Fisco шляхецкія, ці militarысцкія надзелы; аналагічна таксама адносна князёў з каралеўскага роду і суседніх умацаваных замкаў. І на 382-й старонца ён піша, што кароль не можа даваць пасады, паводле каралеўскага права, сваім сынам ці сваёй жонцы без дазволу прадстаўнікоў.

Таксама ён не можа жаніцца без рады і дазволу дзяржаўных дарадчыкаў. Як потым таксама кароль Uladislaus выбачаўся перад каралём Англіі, які ўспрыняў як крыўду, што той не заключыў шлюб з дачкой яго сястры, пфальцграфіняй, і гэта піша ўзгаданы біскуп, pag. 494: Angliæ Rex ægrè fert repulsam filiæ Palatini, licet se illi Uladislaus excusasset, quod isti, uti à fide Catholica multum alienæ, senatus Regni Pol. totus Catholicus contradixisset & Rex lege publicâ teneatur, ne accipiat uxorem, nisi consentiente senatu[68]. Так кажа Fredro, на 95-й старонцы: Cùm Sigismundis Augustus, cum incola

[65] Джан Галеаца Марыя Сфорца (па іт. Gian Galeazzo Maria Sforza; 20.06.1469 – 21.10.1494) – герцаг Міланскі з 1476 па 1494 гады.

[66] Ізабэла Арагонская (па іт. Isabella d'Aragona; 02.10.1470 – 11.02.1524) – неапалітанская прынцэса, герцагіня Міланская, герцагіня Бары і прынцэса Росана з тытулам каралевы Ерусалімскай.

[67] Ян Ларэнца Папакода (па іт. Gian (Giovanni) Lorenzo Pappacoda; пам. 08.07.1576) – стараста Бары, прыдворны і забойца польскай каралевы і прынцэсы Бары Боны Сфорца. Сын барона Масафры Фрачэскі Папакоды і яго жонкі Ізабэлы.

[68] Кароль Англіі незадаволены адмовай ад дачкі графа, хаця Уладзіслаў і выбачыўся перад ім, бо яны, як і шматлікія іншыя чужыя каталіцкай рэлігіі, супярэчаць цалкам каталіцкаму сэнату Кароны Польскай, і кароль зьвязаны публічным законам, што не можа браць жонку акрамя як з дазволу сэната.

foemina, insciâ Republicâ, privatas nuptias egerat, quos motus tunc in Republica vidistis[69]?

!старонка 35!

На соймах кароль праводзіць усе абмеркаваньні са шляхтай. Аднак усё, што пастанаўляецца, выдаецца ад імя караля, і таксама без яго волі нічога не можа быць пастаноўлена. Тады ён зьяўляецца вярхоўным ваяводам. З судоў, як пра гэта ўжо таксама ўзгадвалася вышэй, яму перадаецца толькі частка; другая частка аднак пакідаецца за прыдворным судом. Аднак ушанаваньні, памілаваньні і бенэфіцыі, як у духоўным, таксама і ў сьвецкім саслоўі, ён раздае і параўноўвае паводле свайго жаданьня; а біскупы, і іншыя духоўныя (над якімі ён у астатнім не мае ніякай улады) і сьвецкія, робяць яго сваім сябрам; сярод іх таксама маюцца на ўвазе і намесьнікі, якіх яны называюць Starostias; чыі прыбыткі ў якасьці ўладальнікаў растуць, пакуль яны жывы, калі яны аднак паміраюць, то кароль можа перадаць гэта каму пажадае. Хаця кароль і раіцца з дзяржаўнай радай наконт шляхецкіх злачынцаў, аднак ён глядзіць тут больш на важнасьць, чым на колькасьць галасоў.

Калі, аднак, кароль робіць надта шмат супраць закону і сваёй capitulation, то ўся шляхта зьбіраецца супраць яго, што яны называюць польскім словам Rocoss; пра што можна прачытаць у Piasecius, у гадах 1606 і 1607, у якіх шляхта асабліва паўставала супраць караля і некаторых дзяржаўных дарадчыкаў, якія трымаліся зь ім.

Ці было гэтае каралеўства калі падпарадкаванае Рымскай

!старонка 36!

Імпэрыі і плаціла даніну? Глядзі пра гэта наша ранейшае апісаньне p. 58 і таксама там на p. 112, чаму яно карыстаецца белым каранаваным арлом з адкрытым клювам і распахнутымі крыламі?

Напрыканцы гэтага ўступу мусяць быць прыведзеныя таксама і польскія рэгенты: паколькі я, аднак, узгадваў пра іх на пачатку іншага выданьня, ці edition, майго ранейшага польскага апісаньня: то я хачу тут паведаміць толькі трошкі пра апошніх польскіх каралёў, якія succedirt[70] апошняму з Ягелонскага літоўскага роду (які быў пераемнікам Пясцкаму), а менавіта памерламу ў ліпені 1572-га года ў Кнышыне каралю Жыгімонту, які таксама інакш называўся Жыгімонт Аўгуст: пад уладай якога, як хоча казаць біскуп Piasecius p. 41, перад усім было занесенае немцамі ў Польшчу пратэстанцтва, пад наглядам караля і некаотрых біскупаў.

Яму, аднак, у якасьці абранага караля succedirt Генрых фон Valois, герцаг Anjou, брат караля Францыі Caroli IX[71]. Сярод паслоў, якія былі

[69] Калі Жыгімонт Аўгуст заключыў прыватны шлюб з рэзідэнткай жанчынай без ведама Рэспублікі, то ці бачылі вы які рух узняўся ў Рэспубліцы?

[70] Былі пераемнікамі.

[71] Карл IX (па фр. Charles IX; 27.06.1550 – 30.051574) – перадапошні кароль Францыі з дынастыі Валуа, з 5.12.1560. Сын караля Генрыха II і Кацярыны Медычы. Праўленне Карла адзначылася шматлікімі рэлігійнымі войнамі і Варфаламееўскай ноччу.

пасланыя да яго ў Францыю, быў таксама Joannes з Folstyn Herbort[72], Castellan з Sanoc, і Joan. Zamoiscius[73], тады яшчэ бельзскі капітан, ці Gubernator. Як яны прыбылі ў Ляйпцыг, іх затрымаў герцаг Саксоніі Аўгустус[74] і выбачыўся, што яму не дазволена даваць польскім паслам

!старонка 37!

вольны пашпарт, пакуль ён не даведаецца, якая будзе на гэта воля Імпэратара і іншых князёў Імпэрыі. Калі, аднак, паслы адправілі да яго, да курфюрста, узгаданага Herbort з Folstyn, то ён быў настолькі крануты яго прамовай, што адпусьціў паслоў працягваць іх падарожжа. Калі яны прыбылі ў Парыж, аказалася, што ўзгаданы новы кароль мусіць узяць пад сваё заступніцтва ў Польшчы таксама і тых, што адносіліся да некаталіцкай рэлігіі; хаця каталіцкія паслы protestirt супраць гэтага, аднак у рэшце рэшт пагадзіліся з умовай, што гэты закон не павінен прыносіць шкоду рымска-каталіцкай веры. І Joan. Zborovius, Odolanoviensis Capitaneus, адзін з паслоў, але іншай рэлігіі, сказаў яму: “найпрасьветлены Кароль, я кажу, калі вашыя паслы (а менавіта да Польшчы, сярод якіх найшаноўным быў Monluceius[75]) не прынялі бы ад вашага імя гэтую ўмову наконт спрэчкі ў рэлігіі (як і ўсё іншае), то вы, калі б мы запярэчылі гэтаму, не маглі бы быць абраныя каралём. Таму калі Вам гэта зараз не да спадобы, то Вы не будзеце каралём Польшчы”; як паведамляе Andr. Max. Fredro, p. 117. Аднак кароль Генрых, як потым і ўсе наступныя каралі, як пазначана in Polonia defensa, contra Barclaium, pag. 114, прыняў прысягу бараніць мір і адзінства паміж спрачальнікамі ў рэлігіі і таксама не караць за рэлігію нікога, на роўных умовах,. 24-га студзеня 1574-га году ён

!старонка 38!

прыбыў да мяжы Вялікай Польшчы, адтуль пасьпяшаўся ў Кракаў, каб прысутнічаць на хаўтурах памерлага караля. Калі аднак да яго дайшлі газэты пра тое, што яго брат, кароль Францыі Карл, памёр без законнага спадкаемца, то ён разам з некалькімі нешматлікімі сваімі даверанымі людзьмі, пакінуўшы запіску дзяржаўным дарадчыкам, што былі тады вакол яго, 18-га чэрвеня пазначанага года і на пятым месяцы ад сваёй каранацыі, бясслаўнай ноччу накіраваўся з Кракава ў Вену, адтуль аднак да Вянецыі, а потым праз Piedmont назад у Францыю.

Калі гэта стала вядома ў Польшчы, і прадстаўнікі марна спрабавалі найхуткім чынам вярнуць яго, караля, назад у Польшчу, яны прыйшлі нарэшце да выбараў новага караля; пры гэтым тады частка абрала

---

[72] Ян Гербурт з Фельштына, цяпер Скеліўка, Старасамборскага раёну, Львоўскай вобласьці, Украіна (па пол. Jan Herburt; каля 1524 – 1578) – польскі гісторык, гуманіст, пісьменьнік дыплямат, юрыст, кашталян Санокскі, стараста Пшемысльскі і Санокскі (1572, 1573).

[73] Ян Замойскі (па пол. Jan Zamoyski; 19.03.1542 – 3.06.1605) – польскі дзяржаўны дзеяч з роду Замойскіх, прыхільнік кальвінізму, затым каталік. Буйны магнат. Заснавальнік і будаўнік горада Замасьць.

[74] Август I (31.07.1526 – 12.02.1586) – курфюрст Саксоніі, сын герцага Генрыха Праведнага ад яго шлюбу з Катарынай Мекленбурзскай.

[75] Жан дэ Монлюк (па фр. Jean de Monluc, поўнае імя: Jean de Lasseran de Massencome de Montluc; каля 1508 – 12.04.1579) –французскі арыстакрат, клерык, дыплямат і прыдворны.

Імпэратара Максіміліяна, другая, аднак, Стэфана, венгра, сына Стэфана Battor[76] з Somlio (потым другі ад імя Battor пісаў сябе Battorei) ваяводы Семіградскага ад Ганы Telegdi[77]; які, з прыхільнасьці войска краіны, што ўзначальваў яго брат Хрыстафор Battor[78], пасьля сьмерці Яна Жыгімонта[79], сына караля Венгрыі Яна I[80] і Isabellæ Polonæ[81], 21-га траўня 1571-га года стаў князем Семіградскім і нарэшце праз пасрэдніцтва Самуэля Zborowski[82], што, як абвешчаны ў няміласьць у Польшчы, жыў тады ў яго ў Семіградску,

!старонка 39!

15-га сьнежня 1575-га году, як пазначана, каралём Польшчы: ён, аднак, доўга не марудзіў, але хутка прыбыў у Кракаў і быў там каранаваны, як гэта таксама было апісана вышэй: а пасьля захапіў замак Ландскрон, што трымаў для сябе імпэратар Максіміліян, раскідаў паўсюль імпэратарскія войскі, такім чынам, што напрыканцы 1576-га года ўсе польскія паны, а таксама і сам арцыбіскуп гнэзенскі і астатнія біскупы (якія ўсе, акрамя Ўладзіслаўскага, трымаліся з імпэратарам) пакінулі апошняга, бо той не сьпяшаўся ўвязвацца ў гэта, і здаліся Стэфану; толькі Stanislaus Czarncovius[83] і горад Гданьск працягвалі супраціў; аднак таксама і іх перамаглі, і ў 1577 годзе ў Польшчы ўсё супакоілася.

Затым у 1579-м годзе кароль Стэфан накіраваўся з Вільні ў паход супраць рускіх, ці маскавітаў. Бо яны ў мінулыя годы аднялі Літву і Кіеўшчыну, Смаленшчыну і землі Северскія, і таксама ў часы караля Жыгімонта Аўгуста яшчэ і Polociam з яго ваколіцамі; той горад Poloczko кароль таксама абавязкова захапіў і заснаваў там кляштар езуітаў, і пасьля гэтага вызваліў таксама ўсю ваколіцу, пасьля таго як яна 17 год знаходзілася пад рускімі.

У наступным 1580-м годзе ён абклаў буйны маскавіцкі горад Weil Koluki, які ён

---

[76] Іштван IV Батары (па венг. István Báthory; 1477 – 1534) – ваявода Трансільваніі (з 1529). Сын Міклаша IV Батары з Шам'ё (Somlyo) і Сафіі-Урсулы Банфі з Лашанца (Bánffy de Losoncz).

[77] Памылка аўтара, маецца на ўвазе Катарына Тэлегдзі (па вянг. Katalin Telegdi; 1492 – 1549) – вянгерская арыстакратка, жонка Іштвана Батары.

[78] Крыштоф Баторы (па вянг. Bathory Kristof; 1530 – 27.05.1581) – князь Трансільваніі, сын Іштвана IV, ваяводы Трансільваніі.

[79] Янаш II Жыгімонт Запальяі (па вянг. Zápolya/Szapolyai János Zsigmond; 18.07.1540 – 14.03.1571) – кароль Венгрыі (1540 – 1570), але большую частку гэтага перыяду краінай кіравала яго маці Ізабела Ягелонка пры падтрымцы Сулеймана I Цудоўнага.

[80] Ян Запальяі (па вянг. Szapolyai János; 02.02.1487 – 22.06.1540) – трансільванскі ваявода і князь, а пасля кароль паўднёвай частцы Венгрыі, так званай Асманскай Венгрыі (1527 – 1540). З'яўляецца апошнім нацыянальным кіраўніком Венгрыі.

[81] Ізабэла Ягелонка (па пол. Izabela Jagiellonka; 18.01.1519 – 15.09.1559) – польска-літоўская прынцэса, дачка польскага караля Жыгімонта Старога. Дзякуючы шлюбу ў 1539 годзе з Янашам Запальяі стала каралевай Венгрыі.

[82] Самойла (Самуіл) Мартынавіч Збароўскі (каля 1525 – 26.05.1584) – ваенны і палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, ротмістр каронны, магнат, гетман Войска Запарожскага ў 1581 г.

[83] Стасніслаў Чарнкоўскі (па пол. Stanisław Sędziwój Czarnkowski; 1526 – 1602) – магнат і дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай.

!старонка 40!
таксама разам з замкам перамог агнём; хаця маскавіты мужна абараняліся; бо ў абароне горада яны добрыя, аднак падчас сечы ў полі не асабліва карысныя. Акрамя гэтага яго людзі з accord узялі пад яго ўладу мястэчка і замак Wielisa, што стаіць каля ракі Duna, як таксама і мястэчка і замак Uswiata; і дзяржаўны канцлер Zamoyscius захапіў вельмі моцны лагерам замак Nevela, і таксама замак Zawolocia.

У трэцім паходзе, 1582-га года, яны, палякі, захапілі Астроў і абклалі Пскоў; дык тады Папам Gregorio XIII[84] быў пасланы Antonius Possevinus[85], каб схіліць караля стэфана заключыць мір з Масквой.

У 1584-м годзе вышэй узгаданы Самуэль Zborowski, ці Zborovius, які яму, каралю, дапамагаў з каронай, быў схоплены канцлерам Zamoyscio за зьдзейсьненае ім забойства і зараз раскрыты бунт супраць караля, і быў абезгалоўлены па загаду караля 16-га траўня ў Кракаве: яго брат, Крыштоф Zborowski[86], быў аднак абвешчаны ў няміласьць: з-за чаго кароль яго потым абвясьціў сваім ворагам. Ён таксама загадаў абезгаловіць у Леонберзе Iwan Podkowa[87], малдаваніна, пра што смуткаваў амаль кожны, і гэта адбылося не без пэўнага прыніжэньня яго вялікага імя сярод замежнікаў;
!старонка 41!
як паведамляе Joan. Demetr, Sulikovius, арцыбіскуп у Leopoli у сваім Commentario rerum Polonicarum, p. 105; ён кажа таксама, што гэты Podkowa быў настолькі моцны целам, што мог пальцамі ламаць конскія падковы. І той самы Solikovius (які тады быў Secretarius каралеўства) быў адным з польскіх паслоў да імпэратара Максіміляна, якія былі спыненыя ў адной баварскай вёсцы ў 3 мілях ад Рэгенсбурга і дастаўленыя ў Лінц; таму што Эрнэст Вайер[88] моцна параніў, арыштаваў і абрабаваў імпэратарскага дыплямата Генрыха Курцбахена, які быў адпраўлены ў Прусію, што ніхто не спадзяваўся, што ён выйдзе адтуль жывым. Калі аднак кароль Стэфан вызваліў узгаданага Курцбахена, то таксама і пазначаныя польскія паслы былі вызваленыя ў Лінцы імпэратарам Рудольфам[89] (бо імпэратар Максіміліян падчас гэтага памёр у Рэгенсбургу); як піша сам Solikovius, ці Sulikovius, p. 83 seq.

---

[84] Рыгор XIII (па лац. Gregorius PP. XIII; сьвецкае імя Уга Бонкампаны, Ugo Boncompagni; 07.01.1502 – 31.03.1585) – папа рымскі (13.05.1572 – 31.03.1585).

[85] Антоніё Пасэвіна (Пасэвін; па іт. Antonio Possevino; 1534 – 26.02.1611) – сакратар генэрала езуіцкага ордэна, папскі легат ва Ўсходняй Еўропе, рэктар падуанскай акадэміі, першы езуіт, што наведаў Маскву.

[86] Крыштоф Збароўскі (па пол. Krzysztof Zborowski; памёр у 1593 г.) – польскі шляхціц і авантурыст. Сын кашталяна кракаўскага Марціна Збароўскага і Ганны Канарскай.

[87] Іван Падкова (па рум. Ioan al IV-lea Potcoavă; каля 1530 – 16.06.1578) – у 1577 малдаўскі гаспадар, да гэтага быў адным з чальцоў запарожскіх казакаў.

[88] Эрнэст Вайер (Ernest Weiher; каля 1517 – 1598) – дзяржаўны і ваенны дзеяч Рэчы паспалітай, палкоўнік каронны (1564), староста пуцкі (1582 – 1598), ноўскі, сабавідзскі і навадворскі

[89] Рудольф II (па ням. Rudolf II; 18.07.1552 – 20.01.1612) – кароль Германіі (рымскі кароль) з 27.10.1575 па 02.11.1576, абраны імпэратарам Свяшчэннай Рымскай імпэрыі 02.11.1576 г. Сын і пераемнік Максіміліяна II.

13-га сьнежня 1586 года гэты кароль Стэфан inopinati Epilepsiæ morbo, imprudentiâ Medici neglecto[90], як кажа Piasecius p. 54, памёр цягам некалькіх дзён у Grodna; і потым быў з вялікай пашанай пахаваны ў Кракаве за агульны каралеўскі кошт; гэткі гонар атрымліваюць толькі тыя каралі, якія асабліва палюбіліся польскай дзяржаве і мелі вялікія заслугі перад ёй; іншыя аднак хаваюцца за кожнага зь іх

!старонка 42!

уласныя сродкі, што раней паўсюль лічылася велічным.

Паколькі цяпер польская дзяржава зноўку засталася без караля, і таксама кароль Стэфан не пакінуў ніякіх дзяцей ад сваёй жонкі Анны, малодшай сястры караля Sigismundi Augusti; а арцыбіскуп гнэзенскі (чыі паўнамоцтвы, як таксама і вярхоўных маршалаў, павялічваюцца, калі няма караля, як было ўзгадана вышэй) прызначыў дзяржаўны сход у Варшаве; то большасьцю быў абраны Sigismundus, сын караля Швэцыі Johannis і пані Catharinæ[91], старэйшай сястры караля Sigismundi Augusti: аднак Gorcanis[92] і Zborovianis (з якімі, ня гледзячы на тое, што яны былі ерэтыкамі, як кажа біскуп Piasecius, трымаўся папскі Nuncius, Annibal Capuanus[93]) абралі карэлём ў 1587-м эрцгерцага аўстрыйскага Максіміляна[94]: які затым таксама абклаў Кракаў і потым біўся са стратамі з вялікім канцлерам Zamoyscio паміж вёскай Прамнік і кракаўскім прадмесьцем Біскупье, з-за чаго пакінуў Кракаў і накіраваўся ў Czestochow; 1-га Decembris Sigismunus прыбыў са Швэцыі ў Кракаў, дзе ён потым быў каранавы каралём; Zamoyscius аднак 15-га Januarii 88-га г. дагнаў эрцгерцага Максіміляна ў Wielunia, чаго эрцгерцаг не чакаў і таму рушыў да Сілезіі; але ўзгаданы канцлер пагнаўся за ім,

!старонка 43!

і паколькі яго войска, больш моцнае на людзей і гарматы, па нядбайнасьці, і таму што яны сабе ўжо ўявілі поўную перамогу, не закрыла праход канцлеру, што мусіў рушыць цераз вузкую, аточаную вялікімі і вязкімі багнамі гаць, па якой маглі ехаць разам не больш за 2 ці 3 вершніка, але дало яму прайсьці да Byczyna (Пічын) ў Сілезіі; то 25-га студзеня яны біліся там і, паколькі венгры не пажадалі ўступаць у бой, былі разьбітыя: і пан эрцгерцаг у пазначаным мястэчку, да якога ён накіраваўся разам з некалькімі польскімі панамі, мусіў здацца ў палон вялікаму канцлеру, які адправіў яго ў

[90] Нечакана захварэў на эпілепсію, і ня гледзячы на намаганьні медыкаў

[91] Катарына Ягелонка (па пол. Katarzyna Jagiellonka; 01.11.1526 – 16.09.1583) – герцагіня Фінляндская (1562), каралева Швэцыі (1569), вялікая герцагіня Фінляндская (1581).

[92] Граф Станіслаў Гурка (1538 – 23.10.1592) – дзяржаўны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай. Разам з родам Збароўскіх падтырмаў кандыдатуру Максіміляна III на сталец Кароны Польскай.

[93] Анібал Капуанскі (па іт. Annibale di Capua; каля 1544 – 02.09.1595) – пазачарговы пасол у Празе (1576), арцыбіскуп неапальскі (1578), нунцый у Польшчы (1586 – 1591).

[94] Максіміліян III Габсбург (12.10.1558 – 02.11.1618) – эрцгерцаг аўстрыйскі з дынастыі Габсбургаў, трэці сын імператара Свяшчэннай Рымскай імпэрыі Максіміляна II і Марыі Гішпанскай. У 1587 г. прэтэндэнт на польскую карону; быў абраны адной з партый шляхты, пасля абрання Жыгімонта Вазы пачаў няўдалую інтэрвенцыю ў Польшчу; канчаткова быў пераможаны Янам Замойскім пры Бычыне і быў узяты ў палон і зняволены ў Бэндзінскім замку.

Crasnostaviam; дзе той быў заключаны ў замку з моцным гарнізонам і запрошаны канцлерам да ганаровых трапез, бо тое месца знаходзілася паблізу ад горада Zamoyscio; і быў таксама ўзяты хросным бацькам, калі ў яго, у канцлера, ад яго жонкі Griselide Batorea[95], дачкі брата караля Stephani, нарадзіўся сын Cæsius; і яго ў Crasnostau наведваў сам кароль Жыгімонт; аднак у рэшце рэшт ён быў вызвалены паводле дамовы з імпэратарам Rudolphi.

Напрыканцы 1592-га года памёр вышэй пазначаны кароль Швэцыі Ёган, і ад яго сына, караля Жыгімонта, палякі моцна патрабавалі, каб ён у 93-м годзе адправіўся ў Швэцыю як у сваё спадчыннае каралеўства. Што з гэтага аднак атрымалася,

!старонка 44!

тут не месца распавядаць; і можа быць высьветлена з польскіх аўтараў, якія прыводзяцца разам з іншымі рэчамі ў трэцім выданьні майго апісаньня Каралеўства Швэцкага, якое зьбіраюцца выдаваць у Галандыі без майго прывілею. Ён, кароль Жыгімонт, пасьля таго, як ён у 1594-м г. разам са сваёй жонкай быў каранаваны на сталец Швэцыі лютэранскім арцыбіскупам Упсаля, Abrahamo Andræ[96], у верасьні таго году вярнуўся зноўку ў Кракаў. 31-га студзеня 1598-га г. памёрла каралева Польшчы і Швэцыі Анна: і пасьля гэтага кароль зноўку адправіўся ў Швэцыю; аднак паколькі гэта яму самаму падалося дзіўным, напрыканцы кастрычніка ён адправіўся са сваёй паненкай сястрой Анай[97] з Кальмара назад у Гданьск і больш ніколі не наведваў Швэцыю.

У 1600-м г. палякі пасьпяхова ваявалі з Michael[98], ваяводам малдаўскім. У 1601-м г. ішла польская вайна са швэдамі ў Ліфляндыі, якая працягвалася і ў наступныя годы; пра гэта ў апісаньні Ліфляндыі. У 1605-м г. кароль Жыгімонт абраўся шлюбам з паненкай Constantiam, эрцгерцагіняй аўстрыйскай, сястрой яго ранейшай паненкі жонкі (ад якой ён меў толькі аднаго жывога сына, а менавіта Uladislaum Sigismundum, які нарадзіўся 9-га чэрвеня 1595-га г.). У 1606-м г. у Польшчы адбыліся беспарадкі паміж

!старонка 45!

Каралём і рокашыстамі; пра гэта вышэй; і кароль нарэшце перамог шляхту.

21-га сакавіка 1609-га г. у караля нарадзіўся яго другі сын Joan. Casimirus, цяперашні кароль Польшчы. У 1610-м маскавіты перадалі свайго вялікага князя Basilium Suyski[99] палякам і ўзялі старэйшага сына

---

[95] Грызельда Баторый (па пол. Gryzelda (Krystyna) z Batorych Zamoyska; 1569 – 14.03.1590) – жонка вялікага канцлера Яна Замойскага.

[96] Абрам Андрэ Ангерманскі (Abraham(us) Andreae Angermannus; каля 1540 – 12.1607 альбо 01.1608) – швэдскі люцеранскі тэолаг і арцыбіскуп Упсальскі (1593 – 1599).

[97] Ана Ваза (Anna Wasa; 17 альбо 31.05.1568 – 26.02.1625) – прынцэса швэдская, дачка караля Ёгана III.

[98] Міхай Храбры (па рум. Mihai Viteazul; 1558 – 09.08.1601) – гаспадар Валахіі (1593 – 1601), прадстаўнік дынастыі Басарабаў, які на кароткі час аб'яднаў пад сваёй уладай усе тры дунайскіх княствы.

[99] Васілі Іванавіч Шуйскі (1552 – 12.09.1612) – маскоўскі цар (1606 – 1610). Прадстаўнік княскага роду Шуйскіх. Пасьля выгнаньня з трону знаходзіўся ў палоне ў Рэчы Паспалітай.

караля Жыгімонта сваім панам; кароль аднак не хацеў пасылаць яго ў Маскву, таму маскавіты (гэткі маладушны народ і таму таксама яшчэ больш люты з-за сваёй жудаснай натуры) зноўку адпалі ад Польшчы: палякі аднак абклалі Smolenscum, а другі Demetrius[100], які выдаваў сябе за першага, які нібыта хаця і быў паранены маскавітамі, аднак выжыў, быў забіты сваімі спадарожнікамі, татарамі, пасьля таго як ён доўгі час лічыўся вялікім князем, і ваяваў супраць маскавітаў, якім у 1608-м г. новы кароль Швэцыі Карл[101] паслаў дапамогу пад кіраўніцтвам мужнага героя-ваяра Ponto della Gardia[102]. У 1611-м г. палякі нарэшце захапілі Smolenscum; польскі гарнізон аднак разрабаваў скарбніцу замка Масквы і ў наступным годзе накіраваўся ў Польшчу, пакінуўшы ў замку некалькі сваіх людзей, калі іх доўга абкладалі Moschis, з горада Moschua. У 1612-м г. кароль Жыгімонт нарэшце, але ўжо надта позна, вырашыў накіраваць свайго сына Uladislaum у Маскву; між тым маскавіты

!старонка 46!

з вялікай сур'ёзнасьцю працягвалі аблогу замка; які ў рэшце рэшт таксама быў здадзены палякамі; маскавіты аднак адразу пасьля гэтага абралі сваім герцагам Michaelem Fedorowicz[103], сына Metropolitæ Rostociensis, і каранавалі яго каронай, якая яшчэ заставалася ў замку. І ў гэтым годзе ад Польшчы таксама адышла Малдавія. Пагэтаму яны ў 13-м годзе адправілі пасла ў Канстантынопаль са скаргай, што Constantinus Mohila[104], тамашні законны князь, быў выгнаны адтуль супраць дагавору, і там, з дапамогай татараў, пануе Stephanus Tomsza[105].

У 1616-м г. некалькі польскіх паноў самі па сабе напалі на Малдавію і некалькі разоў перамаглі туркаў, аднак нарэшце пацярпелі паразу. Гэты выпадак быў потым ускладзены на ўсю Польшчу, і туркі скасавалі саюз з каралём, калі польская зброя не перастане ўмешвацца ў малдаўскія справы. У наступным 1617-м годзе палякі стаялі лагерам каля мястэчка Bussa, дзе сустракаюцца Tyra і Morachua, і там іх генэрал, Stanislaus

---

[100] Ілжэдзьмітры II, таксама Тушынскі ці Калужскі злодзей (дата нараджэньня невядомая – 11.12.1610) – самазванец, які выдаваў сябе за сына Івана IV, царэвіча Дзьмітрыя і, адпаведна, за цара Ілжэдзьмітрыя I, які нібыта цудам выжыў 17.05.1606. Сапраўднае імя і паходжаньне не высьветленнае.

[101] Карл IX (па шв. Karl IX; 04.10.1550 – 30.10.1611) – герцаг Сёдэрманландскі, рэгент Швецыі з сярэдзіны 1590-х гадоў, кароль Швецыі (1604) з дынастыі Ваза.

[102] Граф Якаб Понтусан Дэлагардзі (па шв. Jakob de la Gardie; 20.06.1583 – 12.08.1652) — швэдскі ваенны і дзяржаўны дзеяч, актыўны ўдзельнік падзей Смутнага часу (гл. паход Дэлагардзі).

[103] Міхаіл Фёдаравіч (12.07.1596 – 13.07.1645) – першы рускі цар з дынастыі Раманавых.

[104] Канстанцін Магіла (па мал. Constantin Movilă; памёр у 1612) – гаспадар Малдаўскага княства (1607 – 1611). Сын Ерэміі і Елізаветы, якая пасадзіла Канстанціна на трон, атруціўшы Сямёа Магілу і скінуўшы яго сына Міхаіла.

[105] Стафан IX Томша (па мал. Ştefan al IX-lea Tomşa) – гаспадар Малдаўскага княства 1607 – 1615 і 1621 – 1653 гг.

Zolkievius[106], без загаду ці дазволу караля і каралеўства, заключыў дагавор наконт Малдавіі са Скіндар-Bassa[107], што ніякія войскі, што ладзюць беспарадкі ў гэтай правінцыі ці ў яе занятых туркамі ваяводствах,

!старонка 47!

не будуць уведзеныя ў гэты край. То ён таксама пакінуў туркам замак Chocim, у якім яшчэ заставаліся спадчыны герцага Hieronymi Mohilii[108], са старага княскага роду, і яго нядаўна забітага сына Constantini, і абезгаловіў пасаджанага імі туды краёвага ўладара, Nicolaum Ivonium, бо ён не пажадаў сыходзіць адразу паводле загаду; і пакінуў таксама Bersabeam і Rascoviam, што належалі польскім панам і ляжалі вакол ракі Tyram ў адным дні шляху ад турэцкай крэпасьці Tehinia, паколькі ўзгаданы Скіндар-Bassa патрабаваў зруйнаваць іх, бо яны былі прыбежышчам казакаў і былі пабудаваныя на турэцкім участку і зямлі; і такім чынам, праз гэтую дамову, учыніў палякам немалую шкоду і вылішыў іх надалей панаваньня над малдаўскімі ваяводствамі. Тады палякі пацярпелі таксама страты ад швэдаў у Ліфляндыі.

У 1618-м годзе польскі князь Uladislaus абклаў Маскву, і казакі Маскву спусташылі. Маскоўцы аднак сказалі, што цяпер яны вольныя ад дадзенай яму прысягі; бо ён не прыбыў у краіну ў пазначаны час, ці адмовіўся выконваць прадпісаныя яму пры яго абраньні ўмовы; таму ён зрабіў замірэньне з маскоўцамі, ці маскавітамі, на 14 год і 6 месяцаў такім чынам, што палякам павінны былі застацца княствы Severien, Чарнічаўскае і Ноўгарадскае. Тады

!старонка 48!

ў сакавіку 1619-га г. Uladislaus зноўку вярнуўся ў Польчшу. У 1620-м г. у асаблівасьці Gabor Betlem[109] нацкаваў туркаў супраць палякаў, бо казакі прыйшлі на дапамогу імпэратару. Узгаданы Zolkievius 19-га Sept. біўся з Скіндар-Башой у Малдавіі пад Cicora і ніякім чынам не мог атрымаць перамогу: і зноўку палякі адступілі. Калі яны аднак былі ўсяго ў адной мілі ад Mohilowo, і такім чынам таксама ў бяспецы, у лагеры нечакана пачаліся беспарадкі, і шмат хто кінуўся на ўцёкі. Што, калі татары пра гэта даведаліся, прынесла канец палякам, і ваявода Zolkievius быў знойдзены забітым у палове малдаўскай мілі (якая даўжэй за нямецкую) ад берагу ракі Tyræ, калі яму споўнілася 73 гады, а яго адрэзаная галава была адпраўленая ў Канстантынопаль. Малодшы ваявода Stanieslaus Koniecpolski быў пагнаны ў да Bialogorod, а адтуль потым у Канстантынопаль; дзе ён мусіў

[106] Станіслаў Жалкеўскі (па пол. Stanisław Żółkiewski; 1547 ці 1550 – 07.10.1620) – польскі ваявода пачатку XVII ст., польны і вялікі гетман і канцлер вялікі каронны. Заваёўнік Масквы, які перамог царскае войска пры Клушыне.

[107] Іскендар Паша (па тур. Iskender Paşa) – быў Отаманскім ваяводай і бейлербеям Ачакаўскім. У 1620-м кіраваў отаманскім войскам з валашскім кантынгентам (13000 – 20000) супраць Рэчы Паспалітай у бітве пры Цэцоры.

[108] Ерэмія Магіла (па мал. Ieremia Movilă; памёр у 1606) – гаспадар Малдаўскага княства 1595 – 1600 і 1600 – 1606 гг.

[109] Габар Бетлен (па вянг. Bethlen Gábor; 1580 – 15.11.1629) – кіраўнік антыгабсбургскага руху ў Венгерскім каралеўстве, князь Трансільваніі (1613 – 1629), кароль Венгрыі (1620 – 1621).

заставацца вязьнем у чорнай вежы разам з Самеэлям Korecki[110], Luca Zolkiewski[111] і Георгам Фарэнсбахам[112]; пакуль у 1623-м г. яго не выкупілі за 80 тысяч рэйхсталераў, не ўлічваючы розных значных падарункаў, якія былі дастаўленыя служыцелям пры тым двары. У 1621-м годзе новы польскі ваявода Carolus Chodkievicius[113] і Stanislaus Lubomirski[114] павялі войска ў Малдавію супраць туркаў і ўзялі ўзгаданы

!старонка 49!

замак Chocim, на рацэ Tyra; туды прыбылі таксама князь Uladislaus і сам турэцкі імпэратар Osman[115]: Chodkievicius аднак трымаў бой, і туркі, што атакавалі польскі лагер, былі таксама са стратамі адкінутыя. Але апошняму пачало не ставаць правіянту, і распачаліся хваробы: што потым сам князь Uladislaus лёг хворы; а генэрал, ці ваявода, Chodkievicius у пазначаным замку Chocim памёр ва ўзросьце 60-ці год. На яго месца стаў Lubomirski, які разьбіў туркаў, што зноўку напалі на лагер: тады яны таксама марна абстрэльвалі і штурмавалі замак Paniowce: таму Osman увесь час папракаў сваіх ваяроў за іх ляноту, чым выклікаў нянавісьць да сябе сярод янычараў; якія яго таксама і прыдушылі потым у Канстантынопале. Калі цяпер туркі зноўку былі са стратамі адкінутыя ад польскага лагера, то 9-га Octobris быў нарэшце падпісаны мір, туркам перадавалася Малдавія, а іх ваяводам там замак Chocim. І акрамя гэтага кароль Швэцыі атрымаў горад Рыгу. Глядзі, што пра пазначаную турэцкую вайну ў 1620-м і 21-м гадах прыведзена з Contin. Meterani ў дадатку да нашага ранейшага польскага апісаньня. У 1625-м г. працягвалася вайна са Швэцыяй у Ліфляндыі, а ў наступных гадах у Прусіі. У 26-м г. Stephanus

!старонка 50!

Chmielecki[116] са сваімі казакамі атрымаў на русінскай мяжы значную перамогу супраць татараў. У 1629-м г. у Прусіі было зробленая замірэньне паміж Польшчай і Швэцыяй працягласьцю на 6 год, а менавіта да чэрвеня 1635-га г. У пазначаным 29-м годзе узгаданы Chmielecius са сваімі казакамі зноўку перамог татараў пад Brustinowo: гэты мужны ваяр аднак памёр у наступным 30-м годзе, калі яму нарэшце ўдалося стаць Kijoviensкім Palatino.

---

[110] Князь Кароль Самуіл Карэцкі (каля 1588 – 07.11.1633) – польскі магнат, ваенны і дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай.

[111] Лука Жалкеўскі (па пол. Łukasz Żołkiewski; каля 1594 – 12.1636)– ваявода Брацлаўскі і староста Пярэяслаўскі, пляменьнік гетмана Жалкеўскага.

[112] Георг (Юрген) фон Фарэнсбах (па пол. Jerzy Farensbach; 1551 – 17.05.1602) – польскі ваявода.

[113] Ян Караль Хадкевіч (1560 – 24.09.1621) – вайсковы і дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага. Гетман вялікі літоўскі (1605), ваявода віленскі (1616). Прадстаўнік старажытнага магнацкага роду Хадкевічаў. Адзін з самых таленавітых вялікалітоўскіх палкаводцаў 17 ст.

[114] Станіслаў Любамірскі (па пол. Stanisław Lubomirski; 1583 – 16.06.1649) – магнат Рэчы Паспалітай.

[115] Асман II (03.11.1604 – 20.05.1622) – султан Асманскай імперыі ў 1618 – 1622.

[116] Стэфан Хмелецкі (Stefan Chmielecki; каля 1580 – 20.02.1630) – ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай з роду Хмелецкіх герба "Боньча". Прымаў удзел у расейска-польскай вайне 1605 – 1618 гг. і польска-турэцкай вайне 1620 – 1621 гг.

У 1631-м г. калі каралева Constantia, якая была крыху тоўстая целам, на сьвята Цела Хрыстова ў Варшаве падчас абходу прайшла пешай хадой звыш тысячы крокаў пад гарачым сонцам, яе хапіў сонечны ўдар, што некампетэнтныя ўрачы пагоршылі халоднай ваннай і не заўважылі нарастаючую гарачку, ад чаго яна памёрла ноччу; і 10-га чэрвеня яе самая верная пакаёўка Урсула Майерын знайшла яе ранкам памерлай, калі хацела даведацца, як яе пані спала. Праз некалькі дзён таксама і герцаг Георг Збараўскі[117], кашталян Кракаўскі, які не быў варты ўзгаданай каралевы, без кроўных спадкаемцаў крочыў на шлях сьмерці падчас начнога сну. Апошні належыў да Збараўскага роду, і як licet incontinentis vixerit[118] (як кажа Piasecius p. 422) пагарджаў шлюбам, і таксама хацеў не дазволяць свайму брату, каб той ажаніўся.

!старонка 51!

У 1632-м годзе кароль Жыгімонт перадаў прадстаўнікам манетнае права. Таму што пры ім выпускалася дрэнная манета: і пасьля гэтага ён памёр у Варшаве ў апошні дзень красавіка на 66-м годзе свайго ўзросту, аднак на 45-м годзе ўладараньня ў Польшчы. Яго сын Uladislaus, які тады адсутнічаў, сустрэў яго ляжачым у апошнія хвіліны, і адначасова атрымаў швэдскую карону, якую яму ўсклаў да галаву ўласнымі рукамі яго пан бацька. Stanisl. a Kobierzycko піша ў lib. I p. 3-4, што гэты кароль вярнуў польскі край да старай сапраўднай рэлігіі з дапамогай вернага і моцнага сродку; тым што ён даваў пасады тым, хто быў асабліва аддланы старажытнай веры продкаў, і праз гэткі сакрэт кіраваньня ён без залішняй мітусьні часткова падавіў ерэтыкаў, а часткова вярнуў іх да ранейшага стану; і калі ён на пачатку свайго ўладараньня знайшоў большую і паважаную частку дзяржаўнай рады адданай новаму вучэньню, то пасьля сваёй сьмерці ён пакінуў у гэтым толькі дзьвух ваяводаў, калішскага і бельзскага. Яго, як таксама і караля Stephani, прыдворным прапаведнікам быў езуіт Petrus Scarga[119]. Цела караля было апранутае ў строі, якія польскія каралі звычайна насілі падчас сваёй каранацыі, і публічна перанесенае ў пасьляабедзенныя гадзіны ва ўрачыста ўпрыгожаную залу. На галаве ён меў польскую

!старонка 52!

карону, у правай руцэ скіпетр, а ў левай дзяржаву: карона Швэдскага каралеўства ляжала аднак побач на падушцы; а маскоўская карона, якую ён атрымаў пасьля скарэньня Масквы са скарбніцы гэтага народу, ён загадаў пакласьці ў каралеўскую казну ў якасьці спадчыны.

На Сойме, што адбыўся затым, маршалкам польным быў абраны герцаг Крыштаф Радзівіл[120], палкаводзец літоўскі, хаця ён і належыў да

117 Юрый Збаражскі (па пол. Jerzy Zbaraski; каля 1573 – 12.07.1631) – дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай. Апошні прадстаўнік роду.

118 Чалавек, што пакутаваў на нетрыманьне.

119 Пётр Скарга, сапр. Пётр Павенскі (02.1536 – 12.09.1612) – царкоўны і палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, пачынальнік польскай аратарскай прозы.

120 Крыштаф Радзівіл (22.03.1585 – 19.11.1640) – грамадскі і дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, прадстаўнік біржанскай лініі Радзівілаў.

іншай рэлігіі, і яга трымаліся ўсе астатнія, то бок не рымскія католікі. Калі пасьля гэтага распачаліся выбары, то каралём Польшчы быў абраны у Варшаве узгаданы вышэй старэйшы сын нябожчыка караля, Uladislaus; чыё жыцьцё, да таго як ён стаў каралём, асабліва апісвае вышэй пазначаны Stanisl. Kobierzickus, гданьскі кашталян. Тое, што маскавіты таксама абралі яго сваім князям, было ўжо прыведзена вышэй. Бо, паколькі пасьля сьмерці лютага тырана Johannis Basilii[121], што быў чумой і згубай роду чалавецкага, і яго сына Theodori[122], адзін Demetrius[123] выдаў сябе за іншага сына пазначанага тырана, узяў жонкай Marinam[124], дочку ваяводы з Sendomir, і захапіў сабе горад і замак Маскву; аднак быў забіты, а на яго месца абраны Suyscius, які паводзіў сябе як тыран, быў перададзены маскавітамі палякам,

!старонка 53!

і таксама памёр у іх вязьніцы: пасьля чаго іншы Demetrius, якога некаторыя лічылі жыдом, выдаў сябе за першага, які нібыта выжыў, а ўзгаданая Marina з пажадлівасьці таксама трымалася зь ім і назвала сябе імпэратрыцай Маскоўскай: то таму маскавіты абралі сабе царом яго, Uladislaum, яшчэ пры жыцьці ўзгаданага Suyscius і Demetrius II; і той Demetrius уцёк да Caluga, але быў забіты Petro Urozovo[125], камандзірам татараў, што служылі яму. Пасьля чаго пазначаная Marina паслала супраць татараў данецкіх, ці маскавіцкіх казакаў. Вышэй узгаданы Autor крыху інакш распавядае тыя рэчы, якія ўжо былі прыведзеныя вышэй, і кажа, што скарбніца і старая казна герцагаў Маскоўскіх былі адчыненыя; каралеўскія каштоўнасьці былі перададзеныя Zolkievio, як польскаму генэралу; былі адбітыя залатыя і срэбныя манеты з імем новаабранага герцага (Uladislai), нарэшце вышэй названы Basilius Suyscius быў забраны з келы і перададзены яго братамі Demetrio[126] і Joahanne[127] вышэй пазначанаму Zolkiewsci, і толькі тады ў Moscau быў разьмешчаны польскі гарнізон. Калі

---

[121] Іван IV Васільевіч (25.08.1530 – 28.03.1584) – вялікі князь маскоўскі і ўсяе Русі (з 1533), цар усяе Русі (з 1547). З дынастыі Рурыкавічаў, сын Васілія III з яго другога шлюбу з Аленай Глінскай.

[122] Фёдар I Іванавіч (31.05.1557 – 17.01.1598) – цар усяе Русі і вялікі князь маскоўскі з 18.03.1584, трэці сын Івана IV Грознага і царыцы Анастасіі Раманаўны.

[123] Ілжэдзьмітрый I – афіцыйна называў сябе царэвіч (затым цар) Дзьмітрый Іванавіч, першы самаабвешчаны імпэратар Расеі, у зносінах з замежнымі дзяржавамі — Імпэратар Дзьмітрый (Demetreus Imperator; пам. 17.05.1606) – цар Расеі (01.06.1605 – 27.05.1606), першы з трох самазванцаў, што называлі сябе сынамі Івана Грознага і прэтэндавалі на расійскі сталец.

[124] Марына ці Марыяна Юр’яўна Мнішак (па пол. Maryna Mniszech; каля 1588 – 1614/15) – дачка сандамірскага ваяводы Ежы Мнішака і Ядвігі Тарло, жонка Ілжэдзьмітрыя I і каранаваная ў якасьці рускай царыцы (адзіная жанчына каранаваная ў Расеі да Катарыны I); затым жонка наступнага Ілжэдзьмітрыя.

[125] Пётр Арсланавіч Урусаў (Урак бін Джан-Арслан, па тат. Uraq bine Canarslan; пам. у траўні 1639) – нагайскі мурза, сын Джан-Арслана, унук нагайскага бія Уруса.

[126] Дзьмітры Іванавіч Шуйскі (каля 1560 – 1612) – расейскі ваенны дзеяч Смутнага часу. Сын князя Івана Андрэявіча Шуйскага.

[127] Іван Іванавіч Шуйскі-Пугаўка (каля 1566 – каля 1638) – расейскі дзяржаўны і ваенны дзеяч. Сын князя Івана Андрэявіча Шуйскага. Лічыцца апошнім прадстаўніком старэйшай галіны Шуйскіх.

аднак Moschorum паслы да караля Жыгімонта прад'явілі жорсткія ўмовы наконт рэлігіі і іншых прычын, і таксама хацелі мець князя Uladislaum пры сабе ў Маскве; то кароль

!старонка 54!

аднак зацягнуў справу і асабліва адмовіў Маскве ў сваім сыне: то яны затым мусілі стаць перад новымі абставінамі; Zolkiewski зноўку увёў гарнізон у горад і разьмеркаваў войска ў замках вакол горада. Нарэшце горад Moscua быў падпалены палякамі, а жыхароў увесь час забівалі салдаты. І ён піша, на 376-й старонцы 6-й кнігі, што ён чытаў у штодзённых справаздачах тых часоў, што тады загінула каля 100 тысяч маскоўцаў, калі разам з мужчынамі лічыць таксама кабет і дзяцей; хаця іншыя складаюць сумму ў 60 тысяч. Патрыярх быў кінуты ў вязьніцу, дзе ён потым памёр; і ў тыя часы адбыўся захоп Смаленска, 13-га чэрвеня 1611 г. У 7-й кнізе Autor паказвае, які выгляд зноўку набыла Масква, што адбылося праз рознагалосьсе польскіх палкоўнікаў, розныя салдацкія хваляваньні, і вялікі голад, ад якога пакутваў польскі гарнізон у Moscua, то бок тое, што яны харчавалі іх вельмі мярзотнай ежай, і нават чалавечым мясам, як ён паведамляе на 449-й старонцы: таму таксама замак і быў аддадзены маскавітам на пэўных умовах, аднак у 1612-м г. яны насуперак дадзенаму абяцаньню лютавалі супраць палякаў. Кароль Жыгімонт напярэдні перадаў вышэй узгаданую маскавіцкую казну салдатам, дзеля

!старонка 55!

выплаты жалаваньня. Тады ўпершыню на вочы трапіў ліфляндскі рабунак; золата і срэбра горада Вялікага Ноўгарада, якое шмат год таму вялікі князь Basilius вывез адтуль на 300 вазах; цалкам залатыя карціны і сталы; вялікая колькасьць пэрлін, вялікі і дробны пітны посуд і кубкі, залаты крыж, ўпрыгожаны каштоўнымі каменьнямі, рогі і іншыя багацьці гэтай мугатнай дзяржавы. І ўсё роўна яны не былі задаволеныя гэтым, аднак калі яны страцілі горад Moscua, то тры мяцежных польскіх палкаводца абрабавалі Польскае Каралеўства; з-за чаго ў 1613-м годзе кароль склікаў у Варшаве сойм, дзе былі сабраныя грошы, каб супакоіць імі мяцежных жаўнераў. Ultra viginti milliones, si censum in singula jugera impositum adjicias, accepêre pauci seditiosi[128], кажа пазначаны Autor p. 468. Між тым маскоўцы (чыя вернасьць і давер слізкія, pag. 469) адпалі ад Uladislao і, як вышэй ужо было прыведзена, аднадушна абралі сабе новага князя хаця яшчэ маладога, але са старага герцагскага маскоўскага роду, а менавіта Міхаіла Фёдаравіча; які задушыў вышэй пазначаную Marinam, жонку абодвух Дзімітрыяў, што са сваім сынам уцякла з Caluga ў Astracan, яе сына аднак загадаў павесіць, Ita tandem impotens animi, nimiaq; libidine dominandi flagrans foemina immoderatæ cupidinis luit poenas[129], кажа ён таксама, p. 470 seq.

!старонка 56!

---

[128] Звыш 20 мільёнаў, калі далучыць усталяваныя на кожным акры налогі, атрымалі нешматлікія мяцежнікі.

[129] Такім чынам у рэшце рэшт занадта бязглузда; прагнасьць да ўлады, што паліла жанчыну, праз меры была адкупленая пакараньнем юнака.

У 1615-м г. маскоўцы абклалі Smolenscum, аднак былі адкінутыя палякамі, якія абвесьцілі ім вайну і пад камандай князя Uladislaus у 1616-м і наступных 17-і і 18-м гадах вялі баявыя дзеяньні, а таксама абклалі, хаця і марна, сталіцу і пранiклі далёка ў глыбь краіны; таму маскавіты шукаючы міру зрабілі замірэньне, як было ўжо пазначана вышэй, да 1633-га году і пакінулі ды падаравалі палякам наступныя замкі і гарады: а менавіта Smolenscum, Biala, Roslavia, Novogardia ў герцагстве Северскім (ці Малы Ноўгарад) з вось гэтымі раёнамі: што знаходзяцца на тым баку ракі Dziesnæ: як таксама і Czernechovia, Monasterscum ды Moromskum. З іншага боку палякі зноўку аддалі маскоўцам Borissovum, Kosielscum, Mosaiscum, Mescerscum, Viasmam (гэты горад ляжыць паміж гарадамі Smolensko і Moscua) з належнымі да іх землямі: гэтае вяртаньне гарадоў аднак маскоўцы са свайго боку мусілі адплаціць вяртаньнем Starodubo, Poczapovia, Poponagora, Nevela, Siebiezo, Krasno, а таксама Toropecenскіх і Vielisienскіх раёнаў. Такім чынам да Польшчы, як таксама часткова паведамлялася вышэй, тады адыйшлі некаторыя землі, і яе межы павялічыліся больш чым на сотню міль шляху ў даўжыню і шырыню. Пазначанае замірэньне тады
!старонка 57!
запатрабавалі тыя польскія казакі, якія люта захапілі маскоўскую зямлю на рацэ Occa і спусташылі горад Calugam ды шмат іншых мясьцін.

Якую форму пасьля гэтага набыла турэцкая вайна ў Малдавіі (якую адзін з палякаў называе Граб, і ў якой тады ўладарыў Gaspar Gratianus[130], чыё прозвішча мусіць паходзіць ад Граца з Штайр-Ланда, і куды палякі накіраваліся, аднак са стратай свайго, вышэй шмат разоў узгаданага, генэрала Zolkiewski (чыю галаву потым выкупіла ў туркаў яго ўдава і пахавала яе разам з целам у пабудаваным ім горадзе) і таксама іхнага, Gratiani); ужо прыводзілася вышэй.

Пасьля заключэньня Турэцкага міру, Uladislaus са сваім панам айцом, каралём, паехаў у 1623-м г. да Прусіі і ў Голуб да сястры караля Аны, якой належыла гэтае намесьніцтва, а потым прыбылі ў Тарунь: і ў Бідгосьце кароль аглядзіў манетны двор: наведаў аднак Osieck і Таўхаль, зь якіх адзін належыў Uladislai, а другі каралеве Constantiæ; быў таксама ў Вялікай Польшчы ў Грахоліне і Накалі з пашанай прыняты тамашнімі кашталянамі, а ў Vagrovez аднак абатам; потым паехаў з гэтым сваім сынам Uladislao ва ўзгаданую Вялікую Польшчу да Гнезна, Познані, Курніка, Радліна, Козьміна, Кратошына, Голухава і Каліша: затым да Ловіца і зноўку ў Варшаву.
!старонка 58!

У 1624-м годзе Uladislaus накіраваўся з Варшавы ў падарожжа з жаданьнем паглядзець на замежныя краіны. Паехаў з Кракава ў горад пад назвай Clarus Mons, на мяжы Польшчы і Сілезіі; дзе захоўваецца ікона сьв. Нявінніцы Марыі, намаляваная сьв. Лукой, як паведамляе Autor pag. 869, і прывезеная з Канстантынопаля ў Польшчу; а адтуль праз Сілезію і г.д. да

[130] Гаспар Грацыяні (па малд. Gaspar Graziani; 1580? – 09.1620) – гаспадар Малдаўскага княства (19.02.1619 – 20.09.1620). Стаў на бок Рэчы Паспалітай у вайне з туркамі 1620 г.

Вены, дзе імпэратар Ferdinandus II[131] сам паказаў яму старую скарбніцу аўстрыйскага дома, non divitiis tantum, sed variis naturæ, artisq, miraculis refertam[132], як зноўку кажа Autor pag 871. Адтуль князь паехаў да Лінца, Зальцбурга, Мюнхена, Аўгсбурга, Данаўвёрта, Нюрнберга, Вюрцбурга, Ганаў, Франкфурта, Майнца, Бахэраха, Кобленца, Бона, Кёльна, Гюльха, Аха, Візэта, Лёвена, Брюсэля, Мехаля, Анторфа, Брэды (якую тады абклаў Спінола[133]), зноўку да Анторфа і Брюсэля: потым у Ніваль, Мец, Заберн, Страсбург, Мольсхайм, Шлетштадт, Руфах, Энзісхайм, Брызах, Базэль, Залатурн, Люцэрн, цераз Готартсберг да Мілана, Генуі, Пармы, Мадэны, Урбіна, Rimini і Рыма. Таксама аднак ён з Анконы дабраўся да Ларэта і пакінуў там залатую выяву сьвятога Uladislai. У 25-м годзе ён накіраваўся да Неапаля, праз шэсьць дзён вярнуўся ў Рым і паехаў адтуль 20-га студзеня да Фларэнцыі, Пізы, Livorno, Венецыі; адкуль ён трапіў да Граца, у Штайр-Ландзе, зноўку да Вены, Найса ў Сілезіі і назад

!старонка 59!

у Польшчу. У 1631-м годзе з-за стану свайго здароўя, дзеля яго паляпшэньня, ён накіраваўся да Эгера ў Багеміі.

Пра тое, як потым паміраючы кароль Жыгімонт надзеў яму швэдскую карону з 1632-м годзе, ужо было ўзгадана вышэй паводле Piasecio. Вышэй узгаданы Kobierzickus піша пра гэтую падзею, на 945-й старонцы, наступнае: Sigismundus extremo colluctans morbo Varsaviæ Uladislaum etsi voce compellare non posset, paterno intuitus oculo, mox gestu, impositaq; desuper caput manu, Regni Sueciæ verum, ac legitimum hæredem, ac sucessorem, declaravit, adstante Gregorio Borasto, viro apprime erudito, natione Sueco, inq; publicas tabulas eam nuncupationem referente[134]. Пра тое, як гэты Uladislaus пасьля таго быў абраны ў Варшаве каралём Польшчы і потым каранаваны ў Кракаве 6-га лютага 33-га года, таксама распавядалася вышэй.

І ў гэтым годзе маскавіты, раней чым скончылася замірэньне, абклалі Smolensco і з плюндраваньнем і спусташэньнямі люта атакавалі ліфляндскія межы. Аднак кароль Uladislaus з герцагам Крыштофам Радзівілам, вышэйшым палкаводцам Літвы і ваяводай Віленскім, прыйшлі на дапамогу абкладзеным. Затым ён на працягу некалькіх месяцаў займаўся маскоўскім

---

[131] Фердынанд II (па ням. Ferdinand II; 09.07.1578 – 15.02.1637) – кароль Чэхіі, кароль Венгрыі, рымскі кароль, імпэратар Сьвяшчэннай Рымскай імпэрыі, з дынастыі Габсбургаў. Унук Фердынанда I, сын эрцгерцага Штырыі Карла II і Марыі Баварскай.

[132] Што была напоўненная не толькі багацьцем, але і разнастайнымі цудамі прыроды і мастацтва.

[133] Амброджа Спінола-Дорыя, 1-ы маркіз дэ Лос-Бальбасас, 1-ы герцаг Сеста (па гішп. Ambrosio Spínola Doria o Ambrogio Spínola Doria; 1569 – 25.09.1630) – гішпанскі палкаводзец и генуэзскага роду Спінола, які камандаваў войскамі Габсбургаў на апошнім этапе Васьмідзесяцігадовай вайны.

[134] Жыгімонт напрыканцы змаганьня з хваробай у Варшаве не мог нават падаць голас у адрас Уладзіслава, які глядзеў у вочы свайго айца, а потым жэстам ўсклаў на яго галаву карону Швэцыі і, пры дапамозе Рыгора Бараста, чалавека высокай адукацыі з народа Швэцыі, абвясьціў яго верным і законныму спадчыньнікам і пераемнікам; паводле паведамленьняў публічных газэт.

лагерам, у якім таксама знаходзілася 6 тысяч немцаў са старым палкоўнікам Аляксандрам Лесле[135]. Аднак нарэшце палкаводзец маскоўцаў

!старонка 60!

Sehinus[136] капітуліраваў у сакавіку наступнага году, асабліва пасьля уцёкаў немцаў, якія змагаліся непахісна без дому і агню і вымушаныя былі сыйсьці праз нястачу і голад (што маскоўцы лепш могуць перанесьці, бо яны звыклыя да свайго клімату і могуць задавольвацца невялікай колькасьцю гародніны, нават і не варанай). Палякі самі пакутвалі ад такой самай вялікай нястачы правіянту; хаця яны на пачатку і знайшлі ў той мясцовасьці вялікую колькасьць усяго патрэбнага для людзей і коней. Аднак нястрымны абоз за некалькі дзён пажраў столькі, колькі хапіла б на некалькі год, і таксама нямала, у асаблівасьці быдла, увялі на Літву. Кароль Uladislaus забясьпечыў сябе цеснай драўлянай хаткай; яго салдаты аднак квартыраваліся ў дрэнных халупках і звычайна ў мароз пад чыстым небам несьлі варту, якую кароль часта наведваў уначы. Між тым туркі атакавалі пад Camenecia ў Падоліі, каб гэтым адцягнуць вайну ад маскавітаў; іх аднак Koniezpolsky пагнаў да Малдавіі. Паводле заключанага ў пазначаным 34-м годзе з маскоўцамі міру кароль з вялікім ушанаваньнем атрымаў назад вялікія і ў даўжыню на 100, а ў шырыню на 60 нямецкіх міль працяглыя землі, якія былі 200 год таму адабраныя ў Польшчы і Літвы; таксама і мір з туркамі быў адноўлены, парушэньне якога

!старонка 61!

было ўскладзенае, з дапамогай аднаго пасла, на пашу Abazy[137]. Напрыканцы сьнежня гэтага году кароль страціў свайго наймалодшага брата па айцу, Аляксандра[138] (in quo præ cæteris fratribus summa Heroicarum virtutu specimina emicabant[139]; як кажа біскуп Piasecius) і хутка пасьля таго, а менавіта 30-га сьнежня, у Італіі ў Падуі памёр таксама іншы брат караля, Ян Альберт[140], кардынал і біскуп Кракаўскі. У 1635-м годзе ў Штумдорфе 12-га верасьня паміж Польшчай і Швэцыяй была заключанае замірэньне на 26 год, а менавіта да 11-га ліпеня 1661-га году: пра што можна прачытаць у Piasecius p. 480 seq.

У 1637-м годзе кароль абраўся шлюбам з паненкай Cæcilia Renata, паненкай дачкой рымскай імпэратарскай вялікасьці Ferdinandi II, якая

---

[135] Аляксандр Леслі ці (пасьля пераходу ў праваслаўе) Аўраам Ільіч Леслі (па ан. Alexander Leslie of Auchintoul; пам. 1663) – расейскі генэрал шатландскага па’оджаньня, які стаяў на польскай, швэдскай, а потым расейскай службе. Заснавальнік смаленскай галіны шатландскага рода Леслі.

[136] Міхаіл Шэін (канец 1570-х – 08.05.1634) – расейскі палкаводзец, ваенны і дзяржаўны дзеяч Масковіі.

[137] Абаза-паша ці Мехмед Абаза-паша (па тур. Abaza Mehmed Paşa; 1576 – 23.08.1634) – ваенны і дзяржаўны дзеяч, візір Асманскай імпэрыі.

[138] Аляксандр Кароль Ваза (па пол. Aleksander Karol Waza; 04.11.1614 – 19.11.1634) – пяты сын караля Жыгимонта III і Канстанцыі Аўстрыйскай. Памёр ад воспы.

[139] У якім больш за іншых братоў геройскія якасьці перамагалі беды.

[140] Ян Ольбрахт Ваза (Johann Albert Wasa; 25.06.1612 – 29.121634) – польскі кардынал, прынц Рэчы Паспалітай з дынастыі Ваза, князь Сьвяшчэннай Рымскай імпэрыі, сэнатар Рэчы Паспалітай. Памёр ад воспы.

была каранаваная ў Варшвае, і ад якой ён у 1640-м годзе 1-га красавіка атрымаў сына, названага Жыгімонтам Казімірам[141]; а ў 43-м годзе аднак дзяўчынку[142], якая хутка памерла; і калі яна, каралева, была цяжарная трэцім дзіцём, яна памерла ў Vilna, 24-га сакавіка 44-га года. У 1642-м годзе ў Варшаве кароль з вялікім пасагам ажаніў сваю сястру, паненку Анну Катарыну[143], на пане пфальцграфе Філіпе Вільгельме[144], нойбургскай лініі; пра што можна прачытаць у Piasecius p. 504 seq.

У 1645-м годзе кароль зладзіў мірную дыскусію наконт рэлігіі ў Таруні, у Прусіі,

!старонка 62!

падзеі якой маюцца ў друку. Глядзі таксама Piasecius fol. 507, а пра тое, што ў гэтым і наступных 46-м, 47-м і 58-м гадах прадпрымалася ў Польшчы адносна рэлігіі можна прачытаць у дадатку да нашага раней надрукаванага польскага апісаньня, другое edition: дзе можна прачытаць яшчэ шмат іншага. І ў пазначаным 45-м годзе да караля далучыліся таксама герцагствы Опельскае і Ратыбор у Сілезіі; пра што таксама можна прачытаць у ўзгаданага біскупа Piasecius. У 1646-м годзе, 11-га сакавіка ў Варшаве зь ім абралася шлюбам паненка Ludovica Maria[145], паненка дачка герцага Мантуйскага і Нэверскага Caroli Gonzagæ[146]; гэтая яго другая жонка, з якой ён меў бяздзетны шлюб, была каранаваная ў Кракаве 15-га ліпеня. Герцаг Георг Ossolin, вялікі канцлер каронны, прыняў яе 10-га сакавіка ў Варшаве ад імя караля лацінскай прамовай, што была надрукаваная. Gal. Gualdus[147] піша у сваіх гісторыях, part. 3 lib. 9 pag. 429, што шлюбны скарб, ці пасаг, складаў 700 тысяч крон. 9-га жніўня 47-га году паводле новага календара памёр ад крываўкі вышэй узгаданы адзіны сын караля Uladislai, а ў наступным 48-м годзе, 20-га траўня, у Мерачы ў Літве, ва ўзросьце 52 год 11 месяцаў і 11 дзён памёр і сам кароль ад гарачкі, якую недасьведчаныя ўрачы пагоршылі выкарыстаньнем няслушна выробленага Antimonil.

!старонка 63!

---

[141] Жыгімонт Казімір Ваза (па пол. Zygmunt Kazimierz Waza; 01.04.1640 – 09.08.1647) – адзіны сын вялікага князя і караля Ўладзіслава Вазы і яго першай жонкі Цэцыліі Рэнаты Габсбург, названы ў гонар яго дзеда Жыгімонта III і дзядзькі Яна II Казіміра.

[142] Марыя Гана Ізабэла (па поль. Maria Anna Izabela; 08.01.1642 – 07.02.1642) – прынцэса польская, сястра Жыгімонта Казіміра, памёрла ад эпілепсіі.

[143] Ана Катарына Канстанца Ваза (Anna Caterina Constanza Vasa; 07.08.1619 – 08.10.1651) – польская прынцэса, дачка Жыгімонта III і Канстанцыі Аўстрыйскай.

[144] Філіп Вільгельм Нойбурзскі (па ням. Philipp Wilhelm Pfalzgraf von Neuburg; 24.11.1615 – 02.09.1690) – пфальцграф Нойбурга, герцаг Юліха і Берга, курфюрст Пфальца. Адзіны сын пфальцграфа Нойбурга Вольфганга Вільгельма і Магдалены Баварскай.

[145] Людвіка Марыя Ганзага Нэверская (па фр. Marie Louise Gonzaga de Nevers; 18.08.1611 – 10.05.1667) – каралева Польшчы і вялікая княгіня літоўская, жонка апошніх каралёў дынастыі Ваза – Уладзіслава і Яна Казіміра.

[146] Карл дэ Нэвер (па фр. Charles de Nevers; 06.05.1580 – 22.09.1637) – прадстаўнік французскай галіны дома Ганзанга.

[147] Галеаца Гуалда Прыярата (па іт. Galeazzo Gualdo Priorato; 23.07.1606 – 1678) – італьянскі наёмнік, гісторык, геаграф і дыпламат. Пасьля сваіх доўгіх ваенных паходаў ён склаў шматлікія гістарычныя творы пра еўрапейскіх манархаў і гарады.

Затым 17-га лістапада закранутага 48-га года каралём Польшчы быў абраны яго старэйшы брат, пан Ян Казімір, які нарадзіўся ў Кракаве 11-га (21-га) сакавіка 1609 г.; і быў каранаваны ў Кракаве 7-га (17-га) студзеня 49-га г.; і ён клятвенна зацьвердзіў бясьпеку тым, што адносіліся да не рымска-каталіцкай рэлігіі, і паабяцаў бараніць іх аналягічна іншым у агульным пацьвярджэньні вольнасьцей Польскай дзяржавы. Тады, адразу пасьля сьмерці караля Uladislai, калі казакі і татары чынілі зло ў каралеўстве, каталікі і эвангелікі зраўняліся, каб гэтая confoederation з таго часу была jus perpetuum[148] і мела vim legis Regni[149]; у сілу гэтага эвангелікі маглі атрымліваць асалоду ад вольнага exercitiu іх Religionis[150] і пакінуць свае цэрквы неperturbirаванымі[151]: як пазначана ў Франкфурцкіх восеньскіх-Relation 48-га году на 40-й старонцы. У 1638-м годзе ён, Joan Casimirus, быў арыштаваны ў Францым і ўзяты пад ахову; аднак у 40-м ён быў зноўку вызвалены і вярнуўся ў Польшчу. У 43-м ён пераехаў у Рым і падаўся ў езуіты. Калі аднак прайшло 2 probations года, і ён хаціў зрабіць сталы Prefession у гэтым стане, Папа не дазволіў гэтага, аднак у тым самым 46-м годзе зрабіў яго кардыналам; гэты капялюш кардынальскага сану ён адаслаў назад Папе амаль перад самай сьмерцю караля Uladislai. У

!старонка 64!

1649-м годзе 20-га (30-га) траўня ён сыграў каралеўскае вясельле ў варшаўскім саду з пакінутай пані ўдавой вышэй узгаданага караля Uladislai, яго пана брата, таксама раней узгаданай пані Ludovica Maria, якая нарадзіла яму 11-га (21-га) чэрвеня 1650-га г. каралеўскую паненку, названую сьв. Хрышчэньнем Maria Anna Teresia[152], а 9-га (19-га) студзеня 52-га г. маладога паніча[153]; абодва аднак пражылі ня доўга. Якія цяжкія войны вяла Яго Каралеўская Моц, пад час свайго панаваньня, спачатку з татарамі і казакамі, а затым з вялікім князем Маскоўскім Alexio Michaelis[154], і потым з каралём Швэцыі, панам Carolo Gustavo[155], яшчэ знаходзіцца ў сьвежай памяці, і пра гэта можна прачытаць у Joachimus Pastorius, de Bello Scythico-Cosacico, у газэтах і розных іншых друкаваных справаздачах; таксама і ўнізе, пад час апісаньня мясьцін, пры нагодзе будзе трошкі распавядацца пра гэта. У Ляйпцыгскіх вясеньніх Relation ад 54-га году пішуць: нягледзячы на заключаны з татарамі мір, апошнія аднак у лютым пазначанага 54-га года перад сваім сыходам зрабілі

---

148 вечным правам

149 сілу закона

150 адпраўленьня іх рэлігіі

151 некранутымі

152 Марыя Гана Тэрэза (па поль. Maria Anna Teresa; 01.07.1650 – 01.08.1651) – прынцэса польская.

153 Ян Жыгімонт Ваза (па поль. Jan Zygmunt Waza; 06.01.1652 – 20.02.1652) – прынц польскі, сястра Жыгімонта Казіміра, памёрла ад эпілепсіі.

154 Аляксей Міхайлавіч Цішайшы (29.03.1629 – 08.02.1676) – другі цар Маскоўскай дзяржавы з дынастыі Раманавых (з 1645 г.), сын Міхаіла Фёдаравіча.

155 Карл X Густав (па шв. Karl X Gustav; 08.11.1622 – 13.02.1660) – другі пфальцграф Пфальц-Клебурзскі, першы кароль Швэцыі з Пфальц-Цвайбрюкенскай дынастыі.

настолькі люты рэйд па Кароне Польскай, якога не адбывалася яшчэ пры чалавечай памяці: бо казалі, што яны забралі ў цяжкае рабства 200 тысяч чалавек, сярод якіх шмат шляхты.

За гэтым уступам сьледуе кароткае апісаньне найпераважных зямель і месцаў у

!старонка 65!

Каралеўстве Польскім і Вялікім Княстве Літоўскім.

І. Вялікая Польшча, з Куявіяй,
альбо Cujavia.

Гэтая зямля ляжыць на захадзе і мае на поўдні Сілезію, на захадзе Марк-Брандэнбург і герцагства Паморскае, на поўначы частку Прусіі і Мазовію, ад якой яна аддзеленая Віслай, на ўсходзе аднак Малую Польшчу. Падзяляецца на 8 ваяводстваў, ці Palatinatus: Posnaniensem (да яго прыцягваецца таксама Wschoviensенскі раён), Calisfiensem, Lanciciensem, Brestensem, Juniuladislaviensem (гэтыя 2 Palatinatus разам называюцца Куявія), Siradiensem, Ravensem, і Vielunensенскі раён; як паведамляе польскі аўтар Simon Starovolscius у надрукаваным зноўку ў 1656-м г. апісаньні зямлі Польскай; за якім я цяпер па большай частцы сьледую і магу гэткім чынам палепшыць маё ранейшае апісаньне (якое я далей дзеля кароткасьці зьбіраюся пазначаць літарамі П.А.) p. 15, 16. Да зямлі Вялікай Польшчы адносяцца наступныя месцы.

Boleslavecia, мястэчка з вельмі моцным замкам, ляжыць у Vielunenскім раёне.

Borek, мястэчка ў ваяводстве Каліш, якое вядома праз выяву Марыі, якая мусіць рабіць цуды.

!старонка 66!

Сталіца Breste, у Брэстэнскім палатынату, аточаны валам, мурамі і ровам. І да гэтага Satrapia, ці ваяводства, належаць 4 раёны, а менавіта: Брэстэнскі, Крусвіцэнскі, Каваленскі і Прэдэцэнскі.

Bydgostia, абнесены мурам горад у Куявіі, Juniuladislavienскага палатынату; дзе маецца выбітны езуіцкі Collegium.

Byki, замак, які належыць баронам аднаго зь ім імя і зьмяшчаецца ў некалькіх палявых шляхах ад горада Petricow.

Calissium, горад на рацэ Przosna, які ляжыць сярод багнаў і аточаны цагляным мурам і вежамі; ён мае некалькі мужчынскіх кляштараў і кляштарную царкву, а таксама каштоўны езуіцкі Collegium. І гэтаму палатынату належаць 6 кашталянстваў, такія як Castellanus Calissiensis, Gnesnensis, Landensis, Naciensis, Biechoviensis і

Camenensis; як таксама і мястэчкі Dobra, Grabovia, Opatovecia, Plesovia, і шмат іншых. Каліш мае вельмі цікавы лёс. У 1306-м г. Vitenes, герцаг Літоўскі, ненаўмысна атакаваў і захапіў гэты горад. У 1655-м г. ён адышоў да Швэцыі, а ў 56-м годзе, восеньню, зноўку вярнуўся пад уладу сваіх польскіх каралёў; пасьля таго як кур-брандэрбурскія ў ім спачатку даволі моцна абараняліся. Глядзі рэгістр П.А. па слову Каліш, альбо p. 70 seq.

!старонка 67!

Chocia, мястэчка ў пазначаным Калішскім палатынаце, дзе ёсьць кляштарная царква і выбітны пробашч.

Colum, і Cosminum, таксама мястэчкі ўзгаданага ваяводства. Piasecius узгадвае іх упершыню ў 1590-м годзе. У 1655-м г. швэды пераходзілі тут Варту.

Coninum, мястэчка ў Познаньскім палатынаце. У 1655-м г. кароль Швэцыі прыбыў да Ragosno і Гнэзіна і пад гэтым Conin conjungirаваў сваё войска з Вітэнберзскім.

Costenum, таксама мястэчка ў цяпер узгаданым ваяводстве Познані, ляжыць у 9 мілях ад яго сталіцы ў напрамку да Фраўэнштата і Гросглогаў; перад гэтым мястэчкам пан ландграф Фрыдрых Гэсэнскі, з касэльскай лініі, быў расстраляны польскім гарнізонам 24-га верасьня паводле старага календара, калі ён хацеў ехаць да свайго пана швагера, караля Швэцыі; затым мястэчка было гвалтам захопленае швэдамі і спаленае 1-га (11-га) кастрычніка 1655-га г., а таксама было занятае імі, бо мела ўмацаваньні і замак; якія потым палякі зноўку доўга трымалі ў аблозе.

Crone, як паведамляе Augustinus Limmerus у Relation Ляйпцыгскага Міхаіла ад 1655-га года, зьяўляецца мястэчкам і замкам у Вялікай Польшчы, якое захапілі швэды.

Crotosinum, знаходзіцца недалёка ад мястэчка

!старонка 68!

Chocia з вельмі прыгожым (менавіта ў часы Starovolscii) садам, і належыць графам Разразаўскім.

Crusvicia – горад у Cujava-Juniuladislavienскім ваяводстве, якое працягваецца ад возера Goplo і гэтага горада Crusviz да Віслы і Паморскай мяжы і ўключае шмат, хаця па большасьці пабудаваных з дрэва, мястэчак. Crusviz мае мураваную часаным камнем царкву, названую ў гонар сьв. Пятра, разам з 24 канонікамі, і замак з цэглы, пабудаваны на выспе пазначанага Гопленскага возера, дзе шмат часоў таму польскі князь Popielus[156] быў зжэрты мышамі. Гл. ранейшае П.А .p. 103 seq.

Curnicum, мястэчка абнесенае мурам у Познаньскім палатынаце. Гл. ніжэй пра Познань.

Dibovia, Gnieucovia, Uratislavia і Solecia, выбітныя месцы ў Куявіі і яе Juniuladislavienскім ваяводстве.

---

[156] Попел II (Папелек; памёр у 843) – апошні легендарны князь палян з дынастыі Папелідаў, сын Попелы I. Паводле лягенды, Попел II быў зрынуты з прастола Земавітам, сынам земляроба Пяста, выгнаны за несправядлівасць і з'едзены мышамі.

Драхайм, замак і староства на пачатку Вялікай Польшчы, як паведамляе Limmerus, якое ў 1655-м было занятае швэдамі.

Gnesna, Гнэзань, Гнезань, арцыбіскупскі горад, які ляжыць у 7 мілях ад Познані, пра яго ў ранейшым П.А. p. 110 & seqq. І там таксама пра S. Adalberto[157], чыі Reliquien палякі ўсё яшчэ мяркуюць мець пры сабе ў срэбным саркафазе; ня гледзячы на тое, што багемцы гэта аспрэчваюць. Куды аднак пазначаны

!старонка 69!

саркафаг, а таксама неверагодны скарб залатых, срэбных і з каштоўных каменьняў рэчаў, які бачылі там раней у цэнтральнай царкве, зьнік падчас захопу горада швэдамі ў 1655-м г., ці яго наогул перавезьлі адтуль у мінулым, з тых Relationen, што я чытаў, нічога не вядома: Starovolscius называе яго thesaurum inæstimabilem[158]. То ў 1613-м г., калі гэты горад у красавіку ўвесь і цалкам, разам з пазначаным храмам, згарэў у агні, жыхары мусілі б таксама калі не цалкам, але часткова знайсьці гэты скарб. У 56-м г., паводле атрыманай інфармацыі, Гнезна зноўку вярнулася ў польскія рукі. І 27-га красавіка у мілі ад яго, каля мястэчка Клецко (дзе мусіць быць шырокая рака і брод), абылося цяжкае сражэньне паміж палякамі і швэдамі.

Goluchovia, замак графаў з Lesno, ляжыць у Калішскім ваяводстве.

Gostininum, мястэчка ў Равенскім палатынаце, вядомае праз вялікага князя Suiscii, які быў прыведзены сюды ў палон з Масквы і знаходзіўся тут пад аховай у замке, пакуль не памёр; пра гэта распавядалася вышэй ва ўступе і ніжэй у апісаньні Варшавы.

Lencicia, выбітны горад і рэзыдэнцыя ваяводы, да яго адносяцца 4 кашталянствы: Lenciciensis, Brezinensis, Inovlodensis і Conariensis. Горад Lencicia, альбо Ланшыц, ці часам Ландшуц і Лондшуц, ляжыць

!старонка 70!

на рацэ Bsura і сярод багнаў і вядомы праз свае кірмашы; кляштар каноніка аднак знаходзіцца адносна далёка ад горада. Гл. ранейшае П.А. p. 131 seqq. пра тое, як жылося гэтаму гораду ў 1606-м г., што трапіла ў наша пазначанае ранейшае польскае апісаньне p.168 з Setho Calvisio[159] (які называе яго Лондшутс на fol. 880). У друкаваных кёльнскіх газэтах, ад 3-га лістапада 1656-га г., паведамлялася, што польскі кароль Казімір 2-га кастрычніка пазначанага года прыбыў да Ландшуца, а 14-га гвалтам захапіў гэты горад, які аднак быў падпалены самім гарнізонам, калі яны retirt да замку; і горад таксама згарэў цалкам, да царквы і жаночага кляштару; супраць волі караля палякі зьнішчылі ўсё, што не пажраў агонь, асабліва аднак жыдоў, з якіх загінула звыш тысячы душ, ня гледзячы на ўзрост, мужчынскі ці жаночы пол; і не пашкадавалі ніводнага немаўля ў матчынай нутробе, бо яны аказвалі

---

[157] Адальберт Пражскі (Adalbertus Pragensis, ён жа Войцех; 955 – 23.04.997) – біскуп, прапаведнік хрысьціянства, прылічаны да святых каталіцкай царквой.

[158] Скарб неверагоднага кошту.

[159] Зэт Кальвізі (Sethus Calvisius, сапраўднае імя Зэт Кальвіц па ням. Seth Kalwitz; 21.02.1556 – 24.11.1615) – нямецкі астраном, хранолаг, гісторык, тэарэтык музыкі і кампазытар.

моцны супрацiў кiдаючы каменьнi; i 16-га таксама i замак здаўся з discretion[160].

Lesla, ляжыць на рацэ Notecz, памiжа Гнезна i Таруньню; там у 1656-м годзе, як пазначана ў адным дакладзе, жудасна расправiлiся з жыдамi; што таксама адбылося i ў Плёцку, i ў Добржыне; i ў Жнiне яны забiлi каля 20-цi спадарожнiкаў швэдскага караля.

!старонка 71!

У iншай Relation пазначалася, што польскае войска ў траўнi стаяла каля Жнiна, мястэчка недалёка ад Нэца; аднак хутка было адпраўленае на ўцёкi швэдамi, i швэды прайшлi да мястэчка Лапешын, а потым да Таруні.

Lissa, дадаткова называецца польская Lissa, у мiнулым прыгожы i густа населенны горад у польскай Сiлезii, ляжыць у 1½ мiлях ад сiлезскай мяжы i 1 мiлi ад мястэчка Шторхнэст, i на такой самай адлегласьцi ад мястэчка Швэцкаў, i ў ваколiцах Фраўэнштата; жыхары адак, хаця яны мелi вал вакол горада i самi былi вялiкай колькасьцi, у 1656-м годзе самi пакiнулi горад праз жах перад палякамi, якiя з-за швэдскай вайны зрабiлiся яшчэ больш чым раней варожымi да немцаў; потым палякi ўвайшлi ў горад абрабавалi найпрыгожыя дамы, а потым ператварылi ўсё ў попел. Aug. Limmerus паведамляе ў Relation Ляйпцыгскага Мiхайлаўскага рынку, p. 15, Lissa спачатку была проста вёскай, аднак за кароткi час ператварылася ў дастаткова вялiкi i населенны горад; куды з-за Reformation перабралася шмат людзей з Сiлезii. Горад, аднак, быў цалкам ператвораны ў попел 18-га красавiка гэтага 56-га году, прыгожы i сьвежа пабудаваны горад, спачатку яго пакiнула рада, а за ёй пасьледвалi ўсе гараджане ў колькасьцi чатырох тысяч узброеных мужчын. Пасьля, у

!старонка 72!

адной Relation сустракаецца, што беглыя лiсаўчане сабралiся зноўку пад адной карчмой у прысутнасьцi месьцiча, якога звалi Лукаш, i абрабавалi маленькiя мястэчкi Швэцкаў, Шлукцiнгхайм i Шторхнэст; бо яны трымалiся з палякамi падчас рабаваньня Lissa i яе спапяленьня (верагодна з-за розьнiцы ў рэлiгii) i забралi сабе тое, што засталося пасьля агню.

Lovicium, Ловiч, горад у 5 мiлях ад Rava i загарадны маёнтак арцыбiскупа Гнэзенскага, чый замак знаходзiцца пасярод багнаў: тут ёсьць бiскупскi кляштар i iншыя цэрквы i кляштары. Горад таксама густа населенны i мае славутыя кiрмашы. Гл. ранейшае П.А. p. 41 seqq., дзе ён паводле тэкстаў iншых Autorn адносiцца да Мазовii, хаця Starovolscius яшчэ далучае яго да Вялiкай Польшчы i Равенскага ваяводства, таму горад i прыведзены тут. У 1655-м г. швэды захапiлi гэты Ловiч i потым пайшлi на Варшаву. 2-га красавiка 56-га года палякi атакавалi гэтыя мясьцiны, i альбо тады, цi адразу пасьля полк палкоўнiка Iсраэльца, што належыў швэдам, атрымаў нечаканыя страты.

Medirecium, Межарыч, горад у Познаньскiм палатынаце каля Лаўшнiча i Марк-Брандэнбурга, якi мае кашталяна;

!старонка 73!

[160] З абачлiвасьцi.

у астатнім аднак па большасьці населены немцамі. Гл. ранейшае П.А. p. 149 seqq. J. Demetr. Sulikovius мае Medzirecium, куды ў 1574-м г. спачатку прыбыў з Францыі праз Марк-Брандэнбург сьвежаабраны кароль Henricus, ён быў тут з вялікай радасьцю сустрэчаны палякамі, і адтуль паехаў у Польшчу. Што тады паводле ўсіх акалічнасьцей зьмяшчае гэты Межарыч бліжэй да Варты; таму Solikovius ставіць яго на Одар; на якой рацэ, аднак, наколькі мне вядома, палякі не маюць ніякіх гарадоў. У 1656-м г., як кажуць газэты, тут зноўку сабраліся адступіўшыя ад Lissa і Фраўэнштат швэды.

Nisavia, цалкам мураваны горад у Куявіі, якая сярод незьлічонай колькасьці азёраў мае асабліва возера пад назвай Гоплус, якое мае 5 міль у даўжыню і палову ў шырыню. Нізаў ляжыць аднак на Вісьле у Брэстэнскім Palatinat, ці Satrapia, і зусім не далёка адтуль знаходзіцца Raciensum, з вельмі прыгожым замкам, і таксама Radziciova і Sluzevia.

Odolanovia, мястэчка і замак сярод багнаў у Калішскім ваяводстве, ці Palatinat, у аколіцах якога, у 2-х мілях ад Каліса, ці Каліша, ляжыць таксама Olobocum, вельмі заможны і прыгожы жаночы кляштар пабудаваны як замак.

Pacostia, мястэчка у Куяўскім і Юнінладіслаўскім Palatinat. У сілу

!старонка 74!

абставін паводле Cromeri зьяўляецца Pacossum, пра што глядзі ў ранейшым П.А. p. 156 і ў табліцы Пакош; пра якую трапілася ў адным дакладзе, што ў 1656-м годзе пан Карл Густаф Урангель[161], граф Залмскі, імпэрскі Vice адмірал і генэрал фельдмаршал, 13-га траўня па стараму кал. знаходзіўся ў Pysdry: паколькі аднак там і ў тамашніх аколіцах на Варце лютавала чума, ён пераехаў адтуль да Мельзіна, Магільна ды Пакошы і прыбыў у горад Пакош 15-га дня; а потым накіраваўся ў Бромберг; там ён 17-га чысла гэтага месяца захапіў на міласьць і няміласьць заняты палякамі замак. У франкфурцкіх восеньскіх Relation, пазначанага 56-га году, пішуць, што швэды рушылі 7-га красавіка з Варшавы ў мястэчка Blonie, 8-га да Ншчонава, 9-га да Равы, 10-га да мястэчка Ежоў, 12-га чатыры мілі далей, 13-га паўз Ловіч, 14-га да Кладовы, 16-га да Ужэсьні, 17-га да Сабісцырні і далей на Пакош, у 6 мілях ад Таруні, і 18-га красавіка прыбылі ў Тарунь.

Petricovia, Петрыкаў, файна пабудаваны горад у Сірадзішскім ваяводстве, які ляжыць у 7 мілях ад горада Siradia, там знаходзіцца каралеўскі парлямэнт, ці камерны суд, які яны называюць Tribunal. Глядзі ранейшае П.А. p. 8, p. 136 seq.

Posnania, Познань, сталіца Вялікай Польшчы на Варце; якая, паводле ранейшага

!старонка 75!

апісаньня, p.163 & seq, ляжыць пад gradu longit. 39 і latit. 52. Хаця горад сам па сабе невялікі, аднак прыгожы, і там раней жыло шмат купцоў. Горад мае таксама вельмі вялікія прадмесьці, дзе таксама знаходзіцца біскупская галоўная царква з дамамі канонікаў і біскупскі двор, што ляжыць

---

[161] Карл-Густав Урангель (па шв. Carl Gustaf Wrangel; 13.12.1613 – 25.06.1676) – швэдскі адмірал і фельдмаршал, які ўзначальвай швэдскае войска на апошнім этапе Трыццацігадовай вайны.

паміж багнамі, якія яны называюць Valisoviam, нібыта мястэчка, якое вельмі зручнае для ўмацаваньня. Там таксама знаходзіцца Gymnasium Lubranscianum, дзе ў асаблівасьці выкладаюць навуку руха нябёсаў і права; у горадзе аднак езуіты маюць свой Collegium; а ў дамініканаў выкладаюць Theologia. Сярод іншых месцаў, што належаць да гэтага Palatinat, мурам абнесеныя яшчэ таксама Slupcia, Kcina, Kazimiria і Nacum. Аднак, вяртаючыся зноўку да горада Познані, то з Брэслаў 3-га чэрвеня 56-га года, па новаму кал., пісалі, што швэды выгналі з гэтага горада ўсіх езуітаў, манахаў і сьвятароў, за невялічкім выключэньнем, а ўсе прадмесьці, цэрквы і кляштары вакол горада спалілі. Тады гэты горад разам з Калішам і Мяджэнцам (як гэтае апошняе месца называе Limmerus) у 1655-м годзе трапілі пад швэдскую ўладу.

Pisdra, ці Pysdry, знаходзіцца ў пазначаным Познаньскім ваяводстве; пра яго ўзгадваецца тут вышэй у Pacostia і ў ранейшым П.А. p. 171. Стаіць на Варце.

!старонка 76!

Rava, горад і рэзыдэнцыя ваяводы, якая мае пад сабой 3 Castellanen. У Раве маецца мураваны замак, у якім трымаюць палоннымі ворагаў Айчыны, калі яны зьяўляюцца паважанымі асобамі; і таксама езуіцкі Collegium. Акрамя таго ў Равенскім Palatinat ляжыць мястэчка Volboria, дзе біскуп Куявіі трымае свой двор; і таксама Gombinum, Sochaciovia, Gostininum (пра яго было вышэй), Squernevicia (дзе арцыбіскуп Гнэзенскі мае палац), Biala, раён Кельменскага біскупа, адкуль бачны Radzejoviam, вельмі прыгожы замак Lencicienскага, ці Ланшуцкага Palatini, адкуль і яго імя, і які меў у часы Starovolscii надта вясёлыя сады, фантаны і фруктовыя сады. Вышэй узгаданая мястэчка Squernecia, ці Squiernievicium у 1622-м г. належыла арцыбіскупу Гнэзенскаму, як паведамляе Stanislaus à Kobierzycko і шматлікія іншыя.

Scodra, месца ў 4 мілях ад Познані, як паведамляе Augustinus Limmerus, там у 1655-м годзе фельдмаршал Ўітэнберг[162] трымаў свой асноўны лагер.

Siradia, Сірач, шаноўны горад і рэзыдэнцыя ваяводы, на Варце, да якога належаць мястэчкі Vidavia, Varta, ці Варта, Pabianice, Lascum (дзе жыве шаноўны пробашч) і шмат іншых. У Сірачы ёсьць замак. Гл. ранейшае П.А. p. 177 seq. У 1290-м годзе гэты горад быў жудасна спустошаны татарамі.

!старонка 77!

Sreda, мястэчка, дзе пасьля сьмерці караля Sigismundi Augusti палякамі быў арганізаваны сход; як паведамляе Andr. Max. Fredro.

Stavum, называемы некаторымі Stavus і Stavisinum, мястэчка ў Калішскім ваяводстве; якое Vitenes[163], князь Літоўскі, нечакана захапіў у

---

[162] Арвід Ўітэнберг (па шв. Arvid Wirtenberg von Debern; 1606 – 07.09.1657) – швэдскі граф, фельдмаршал і ўдзельнік рыксрода. Удзельнік Трыццацігадовай і Паўночнай вайны.

[163] Віцень (пачатак 1250-х – 1316) – вялікі князь літоўскі (1295 – 1316). Паводле Густынскага летапісу, Віцень прыняў Пагоню дзяржаўным гербам Вялікага Княства Літоўскага.

1306-м годзе. Калі ў 1331-м г. Нямецкі Прускі Ордэн жудасна лютаваў у Польшчы, таксама і гэтае места было спаленае.

Strelce, шаноўнае месца ў Куявіі і Юніўладзіслаўскім Palatinat, дзе знаходзіцца самы заможны жаночы кляштар Вялікай Польшчы; як кажа Starovolscius.

Velunia, горад з прыгожымі цаглянымі дамамі, кляштарам канонікаў і некалькімі іншымі кляштарамі; чые землі, на якіх знаходзіцца мястэчка Boleslavecia, мяжуюць з Сірадзішскім Palatinat і Terravielunensis, які па нямецку называецца Велунь. Augustinus Limmerus у Пасхальных Ляйпцыгскіх Relation ад 56-га году піша, p. 14 & seqq. і p. 41, што ў Велуні, горадзе каля Сілезіі, швэды былі атакаваныя палякамі і люта tractirt, разьбітыя, таксама разам з гараджанамі евангелікамі, жанчынамі і нявіннымі дзецьмі, якія ў 1655-м годзе перасяліліся туды; аднак замак швэды ўтрымалі. Frölichius паведамляе ў сваім Viatorio, што Vielunia зьяўляецца ўмацаваным горадам з моцным замкам у Польшчы: аднак не паведамляе, дзе ён

!старонка 78!

знаходзіцца. У восеньскіх Франкфурцкіх Relation ад 1656-га году пазначана, што Велунь, вельмі моцнае мястэчка каля Чэнстохава, была спаленая палякамі. У іншым дакладзе сустракаецца, што ў 56-м годзе жыхары Чэнстохава (пра гэтае месца распавядаецца ніжэй у апісаньні Малай Польшчы) праз здраду падпалілі мястэчка Велунь у 20-ці месцах, што ад яго нічога не засталося. Цяпер аднак вышэй узгаданая Велунь ляжыць паміж Сірадыяй і Чэнстохава; і я больш не знаходжу ніякай іншай Велуні ў сьпісах, акрамя ўзгаданай першай.

Viasdum, мястэчка з надта прыгожым замкам, адразу леваруч ад горада Ravæ і ў Равенскім Palatinat.

Uladislavia, Уладіслаў, горад на Вісьле ірэзыдэнцы біскупа Куявіі і Памор’я; які ляжыць у Брэстэнскім Palatinat. Гл. наша ранейшае Поль. А. p. 209 seqq. сярод літар У.

Uniejovia, горад разам з майстэрскі пабудаваным замкам, які ляжыць на Варце і ў Ленцыцыенскім Palatinat, і разам з горадам Piontko належыць арцыбіскупу Гнэзенскаму.

Uschohovia, горад у Познаньскім, ці горада Познань, Palatinat; які таксама называецца Vuschova, а сярод немцаў – Фраўэнштат, і ляжыць у польскай Сілезіі, у 2-х мілях ад Грос Глогаў; пра што гл. ранейшае П.А.

!старонка 79!

p. 108, 109. Augustinus Limmerus кажа, што тут нічога не адбывалася акрамя таго, што ў 1656-м годзе, пасля жудасных падзей у польскай Лісе, жыхары тут склалі зброю і адаслалі яе палякам.

Znena, Snena, якая ляжыць паміж Шмармойсэлям і Пакошай і належыць арцыбіскупу Гнэзенскаму, як паведамляе Sulikovius (як называе гэта insigne oppidum[164]). Ляжыць зусім недалёка ад Notecz, які ў газэтах і таксама часам у Relationen называюць Нэча, а Znena – Зьнін і Жына.

[164] Герб горада.

II. Малая Польшча.

Ляжыць на поўдні, і пакрытая гарамі, асабліва каля Венгрыі. Праз яе бяжыць Вісла, ці Vistula; і гэтая зямля мяжуе з Русьсю, Вялікай Польшчай, Сілезіяй і Венгрыяй. Яна мае волава і срэбра пад Ілкушам, Слаўковам, Северыяй і Новагорай; руду і золата пад Novotargo і ў гарах вакол Сіндэка; мэталёвую соль, як скалы, пад Bochna і Velisca; мармур разнастайных колераў пад Solecia; селітру пад Vislicia; купарвас пад Biecia; медзь і каменны вугаль пад Тэнчынам; сталь пад Podolenecia; аднак звычайныя жалезныя і шкляныя майстэрні пад Olstinia і ў іншых месцах, пра якія пойдзе гаворка ніжэй. І гэтая зямля падзяляецца на 3 ваяводствы, ці Palatinatus, а менавіта Кракаўскае, Sendomirs і Люблінскае.

!старонка 80!

Найбольш выбітныя з месцаў, што маюцца там, гэта:

Andrejovia, Audreovum, мястэчка, пра якое можна прачытаць у нашым ранейшым Польскім Апісаньні p. 60. У 1607-м годзе польская шляхта, якая была супраць караля, ці Rokossiani, прызначылі тут агульны сход на 28-е сакавіка. Таксама і раней, у 1576-м годзе ў студзені тыя палякі, што трымаліся са Стэфанам Bathoreo, арганізавалі тут узброены Convent. У астатнім, гэтае мястэчка ляжыць у Кракаўскім Palatinat, каля Сілезіі, і недалёка ад Вянгерскай мяжы.

Biecia, прыгожы горад, які ляжыць на ўмацаваным месцы, да якога належыць раён. Знаходзіцца ў Кракаўскім палатынаце.

Bochnia, горад, які таксама ляжыць у Кракаўскім палатынаце, дзе, як таксама вышэй было ўзгадана, маецца саляная шахта; і па правую руку ад яго ў напрамку Венгрыі бачны горад і замак Dobcicia, а на ўсходзе ў Visniz – вельмі моцны замак графа Lubomirsci[165]. Глядзі пра гэты горад, што знаходзіцца ў 5-ці мілях ад Кракава, і пра пазначаную саляную шахту ў нашым ранейшым П. А. p. 63 seq.

Bozentinum, дастаткова файны горад аточаны мурамі і валам, ляжыць у самага падножжа гары Кааленберг, ці Calvimontis, вышэй за якую ва ўсёй Польшчы не

!старонка 81!

знайсьці ніводнай гары. Кракаўскі біскуп звычайна трымае двор у Бозэнціне; і мае акрамя яго таксама ў Кельцы, дзе ёсьць прыгожы кляштар, палац упрыгожаны мармурам. Гл. П. А. p. 65.

Cazimiria, вельмі прыгожа пабудаваны горад на Вісьле ў Люблінскім палатынаце, там яшчэ нядаўна было шмат купцоў. Гл. П. А. p. 74 , кароль Швэцыі перайшоў тут цераз пазначаную раку і потым 8-га лютага 1656-га г.

---

[165] Аляксандр Міхаіл Любамірскі (1614 – 1677) – магнат Рэчы Паспалітай, які валодаў замкам Вішніц у час напісаньня кнігі.

пасьпяхова біўся з польскім палкаводцам Stephano Czarnecki[166] пад Wlostowiz.

Christophoria, замак у Сандамірскім Palatinat, дзе ў 1656-м г. швэдскі палкоўнік прасіў ежы. Starovolscius піша, што у гэтых ваколіцах стаяць прыгожыя замкі шляхты, і сярод іх Rzemienium – вельмі моцны, Vieviorkam – вельмі забаўны, і Baranoviam – вельмі прыгожы; аднак Christophoria пераўзыходзіць іх усіх. У Франкфурцкіх восеньскіх Relation 56-га года узгаданы Baranow, ці Baronowa, называецца як горад паміж Яраславам і Сандамірам; дзе 24-га сакавіка кароль Швэцыі перамог польскага палкоўніка Сапегу. Пазначаныя Relation узгадваюць таксама корад Беліц, каля Белаў, на шляху з Кракава да Яблункі.

Chroberscum, прыгожы горад, які ў часы Starovolscii належыў маркграфу фон Міскаў;

!старонка 82!

якому належыць таксама горад Pinczovia разам з вельмі раскошным палацам.

Claratumba, ці Mogila, Mogillo, у адной мілі ад Кракава, вельмі заможны, прыгожы і добра ўмацаваны Цыстэрыянскі кляштар і абацтва. Як я знайшоў, быў спалены ў 1473-м г.

Corczynum, цэнтр свайго раёну, які мае замак і стаіць на цьвёрдым месцы пасярод вады.

Cracovia, сталіца не толькі Малай, але і ўсёй Польшчы; яе Palatinat, ці ваяводства, працягваецца таксама на вялікую адлегласьць; бо ў ім маюцца 4 вялікія раёны і 3 герцагствы, а менавіта: ducatus Osvecimensis, Zatoriensis і Severiensis, якое зьяўляецца часткай Сілезіі. То сюды таксама адносюць 13 адкрытых мястэчак разам з замкам Lublo, ці Люблаў, які палякі называюць Luboulia, які зьяўляецца надта моцным, мае пастаянны гарнізон і лажяць у Цыпсе, ці Comitatu Scepusiensi, і ў 1412-м г. быў перададзены Венгрыяй Польшчы ў якасьці заклада за атрыманыя грошы; як пра гэта і шматлікае іншае можна прачытаць у маім Апісаньні каралеўства Венгерскага, p. 26 seq. Кракаўская зямля мае біскупа, кашталяна (які сядзіць адразу пасьля біскупа на ўсіх сьвецкіх Соймах), Palatin Кракаўскага і 4-х іншых кашталянаш, а менавіта Voinicensem, Osuecimensem, Sandecensem і Biecensem, разам са шматлікімі іншымі высокімі асобамі. Пра багацьці гэтай зямлі вышэй ужо трошкі распавядалася.

!старонка 83!

Акрамя тых месцаў, якія ўжо былі прыведзеныя і яшчэ будуць прыведзеныя ніжэй, у гэтым Palatinat, на Varta, ляжыць мястэчка Mstovia; а праваруч, у лясах, на надта высокай скале замак Olstima; на рацэ Pilcia ляжыць аднак Novopolia з надта прыгожым замкам, які належыць Koniecpolsciis разам з замкам Potok, ад якога атрымаў імя шаноўны род Potociorum, які адтуль перабраўся да Русі. На захадзе, і ў адной мілі ад горада Кракаў,

[166] Стэфан Чарнецкі (па пол. Stefan Czarniecki; 1599 – 16.02.1665) – выбітны полські ваенны дзеяч, гетман польны каронны. Нацыянальны герой Польшчы.

можна бачыць на высокай гары кляштар, ці Eremitorium камалдуленскіх манахаў; і ў палове мілі адтуль Tinecium, бенэдыктынскі кляштар на берагу працякаючай каля яго Віслы, абат якога зьяўляецца панам над 5 гарадамі і сотняй вёсак. Калі накіравацца да сілезскай мяжы, то сустрэнеш Bobrcenскі замак у Osvecimenскім княстве. У Zatorienскім княстве знаходзіцца Osiecenскі палац. Яшчэ у Кракаўскім Palatinat знаходзіцца таксама Tucholia, Zmigrodum, Dombovecia, Ducla; і калі павярнуць на поўнач, то там знаходзяцца мястэчкі Opatovecia, Cosicia, Prosovia, Miechovia (належыць разам з ваколіцамі рыцарам Гроба Хрыстова), Scarbimiria, і ў Кракаўскі ваколіцах маюцца таксама шматлікія іншыя, не такія знакамітыя. Што аднак да самаго горада Кракаў, то ён ляжыць на 42 gradu longit і 50 latit, як кажа

!старонка 84!

Starovolscius. І мае побач на ўсходзе Cazimiriam, а на поўначы Clepardiam, а каралеўскі замак аднак знаходзіцца на скале, і такім чынам у цэнтры, над Віслай. Які скарб захоўваўся ў замкавай ці S. Stanislai царкве ва ўзгаданыя часы Starovolscii, распавядае ён на p. 14. У гэтай царкве сьвятары сьпяваюць на працягу ўсёй ночы. Яе біскуп зьяўляеццца панам над 13 гарадамі і вярхоўным князем у Severienскім княстве; мае пад сабой таксама 1018 цэркваў, 13 з якіх зьяўляюцца біскупскімі кляштарамі, капітул, які складаецца з 36 клірыкаў мае разам з іншымі сьвятарамі больш нізкага стану такі самы даход, як і біскуп. Мясцовая вышэйшая школа, што была заснаваная 17-га жніўня 1344-га г., мае 11 Collegia, распавядае Starovolscius на p. 15, і дадаткова 14 Scholas Grammatices, раскіданых па гораду, якія ўсе знаходзяцца пад началам Magnifico Academiæ Rectore. Яны захоўваюць там таксама шмат мошчаў сьвятых і асабліва тыя, што мусяць рабіць цуды; як сьв. Stanislai, які быў туташнім біскупам, S. Prandothæ і S. Joann. Grothti, у замку; S. Hyacinthi і Ivonis, біскупаў у Dominicанаў; S. Isaiæ, спавядальнікаў, у Eremitанцаў S. Augustini; Stanislai Cazimirien у Canonicis Regularibus; S. Simonis Lipnicæ у Minoriтаў з Observanz; S. Joannis Cantii, Academici у сьв. Анны &c. У Кракаве, у

!старонка 85!

замку захоўваецца асноўны дакумэнт, скіпетр, кароны, скарбніца і іншыя высокакаштоўныя рэчы каралеўства: таму таксама Малая Польшча мае паравагу над Вялікай, бо там знаходзіцца каралеўскі сталец. Той, хто жадае ведаць больш і падрабязьней пра гэты горад (які Andreas de Pilca Corycinius называе Grachoviam паводле яго фунтададатара Gracho), той няхай чытае маё ранейшае Польскае Апісаньне на 78-й і наступных старонках: няма патрэбы паўтараць гэта тут, бо гэта друкавалася ўжо двойчы: і тут таксама прыводзіцца на pag. 95 & seqq. тое асаблівае, што яшчэ можна сюды дадаць; урыўкі адттуль, наконт падзей 1580-га г., таксама прыведзеня ў дадатку да іншага Edition. Таму я хачу толькі яшчэ ўзгадаць некалькі найновых гісторый, якіх не знайсьці ў іншых месцах; як тое, што ў 1587-м г. пан эрцгерцаг Максіміліян Аўстрыйскі, які часткай палякаў быў абраны каралём, абклаў Кракаў; пра што вышэй напісана ва ўступе. Пра

непарадкі супраць эвангелікаў у гэтым горадзе у 1591-м годзе хаця ўжо і прыводзілася трошкі ў пазначаным нашым апісаньні, p. 100: аднак можна да гэтага дадаць яшчэ тое, што біскуп Piasecius піша на 92-й старонцы сваёй польскай хронікі: паколькі сястра караля Жыгімонта, паненка Анна, што прыехала разам зь ім са Швэцым, была лютаранкай, то лютаране з гэтай нагоды ў вялікіх колькасьцях накіраваліся да Кракава і пабудавалі там сваю Synagogam; item & aliam dissentientes sibi in

!старонка 86!

religione[167], як ён кажа. Аднак! народ разбурыў уначы гэтую Synagogas і спаліў, і ерэтыкі яе больш ніколі не аднаўлялі. У 1595-м г. 9-га чэрвеня тут нарадзіўся наступны кароль laus: аднак уначы, што была напярэдні яго народзінаў, нечакана згарэла лепшая частка каралеўскага палацу, тая што глядзіць на горад: таму зьявіліся розныя прадказаньні наконт шчасьлівасьці маладога паніча; і час паказаў, што ўсе гіпотэзы былі млушныя, і што падобная выпадковасьць пайшла на дабро таксама і замку, бо кардынал Георгій Радзівіл, біскуп Кракаўскі, даў каралю столькі медзі з тады толькі адкрытых у яго біскупстве, на Kielcenскіх палях, залатых руднікоў, колькі яму патрабавалася, каб аднавіць страчаны ў полымі дах; і сам кароль, з немалымі выдаткамі, аднавіў гэтую частку замка. У 1652-м годзе тут мусілі памерці 173 тысячы хрысьціян і 20 тысяч жыдоў: акрамя таго аднак у Польшчы ў гэтым годзе загінула ад мяча і хваробаў звыш 400 тысяч чалавек; як сьведчаць атрыманыя даклады. У 1655-м г. кароль Швэцыі Carolus Gustav абклаў Кракаў, і 16-га верасьня са згодай захапіў сабе горад Казімір і прадмесьце Страдон (якое палякі самі большай часткай ruinirt, і таксама спалілі прадмесьце Клепард), а 8-га (18-га) кастрычніка і сам горад

!старонка 87!

Кракаў; а 9-га (19-га) чысла таго месяца польскі гарнізон пакінуў замак; як напісана ў франкфурцкіх веснавых Relation ад 56-га году: Augustin. Limmerus аднак кажа, што прадмесьце Клепштат было падпаленае палякамі з розных бакоў, а горад Казімір быў захоплены швэдамі 16-га верасьня разам з прадмесьцем Страдон; Страдон аднак быў спалены польскім камендантам Кракава; 9-га кастрычніка Кракаў са згодай перайшоў да швэдаў, якія зруйнавалі большасьць муроў у спаленых кракаўскім прадмесьцях. Потым палякі шмат разоў атакавалі гэты Кракаў, і асабліва адзін каронны мечаносец у 56-м годзе ўжо меркаваў трымаць гэта места, аднак быў разьбіты там швэцкім палкаводцам 31-га ліпеня; пра што маецца друкаваная Relation, у якой таксама ўзгаданы мечаносец не названы па імені, аднак узгадваецца ўсё ж нехта з кляштару Лінец на Вісьле і з дому Tentichin, які належыць прыдворнаму маршалу Opolinsky і ляжыць у 3-х мілях ад Кракава. Акрамя таго ў 1651-м г. каронным мечаносцам, альбо Regni Gladifer, быў Michael Zebrzydovius[168], адзін з вялікіх паноў ваяводства Кракаўскага, які таксама яшчэ мог быць тым самым безыменным мечаносцам. Потым палякі зноўку жорстка змагаліся пад гэтым горадам.

---

167 Разам з іншымі, што адрозьніваюцца ў веры.

168 Міхаіл Зэбжыдоўскі (па пол. Michał Zebrzydowski; 19.09.1613 – 19.04.1667) – дзяржаўны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай, мечнік вялікі каронны, ваявода Кракаўскі.

Czenstochia, Чэнстохава, мястэчка, дзе
!старонка 88!
робюць надта добрае піва, якое прадаецца не толькі ў Польшчы, але таксама і ў суседнім нямецкіх землях; аднак кляштар, які добра ўмацаваны і разам з горадам таксама знаходзіцца на Кларенберг, знакаміты праз выяву сьв. Нявіньніцы Марыі, якую мусіў намаляваць С. Лукаш, і да якой робіцца шмат пілігрымак; а ў кляштары эрэміцкага ордэна S. Pauli знаходзіцца значная скарбніца. Dominicaner маюць паблізу сваю рэзыдэнцыю, якая называецца Гідленскай, і таксама вельмі вядомая праз цудадзейную, як яны кажуць, выяву сьв. Нявіньніцы; таксама там нядаўна быў падубаваны картэзіянскі кляштар. Швэды абклалі Чэнстохаўскі кляштар у 1655-м г., аднак з-за маразоў мусілі зноўку зьняць аблогу; у наступным 56-м годзе яны таксама марна атакавалі яго.

Czorstein, каралеўскі замак у 12 мілях ад Кракава, ляжыць на высокай гары, пад якой цячэ рака Donajecius; там у 1651-м годзе Napierski[169], якога назвалі Kostka, падняў бунт у спадзяваньні на казацкую падтрымку. Аднак пазначаны замак, які ён захапіў сабе, быў зноўку захоплены дзякуючы стараннасьці біскупа Кракаўскага, а пазначаны здраднік Костка атрымаў там заслужанае пакараньне.

Inovlodia, на рацэ Pilca ў Сандамірскім Palatinat, мястэчка, якое знаходзіцца ў гэтым ваяводстве разам з Drevicia, што мае добры замак.
!старонка 89!

Ilcussia, каралеўскі горад у Кракаўскім Palatinat, дзе маюцца свінцовыя і срэбныя руднікі; і дзе можна знайсьці прыгожы смачны хлеб і добрае бычынае мяса. Знаходзіцца менш, чым у 5 мілях ад Кракава, і не далёка ад Слаўцова, які належыць біскупу Кракаўскаму і Северыйскаму герцагству і вельмі знакаміты праз свае срэбныя шахты.

Ilza, прыгожы горад з цаглянымі дамамі, які належыць таксама пазначанаму біскупу Кракаўскаму, аднак ляжыць у Сандамірскім Palatinat, мае замак і распаўсюджвае па ўсёй Польшчы вельмі прыгожыя збаны, ці гаршчкі. Да яго адносіцца Cunonia, якая вельмі вядомая за свае разнастайныя мармуровыя камяні ўсемагчымых колераў.

Lagovia, горад таксама пазначанага Palatinat, які належыць біскупу Куяўскаму; яго жбаны таксама даволі знакамітыя, таму прадаюцца па ўсёй Польшчы.

Landiscorona, Ландс-Крон, замак на высокай скале ў Кракаўскім Palatinat, які з усіх бакоў бачны за некалькі міль шляху, і ў тых ваколіцах знаходзіцца таксама гара Calvariæ, а на ёй – кляштар манахаў Observanz і шматлікія капліцы, ці малітоўныя домікі, у ерусалімскім стыле: таму таксама туды робіцца шмат пілігрымак. Albetrus Laski, ваявода Сірадскі, пакінуў пазначаны Ландс-Крон, бо ён знаходзіцца ўсяго толькі ў 4-х мілях ад Кракава, пану эрцгерцагу
!старонка 90!

[169] Аляксандр Леон Костка-Наперскі (к. 1620 – 18.07.1651) – польскі афіцэр, кіраўнік сялянскага паўстаньня ў Кракаўскам Падгальле ў 1651 г.

Максіміляну Аўстрыйскаму, аднак кароль Стэфае прымусіў яго да капітуляцыі. Piasecius называе яго Lanskoronam, і кажа, што ён знаходзіцца каля вянгерскіх межаў. У 1655-м годзе 19-га (29-га) Sept. пан граф Дуглас і яго швэды захапілі гэты моцны горны замак. Аднак у 56-м годзе, як кажуць людзі, палякі зноўку занялі яго дзякуючы здрадзе.

Lelovia, мястэчка таксама ў Кракаўскім Palatinat, абнесенае старым мурам; да яго адносіцца панства, ці раён.

Lezaiscum, мястэчка; там, акрамя яго самаго, ёсьць мінарыцкі кляштар, у якім захоўваецца выява сьв. Марыі, якая мусіць рабіць цуды. Знаходзіцца ў Сандамірскім Palatinat.

Lipovecia, мястэчка разам з замкам на высокай скале, у якім трымаюць сьвятароў Кракаўскай парафіі, калі яны паводзяць сябе неналежным чынам.

Lublinum, славуты горад і сталіца трэцяга Palatinat у малай Польшчы, разам з далучаным да яго Луковінскім раёнам. У ім да нядаўняга часу мусіла быць каля 2000 шляхетных дамоў; і ў знаходзяцца гарады: Cazimiria, Opolia, Curovia, Crasnicia, Levartovia, Urzendovia, Lenczna, Czemiernicos; і замак паноў Фірляй Dombrovicia. Пазначаны стольны горад Люблін ляжыць амаль пад 45 gr. longit. і далей, на 51 grad. latit., як піша Starovolscius. Сам па сабе не надта вялікі, аднак прыгожа пабудаваны

!старонка 91!

і не адрозьніваецца амаль ні ад якога горада ва ўсёй Сарматыі ані па маляўнічасьці месцахнаходжанья, ані па здаровасьці паветра, ані па ўрадлівасьці глебы; як хоча зноўку пазначыць узгаданы польскі аўтар. Мае з раскошай пабудаваныя цэрквы і кляштары, катэдру і езуіцкі калегіюм, а таксама яшчэ камерны суд, ці парлямэнт; і трымае тройчы на год славутыя і буйныя кірмашы. Больш пра іх глядзі ў нашым ранейшым Польск. Апісаньні, p. 143 & seqq. У 1606-м г. польская шляхта зладзіла тут сход супраць караля і некаторых паноў рады, якія трымаліся зь ім; пра тое, што адбылося потым можна прачытаць у Польскай хроніцы Pauli Piasecii. Што зрабілі тут у Любліне (у 24-х мілях ад Варшавы) з жыдамі ў 1646-м годзе, напіасан ў дадатку да ўзгаданага Польск. Апіс., другога edition. У 1656-м годзе кароль Швэцыі знайшоў гэты горад незанятым і адкрытым, за што яны мусілі аддаць 30 000 гульдэнаў страхоўкі ад падпалаў, як напісана ў Франкфурцкіх веснавых Relation. Кароль аднак вярнуў іх ім. І потым тут у сакавіку памёр сваёй сьмерцю граф Вальдэмар з Даніі[170].

Ogrodenecia, замак на скале ў Кракаўскім Palatinat, належыць панам Фірляй, паміж ім і горадам Severia знаходзяцца некалькі невялічкіх мястэчак.

Opatovia, выбітны горад у

!старонка 92!

[170] Вальдэмар Крысьціян (па дац. Waldemar Christian; 26.06.1622 – 26.02.1656) – сын дацкага караля Крысьціяна IV і яго марганатычнай жонкі Кірстэн Мунк. Насіў тытул графа Шлезьвіг-Гольштайнскага, аднак насамрэч нідзе не ўладарыў.

Сандамірскім Palatinat, у чатырох мілях ад яго сталіцы; там таксама была нядаўна пабудаваная Viazdenская крэпасьць, як таксама і мястэчка Jedlinskio, дзе знаходзіцца славутая Gymnasium і майстэрскі пабудаваная царква.

Osvesimia, горад і сталіца суседняга з Сілезіей Osuecimenскага герцагства, які ляжыць паміж багнамі; аднак у Заторскім герцагстве, якое таксама знаходзіцца ад Кракава ў напрамку Сілезіі, маецца Palatium Osjecense: аднак Bobrcenскі замак стаіць ва ўзгаданым Osuecimenскім герцагстве.

Pilcia, мястэчка і таксама яго раён, які належыць герцагу Zbaravio, дзе маецца кляштар канонікаў і раскошны палац разам з яго прыгожым паркам упрыгожаным ва ўэльскім стылі; на гары аднак стаіць добрая крэпасьць. Знаходзіцца ў Кракаўскім Palatinat.

Pilsna, мястэчка і сталіца свайго раёну ў Сандамірскім Palatinat; дзе маецца прыгожая царква і вельмі знакамітыя арганы. І ў тых ваколіцах знаходзяцца таксама мястэчкі: Sendisovia, Zarnovecia, Socolovia, Præclavia і Zaclicynum; дзе маецца вельмі прыгожы рынак, ці пляц.

Racovia, у мінулым густанаселены горад і выбітная школа арыянаў у Сандамірскім Palatinat; тыя арыяне аднак былі адтуль выгнаныя праз публічны дэкрэт, і месца цалкам вызвалілася для рымскіх каталікоў.

!старонка 93!

Глядзі дадатак да ранейшага Поль. Ап. p. 10 & 11.

Radomia, горад і цэнтр свайго раёна, які знаходзіцца ў Сандамірскім Palatinat, дзе мінарыты маюць прыгожую царкву. У 1656-м годзе гэтае меца было захопленае лейтэнант-палкоўнікам Кароны Швэцкай, Рутгерам фон Ашенбергам[171], і каля яго палякі былі разьбітыя.

Sandecia, выбітны горад у Кракаўскім Palatinat на рацэ Donajecio, які пераўзыходзіць іншыя вакольныя гарады па колькасьці насельніцтва, пырмае істотную колькасьць гандляроў, мае надта маляўнічае месцазнаходжаньня і таксама Præmonstratenser абацтва і кляштарныя цэрквы, і мае амаль у адной мілі перад вачыма стары Сандэч, дзе стаіць жаночы Præmonstratenser кляштар, якім павінен быць самым заможным ва ўсёй Польшчы.

Sborovia, замак старажытнай пабудовы, у самай сярэдзіне паміж Vislicz і Corczyn, у Сандамірскім Palatinat, дзе знаходзяцца вельмі шырокія сады з жывёламі і рыбныя пруды.

Sendomiria, славу ты горад і цэнтр ваяводства, якое носіць яго імя і багатае на залатыя, срэбныя, рудныя і лазурныя шахты пад Kielce; на сьвінец і срэбра пад Chencin, дзе таксама маецца самы чорны мармур; зялёны і чырвоны аднак пад Куновам; жалеза і сталь сустракаюцца пад Vonchotia, Boadzantino, Sydlovecia,

!старонка 94!

[171] Рутгер фон Ашеберг (па ням. Rütger von Ascheberg; 02.06.1621 – 17.04.1693) – швэцкі ваенны і дзяржаўны дзеяч.

і ў розных іншых мясьцінах. Гэты Palatinat працягваецца далёва, бо мае 8 раёнаў і 9 паноў рады, а менавіта ваявода Сандамірскі і наступныя Castellanos: Sendomiriensem, Visliciensem, Radomiensem, Zavichostensem, Zarnoviensem, Malogostensem, Polanecensem і Cechoviesam. Акрамя тых месцаў, што ўжо былі прыведзеныя вышэй, у гэтым Palatinat знаходзяцца таксама наступныя мястэчкі: Tarlovium, а ў ім раскошны храм; Solecia, на Вісьле, цудоўны замак; Malogostia; Vilcienскі замак, у Stenzicenскім раёне, які адначасова зьяўляецца дадакам да гэтага ваяводства; і таксама мястэчка: Osiecum, Stasovum, Polanecia, Paczanovia, Stobnicia, Olesnicia, Ossolinum і яшчэ шматлікія іншыя, якія аднак зьяўляюцца дробнымі, акрамя тых, што будуць апісаныя далей; бо там ёсьць сам узгаданы горад Sendomiria, што ляжыць на высокай скале і мае прыемны позірк на Віслу. Пра яго глядзі больш у нашым ранейшым Польск. Апісаньні, p. 174 & seqq. У 1656-м годзе, 20-га сакавіка па стараму каляндару, палякі зноўку вярнулі гэты горад Sandomirs, які быў у 55-м годзе заняты швэдамі. Швэдскі камендант у замку загадаў падпаліць езуіцкі Collegium, з-за чаго горад заглынуўся ў дыму, а потым таксама і замак, і разам зь ім звыш тысячы палякаў; калі ўзгаданы ўцякаючы камендант пакінуў фіціль у адным з сутарэньняў,

!старонка 95!

ад чаго ўзарваўся порах; як стаіць у адным друкаваным дакладзе; і там таксама паведамляецца, што каля ракі Руднік, у ваколіцах горада, кароль Швэцыі быў моцна атакаваны палякамі. У іншым дакладзе сустракаецца, што палякі нібыта самі падпалілі некалькі дамоў у замку, і што ў замку засталося і згарэла каля 1200 палякаў: што пацьвярджаюць таксама Франкфурцкія восеньскія Relation гэтага года p. 17: у якіх таксама напісана, што Руднік гэта замак паміж Jaroslaw і Sandomis, пад якім швэды панесьлі істотныя страты; як ужо паведамлялася вышэй.

Severia, горад і цэнтр княства Severien, якое адносюць да Кракаўскага Palatinat, і якое ляжыць каля Сілезіі; там маецца добра ўмацаваны замак, на высьпе надта шырокага возера.

Sialovecia, горад у Сандамірскім Palatinat разам з прыналежным герцагу Радзівілу графствам. Ва ўзгаданым горадзе маюцца прыгожыя будынкі.

Slupecia, мястэчка ў падножжы Лысай гары, якое належыць абату Сьв. Крыжа і ляжыць у Сандамірскім Palatinat. Узгаданая гара стаіць у цэнтры Малай Польшчы, а на ёй знаходзіцца кляштар бенэдыктаў названы ў гонар сьвятога Крыжа праз дрэва, на якім вісеў сам Ратавальнік сьвету, што знаходзіцца там,

!старонка 96!

як яны вераць. Глядзі ніжэй у апісаньні Літвы.

Sulovia, мястэчка ва ўзгаданым ваяводстве, чый абат, з ордэна цыстэрыян, зьяўляецца панам некалькіх вакольных мястэчак.

Sydlovia, мястэчка таксама ў гэтым Palatinat, аточанае старым мурам і ўмацаванае замкам.

Tarnovia, горад у Кракаўскім Palatinat, у кляштарнай царкве якога ляжаць пахаваныя графы Тарноўскія і апошні герцаг Астрожскі, Ёган. За горадам на высокай гары маецца цудоўны замак і пры ім вельмі вялікі сад з жывёламі. У 1656-м годзе гэты горад Тарноў, у 8 мілях ад Кракава, быў пераможаны швэдамі, як пішуць у Франкфурцкіх Relation.

Tencinum, вельмі прыгожы замак на вельмі высокай гары ў ваколіцах Кракава, які належыць графам фон Tenzyn.

Velisca, горад вядомы паўсюль праз свае саляныя шахты, называецца таксама velizki, Vielyzcka і Velicia; пра яго і адну вартую ўзгаданьня гісторыю глядзі ў нашым ранейшым Апісаньні, p. 189 seq., і яшчэ больш пра гэта месца чытаў там у рэгістры. У 1644-м г., 16-га сьнежня, зноўку адбылося вялікае няшчасьце ў гэтых Vilicenскіх рудніках (якія, як лічыць Piasecius

!старонка 97!

p. 505, зьяўляюцца адным з цудаў прыроды ў Europa), у іхных Bonarovianскіх шахтах, як ён іх называе, у якія неасьцярожным чынам кінулі частку конскага корму, які трапіў на агонь, што гарэў там унізе гэтай шахты, і загарэўся, ад чаго паўстала жудаснае полымя, якое спаліла рудакопаў, што былі там унізе, разам з конямі. І гэтае полымя заставалася ўвесь наступны 45-ы год і яшчэ далей; што з-за вялікага смуроду і дыму, якія выклікаў гэты пажар, ніхто не мог знаходзіцца ў тых пячорах да вялікіх стратаў Каралеўскага прыбытку, большая частка якога складалася з коштаў тамашняй солі. Ці быў аднак агонь зноўку патушаны ў наступныя часы, я нідзе не знайшоў; хаця ў газэтах пісалі, што швэды нанесьлі гэтым руднікам пэўную шкоду.

Vislicia, горад у Сандамірскім Palatinat, які ляжыць сярод багнаў, там маецца кляштар Canonікаў з квадратнай цэглы, і незьлічонае мноства зьмей і іншых гадаў паўсюль, якія аднак не чыняць шкоды тамашнім жыхарам, пасьля таго як яны былі заклятыя Рымскім папам, як сьведчаць registrirаваныя тэксты; піша Simon Starovolscius у сваёй Polinia, p. 28.

Visnica, Віжнец, замак у Кракаўскім Palatinat у адной мілі ад мястэчка Бохна, які быў захоплены каралём Швэцыі

!старонка 98!

21-га верасьня 1655-га г.; як пішуць у Франкф. Relation; гэта таксама пацьвярджаецца ў Ляйпцыгскім, дзе ён названы Вішніц.

Жывіц, мястэчка і замак каля Сілезіі, які швэды ў 1656-м г. захапілі і абрабавалі, і падпалілі некаторыя месцы; як пішуць у Франкф. Восеньскім Relation пазначанага году; і ў іх таксама пішуць, што яны абрабавалі і падпалілі мястэчка Сеўбуш, у ваколіцах Кракава каля Яблункі; аднак палякі яго патушылі. Што да вышэй узгаданага Жывіца, то біскуп Piasecius піша, p. 368, што каралева Польшчы Constantia ў 1624-м г. набыла ў Nicolao Komorowski Жывіцкае графства, якое цягнецца ў даўжыню на 10, а ў шырыню на 6 нямецкіх міляў і знаходзіцца паміж сілезскай і вянгерскай мяжой, прымыкае да зямлі Маравіі, ад Кракава аднак знаходзіцца ў васьмі мілях; і гэтае набыцьцё каштавала звыш 60 тысяч польскіх гульдэнаў.

III. Lituania Літва, з Палесьсем
і Падляшшам, ці Podlachia,
альбо Subsylvania.

Пра гэтае Вялікае Княства паведамляе Сымон Starovolscius, што яно ад мяжы Люблінскага ваяводства, што ў Малай Польшчы, да межаў Ліфляндыі ў даўжыню мае да 90 нямецкіх

!старонка 99!

міляў, а ў шырыню звыш 40, і звычайна падзяляецца на 3 ваяводствы, ці Palatinatus (акрамя таго, што адносіцца да яго ад Русі, пра што далей), а менавіта Vilnensem, Trocensem і Brescianensem.

Vilnenскае, ці Вільдзенскае ваяводства цягнецца да Масквы і мае акрамя сталіцы Vilna разам з гарадамі Руднік, Ліда, Osmiana (цэнтры сваіх раёнаў) і Bierze амаль толькі драўляныя мястэчкі. Trocenскае ваяводства ўключае гарадзенскую зямлю, што прыпісвае да яго таксама і Volcoviscenскі раён. Там знаходзяцца гарады Troki, Grodna &c. Brescianenскі Palatinat мяжуе з Люблінскім і мае драўляныя, альбо пабудаваныя з дрэва, гарады, асабліва Cameneciam, Cobriniam, Janoviam (якія маюць замкі), Voiniam, Rososiam, Ulodavam, Bialam і іншыя, зусім маленькія; акрамя самой сталіцы Brescia, зьнізу. Pinscenскі раён, вельмі вялікі, аднак запоўнены лясамі і багнамі, належыць да гэтага Palatinat, хаця і мае сваю уласную ўладу. Сталіцай яго зьяўляецца горад Pinscum. Гэта ўсё са Starovolscio. Глядзі наша ранейшае Польскае Апісаньне, на 17-й і наступных старонках, і пра жыхароў гэтай зямлі на 40-й і 44-й; аднак пра ўзгаданы Пінскі раён (які інакш называецца Podlesia і Polesio) разам з Podlachia, ці Podlassia (што знаходзіцца паміж Мазовіяй і Літвой, у

!старонка 100!

у духоўным сэнсе цалкам пад уладай Люцэарыйскага біскупа; таксама падзяляецца на 3 раёна: Драгічынскі, Mielnicenскі і Бельзскі, названыя паводле іх 3 сталоці; і мае гарады і мястэчкі: Holovacze, Surasie, Visokie, Sokalovium, Bielsko, Augustow, Tikoczin і Knyssin) на 37-й і наступных старонках. І на пазначаных старонках часткова ўзгадваюцца таксама і характар гэтых зямель.

І Літва асабліва ўрадлівая на збожжа, якога яна прадае надта шмат, нават за мяжу. Найважная рака гэта Chronon, які яны называюць Niemen. Глядзі Poloniam defensam, contra Joan. Barclajum. Паколькі Albertus Wiiuk Kojalowicz[172], S.J. у 1650-м г. выдаў Гісторыю Літвы, да таго як яны зрабіліся хрысьціянамі, і прысьвяціў яе (якую не кожны мае ў руках) пану

[172] Альбэрт (Войцех) Каяловіч (Віюк-Каяловіч) (1609 – 06.10.1677) – беларускі пісьменьнік, палеміст, гісторык. Доктар тэалёгіі (1645). У 1627 уступіў у ордэн езуітаў.

Casimiro Leoni Sapiehæ[173], M. Duc. Litvaniæ Procancellario, Slonimensi, Luboszanensi, Volpensi &c. Gubernatori: то я хачу далей прывесьці тут наступны ўрывак адтуль да майго паведамленьня пра літоўскую гісторыю.

Ён прытрымліваецца аднак меркаваньня, што ў мінулым на гэтых землях жылі Heruli; і кажа, што Літва на роднай мове называецца Littuva, альбо Littuba, і што сярод літоўскіх можна знайсьці шмат лацінскіх словаў; і што таксама ліфляндцы (а менавіта ненямецкія), ці Lotavi, маюць з літоўцамі аднолькавую, зьмешаную з лацінскімі і грэцкімі

!старонка 101!

словамі мову; гэтыя словы, раней чым італьянцы трапілі ў тыя ваколіцы, пра што пойдзе гаворка ніжэй, жыхары гэтых зямель прыцягнулі да дому разам з багатай здабычай, калі яны спачатку як ворагі, але потым як сябры і памочнікі рымлян доўгі час знаходзіліся ў Італіі і Тракіі. І ён разам з іншымі лічыць, што частка герулаў, якія ў мінулым называліся Alani, чыя тэрыторыя, што ляжыць у той частцы Літвы, што бліжэй да Жамайціі, знаходзілася паміж рэкамі Nemeno, Vilia, альбо Neride, і Duna, называлася спачатку Alania, а потым аднак Littalania і Lituania, ад князя Littalano, ці Littuone Малодшага (які жыў пры імпэратары Valentiniano I[174]). Потым калі аланы былі адкінутыя ад Sicambris да Райна і нават цалкам асуджаныя да знішчэньня, важак герульскага войска, Littalanus, пажадаў, каб яны захаваліся на некаторы час. Таму яны ўцякаючы адразу накіравалі да Прусіі, дзе яны былі ветліва прынятыя прусамі, паміж імі аднак потым паўстала варожасьць, калі тыя і тыя памножыліся праз узаемныя шлюбы, між тым яны жылі без улады, пакуль з Alanis, названых потым Lituani, не паўстаў Veidewutas[175], які стаў першым князем прусаў і аланаў. Калі ён памёр, паміж яго сынамі абудзіліся спрэчкі, і малодшы,

!старонка 102!

па імя Littalanus альбо Lituo, які нарадзіўся ад аланкі, прыемнай маці астатніх, быў атакаваны сваімі братамі з цяжкай вайной; таму ён у 373-м годзе хрыстовым павёў увесь аланскі народ з Прусіі і заняў іх старыя тэрыторыі, якія потым атрымалі ад яго сваё сучаснае імя; у Жмудзі, ці Жамайціі, ці Sudinia, якую ў частцы Прусіі таксама называюць Sambiam, уладарыў брат узгаданага Lituonis, Saimo, чый народ, які ад пачатку жыў у гэтай зямлі, увесь час меў з літоўцамі сталае сяброўства. Пасьля таго часу і, што здаецца вельмі падобным да праўды, толькі пасьля 900 году ад

---

[173] Казімер Леў Сапега (15.07.1609 – 19.01.1656) – дзяржаўны дзяяч Вялікага Княства Літоўскага. Каралеўскі сакратар і пісар вялікі, маршалак дворны і падканцлер (з 1645).

[174] Флавій Валентыніян (па лац. Flavius Valentinianus; 321 (320) – 17.11.375) – рымскі імператар у 364 – 375 гг., часта названы проста Валентыніян I. Прыняў на сябе толькі кіраванне заходняй часткай імперыі, а ўсходнюю падаў свайму малодшаму брату Валенту.

[175] Відэвут (ад пруск. Widewuto, Viduutus, Vidvutus, Witowudi, Waidewut) – вялікі кароль з лягенд прусаў, які ўладарыў разам са сваім братам Брутэнам у VI ст. У 573 г. Відэвут і Брутэн вырашылі падзяліць Брутению (Прусію, ад імя Bruteno – Pruteno) паміж нашчадкамі. Тады Відэвут передаў свайму сыну Літуо краіну Літаўэн (Літву).

нараджэньня Хрыстова каля 500 шляхетных італьянцаў, сярод важакоў якіх былі Palæmon, ці P. Libo, з роду Columna, Julianus Dorsprungus, Prosper Cæsarinus Columna, Ursinus і Hector, Rosæ, трапілі па Балтыйскаму мору ў Курляндскі порт, а затым да вусьця Nemeni, ці Chroni (які, пасьля таго як ён зьбірае шмат вады праз Русь, Літву і Прусію, нарэшце разьліваецца на 12 рукавоў), і ўверх па ім прыбылі ў Жамайцію і Літуанію. Аднак ці былі яны выгнаныя з Italia, альбо былі закінутыя туды штормам, ці прадпрынялі гэтае падарожжа з нейкай іншай нагоды, застаецца не вядомым. Яны тады праз сваю дабрачыннасьць і ветлівасьць лёгка зрабіліся сябрамі літоўцаў, што тыя

!старонка 103!

пасьля сьмерці іх князя аднадушна абралі на яго месца вышэй узгаданага Palæmonem. Гэты Palæmon, герцаг Літвы і Жамайціі пакікнуў трох сыноў: Borcum, Speram і Cunassum, ці Cunam; сярод якіх Borcus атрымаў ад айца ў спадчыну княскі сталец, яго спадкаемцам быў Spera, а потым Cunassus, абодва яго браты. Апошні меў 2 сыноў, зь якіх адзін, па імя Kiernus, у 1040-м г. стаў князем Літвы, а малодшы Gimbutus аднак князем Жамайціі. Старэйшы пабудаваў замак Kiernow, які ў мінулым быў сталіцай Літвы, а цяпер аднак з цягам часу зьнік, засталася толькі назва. Ён захапіў Браслаў у Русі, які потым пакінуў паводле літоўскага закону. І паколькі ён не меў сыноў і быў ужо стары, таму ў 1089-м годзе ён узяў замест сына Zivibundum, хлопца з нашчадкаў вышэй узгаданага Juliani Dorsprungi, і даў яму ў жонкі сваю дачку Pojatam, а ў якасьці пасагу – герцагства Літоўскае. Гэты Zivibundus і Montwilo, герцаг Жамайцкі, спусташылі агнём і мячом герцагствы Novogrod, Luceorisien і Volodimirien, аднак пацярпелі моцную паразу ад русінаў. У 1206-м г. літоўцы былі зноўку разьбітыя русінамі. Затым Zivibundus падтрымаў прусаў супраць герцага Конрада ў Мазовіі; у гэтым паходзе у Conrado аднялі зямлю Culmigeria,

!старонка 104!

спусташылі ўсю Мазовію, ці Мазурыю, і спалілі яе найвыбітны горад Plocia. У 1221-м г. Zivibundus памёр пакінуўшы сына Kukovoitem, герцага Літоўскага і Жамайцкага, а той сына Vitenem, ад якога атырмаў імя літоўскі горад Ucianum. Калі ён памёр, яго сын Suintorogus быў амаль яшчэ дзіця, таму Ringoldus герцаг Novogroдскі стаў яго апекуном. Потым узгаданы герцаг Жамайцкі Montwilo пакінуў сына Erdivilum, які, калі ён кіраваў літоўскім войскам, што зьбіралася ў паход на Русь, узьвёў горад Novogrodecum і стаў першым яго герцагам; і яму належылі Novogrodia, Brestia, Grodna і Subsylvania, ці Podlachia; Жамайцію аднак ён перадаў узгаданаму Zivibundo. Ён памёр пасьля атрыманьня вялікай перамогі супраць татар у 1219-м г. пакінуўшы Michaelem, ці Mingailonem у якасьці Novogroдскага князя, які далучыў да свайго княства таксама Polocкую правінцыю ў Русі і пакінуў у якасьці спадкаемцаў Skirmundum і Ginvilonem, той узяў княства Novogrod, а гэты Polocenскае. Skirmundus забраў у русінаў Pinscum і Turoviam, а паслам новага татарскага князя

Balaklai, што патрабавалі даніну, пасьля таго як ён іх належным чынам gastirt, калі яны хацелі ехаць назад, загадаў

!старонка 105!

адрэзаць насы і вушы; затым ён забіў пазначанага Balaklajum падчас сечы; таксама забраў сабе з варожай рукі Mozyrum, Starodubum, Zernichoviam, Karaczoviam і ўсю Severiam; і пакінуў сыноў Lubartum, Pisimundum і Troynatum; яго вышэй узгаданы брат Genvilo пакінуў аднак у Polocia сына Borysum, першага хрысьціяніна сярод літоўскіх князёў. Калі пазначаныя Pisimundus і Lubartus загінулі ў сечы з татарамі, тады іх брат Troynatus накіраваў свайго сына Algimundum ў якасьці герцага да новагародцаў, а сабе прысвоіў спадчыну сваіх братоў, аднак у хуткасьці памёр. Algimundus таксама пасьледваў за ім і пакінуў пасьля сябе вышэй узгаданага Ringoldum, свайго сына і апекуна Suintorogi; між тым Basilius Rechuoldus заняў Полацкае княства, яго дачка Praxedis, якую агульна называюць Poroscovia, у 1273-м годзе была далучаная да ліку сьвятых Папай Gregorio[176]; а яго сын Hlebus, паколькі ня меў дзяцей, пакінуў палачанам у 1235-м годзе поўную свабоду. Пазначаны Ringoldus, які быў нашчадкам Gimbuto герцага Літоўскага, пляменьніка Palæmonis, быў першым, хто назва сябе вялікім герцагам літоўскім, а менавіта абодвух Літвах, Samogitien, Курляндыі, Подляхіі, Новаградзе, Мозыры і ў Pinsco, ці ў Палесьсі, а таксама ў Severien і Czernichovien; хаця гэтыя землі не ўсе належылі яму,

!старонка 106!

аднак добрая частка належыла яго падапечнаму, Suintorogo, які між тым мусіў чакаць, пакуль жыве Ringoldus і яго нашчадкі: каб потым атрымаць, як казалі вышэй, уладу над Samogitien. У 1240-м годзе памёрламу Ringoldus succedirte яго сын Mendogus[177], які на пачатку кіраваньня забіў сваіх бліжэйшых родзічаў, аднак пашкадаваў сваіх пляменьнікаў (ад яго брата), а менавіта Arduri, Vikundi і Cieuciwilonis, ці Theophili[178], якіх ён адправіў на вайну, і якія там атрымалі добры посьпех; і Arduri перайшлі Druciam і частка Smolenscia, Vikundi – Vitepsciam, а Theophili – Polociam. І каб зрабіць сваіх хрысьціянскіх падданых больш прыхільнымі, яны таксама прынялі храсьціянства. Пагэтаму потым паўстала вайна і Polocia, хаця і безвынікова, была абкладзеная Mendogo; і Theophilus з дапамогай арцыбіскупа Рыгі (чыю веру ён прыняў пакінуўшы грэцкую) і высокага магістра Ліфляндыі пайшоў вайной на Mendogum, брата яго айца; той пагэтаму абвесьціў сябе хрысьціянінам і з 600 сваімі найшаноўнымі людзьмі хрысьціўся ў 1252-м годзе і потым быў каранаваны каронай, якую

[176] Грыгорый X (па лац. Gregorius PP. X, свецкае імя Тэабальда Вісконці, па іт. Teobaldo Visconti; каля 1210 – 10.01.1276) – папа рымскі з 01.09.1271 па 10.01.1276 года.

[177] Міндоўг (каля 1195 – 12.09.1263) – першы вялікі князь (кан. 1248 – 1253 і 1261 – 1263) Вялікага княства Літоўскага, першы і апошні кароль літоўскі (1253 – 1261).

[178] Таўцівіл Даўспрункавіч (? – 1264) – князь літоўскі, князь полацкі (~1250-я – 1264).

даслаў яму папа Innocentius IV[179]. Аднак ён зноўку пакінуў хрысьціянскую рэлігію і атакаваў хрысьціянскія землю, разбурыў і спаліў Люблін у Польшчы, як таксама і

!старонка 107!

замак Plociam у Мазовіі, мястэчкі і вёскі ў Прусіі, якія толькі нядаўна былі пабудаваныя, і не пакінуў у жывых ніводнага хрысьціяніна, што адбылося ў 1260-м годзе. Затым ён атакаваў Курляндыю і абклаў на прускай мяжы замак Каршовін; таксама і курляндцы палі перад літоўцамі, і іх тагачасны высокі магістр Ліфляндыі быў моцна разьбіты і застаўся толькі з 150 братамі, альбо рыцарамі. Калі затым у Курляндыі пазначаны замак Каршовін, і таксама замак Гайсбург, былі спаленыя, войскі рушылі ў Samogitien і Прусію, і горад Кёнігсберг, недаўна пабудаваны, быў абкладзены; аднак мужна абараняўся. Прусы аднак зноўку адпалі ад хрысьціянскай веры і Тэўтонскага ордэна і разбурылі цэрквы. І хаця з Нямеччыны прыбыла падрымка, яна была аднак разьбітая прусамі; і ў крыжакоў былі адабраныя Гелцберг, Кройцбург, Кёнігсберг і Бартэнштайн. Кароль Mendogus у 1262-м г. пайшоў на Мазовію, якая была спустошаная разам з добрай часткай Куявіі. У 63-м годзе ён разбурыў Парнаў у Ліфляндыі і біўся са сваімі ворагамі у вусьці Дзьвіны. Пасьля таго ён аднак не доўга пражыў, але быў забіты ў ложку разам з 2 сынамі Ruclio і Repico; і яму, першамі і апошняму каралю Літвы, succedirt сын яго сястры

!старонка 108!

Troynatus[180], герцаг Samogitien (бо яго, Mendogi, трэці сын Volstinicius[181] быў хрысьціянінам і жыў у кляштары); ён, будучы паганцам, напаў на Мазовію і Ліфляндыю і забіў вышэй узгаданага Theophilum, якога запрасіў да сябе; аднак сам быў забіты, калі пайшоў у купальню, не кіраваўшы нават году. На яго месца літоўцы паставілі вялікім герцагам вышэй узгаданага манаха Volstinicum, які ў помсту за сьмерць айца таксама спусташыў Польшчу і Мазовію. Таму Boleslaus Pudicus[182], князь польскі, у сечы амаль зьнішчыў імя Jatwieczyos, ці Jazyges, што дапамагалі літоўцам. Частка іх сялян уцякла да сваіх суседзяў літоўцаў, частка перайшла ў хрысьціянскую веру і стала палякамі, чыя зямля цяпер называецца Subsylvania, альбо Podlachia, і заселеная палякамі, русінамі і літоўцамі. Пазначаны Volstinicus ў 1266-м годзе таксама панёс страты ў

[179] Інакенцій IV (па лац.: Innocentius PP. IV, свецкае імя: Сінібальда Фіескі, граф Лавану, па італ. Sinibaldo de Fieschi); каля 1195 – 07.12.1254) – папа рымскі з роду Фіескі (25.06.1243 – 07.12.1254).

[180] Транята (~1210 – 1264) – князь жамойцкі (? – 1264), вялікі князь літоўскі (1263 – 1264). Упершыню згадваецца пад 1260—1261 гадамі ў Лівонскай старэйшай рыфмаванай хроніцы, калі пад яго кіраўніцтвам Жамойць скінула ўладу немцаў, якім гэтыя землі перадаў Міндоўг.

[181] Войшалк (1223 – 18 або 23.04.1267) – князь навагрудскі (1240-я – каля 1255 і каля 1258 – 1264), вялікі князь літоўскі (1264 – 1267). Сын Міндоўга, вялікага князя літоўскага, караля літоўскага. Пашырыў тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага за кошт уключэння усходнебалцкіх зямель Нальшчаны і Дзяволтва. Заснаваў Лаўрышаўскі манастыр.

[182] Баляслаў V Сарамлівы (Калішскі; па пол. Bolesław Wstydliwy; 21.061226 – 07.12.1279) – польскі князь (1243 – 1279), прадстаўнік дынастыі Пястаў. Сын Лешка Белага і Гржыміславы Луцкай.

Польшчы і нарэшце праз падман быў забіты ў Русі, калі Leo[183], герцаг Volodimirien, запрасіў яго да сябе. Калі цяпер разам зь ім спыніўся ўвесь палемонаўскі род, то літоўская зямля зноўку перайшла да нашчадкаў Juliani Dorsprungi, а менавіта да вышэй узгаданага Suintorogum, сына Utenis, у якога адняў зямлю яго апекун Ringoldus. Ён быў ужо 96 год узростам, аднак у той час, калі ён стаў вялікім герцагам, ён меў аднаго сына, унукаў і аднаго

!старонка 109!

дарослага праўнука; і яго сын Giermondus быў амаль 60 гадоў узросту, калі succedirte яму; ён спусташыў Volyniam, русінскую правінцыю, заснаваў горад Gervat, ваяваў у Польшчы, Прусіі і Ліфляндыі і памёр у 1275-м г. На яго месца вялікім герцагам літоўскім стаў яго старэйшы сын Giliginus, яго брат Trabo аднак стаў герцагам Samogitien. Аднак у 1278-м годзе пазначаны Giliginus, а цягам года памёр і яго сын Romundus, памёр. І такім чынам да ўлады прыйшоў пазначаны Trabo, ён аднак не пражыў і года, і замест яго вялікім герцагам стаў альбо яго сын, альбо ўнук, Narimundus, які вылучыў сваім братам іх рэзыдэнцыі ў Літве, а калі ён у 1281-м годзе зноўку забраў у Польшчы землі Падляхіі, то перадаў іх свайму малодшаму брату Troideno[184], які таксама succedirte яму ў Літве; аднак іншы брат, па імя Daumondus[185], які захапіў сабе горад Pólocíæ, загадаў закалоць яго па дарозе да купальні 6-ці наёмным забойцам пад выглядам сялян, якія нібыта хацелі нешта прасіць; але сам ён быў таксама забіты сынам Troideni Lauro. Знаць Літвы выбрала потым гэтага Laurum сваім князем, ён аднак адхіліў гэта і прапанаваў замест сябе Vitenem[186], які быў маршалам вышэй узгаданага Troideni і нашчадкам Cæsarini Columnæ, які, як паведамлялася вышэй, прыбыў разам з Palæmone ў Літву з Italia;

!старонка 110!

а ўзгаданы Laurus застаўся манахам да свайго скону.

То цяпер Vitenes, з Samogitien, стаў вялікім герцагам і вёў шмат войнаў у Польшчы і Прусіі, хаця меліся розныя князьья з папярэдняга герцагскага роду, адкуль быў таксама і Pelussa, які пасяліўся ў Прусіі і назваўся вялікім герцагам. Ён, калі даведаўся, што вялікія паны з усёй Літвы былі запрошаныя нейкім князем на вясельны пір, атакаваў гасьцей сярод ночы са сваімі і некалькімі атрыманымі ад Тэўтонскага ордзена рыцарамі, і толькі з вялікіх паноў, акрамя іншых, забіў 70 чалавек; жаніха аднак разам з нявестай і іншымі шаноўнымі кабетамі і таксама з вельмі вялікім рабункам

---

[183] Леў Данілавіч (каля 1228 – каля 1301) – князь Перамышльскі (1240 – 1301), Белзскі (1245 – 1269), Холмскі і Галіцкі (1264 – каля 1301, да 1269 разам з братамі Шварнам Данілавічам і Мсціславам), князь Валынскі (пасля 1292). Военачальнік і дыпламат. Другі сын Данііла Раманавіча Галіцкага, з валынскай галіны Рурыкавічаў.

[184] Трайдзень, Трайдзен (? – 1282) – вялікі князь літоўскі (1270 – 1282). Вёў зацятую барацьбу з Тэўтонскім ордэнам і Галіцка-Валынскім княствам, здолеў утрымаць Вялікае Княства Літоўскае практычна ў тых самых межах, у якіх атрымаў.

[185] Даўмонт (? – 05.08.1285) – меркаваны вялікі князь літоўскі (1282? – 1285). На думку гісторыкаў, мог быць сынам і непасрэдным пераемнікам Трайдзеня.

[186] Віцень (? – 1315/1316) – вялікі князь літоўскі (каля 1294 – 1315/1316).

даставіў да сябе ў Кёнігсберг. І праз гэта няшчаснае сьвята амаль усе шляхетныя роды Літвы альбо загінулі, альбо трапілі ў палон, і на адным месцы быў абрабаваны амаль увесь той край, бо кожны зь гасьцей хацеў выглядаць велічна і прыцягнуў туды лепшыя свае рэчы. Хаця Vitenes дастаткова адпомсьціў Тэўтонскаму ордзену, і таксама адзін літовец, які выдаў сябе за жанчыну і быў узяты на прускі карабель, і з дапамогай іншых забіў усіх, хто там быў. І потым ён ладзіў моцныя войны ў Прусіі, Польшчы і Ліфляндыі;

!старонка 111!

хаця Тэўтонскі ордзен таксама нарабіў літоўцам дастаткова шкоды, і ў 1311 годзе Vitenes з-за блюзнерства і жудасных учынкаў у Прусіі быў, праз Боскае пакараньне, цяжка паранены ў галаву крыжакамі, а яго войска было разьбіта, што ён ледзь уцёк з 2 сваімі паплечнікамі. У 1315-м годзе Vitenes у апошні раз пайшоў на Прусію, аднак мала чаго дасягнуў і памёр, калі зноўку вярнуўся ў Літву, і яго ўлада доўжылася 22 гады.

За ім быў яго сын Gediminus[187], які ў 1316-м годзе скарыстаўся таратармі супраць крыжакоў, потым ён атакаваў Русь, рознымі чынамі атрымаў перамогі і таксама захапіў Volyniam, а потым накіраваўся ў Severien ды ў 1322-м годзе ў Ліфляндыю. У 1326-м годзе літоўцы аказалі падтрымку палякам супраць маркграфа Вальдэмара Брандэнбурзскага[188]; і таксама ў 27-м годзе сын Gedimini, Olgerdus[189], абклаў горад Франкфурт на Одары. У 1329-м годзе Gediminus быў падстрэлены ў чарговай вайне супраць Тэўтонскага ордэна (які тады ўпершыню выкарыстаў нядаўна адкрытыя гарматы, якія літоўцам былі яшчэ невядомыя), быў прывезены ў яго новы горад Vilnam і спалены паводле паганскага звычая на полі Suintoroha. Яму спачатку succedirt яго малодшы сын Jawnutus[190], якога аднак прагналі браты, і на яго месца вялікім герцагам стаў Olgerdus,

!старонка 112!

які ў 1330-м годзе люта спусташыў Прусію, потым пасьпяхова ваяваў з татарамі, а ў 1332-м годзе таксама перамог маскавітаў, дайшоў да Масквы і затым заключыў мір з герцагам Дзімітрыям[191], які будучы хрысьціянінам і прыхільнікам грэцкай рэлігіі падараваў яму пасхальнае яйка ўпрыгожанае разнастайнымі фарбамі. У наступны час Olgerdus зноўку ваяваў з Прусіяй і Польшчай, у чым яму быў верным паплечнікам яго брат Kieystutus[192], які з-за гэтага некалькі разоў трапляў у палон.

---

[187] Гедзімін, (~1275 – 1341) – вялікі князь літоўскі (~1316 – 1341). У яго часы Вялікае Княства Літоўскае зрабілася моцнай ўсходне-еўрапейскай дзяржавай, яго тэрыторыя павялічылася ўдвая.

[188] Вальдэмар Вялікі (па ням. Waldemar, Markgraf von Brandenburg; каля 1280 – 14.08.1319) – в 1309 – 1319 гг. маркграф Брандэнбурга з роду Асканіяў.

[189] Альгерд (~1295 – 05.1377) – вялікі князь літоўскі (1345 – 1377).

[190] Яўнут (у праваслаўі Іван; каля 1308 – пасля 1366) – вялікі князь літоўскі (1341—1345). Сын Гедзіміна. Родапачынальнік князёў Заслаўскіх.

[191] Дзьмітрый Іванавіч (12.10.1350 – 19.05.1389) – вялікі князь маскоўскі (з 1359) і уладзімірскі (з 1363). Сын князя Івана ІІ Чырвонага і яго другой жонкі княгіні Аляксандры Іванаўны.

[192] Кейстут Гедзімінавіч (~1297 – 15.08.1382) – вялікі князь літоўскі (1381 – 1382). Сын Гедзіміна ад другога шлюба, малодшы брат Альгерда.

І гэткая разнастайная вайна працягвалася пакуль Olgerdus быў жывы; памёр ён нарэшце ў 1381-м годзе ў высокім узросьце пасьля таго, як абвясьціў вялікім герцагам свайго сына Jagelonem[193], што быў яму найлюбым. Яго іншыя сыны ад дзьвух жонак (сярод якіх Uliana[194], хрысьціянка, была дачкой князя Vitepsciorum) былі: 1. Volodimirus[195], герцаг Kijovia, ад якога пайшоў Olelko[196], ці Аляксандр, князь Слуцкі; 2. Joannes Zedzevitus[197], герцаг Падольскі; 3. Simon Languinus[198], герцаг Mscislaўскі; 4. Andreas Wigundus[199], ад якога пайшлі герцагі Трубецкія; 5. Constantinus[200], герцаг Czernicovia, ад якога потым пайшлі герцагі Czartorienскія; 6. Theodorum Lubartus[201], айцец Sanguszkorum[202], ад якога пайшлі герцагі Kovelscii і Koszyrscii; 7. Skirgello[203]; 8. Swidrigelo[204]; 9.

!старонка 113!

Korybutus[205], ад якога бяруць сваё пахожаньне роды герцагаў Zbarascii і Wisniewiecii; 10. Demetrius[206], айцец герцага Koreciorum; 11.

---

193 Ягайла, у каталіцкім хрышчэнні Уладзіслаў, магчыма, ахрышчаны ў праваслаўе як Якаў (па пол. Władysław II Jagiełło; 1352 – 01.06.1434) – князь віцебскі, вялікі князь літоўскі (1377 – 1392), кароль польскі (1386 – 1434) – спачатку разам з жонкай Ядвігай да 1399, а потым аднаасобна – і вярхоўны князь літоўскі (1392 – 1434). Першы сын Альгерда ад Юльяны Цвярской.

194 Юліянія Цверская (? – восень 1392) – княжна цверская, вялікая княгіня літоўская – 2-я жонка Альгерда.

195 Уладзімір (да 1344 – паміж 12.10.1398 і 12.8.1399) – вялікі князь кіеўскі (да 1367 – восень 1394), князь капыльскі (1395 – пасля 12.10.1398). 4-ы сын Альгерда ад Марыі Віцебскай.

196 Алелька (Аляксандр) (? – 1454) – князь слуцкі і капыльскі (пасля 1398 – 1440), князь кіеўскі (1440 – 1454).

197 Ян Жэдзевіт, некаторыя лічаць яго сынам Фёдара Карэатавіча.

198 Лугвен-Сымон, Лонгвін-Сямён, Лангвен, Лугвень (каля 1355 – 1431) – чацвёрты сын Альгерда ад Юліяны Цвярской, князь мсціслаўскі (1392 – 1431).

199 Андрэй, Андрэй Полацкі (каля 1320 – 12.08.1399) – князь пскоўскі, князь полацкі (1348 – 1387), некаторы час тытулаваўся вялікім князем полацкім і вялікім князем рускім. Старэйшы сын Альгерда і яго першай жонкі Марыі Віцебскай.

200 Канстантын Чартарыйскі (па пол. Konstanty Czartoryski; памёр паміж 1388 і 1392) – дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, заснавальнік рода Чартарыйскіх.

201 Фёдар (каля 1324/1326 – паміж 10.02.1394 і 1400) – удзельны князь ратненскі, любомльскі і, верагодна, кобрынскі з дынастыі Гедымінавічаў. Традыцыйна Фёдор лічыцца малодшым сынам Альгерда ад Марыі Віцебскай.

202 Сангушка, вядомы як Сангушка Федкавіч (памёр 1455) – дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, князь ратненскі і кашырскі (1433 – 1455).

203 Скіргайла (каля 1354 – 23.12.1394?) – князь полацкі, трокскі і кіеўскі ў ВКЛ. Другі сын Альгерда ад Юльяны Цвярской.

204 Свідрыгайла, у каталіцкім хрышчэнні Баляслаў (паміж 1369 і 1376 – 10.02.1452) – вялікі князь літоўскі. Малодшы сын Альгерда ад Юльяны Цвярской.

205 Карыбут (пам. пасля 1404) – князь з дынастыі Гедзімінавічаў. Трэці сын Альгерда ад Юльяны Цвярской.

206 Дзмітрый (пам. 12.08.1399) – удзельны князь бранскі, старадубскі і трубчэўскі з дынастыі. Сын Альгерда ад Марыі Віцебскай.

Vigundus[207], які быў названы Basilius, калі перайшоў да грэцкай рэлігіі, аднак у хуткасьці потым, калі прыняў рымскую, быў названы Alexander, і быў герцагам Severia і Kiernovia. Узгаданы Kieystutus меў таксама 6 сыноў: 1. Vitoldum[208]; 2. Patricum[209]; 3. Totivilum[210], ці Theophilum; 4. Sigisdum, ці Sigismundum[211]; 5. Andream Woydatum[212], ці Harbatum; 6. Dougothum[213].

Цяпер аднак я пераходжу да новага вялікага герцага, Jagelonem, які аддаў сваю сястру Mariam[214] у жонкі Woidiloni[215], чалавеку зусім нізкага стану, які аднак меў пры ім вялікую ласку; што раззлавала пазначанага Kieystutum, які меў заслугі перад усёй Літвой. Таму Woidilo гэтак абгаварыў яго перад Jagelone, што той задумаў забіць яго, узгаданага брата свайго айца, разам з яго дзецьмі; пра што аднак Kieystutus даведаўся і схапіў Jagelonem у палон, а Woidilonem павесіў. Яго сын Vitoldum, найверны сябар Jageloni, угаварыў айца, каб той падараваў Jageloni жыцьцё і перадаў яму 2 герцагства, і сярод іх таксама Vitepscae, якое належыла яго маці, разам з усімі грошамі і вялікай скарбніцай, якую ён Kieystutus знайшоў у замке Vilna.

!старонка 114!

Але Jagelo хітрасьцю захапіў Kieystutum у свае рукі і мужны князь быў задушаны ў вязьніцы; яго сын Vitoldus аднак праз вернасьць сваёй супружніцы Annæ[216], якая з 2 прыслужніцамі атрымала дазвол наведаць яго ў вязьніцы, пад вечар выбраўся з вязьніцы пераапрануўшыся ў вопратку адной прыслужніцы і ўначы трапіў цераз муры ў Krevo, дзе знайшоў каня, на якім

---

207 Віганд (каля 1372 – 28.06.1392) – князь кернаўскі, сын Альгерда Гедзімінавіча ад другой шлюбу з Юльянай Цвярской, малодшы брат і паплечнік вялікага князя літоўскага Ягайлы.

208 Вітаўт-Аляксандр (~1350 – 27.10.1430) – князь гарадзенскі (1370 – 1382), князь луцкі (1370 – 1382), вялікі князь літоўскі (1392 – 1430). Абвешчаны кароль гусітаў. Сын Кейстута, пляменнік Альгерда і стрыечны брат Ягайлы. Адзін з найбольш вядомых кіраўнікоў Вялікага Княства Літоўскага, яшчэ пры жыцці празваны Вялікім

209 Пацірг (1325? – 1365?) – старэйшы сын Кейстута. Разам з бацькам удзельнічаў у бітвах з крыжакамі, у 1365 г. бараніў ад іх Гародню, дзе быў намеснікам. Затым быў пераведзены ў адзін з унутраных удзелаў і больш у крыніцах не згадваецца.

210 Таўцівіл, у хрышчэнні Конрад (каля 1355 – 09.1390) – сын Кейстута. Актыўны прыхільнік Вітаўта ў міжусобнай вайне з Ягайлам.

211 Жыгімонт (~1365 – 20.03.1440) – вялікі князь літоўскі (1432 – 1440). Малодшы сын Кейстута.

212 Войдат (XIV ст. – пасля 1401) – сын Кейстута. Надзейнымі крыніцамі ўзгадваецца толькі двойчы.

213 Доўгат.

214 Марыя (каля 1363 – пасьля 1382) – дачка Альгерда ад Юльяны Цвярской. Каля 1379 г. была выдадзена сваім братам Ягайла замуж за яго фаварыта Вайдылу.

215 Вайдыла (па пол. Woidiło; пам. 1381) – радца вял. кн. літоўскіх Альгерда і Ягайлы, староста лідскі (1373 – 1381). Паводле летапісаў, Вайдыла быў пекарам, вызначаўся розумам і быў набліжаны вял.кн. Альгердам, служыў яму пасцельнічым і краўчым, стаў найбліжэйшым радцам. Па смерці Альгерда захаваў высокае становішча пры двары Ягайлы, які ў 1379 выдаў замуж за Вайдылу сваю сястру Марыю, што разгневала Ягайлава дзядзьку Кейстута. У пачатку грамадзянскай вайны Вайдыла быў схоплены Кейстутам і павешаны. Ягайла адпомсціў за яго, пакараўшы смерцю Відзімонта і Бутрыма, сваякоў Кейстутавай жонкі Біруты.

216 Ганна Святаслаўна (? – 31.08.1418) – вялікая княгіня літоўская, жонка Вітаўта.

уцёк у Мазовію, а потым у 1383-м г. у Прусію; а затым з дапамогай прусаў і жамойтаў напаў на Літву. Таму Jagelo зноўку замірыўся зь ім, пакінуўшы яму Grodnam, Volkoniscum і Brestiam, і яны такім чынам зноўку сталі лепшымі сябрамі.

У 1384-м г. Jagelo прайшоў па Мазовіі і Сандаміру і праз разумнасьць Радзівіла, які ўзначальваў літоўскіх вершнікаў, з агнём захапіў замак Завіхвост; а потым спусташыў Малую Польшчу і абрабаваў храм Каленберга, перацягнуў адтуль у Vilna частку сьв. крыжа, аднак зноўку вярнуў на месца; бо той, хто яго кранецца, павінен атрымаць ад яго шкоду; як распавядае Autor p. 381, і раней таксама піша p. 342 seq., што калі пасьля сьмерці караля Польшчы Casimiri літоўцы скралі той самы сьв. крыж, то немагчыма было зрушыць з месца воз, дзе ён знаходзіўся, таму ён быў зноўку адасланы назад. Затым Jagelo адправіў паслоў да новая каралевы польскай, паненкі Ядвігі[217],

!старонка 115!

і прапанаваў ёй шлюб, які хаця і не быў прыемны для яе, аднак быў прыемны для палякаў; пагэтаму яна нарэшце прыняла яго, і ў 1386-м г. Jagelo прыбыў у Кракаў, дзе быў хрышчоны арцыбіскупам Гнэзенскім, атрымаў імя Uladislaus і быў каранаваны каралём Польшчы. Між тым Andreas Vigundus, яго, караля, брат, падняў непарадкі ў Літве і захапіў моцны замак Лукомля, яму таксама дабравольна здаліся Druja, Drissa і Polocia; хаця Лукомля зноўку была ўзятая літоўцамі, горад Mstislavia быў вызвалены, Polocia занятая, а герцаг Andreas Vigundus быў адасланы да караля, а Suentoslaus[218] герцаг Smolensco, які хаця і марна, але атакаваў вайной гарады Vitepsiam і Orszam і прынёс краю шмат кшоды, быў заколаты; яго сын Georgius[219] трапіў аднак у палон, і такім чынам уся Русь была супакоена. Пазначанаму Georgio зноўку вярнулі Смаленскае княства яго айца, пасьля таго як ён даў клятву вернасьці вялікаму герцагу Літоўскаму. Затым кароль Jagelo Uladislaus з каралевай прыбыў з Польшчы ў Vilna, дзе ён трымаў сойм, які скасаваў паганскае ідалапаклонства, заснаваў у Vilna біскупства; прыклаў усе намаганьні каб нават просты люд прывесьці да хрысьціянскай веры, аб’ехаў усю Літву і талкаваў народу Сьв. Пісаньне на іх роднай мове; паколькі дасьведчаных у гэтым

!старонка 116!

[217] Ядвіга Анжуйская (03.10.1373/18.02.1374 – 17.07.1399) – каралева польская (1384 – 1399). Дачка караля венгерскага і польскага Людовіка Венгерскага і Лізаветы Босніяцкай. На каралеўскі сталец абрана пасля смерці бацькі – у 1384, польскія магнаты абвясцілі яе каралевай. У 1385 яна заключыла г.зв. Крэўскую унію. У 1386 годзе была выдадзена замуж за Ягайлу. Была беатыфікавана Каталіцкім Касцёлам ў 1986, кананізавана ў 1997.

[218] Святаслаў Іванавіч (? – 29.04.1386) – вялікі князь смаленскі з 1358 г. Сын вялікага князя смаленскага Івана Аляксандравіча. У пачатку 1380-х г. Святаслаў Іванавіч каардынаваў сваю знешнюю палітыку з князем Андрэем Полацкім. У 1386 г. разам з ім пачаў барацьбу супраць Вільні. Пасля няўдалай аблогі Віцебска і Оршы спрабаваў узяць Мсціслаў. 29.04.1386 пад сценамі горада адбылася бітва з падышоўшым войскам ВКЛ, у якой Святаслаў Іванавіч быў забіты.

[219] Юрый Святаславіч (? – 14.09.1407) – вялікі князь смаленскі (1386 – 1392; 1401 – 1404), князь ноўгарадскі (1404 – 1406/07), наваторжскі (1407).

сьвятароў не было пад рукой. Калі ён зноўку вярнуўся ў Vilna, ён аддаў сваю сястру Alexandram[220] ў жонкі герцагу Мазовіі Semovito[221], ад якой ён нарадзіў Cymbyrcam[222], супружніцу эрцгерцага аўстрыйскага Эрнста[223] і маці імпэратара Friderici[224]. Аднак перад тым як Jagelo накіраваўся адтуль назад у Польшчу, ён з ухваленьня найшляхетных паноў прызначыў замест сябе вялікім герцагам Літоўскім Skirgelonem, ці Skirgailum (свайго брата), які пасьля хрышчэньня ў Кракаве быў названы Казімірам, аднак пры ўмове, што найгалоўная ўлада над Літвой застанецца за ім, каралём Jagelone. Аднак у той час, калі ён стаў каралём у Польшчы, да Літвы належылі: сама пазначаная зямля, разам з Samogitia, Polesia, Podlachia, Vitebsia, Polocia, Smolenscia, Mscislavia, Severia, Kijovia, Volynia і частка Падоліі, як паведамляе вышэй узгаданы Autor p. 399 і завяршае гэтым сваю першую частку. Што аднак далей адбывалася ў Літве, ён абавязаўся паведаміць у другой частке, якая верагодна, але я пра гэта ня ведаю, ужо таксама была надуркаваная. Між тым у нашым ранейшым Польскім апісаньні p. 17 & seqq. можна трошкі прачытаць пра тых рэгентаў, якія ішлі пасьля Jagelonem. Коратка аднак прывядзем іх і тут: то пазначаны Skirgelo Casimirus ужо быў, і замест яго вялікім герцагам у 1392-м г. стаў раней узгаданы Vitoldus, сын Keistuti;

!старонка 117!

пасьля яго аднак брат караля Jagelonis, Suidrigelo, а калі яго выгналі – Жыгімонт, сын Keistuti; і, пасьля таго як ён быў забіты, Казімір, сын шмат разоў узгаданага караля Jagelonis Uladislai, потым яго брат Аляксандр, а пасьля яго вялікім герцагам у Літве стаў іншы брат, а менавіта Жыгімонт I кароль Польскі; ад таго часу і далей Літва нязменна заставалася пры Польшчы. Я цяпер вяртаюся да найвыбітных месцаў, якія адносяцца да Літвы, акрамя тых, што ніжэй прыведзеныя ў апісаньні Русі; такім чынам тут маюцца:

---

[220] Аляксандра (~1360 – 20.04. ці 19.06.1434) – літоўская княгіня, дачка Альгерда ад Юльяны Цвярской. У шлюбе з Земавітам IV нарадзіла 12 дзяцей.

[221] Земавіт IV Плоцкі ці Куяўскі (па пол. Siemowit (Ziemowit); 1352 – 21.01.1426) – князь раўскі (1373/1374 – 1426), плоцкі (1381 – 1426), візненскі (1381 – 1382, 1401 – 1426) і белзскі (1388 – 1426), прадстаўнік Мазавецкай лініі Пястаў. Малодшы сын князя плоцкага і раўскага Земавіта III ад першага шлюбу з сілезскай князёўнай Эўфіміяй Апольскай.

[222] Кімбурга (Цымбарка) Мазавецкая (па пол. Cymbarka Mazowiecka; 1394 ці 1397 – 28.09.1429) – дачка Земавіта IV, герцага Мазавецкага з рода Пястаў, у шлюбе – эрцгерцагіня Аўстрыйская.

[223] Эрнст Габсбург (15.06.1553 – 20.02.1595) – эрцгерцаг Аўстрыі, сын імператара Максіміліяна II Габсбурга і Марыі Іспанскай. Два разы, у 1573 і 1587, з'яўляўся кандыдатам на трон Рэчы Паспалітай. У 1592 атрымаў ад караля Жыгімонта III Вазы прапанову ўзяць на сябе паспалітую карону.

[224] Фрыдрых III (па ням. Friedrich III.; 21.09.1415 – 19.08.1493) – кароль Германіі (рымскі кароль) з 02.02.1440 (пад імем Фрыдрыха IV), імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі з 19.03.1452 г., эрцгерцаг Аўстрыйскі з 23.11.1457 г. (пад імем Фрыдрыха V), герцаг Штырыі, Карынтыі і Крайны з 1424 г., кароль Венгрыі (намінальна) з 17.02.1458 па 17.07.1463 года, прадстаўнік Леапальдзінскай лініі дынастыі Габсбургаў, апошні імператар, каранаваны ў Рыме, і аб'яднальнік аўстрыйскіх земляў.

Augustow, горад у Падляхіі, пабудаваны каралём Польшчы Sigismundo Augusto. Польск. Ап. 60.

Biala, горад у Літве, дзе герцагі Радзівілы маюць вельмі прыгожы палац; так таксама заснаваная вышэйшкая школа, у якую запрашаюцца з Кракава настаўнікі па ўсім навукам.

Bielsco, горад у Podlachia, які лічыцца сталіцай свайго края, хаця мае толькі драўляныя будынкі; у астатнем аднак стаіць на рацэ Biala.

Bierze, горад у Літве разам з вельмі моцным замкам, што належыць герцагам Радзівілам; некаторыя з якіх яшчэ нядаўна належылі да абодвух рэлігій: рымска-каталіцкай і рэфармісцкай. У 1614-м г. Matthæus Raderus[225] прысьвяціў свой Viridarium Sanctorum тром сынам пана

!старонка 118!

Nicolai Christophori Radzivili[226], герцага Olyca, Niesviesio, князя Сьв. Рым. Імпэрыі, ваяводы Vilna, графа Szydlowiec і Mir, рыцара Ерусаліма: Joan. Georgio[227], Adalberto Wladislao[228] і Christoph. Nicolao Radzivilis. У 1656 годзе у Гданьску восеньню памёр адзін герцаг Радзівіл[229], які быў вялікім канцлерам Літвы: герцаг, пан Boguslav Radzivil[230], аднак, трымаўся тады ў Прусіі са швэдамі над брандэнбурзскімі войскамі. У 1625-м г. кароль Швэцыі захапіў узгаданы моцны замак Bierze належны герцагу Крыштафу Радзівілу[231] і вывез адтуль у Рыгу 60 металёвых гармат; за гэта літоўцы праз дамову аб абмене аддалі швэдам Laudanum.

---

225 Матэуш Радэр (па ням. Matthäus Rader; пачатак 1561 – 22.12.1634) – нямецкі езуіт, філолаг і гісторык.

226 Мікалай Крыштаф Радзівіл “Сіротка” (1549 – 1616) – магнат, дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, мецэнат, пісьменнік. Сын пачынальніка Рэфармацыі ў ВКЛ, князя Мікалая Радзівіла Чорнага. Разам з братамі Альбрэхтам і Станіславам стварыў Нясвіжскую, Клецкую і Алыцкую ардынацыі, быў першым ардынатам на Нясвіжы (1586).

227 Ян Ежы (Юры) Радзівіл (08.01.1588 – 18.12.1625) – дзяржаўны дзеяч ВКЛ. Вучыўся ў езуіцкіх калегіумах у Нясвіжы, Брунсбергу (Браневе), Аўгсбургу; падарожнічаў па Германіі, Італіі. У 1619 выехаў у вялікае замежнае падарожжа, наведаў Германію, Бельгію, Англію, Францыю, Іспанію, Італію. У 1621 запісаўся ва ўніверсітэт у Падуі, а ў 1625 — у Балонні.

228 Альбрэхт Уладзіслаў Радзівіл (16.06.1589 – 20.07.1636) – дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ, мецэнат. З 1609 на чале ўласных атрадаў удзельнічаў у вайне Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600-29. Быў адным з багацейшых магнатаў ВКЛ. Мецэнат, клапаціўся пра пашырэнне галерэі партрэтаў у Нясвіжы.

229 Альбрэхт Станіслаў Радзівіл (мянушка Абаронца Правоў; 01.07.1593 – 12.11.1656) – дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, пісьменнік, гісторык. Літоўскі магнат, князь, падканцлер і канцлер вялікі літоўскі.

230 Багуслаў Радзівіл (03.05.1620 –31.12.1669) – харунжы літоўскі, канюшы літоўскі, генеральны губернатар Прускага герцагства. У 1656 г. разам з Янушам Радзівілам з'яўляўся ініцыятарам Кейданскай уніі – пераходу ВКЛ пад пратэктарат Швецыі. Перайшоўшы да шведаў, узначальваў брандэнбургскую армію на тэрыторыі Прусіі (1657 – 1658), пасля вярнуўся на бок Рэчы Паспалітай і ваяваў супраць Швецыі ў Курляндыі.

231 Крыштаф Радзівіл “Пярун” (09.02.1547 – 20.11.1603) – сын Мікалая Радзівіла Рудога, вялікі гетман літоўскі, ваявода віленскі, кашталян троцкі, гетман польны літоўскі, вялікі падчашы літоўскі, староста кокенгаўзенскі, салецкі, жыжморскі, барысаўскі.

Borisovia, Borissow, мястэчка на рацэ Beresina ў Літве, якое маскавіты з гвалтам захапілі ў ліпені 1655-га г.

Brescia, Brestia, сталіца Брэсцкага палатыната ў Літве разам з замкам, які стаіць на скале паміж рэкамі Буг і Мухавец. За горадам знаходзіцца каралеўскі палац у новым архітэктурным стылі з маляўнічымі садамі; у горадзе аднак маецца езуіцкі Collegium і некалькі кляштараў. Таксама жыды маюць там на ўсю Europa знакамітую школу, куды яны едуць з Валахіі, Нямеччыны, Маравіі, Сілезіі не толькі дзеля вучобы,

!старонка 119!

аднак таксама каб стаць равінамі і па вяртаньні назад да дому ўзначаліць свае школы. Gediminus, вялікі герцаг Літоўскі, з вайной атакаваў у Русі луцкага герцага, Leonem[232], які раней у адсутнасьць пазначанага Gedimini забраў у літоўцаў Brestiam і Drohicio; і захапіў абодва места ў 1319-м г. разам з горадам і ваколіцамі Luceoria. Глядзі пра гэты літоўскі Brescie, Breste, ці Brestia, у ранейшым П.А. p. 66 seqq.

Cauna, адзін з найвыбітных горадоў Літвы, разам з замкам, які мае імя ад герцага Cunasso, ці Cuna, сына Palæmonis. У часы герцага Gedimino прусы захапілі замкі Юрбург і Cauna. У 1362-м г. нямецкія паны ў Прусіі зноўку ўзялі гэты Cauna і разбурылі замак; і 3000 літоўцаў, што знаходзіліся ў гарнізоне, загінулі ў полымі згараючага замка; і потым імі былі зьнішчаныя таксама Pistena і Vielona; і яны ў наступным годзе спусташылі ўсю Літву; таксама Жамайція не ўратавалася ад іх; у 1376-м г. калі літоўцы за дзесяць тыдняў разбурылі ў Польшчы ўсё паміж рэкамі Зан і Вісла, крыжакі з Прусіі ў той час зрабілі надта глыбокі рэйд у Жамайцію і Літву, аднак Cauna на гэты раз

!старонка 120!

быў імі безвынікова абкладзены. Augustinus Limmerus піша, у Ляйпц. Міхаэля дакладах, што маскавіты ў жніўні месяцы 1655-га г. ўзялі Гродна, Койданаў і Коўна, вельмі жудасна лютавалі паўсюль; у Коўна былі спаленыя ўсе цэрквы акрамя адной і жаночы манастыр.

Colainum, першы замак у Літве, што стаіць каля Прусіі на Nemeno, які Тэўтонскі ордэн у 1290-м г. захапіў, а ў наступным годзе зноўку рабіў рэйд у Літву і спаліў гэты замак і захапіў замак Junigedia; між тым літоўцы спусташылі Куявію, а у 1293-м годзе спалілі мястэчка Скаловіч у Прусіі, замак аднак застаўся за крыжакамі, якія захапілі ў Літве замак Mingedinum, а ў наступным годзе таксама і мястэчка Romnove, якое цалкам зьнішчылі; у 95-м г. захапілі яшчэ замак Kimelos у Літве.

Czernihovia, добра ўмацаваны горад у Літве, які ў мінулыя гады быў заняты казакамі, супраць гэтых казакаў пасьпяхова ваяваў герцаг Радзівіл, яны пакінулі Lubeczam, і таксама Czernoblium дабрахвотна здаўся. Глядзі Joachim. Pastorium in Bello Scythico-Cosacico.

Grodna, выбітны горад у Літве на рацэ Cronone, ці Nemeno, які мае высокі замак, некалькі кляштараў, прыгожую фарную царкву

!старонка 121!

---

[232] Леў Галіцкі, Леў Юрьявіч, Леў II (памёр каля 1323) – князь Луцкі, Галіцкі (з 1308 года).

і езуіцкі Collegium; кароль Sigismundus III перакінуў праз пазначаную вялікую раку надта майстэрскія драўляныя масты, падобных якім, як кажа Starovolscius, няма ў Польшчы. У 1283-м годзе Тэўтонскі ордэн, пасьля таго як ён цалкам скарыў прускія народы, пачаў напады на Літву, спусташыў край і захапіў замак Grodna, што каштавала шмат крыві; аднак літоўцы вярнулі яго назад; гэты замак таксама і ў 1306-м годзе прусы не маглі ўзяць, хаця яны разрабавалі і падпалілі гарадок. Глядзі вышэй у апісаньні Cauna і ў нашым ранейшым Польскім апісаньні, p. 116 seqq.

Knisinum, Кнысін, мястэчка ў падляхіі, дзе ў 1572-м годзе памёр кароль Sigismundus Augustus. Глядзі ранейшае Польс. Ап. p. 130.

Merecium, места ў Літве, якое мае вельмі маляўнічае месца зьмяшчэньня, і там злучаюцца дзьве ракі з вельмі гучнай стромай; таму таксама кароль Uladislaus IV перад тым, як ён атрымаў уладу, з асаблівым задавальненьнем спыняўся тут; і таксама памёр нарэшце ў гэтым мястэчку ад ліхаманкі і камянёў 10-га (20-га) траўня 1648-га года.

Pinscum, горад у Літве, чыі гандляры гандлююць у Маскве ды Нямеччыне і большай часткай належаць да грэцкай рэлігіі, і маюць свайго ўласнага бікупа; хаця

!старонка 122!

там таксама ёсьць і езуіцкі Collegium. У нядаўней казацкай вайне гэты густанаселены горад трапіў у іх рукі праз здраду гараджан, як кажа Pastorius, аднак быў зноўку ўзяты літоўцамі і зьнішчаны агнём і мячом як найвыбітны прытулак бунтароў, і таксама каб ён паслужыў для іншых узорам пакараньня нявернасьці.

Rudnicum, Rudniki, мястэчка ў Літве, якое знаходзіцца ў лясах у 4-х мілях ад Vilna, там можна пабачыць вытанчана пабудаваны каралеўскі палац, маляўнічы парк і таму падобнае.

Rzeczycza, мястэчка ў Літве з вельмі добрым месцам зьмяшчэньня, якое казакі ў нядаўняй вайне, калі яны перайшлі раку Pripetum, хацелі атакаваць, аднак перадумалі.

Trocum, Troki, горад і рэзыдэнцыя ваяводы ў Літве, якое знаходзіцца сярод непраходных багнаў, якія нават пры моцных маразах не замярзаюць цалкам, у 4-х мілях ад Vilna; там таксама маецца замак, які добра ўмацаваны, і выява Марыі ў фарнай царкве, якая мусіць рабіць цуды. Starovolscius называе яе B. Virginis miraculis claram[233]. Калі вялікі герцаг Gediminus вярнуўся з русінскай вайны назад у Літву, ён пабудаваў гэты горад і перанёс туды сваю рэзыдэнцыю з Kiernovia, дзе ён знаходзіўся раней; гэта адбылося ў 1321-м годзе. Калі затым вялікі герцаг Jagelo трапіў у няміласьць брата свайго айца, Kieystuto, Jagelo

!старонка 123!

абклаў гэты Trocos, і горад разам з замкам здаліся яму. Augustinus Limmerus піша, у сваіх Ляйпцыгскіх Relation Новага года, за 56-ы год, што ў 1655-м годзе маскавітамі былі цалкам ruinirt Трокі, а вышэй узгаданыя Merecz, Breso і Grodno былі зраўняныя з зямлёй. На палях усё завалена

[233] Сьв. Нявінніцы чысты цуд.

трупамі, жанчын і дзевак яны пагналі ў Маскву нібыта быдла; у Каўна было зраўнянае ўсё акрамя фарнай царквы, з мурамі якой яны не маглі справіцца.

Tykoczyn, на рацэ Narew, мястэчка і замак у Падляхіі, ці Падлесьсі. Вышэй узгаданы Limmerus паведамляе , у Relation Міхайлава рынка ад 1656-га года, што моцны дом Tykoczyn у Падляхіі, які палякі трымалі blocquirt і абкладзеным на парцягу 9 тыдняў, і радзівілаўскія людзі разам з гарнізонам выстаялі 2 штурма, 3-га чэрвеня пазначанага года быў пакінуты Bogislao Радзівілам і генэралам Дугласам з вялікімі стратамі сярод палякаў. Starovolscius называе яго палацам, які стаіць на цьвёрдым месцы сярод багнаў; і кажа, што ў 4-х мілях ад мястэчка Tycocino знаходзіцца вельмі прыгожы замак і царква Bialostocum, і трошкі бліжэй адтуль, у лясох – вельмі заможны манастыр русінскіх манахаў ордэна сьв. Васілія, Supraslum.

Vilna, Вільда, сталіца ўсёй Літвы, якую пачаў будаваць вышэй у падзеле пра Troky ўзгаданы Gediminus пры

!старонка 124!

спалучэньні вод Vilia і Vilna, разам з верхнім і ніжнім замкамі, у 1305-м годзе. Зьяўляецца рэзыдэнцыяй біскупа і ваяводы. Біскупа падпісваецца Dusem Juanum, першым прызначаным сюды ад караля Jagelone Uladislao біскупам быў Vasillo, польскі шляхціц. У цэнтральнай царкве пакоіцца поўнае цела сьв. Cazimiri[234], брата польскага караля Sigismundi Першага, якога папа Leo X[235] далучыў да ліку сьвятых. Кароль Sigismundus III зрабіў яму срэбны саркафаг, вагай у 3000 фунтаў, разам са срэбным алтаром і капліцай з лепшага мармуру. Аднак шмат разоў узгаданы Limmerus паведамляе, калі маскавіты ў 1655-м годзе занялі гэты горад 29-га ліпеня, па стараму календару (як напісана ў Франкфурцкіх Relation), то ўвесь скарб царквы S. Casimiri трапіў у іх рукі, і тут у Вільдзе было забіта каля 15000 чалавек. Бо горад не ўмацаваны, і таксама верхні каралеўскі замак стаіць цалкам закінуты, як Starovolscius паведамляе пра свае часы, верагодна таму, што вялікая колькасьць жыхароў здавалася надта моцнай для ворага; як потым вышэй узгаданы Kojalowicius прыводзіць дзеля хвалы гэтаму гораду на p. 265 таксама наступнае: Ipsa incuriosa munitio contemptum hostium spirat[236]. Вышэй названы кароль Sigismund. III, пасьля таго як ён узяў горад Smolensco, зрабіў тут таксама надта вялікі звон, падобны кракаўскаму, што быў усталяваны там каралём Sigismundo I, і носіць таксама

!старонка 125!

яго імя, які цягнулі 24 моцных мужыка. У той самы час ён заснаваў езуітам прыгожую царкву ва ўэльскім стылі на сярэднім рынку, ці гарадской плошчы,

---

[234] Казімір Казіміравіч, святы Казімір (03.10.1458 – 04.03.1484) – каралевіч польскі і вялікі княжыч літоўскі. Каталіцкі святы, ушаноўваецца каталіцкай царквой як патрон Вільні.

[235] Леў X (па лац. Leo PP. X, сьвецкае імя Джавані Медычы, па іт. Giovanni Medici; 11.12.1475 – 01.12.1521) – папа Рымскі з 11.03.1513 да 01.12.1521 года. Апошні аапа, які не меў святога сану на момант абрання.

[236] Яе бестурботная абарона пагарджае варожымі ўдарамі.

пад імя і аховай пазначанага сьв. Casimiri; аднак іх Collegium на замкавых завулках заснаваў у 1579-м годзе з тытулам Universitet Папа Gregorius XIII[237]; пра гэта таксама можна прачытаць у вышэй узгаданага Albertus Cojalovicius, S.J. яго Universitet Procancellarius, in miscrellaneis rerum ad statum Eccles. in mag. Duc. Litu. pertinentium. У Theologia выкладалі 6 Professores, ці сёмы па габрэйскай мове, Philosophiam – 5, абодва права – 4, і humaniores literas – 7. Належныя да рэфармаванай рэлігіі мелі там таксама вышэйшую школу, ці Gymnasium; але ў іх паводле рашэньня Сойма былі цалкам адабраныя цэрквы і школы, як у арыян у Ракаве, аднак тым, што належаць да грэцкай рэлігіі, пакінулі іх манастыры. У 1378-м годзе падчас вайны памід прусамі і літоўцамі, гэты горад Vilna быў спалены прусамі; аднак вышэй узгаданыя два замкі, разам з некалькімі дамамі гараджан, яшчэ захаваліся. У 1571-м годзе было вялікае падаражаньне, і ў запісах можна знайсьці, што гэтым горадзе Вільдзе ад голаду памёрла 15 000, а ў Мушке за адну ноч 2000 чалавек; і што ў аднаго шляхціца

!старонка 126!

зерне ператварылася ў зьмей; піша М. Тобіяс Шмідт у Цвікаўскай хроніке, pag. 398. У 1578-м годзе кароль Стэфан прыбыў сюды з перамогай над маскавітамі і быў прыняты школьнікамі, што ён лічыў сваім трыумфам, бо яны былі першым вынікам дадзенай ім тутэйшым школам свабоды. Таму што хаця біскуп Vilna Valerianus і прывёў сюды езуітаў і вылучыў ім плошчы, дамы і землі, аднак яны не атрымалі сваім школам пакуль ані каралеўскага пацьвярджэньня, ані таксама імя Academi, як піша Joan. Demetr. Sulokovius p. 123. Пагэтаму потым таксама ў 1579-м годзе, як паведамлялася вышэй, прыбылі confirmation ад Папы, і гэтыя школы затым моцна пашырыліся. У 1610-м годзе увест горад згарэў і потым быў пабудаваны больш прыгожа з мураванымі дамамі. Што тут адбывалася ў 1655-м годзе, было ўжо адлюстравана вышэй; і большасьць цэркваў тады мусіў спасьцігнуць падобны лёс. Глядзі больш пра гэты горад (дзе рабілі прыгожыя гарматы і іншую ваенную зброю, якую вельмі паважалі іншыя) у нашым ранейшым Поль. Апісаньні, pag. 190 да старонкі 201; і пра вялікія хваляваньні ўзьнятыя студэнтамі ў заключэньні дадатка, у другім edition.

Акрамя гэтых апісаных местаў у Літве маюцца таксама іншыя, сярод якіх Zurovicia, якая, як паведамляе Pastorius, славутая праз цуд,

!старонка 127!

што там адбыўся. Таксама Camenecia, ці Kamieniecz, мястрэчка ў Падляхіі, пра якое глядзі ранейшае Польск. Апісаньне, pag. 72. Таксама Bissena, мястэчка, якое было абкладзенае крыжакамі з Прусіі, калі яны ўторгліся ў

[237] Грыгорый XIII (па лац. Gregorius PP. XIII, сьвецкае імя Уга Банкампаны, па іт.: Ugo Boncompagni; 07.01.1502 – 10.04.1585) – папа Рымскі з 13.05.1572 па 10.04.1585 года. Натхніцель контр-рэфармацыі ў еўрапейскіх дзяржавах. Падтрымліваў французскіх католікаў у іх барацьбе з гугенотамі, садзейнічаў узмацненню езуітаў. Імкнуўся пашырыць каталіцызм у Расіі, Японіі, Кітаі. Грыгорый XIII правёў рэформу календара (1582), ад яго імя назва стылю — грыгарыянскі.

Літву супраць герцага Vitenem, са стратамі для іх. Знаходзіцца альбо ў Літве, альбо ў Samogitien.

IV. Жамайція, альбо Samogitia.

Хаця гэтая мясцовасьць у аўтараў не ідзе адразу за апісаньнем Літвы, аднак паколькі яна тут вышэй у апісаньні Літвы была так часта ўзгаданая, бо абмежаваная з поўдня і ўсходу Літвой, а з захаду Прусіяй, а менавіта яе герцагскай часткай, і з поўначы Ліфляндыяй, таму яна мела ў Прускай і Ліфляндскай вайне амаль аднолькавы з Літвой лёс, і частка таксама кіравалася хаця і ўласнымі панамі, але ўсё ж з княска літоўскага роду; таму я пажадаў прывесьці гэтую мясцовасьць тут, адразу пасьля Літвы.

Starovolscius піша аднак пра гэты край, што ён вялікі і ўрадлівы, але цалкам пакрыты лясамі. Мае шмат фогтаў, таксама аднаго вярхоўнага гетмана, шмат гарадоў, як каралеўскіх, так і належных шляхце; яны аднак усе пабудаваныя з дрэва, акрамя Couna, які стаіць на беразе Crononis, ці Nemeni

!старонка 128!

і мае езуіцкі Collegium і кляштар. Біскуп, падданы Рыму, знаходзіцца ў Mednicia. Езуіты маюцца таксама адзін Collegium у Crosis, а браты S. Francisci ад Obserbanz маюць у Cretinga вельмі раскошны кляштар, на беразе Балтыйскага мора, каля якога на поўначы ляжыць гэты край. Для ворыва яны карыстаюцца толькі драўлянымі прыладамі, якія дастаткова цьвёрдыя для зямлі. Дасюль ішло паведамленьне гэтага аўтара. Глядзі наша Польс. Апіс. p. 22 &seqq. і p. 46.

Найвысокая шляхта ў краі мусіць паходзіць ад Cæsarino Columna, які з Palæmone і іншымі прыбыў у Літву з Italia; іншы тамашні народ называецца Eiragolii, з яго пайшоў герцаг Літоўскі Vitenes, астатнія аднак таксама ад пазначанага Columna. У літоўскіх гісторыях узгадваецца замак Oukaimi ў гэтым краі, які прусы ў 1301-м годзе захапілі праз здраду і разбурылі, а літоўцы зноўку адбудавалі; аднак у 1034-м годзе прусы зноўку ўзялі яго праз здраду і зраўнялі ўмацаваньні з зямлёй. Акрамя гэтага, калі ехаць па Жамайціі з Прусіі ў Ліфляндыю, то трапляеш у месца, якае немцы называюць Хайлігенаў, і якое адасабляе Курляндыю ад Samogitia. Як я чытаў, гэты край не мае ніякіх сапраўдных марскіх партоў, куды караблі маглі б бяспечна прыставаць, але маюцца найміты, якія мусяць прыходзіць на дапамогу караблям у надзвычайных выпадках.

!старонка 129!

V. Край Русаў, Русь з Podolia, Volhynia, Pocucia,

Ukraina.

Шмат і часта ўзгаданы Simon Starovolscius, у апісаньні сваёй айчыны, Польшчы, кажа, што Русь, наколькі яна падуладная польскаму каралю, цягнецца ў даўжыню ад Pocucenскіх ваколіц да ліфляндскай мяжы прыкладна на 200, а ў шырыню аднак ад Малай Польшчы, ці ад Літвы, на ўсход да шырокіх татарскіх палёў, ці да Масквы, на 120 міль. Падзяляецца на Белую Русь, якая належыць да Літвы, і Чырвоную, якая дарэчы называецца Roxolania і адносіцца да Польшчы. Бо трэцюю частку Края Русаў, што ляжыць над крыніцамі, ці вытокамі, Don, ці Tanaim, і Borysthenis, старажытныя называлі Чорная Русь, а сучасныя аднак звычайна называюць яе Масква, а раней яна называлася Sarmatia Asiatica; аналагічна як польская Русь, па гэты бок ад Borysthenis, называлася Sarmatia Europæa, а сама Польшча дарэчы – Vandalia. Гэты край мае надзвычайна вялікую колькасьць мёду, асабліва ў Podolia, дзе пчолы зьбіраюць яго з ясенца і іншых траваў і кветак з прыемным водарам.

Чырвоная Русь, ці Russia rubra, піша ён далей, мае на поўдні Ungarn, Малдавію і Бесарабію; на усходзе скіфскія пустэчы

!старонка 130!

і магутных маскавіцкіх князёў; на поўдні Белую Русь, ад якой яна адасабляецца рэкамі Stirum і Pripetium; на захадзе аднак Малую Польшчу, якую адасабляюць ад яе рэкі Visloca і Veprus. Гэтая Чырвоная Русь мае надта вялікія ваяводствы, асабліва Русінскае, названае асобна, а потым Падольскае, Volhynскае, Бельзскае, Браслаўскае, Кіеўскае, разам з Хельменскімі і Галіцкімі раёнамі, альбо мясьцінамі. Русінскае ваяводства акрамя ваяводы, ці Palatini Russiæ, мае 4 кашталянаш, а менавіта ў Лемберге, Пржэмысьле, Заноке і Галічы, і сюды адносіцца таксама біскум Кіеўскі. Найвыбітны горад – Левенбург, ці Leopolis, іншыя, якія таксама зьяўляюцца выбітнымі ў гэтым раёне, гэта Gliniani, Zloczovia, Zboravia, Grodecia, Komarna, Zolkuja, Javorisvia. Præmislienскае кашталянства акрамя сталіцы Пржэмысль мае паўсюдна моцныя замкі шляхты супраць пастаянных нападаў татараў, ці скіфаў, сярод іх Bialoboki, Sosnicia, Dombrova, Uherce, Prochnicum, Laski, асабліва аднак Castellum Crasicinum на рацэ San; навыбітныя мястэчкі гэтага раёна гэта: Samboria, Fulstinia, Dombromilia, Visnia, Zidaczovia, Mosciska, Dubiecia, Canczuga, Prævorscia, Jaroslavia, Resovia; Занокскае кашталянства ляжыць бліжэй да вянгерскіх гор і Семіграда і пагэтаму мае шмат халмоў, акрамя ваколіц горада

!старонка 131!

Crosna. Sanocum зьяўляецца сталіцай гэтага раёну, таксама там маюцца гарады: Brozovia, Rimanovia, Dinovia, Lesko, якія маюць свае замкі. Halicienскае аточана на зімовым захадзе Семіградскімі гарамі, а на поўдні малдаўскімі букавымі лясамі. Вельмі хуткая рака Tyra, якая пачынаецца ў Карпацкіх гарах і бяжыць на ўсход да Эўксінскага мора, дзеліць гэты раён

роўна па цэнтру, частка, што ляжыць на поўдні і над пазначанай ракой Tyram называецца звычайна Pocuce, ці Pocucia. Найвыбітныя гарады і мястэчкі там гэта: Halicia, Sniatinum (які дарэчы зьяўляецца сталіцай Pocucia), Colomia. Акрамя таго ў Pocucia вядомымі мясьцінамі зьяўляюцца: Martinovia, Dolina, Strium, які мае замак у багнах; па гэты бок ад ракі Tyræ, ці Nestri, ляжыць Podocum з добрым замкам, мястэчка і замак Monasterzisca, Potuciorum, а таксама Uscie, Dobrouoda і іншыя замкі і гарадкі, і сярод іх Buczavia, якая мае моцны замак, і таксама Podhajecia, аточаная мурам і больверкамі; і па суседству замак Zavalovia, а потым горад Brezanum.

2. Далей ідзе Podolia, другое ваяводства, якое асабліва вядомае праз пастаянныя напады варварскіх народаў, і тут у ім часта адбываюцца сечы, у астатнем яно мае ўрадлівую глебу, разнастайны мармур і алебастар

!старонка 132!

у розных месцах. Падзяляецца таксама на 3 раёна: Camenecenскі, Tremboulienскі і Laticzovienскі. Акрамя сталіцы Camenecia там маюцца: Tremboula, Laticzovia, Husiatinum, Barum, Czaricovia, Janovia, Zincovia, Misdzibozia, Jesupolis, Grodecia, Jaslovecia, Satanovia, Zuanccia, Tarnopolia, Kitaigrodum, Dunaigrodum, і шмат іншых мястэчак, якія амаль усе з-за набегаў скіфаў, ці татар, і няспынных войн нядрэнна абароненыя і маюць надта моцныя замкі і жыхароў, што нарадзіліся дзеля вайны. Дзяржаўнымі дарадчыкамі гэтага края зьяўляюцца трое: біскуп з Cameniecz, Podolскі ваявода, ці Palatinatus, і Castellanus Camenecensis.

Трэцяе ваяводства ў чырвонай Русі гэта Braslavienскае, якое ляжыць над Падоліей і каля татарскай мяжы і мае надта шмат густанаселенных местаў, таксама і надта моцныя замкі; сярод іх найвыбітнымі зьяўляюцца: Morachua, Jarosovia, Zitomiria, Sarogrodum, Felstinum, Chmielnicum, сам горад Браслаў і Vinnicza. Гэты Palatinat мае 2 раёны: Vinnicenскі і Zitomirienскі.

Чацьвёртае ваяводства гэта Kiovienскае, якое таксама ляжыць блізка да татараў, на другім баку мае аднак Маскву і падзяляецца роўна на 2 часткі Borysthenem, вялікай ракой. Яго сталіца – Kiovia; іншыя славутыя месцы гэта: Canovia, Circassia,

!старонка 133!

Bohuslavia, Pereslavia, Bialocerqua, Stepanovia, Fastovia, Residenz біскупа Kiovien.

Пятае ваяводства гэта Volinскае, якое з захаду мяжуе з Kiovскім і складаецца з дзьвух буйных раёнаў: Cremenecenскага і Luceorienскага. Найвыбітныя месты там: Luceoria, Volodimiria, Rubesovia, Socalia, Czartoriscum, Olescum, Crilovia (усе яны добрыя і забясьпечаныя вельмі моцнымі замкамі гарады), Brodi, Olika, Cremenecia, Vismovecia, Zaslavia, Constantinovia, Basilea, Dubna, Ostrogium, Zbaravia, кожны з якіх мае вельмі моцны і вытанчаны замак, паколькі яны былі асноўнымі рэзыдэнцыямі і кватэрамі русінскіх герцагаў.

Шостае ваяводства гэта Бельзскае, якое ляжыць побач з Леопальскім раёнам і Хельменскім краем у цэнтры чырвонай Русі. Сталіца Belza ляжыць сярод багнаў, і гэты Palatinat падзяляецца на 4 раёны: Бельзскі, Бускенскі, Гродленскі і Грабавечанскі; чыі сталіцы, ці гарады, маюць свае ўмацаваныя замкі.

Нарэшце Хельменскі край, які ляжыць паміж Люблінскім палатынатам і літоўскай мяжой, а на ўсходзе мае Volhyniam. Сталіца яго гэта Chelma; там ёсьць: Rozana, Ulodavia, Turobinum, Tamogrodia, Tomasovia, Ctesovia, і шмат іншых, і таксама Uchania. Да

!старонка 134!

гэтых узгаданых Autor дадае таксама Чарнігаўскае ваяводства, што ляжыць дарэчы ў Чорнай Русі на тым баку Borysthenis, якое кароль Uladislaus IV адняў у маскавітаў і ў шматлікіх местах пабудаваў цэрквы паводле рымскага звычая, і таксама заснаваў у Novogrod езуіцкі Collegium.

За гэтай чырвонай Русьсю ідзе ў пазначанага Autore Белая Русь, ці Alba Russia, якая, як паведамлялася вышэй, адносіцца да Літвы. Імя паходзіць ад таго, што жыхары аддаюць перавагу гэтай фарбе, часткова таксама таму што палі тут даўжэй чым дзе застаюцца пакрытыя сьнегам; тут таксама можна бачыць паўюсль белых ваўкоў, мядзьведзяў, зайцаў, лісаў і іншых, як хатніх, так сама і дзікіх жывёлаў.

Гэтыя вельмі высакародныя мясьціны падзяляюцца на 6 ваяводстваў: першае з якіх, а менавіта Novogrodnenскае, мае больш жыхароў за астатнія і падзяляецца на два раёны: Novogrodnenскі і Slonimскі, кожны зь якіх мае шмат густанаселенных мястэчак, аднак найвыбітнымі зьяўляюцца: Novogrodkum, Slonimum, Rozana, Selecia, Mysza, Lachovicia (вельмі моцнае), Nesuicia, Sluckum &c.

Другое ваяводства гэта Mscislavienskае, якое ляжыць у форме трохктутніка ў цэнтры паміж Pripetio з поўдня і Borysthene з усходу, цалкам зацягнутае лясамі і аточаная водамі. Падзяляецца на 2 вялікіх раёна,

!старонка 135!

а менавіта Mscislavienskі і Modzirenskі. Найвыбітныя гарады там: Cleckum, Ouruckum, Homlia і Criczovia, аздобленыя вельмі прыгожымі замкамі; таксама і Ostrskum, сама Mscislavia і Modziria.

3. Palatinatus Vitebscensis, гэтае ваяводства, як таксама і папярэдняе мае на поўдні Borysthene; падзяляецца таксама на 2 добрых раёна, а менавіта Vitebscenskі і Braslavienskі. Там, акрамя дзьвух пазначаных цэнтральных гарадоў, знаходзіцца горад Mohilow і некалькі невялічкіх мястэчак.

4. Palatinatus Minscensis, да якога належыць таксама Barisovскі раён. Акрая цэнтральных гарадоў Minsco і Barisovia, там знаходзяцца: Toloczinum, Smolniany, Coidanovia і Turkum, не малае мястэчка; астатнія аднак не надта істотныя, у іх можна пабачыць таксама кляштары і палацы шаноўных паноў.

5. Polocenskае ваяводства, у якім знаходзяцца гарады: Polotzum, Usuiatum, Starzicia, Velisia (цэнтра раёна, які належыць да гэтага

Palatinat), і потым два моцных, у мінулым належных непараўнальнаму герою Carolo Chodkievicio, горада: Sclovia і Bychovia.

6. Апошняе і самае вялікае ваяводства гэта Smolenscensкае, якое, хаця яно нядаўна зноўку трапіла ў рукі маскавітаў, тым не менш як належны да Літвы верагодна з цягам часу

!старонка 136!

зноўку зможа вярнуцца да яе. Гэты Palatinatus, аднак, уключае герцагства Severien у Русі, Czernichivienskі край (відаць нейкі іншы, чым узгадыны вышэй у чырвонай Русі), і Orsanenskі раён. І кароль Sigismundus III праз вайну з Масквой адняў у ворага Rumnenskія і Sierpicioviensкія землі і далучыў іх да Smolenscensкага Palatinat.

У гэтай мясцовасьці знаходзяцца: Dorohobusum, Starobubum і Dombrouna, файнае мястэчка; і таксама Orsza. І гэта з шмат разоў узгаданага Starovolscio. Іншыя называюць яго Чырвоную Русь Чорнай, а Маскву – Белай Русьсю, глядзі, што падрабязна прыведзена пра Русь у нашым ранейшым Польскім Апісаньні, p. 25 seq. да 37й старонкі. Што адносіцца да местаў, якія зьмяшчаюцца тут, пра іх ужо не мала было прыведзена вышэй; найвыбітныя аднак пералічваюцца ніжэй, як:

Barisovia, горад у Белай Русі, на рацэ Berezina, разам з 2 замкамі, верхнім і ніжнім.

Barum, горад у Чырвонай Русі, пабудаваны жонкай караля Sigismundi I, Bona Sfortia; там маецца езуіцкі Collegium. На пачатку ўладараньня караля Johannis Casimiri Korecius і Christophorus Przyiemscius (які таксама і ў замежных войнай здабыў сабе славу) зноўку адбілі ў казакаў гэты горад, як таксама і Zuechalum, і Ostropolin,

!старонка 137!

паклалі шмат тысяч казакаў і атрымалі вялікія трафеі. Barum, ці Бар, ляжыць у частцы Русі, якая называецца Podolia.

Bialocerqua, мястэчка і замак у Кіеўскім Palatinat. Joach. Pastorius узгадвае каралеўскі горад Bialacerkiew, ці Albi Fani, пад якім у 1648-м годзе спыніўся казацкі палкоўнік Chmelnicius, і які што паводле майго меркаваньня зьяўляецца тым самым Bialocerquam. Знаходзіцца дарэчы ў Volynia ulteriore, якая часам называецца Ukraina, а часам аднак Nis.

Braslavia, сталіца Браслаўскага ваяводства ў Чырвонай Русі, на рацэ Bogo, які захапіў Kiernus, герцаг Літоўскі, што пачаў уладарыць у 1040-м годзе.

Brezanum, горад у Галіцынскім ваяводстве, які зьяўляецца густанаселенным, мае прыгожыя цэрквы і раскошны ды моцны палац.

Brodi, горад у Volinia, ці Volhynia, які Stanislau Koniecpolscius, Кракаўскі Castellan і вярхоўны польскі палкаводзец, аздобіў крэпасьцю, кафедральным саборам і адкрытай вышэйшай школай. Недалёка адтуль можна пабачыць Падгорзскі палац і таксама каралеўскія сады і статныя гідратэхнічныя прылады.

Camenecia, Camenecum, Cameniez, ці Kamieniecz, з дабаўкай да імя Podolsky, бо гэтае места знаходзіцца ў Podolien, і зьяўляецца сталіцай гэтага краю.

!старонка 138!

Мусіць быць пабудаванай старажытнымі Clepidava і Dacis. Глядзі маё ранейшае Польскае Апісаньне, pag. 72 & seq. Хаця Albertus Kojalovicius кажа, што калі Olgerdus, герцаг Літвы, выгнаў татар з Podolien і перадаў гэты край сынам свайго брата Coriathi, то гэты вельмі моцны, разьмешчаны на скале, горад і цуд фартыфікацыі (там вал быў навалены ў вышыню не з зямлі майстрамі, але прыродай з моцнай скалы) меў сваімі пачынальнікамі пазначаных князёў; як паведамляюць аўтары. Гэты Autor адносіць таксама і вышэй пазначаны горад Braslaviam да Podolien, і хоча сказаць, што найвыбітнымі замкамі гэтага краю зьяўляюцца: Braslavia, Smotryca, Sokolcum, Skala, гэты Kamenecum і Czervonogrodecum. Piasecius піша, што турэцкі імпэратар Osman у 1621-м годзе дайшоў з большасьцю рэйтараў і янычараў да Camieniecz, аглядзеў цудоўную крэпасьць з суседняй гары і спытаў: хто ўмацаваў яе? І калі нехта адказаў, што гэта зрабіў Бог, ён мусіў сказаць: то няхай Бог сам яе і заваёўвае; і развярнуўся адтуль, і загадаў абстраляць і штурмаваць замак Panowce; хаця ён адступыіў насуперак невыкананым справам і ўвесь час папракаў сваіх ваяроў за іх бяздзейнасьць, і таму таксама Janizeros сталі яму ворагамі; і таксама задушылі яго неўзабаве пасьля таго, у Канстантынопале.

!старонка 139!

Пазначаны горад, разам з моцным замкам, ляжыць у 30 вялікіх мілях ад русінскага Левенбурга ў напрамку да зімовага ўсходу пад 49-м gradu longit. і 48-м latit., і мае 2 біскупаў, рымскага і армянскага; тыя армяне маюць там свайго ўласнагу галаву, які карае іх за іх злачынствы. Там таксама маецца езуіцкі Collegium, і ў 2-х мілях ад горада ляжыць вышэй узгаданы замак Potociorum Paniouce. У 1633-м годзе туркі зрабілі сюды рэйд, аднак былі адкінутыя Koniecpolscio да Малдавіі. У 1651-м годзе казакі і татары, пасьля таго як яны праз здраду ўзялі вышэй узгаданы Пановечэнскі замак, са стратамі для сябе атакавалі гэты горад. Таму нехта назваў яго Camenecia unicum adversus Orientis minas propugnaculum[238]. Глядзі пра гэтую татарска-казацкую аблогу надрукваны Самуэлям Бучскім у 1656-м годзе Tractat, з ціхім спакойным настроем; адтуль бачна, як пан старэйшы лейтэнант, Ян Георг фон Зэбіш, і Маршвіц з Шмідэвельда, сілезскі шляхціц, абараняў і ўтрымаў гэтую крэпасьць з малай колькасьцю людзей супраць 120 000 ворагаў, якія 6 чэрвеня прыйшлі сюды, а 23-га дня таго месяца зноўку адступілі; і што каля старага замка там тады быў, і без сумневу яшчэ ёсьць, таксама і новы, хаця і дастаткова правалены ў ірвах на трох месцах, замак. А яшчэ

!старонка 140!

---

[238] Камянец – унікальны быстыён супраць пагрозаў з усходу.

ў сьнежні ўзгаданага 51-га года пазначаны горад, як паведамляецца ў тых Relationen, цалкам вымер ад чумы.

Chelma, сталіца Хельменскага краю, атрымаўшага ад яе сваю назву, там маецца 2 біскупа: рымскі і рускі; адзін з якіх сядзіць у Crasnostavia, а другі мае сваю царкву тут і таму таксама падзяляецца гэты край на 2 раёны: Хельменскі і Краснаставенскі.

Colomia, даволі населенны горад у Галіцыі, дзе здабываецца шмат солі і прадаецца потым па ўсёй Русі і Літве. У Пржэмысьлінскім раёне таксама робяць соль, як і ў некаторых вёсках пад Галічам. Яшчэ каля Boristhene ёсьць возера, на тых дзікіх палях Ukrainæ, ці ulterioris Podoliæ[239], чые воды пры ясным і надта гарачым надвор'і ўтвараюць цьвёрдую соль, якой карыстаюцца жыхары наваколься, як пазначае Starovolscius p.14.

Coidanovia, горад, што ляжыць у Белай Русі і Мінскім Palatinat і мусіць быць прыгожа пабудаваным.

Crasnostavia, зьмешчаны на рацэ Vepro, у Хельменскім краі, горад, рэзыдэнцыя біскупа Хельмскага, замак і палац. Тут некалькімі польскімі панамі быў абраны іх каралём пан эрц-герцаг Максіміліян, але ён быў разьбіты разам з яго ваярамі польскім

!старонка 141!

вялікім канцлерам Zamoscio, і дастаўлены сюды ў палон, і знаходзіўся тут пад аховай у замке, як пра гэта таксама распавядалася вышэй ва Ўступе. Калі ў 1649-м годзе польскі лагер пад Zbaras быў узяты ў кальцо казакамі і татарамі, кароль Ян Казімір прыбыў з Любліна, каб вызваліць іх, 18-га ліпеня сюды, у Crasnostow, потым рушыў на Toporow і мястэчка Bialocamin, далей 13-га жніўня на Zloczewo, а затым на Zborow, які ляжаў у шасьці мілях ад ворага і прыкладна ў 1 ½ мілях ад Jeziorna.

Cremenecia, сталіца Кременецкага раёна ў Чырвонай Русі, гэты горад мае зьмешчаны на высокай скале замак.

Crosna, файны горад у Занокскім раёне, дзе маецца езуіцкі Collegium, і зь якім моцна гандлююць венгры, бо ён ляжыць на мяжы.

Dubna, горад, які ў 1651-м годзе належыў пану Дамініку, герцагу Заслаўскаму. У тым самым годзе, падчас паходу супраць казакаў, кароль Ян Казімір прыбыў да Vygnanca, багатага на ваду і выганы месца, і адтуль да Berestecia, гэтае мястэчка ў мінулым належыла Прунскім герцагам, а на той час было пад уладай графа Uladislao з Leszno, з усіх бакоў аточанае ракой Styrus. Адтуль ён потым рушыў да ўзгаданага мястэчка Dubna. Chmelnicius

!старонка 142!

паставіў свой лагер паміж мястэчкамі Zbaravio і Visnovecia, а татарскі хан у Lesnowia, Coniecpolsкім мястэчку, у некалькіх тысячах крокаў ад пазначанага Berestia. У дзень сьв. Пятра і Паўла тут адбылася сеча супраць татар і казакаў, у якой ад палякаў застолося каля 300 высакародных людзей; поле таксама ўдалося атрымаць. На наступный дзень адбылася

[239] Далёкай Падоліі.

нарэшце галоўная бітва, у якой прымаў удзел сам кароль, разам з герцагам Дамінікам Астрожскім і Заслаўскім[240], з Ерэміяй Міхаэлем герцагам Вішневецкім[241] і 2 іншымі князьямі яго роду, з Sigismundo Przyemscio[242] магістрам артылерыі па ўсёй Кароне Польскай і таксама Notario Campestri, з Якубам Вайгерам ваяводам Марыенбурга[243], з панам Шафгоча з Сілезіі[244], з палкоўнікам Хрыстафам Губальдэнам, які праславіўся ў Нямецкай вайне, і з Багуславам Радзівілам. Татараў аднак, з іх вялікімі стратамі, перамаглі, як таксама і дабруцыенскіх і сілістрыенскіх туркаў, што прыйшлі на дапамогу казакам, і якіх прывёў Chmelnicius (якому пад час раней заключанага міру кароль перадаў Czeherinum, у якасьці рэзідэнцыі). Казакі яшчэ доўга трымаліся ў сваім лагеры, аднак нарэшце кінуліся на ўцёкі, і зь іх і з мяцежных сялян амаль каля 30 000 мусіла загінуць у багнах, гушчарах і лясах. У пакінутым лагеры

!старонка 143!

палякі атрымалі акрамя дробязей велізарную здабычу і 18 штук гармат.

Glinianum, горад у чырвонай Русі, дзе ў 1648-м годзе польскае войска пад рукой герцага Дамініка Астрожскага, Мікалая Астрожскага[245] і Alexandro Koniecpolscio[246], каралеўскага харунжага, сабралося супраць Bogdanum Chmielnicium. Пасьля сьмерці караля Sigismundi Augusti, тут сабраліся рускія і падольскія ваяводы з Castellanen і з усім раксаланскім рыцарствам. У 1649-м годзе сюды прыбыў таксама кароль Ян Казімір. Ляжыць далей за Левенбург, ці Leopolis.

Halicia, Галіч, у мінулыя часы сталіца Русінскага Каралеўства, якая аднак у сёняшнія дні не мае больш ніякіх намёкаў на былую веліч, хаця мае яшчж файны замак на рацэ Tyra. Глядзіц пра яе рэгістр нашага ранейшага Польскага Апісаньня. Romanus[247], герцаг Галіцыі і Ўладзіміріі, пасьля таго як

---

[240] Уладзіслаў Дамінік Заслаўскі-Астрожскі (па-пол. Władysław Dominik Zasławski-Ostrogski; 1616 – 05.05.1656) – магнат, перадапошні прадстаўнік княскага роду Астрожскіх.

[241] Ерэмія Міхал Карыбут Вішнявецкі (па-пол. Jeremi Michał Korybut Wiśniowiecki; 17.08.1612 – 20.08.1651) – князь на Вішняўцы, Лубнах і Хароле, даводца кароннага войска, ваявода рускі ад 1646 року, староста пшэмыскі, пжасныскі, новатарскі, гадзяцкі, канеўскі. Бацька караля Рэчы Паспалітай Міхала Карыбута Вішнявецкага. Першапачаткова вызнаваў праваслаўе, пасьля перайшоў у каталіцтва.

[242] Жыгімонт Пшыемскі (па-пол. Zygmunt Przyjemski; каля 1610 – 03.06.1652) – вядомы палкаводзец XVII ст., шляхціц герба Равіч, генэрал артылерыі кароннай (лат. generalis artileriae magister) (1650 – 1652), польны пісар каронны (1649).

[243] Якуб Вайгер (па ням.: Jakob von Weiher; 1609 – 20.02.1657) – дзяржаўны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай. Фундатар Вайгерава і Вайгераўскай Кальварыі. Удзельнік войн з Масквой (1632 – 1634, 1654 – 1667), са Швэцыяй (1655 – 1660) і мяцежнымі казакамі.

[244] Хрыстафор Леапольд фон Шафгоч (па ням.: Christoph Leopold von Schaffgotsch; 08.04.1623 – 30.061703) – нямецкі салдат і шляхціц.

[245] Мікалай Астрарог (па-пол. Mikołaj Ostroróg; 1593 – 1651) – палітычны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай.

[246] Аляксандр Канецпольскі (па пол. Aleksander Koniecpolski; 1620 – 30.03.1659) – буйны магнат, харунжы вялікі каронны (1641 – 1656).

[247] Раман Мсціславіч Галіцкі (пасля 1160 – 19.06.1205) – першы галіцка-валынскі князь, сын уладзіміра-валынскага і кіеўскага князя Мсціслава Ізяславіча і Агнесы, дачкі польскага князя

ён альбо перамог, альбо выгнаў іншых русінскіх князёў, стаў адзіным панам над усёй Русьсю, і таму таксама заганарыўся і распачаў вайну з Польшчай, падчас якой ён загінуў у 1205-м годзе пад Завіхвостам. У 1353-м годзе Lubartus[248], герцаг Volynia, нечакана захапіў гэты горад, абрабаваў яго і падпаліў.

Jaroslavia, славуты горад у Чырвонай Русі,

!старонка 144!

чый замак з поўдня дасягае ракі Сан. Езуіты маюць там Collegium, і ў вечар Узьнясеньня сьв. Марыі там праводзіцца вядомы на ўсё каралеўства кірмаш, ці ярмакра, куды прывозяць тавары з Персіі, Канстантынопаля, Венецыі, Масквы і Амстэрдама, на якой прадаецца да 40 000 быкоў і ў палову гэтага коней; як паведамляе яшчэ Starovolscius пра свае часы. Piasecius кажа, што тут, асярэдзіне жніўня праводзіцца кірмаш, які пасьля франкфурцкага славуты па ўсёй Эўропе; настолькі што, калі ў 1625-м годзе цягам адной гадзіны ўвесь горад згарэў з-за таго, што яны мелі толькі драўляныя дамы, то тавары, якія такім чынамператварыліся ў попел, ацэньваюцца ў звыш 10 тысяч памножаных на тысячу, ці 10 мільёнаў гульдэнаў. Хаця потым тут зноўку адбудаваліся. А ў 1656-м годзе горад узялі швэды.

Javorisvia, горад славуты сваімі гарачымі крыніцамі, якія бьюць у вёсцы Sclovia, знаходзіцца ў самім Чырвонарусінскім, так і названым, Palatinat.

Kiovia, сталіца аднайменнага ваяводства ў Чырвонай Русі, якое ёсьць вялікае і багатае на жыхароў; таксама сталая рэзыдэнцыя кіеўскіх князей, якія ўладарылі над усёй Русьсю, ці Sarmatien, як у Азіі, так і ў Эўропе; хаця цяпер амаль нічога, ці толькі зусім трошкі, засталося тут ад той велічы. Глядзі таксама наша

!старонка 145!

ранейшае падрабязнае Польск. Ап. p. 124 & seqq. Тут маецца русінскі арцыбіскуп, галоўны ва ўсім каралеўстве, які ўладарыць над усімі біскупамі, што належыць да грэцкай рэлігіі; які цяпер таксама, як кажа Starovolscius, выказвае паслухмянасьць Рымскаму папе. Побач з ім маецца тут таксама і рымскі біскуп. Таксама тут знаходзяцца манахі Ордэна S. Basilii, чый настаяцель мае пад сабой сотні вёсак. Гэтыя манахі вядуць зусім цяжкае жыцьцё, і ў часы паста яны сыходзяць у пячоры, ці норы, пад зямлю і робяць там у самоце пакаяньне. Іншыя накіроўваюцца ў дзікія мясьціны, апрануўшыся ў валасяную вопратку і начапіўшы жалезныя ланцугі, пакуль не забяруцца зусім далёка ў Татарыю, дзе яны прапаведуюць Эвангельле і прымаюць сьмерць за гэта. Яны маюць шмат кляштараў у Русі, некаторыя з іх аднак цяпер знаходзяцца ў суполцы з рымскімі цэрквамі. Езуіты маюць у Kiovia таксама Collegium. Тамашняе ваяводства цягнецца далёка, як да Эўксінскага мора і поўдня, таксама і да захаду і поўначы, да Літоўскіх і

Баляслава III. Бацька Данілы Раманавіча. У 1202 – 1203 падпарадкаваў сабе Кіеўскае княства і стаў наймацнейшым князем Паўднёва-Заходняй Русі.

[248] Любарт (у хрышчэньні – Дзімітры; пасля 1300 – 04.08.1383) – літоўска-рускі князь, малодшы сын Гедзіміна. Апошні уладар адзінага Галіцка-Валынскага княства.

Беларускіх межаў; і мае шмат густанаселенных і ўмацаваных замкамі мястэчак. У 1320-м годзе Gediminus, герцаг Літоўскі, захапіў замак Owniezam і таксама Zitomirum, што належылі тамашняму герцагу Stanislai. Потым рушыў на Kiow, біўся з Olha, герцагам Pereslavienскім, Romano, герцагам Branscenскім, і з Leone, герцагам Luceorienскім, і перамог іх

!старонка 146!

потым захапіў горад Kijoviam, а вышэй узгаданы Stanislaus, тагачасны вярхоўны князь ва ўсёй Русі, уцёк у Разань. І пасьля таго тыя пераможаныя русіны назвалі Gediminus вялікім герцагам Русінскім. Ён атрымаў таксама Volyniam і суседнія з Kiovia замкі: Bialogrodecum, Slepovrotum, Kanioviam і Czerkasium; і таксама накіраўваўся ў Severiam і захапіў там пад сваю ўладу Bransko і Pereslau, 2 сталіцы сваіх правінцый. Такім чынам цяпер вярхоўнае Kijoviensiйскае княства, якое хаця і не з аднолькавым посьпехам і зьменамі абаранялася на працягу 430 год, напаткала свой канец; і пагэтаму паміж палякамі і літоўцамі распачалася вялікая спрэчка. У мінулым годзе казакі захапілі горад Kioviam пад сваю ўладу, аднак каралеўскія зноўку адбілі яго. У той час, калі там быў герцаг Радзівіл, 16-га жніўня 1651-га г., узняўся там агонь, які зьнішчыў 60 дамоў. На наступны дзень быў яшчэ большы пажар, у якім акрамя шэраговай забудовы і крамаў згарэла больш за 200 шляхецкіх падвор'яў, і таксама некалькі лацінскіх і грэцкіх цэркваў; аднак галоўная царква і кляштар Dominicанаў захаваліся. Joach. Pastorius робіць Podlesiam (пра яго распавядалася вышэй у падзеле пра Літву) часткай Volhiniensiйскага і Kioviensiйскага

!старонка 147!

Palatinats, які сярод лясоў працягваецца надта далёка, да суседняй Літвы.

Lancutum, што ляжыць у Пржэмысьленскім Palatinat, аздоблены Stanislao Lubomirscio, тагачасным кракаўскім ваяводай, раскошна пабудаванымі цэрквамі, цудоўным палацам і добрай крэпасьцю, і таксама забаўляльнымі садамі горад; газэты звычайна называюць яго Ландгут, ці Ландсгут, аднак вялікі літоўскі рэестр зямель называе яго Lanzut. У адным дакладзе стаіць, што гэты Lanzut ляжыць у 24-х мілях пад Кракавам, і што гэтае места ў лютым 1656-га г. швэдскі генэраг граф Дуглас знайшоў пустым.

Leopolis, па русінску называецца Левенбург, і агульна Лембург, сталіца чырвонай Русі, падрабязнае апісаньне якой можна знайсьці ў нашай раней надрукаванай кніжыцы пра Польшчу, p. 123 & seqq. Ляжыць на 46-м grade longit. і 49-м latit., і добра ўмацаваны; там жыве рымскі арцыбіскупа, як таксама і армянскі і русінскі біскупы. То там езуіты маюць Collegium, а Dominiканы, Franciscаны, Bernardiны і іншыя маюць свае кляштары; аднак у гарадской Gymnasio выкладаюць замоўленыя з Кракава Professores. У дзень сьв. Агнэсы тут ладзіцца статны кірмаш, да якога зьбіраюцца звычайна гандляры з Венгрыі, Турцыі, Малдавіі і іншых частак сьвету. Пра туташнія царкоўныя скарбы распавядае Starovolscius на 37-й

!старонка 148!

старонцы. Армяне, чыя мова мае аднолькавасьці з турэцкай, паводле каралеўскага загаду прыроўненыя тут адносна грамадскага стану да

католікаў, хаця яны і адрозьніваюцца ад іх у рэлігіі; як паведамляе Sulikovius, тагачасны тамашні біскуп. У 1648-м г. горад некалькі дзён мужна абараняўся ад Chmielnicium, які абклаў яго з 300 000 чалавек. Калі аднак замак перайшоў да іх з-за недахопу абаронцаў, і гараджане, якім не хапала салдатаў, не адважыліся супрацьстаяць гэткай вялікай навале, і таксама правіянту са дня на дзень рабілася ўсё менш; таму яны адкупіліся ад іх золатам і срэбрам, што тыя зноўку адступілі, і горад такім чынам ўратаваўся.

Luceoria, горад у Volinia, чый біскуп разам з капітулам мае сваю рэзыдэнцыю ў замке, а русінскі біскуп у горадзе. Езуіцкі Collegium таксама знаходзіцца ў замке.

Miedireczum, горад у Volinia, у Cremenecensiйскім раёне, які зьяўляецца надта моцным, і ў якім апошні герцаг Астрожскі, Ян, раскошна пабудаваў Franciscанам царкву і кляштар, а яго ўнучка аднак – Collegium для езуітаў і царкву, і перанесла у яе парэшткі свайго супруга, Caroli Kodkievicii.

Minscum, сталіца Mincensiйскага Palatinats, мае добра ўмацаваны замак сярод вады, мае таксама яшчэ крэпасьць,

!старонка 149!

ці ніжні замак, і тут знаходзіцца Tribunal, альбо прыдворны і краёвы суд белай Русі, якая належыць да Літвы. Таму атрымалася такім чынам, што ён пераменным чынам зьбіраецца ў адзін год у Vilna ў Літве, у іншы год аднак альбо тут, альбо ў Novogrod.

Modziria, ці Modzyrum, горад і замак сярод багнаў, які зннаходзіцца ў Mcislaviensiйскім Palatinat, і да якога належыць аднайменны раён. У нядаўняй казацкай вайне, перад тым як у Zborovio быў заключаны мір з Chmelnicio, герцаг Радзівіл павёў па Дняпру літоўскае войска, паколькі яму добравольна здаліся мястэчкі Turovia, Grodecum; таму ён спачатку са зброяй атакаваў замак Mozyrum, у якім абараняліся бунтаўшчыкі, і таксама захапіў яго. Адтуль ён накіраваўся на Bobroiscum, які ляжыць на рацэ Berezina, і які ён таксама захапіў; мястэчка Lojovium аднак, што ляжыць на пазначаным Дняпры, ці Borysthene, казакі самі падпалілі разам з замкам.

Mohilavia, Магілёў, вялікі горад у белай Русі і ейным краі Vitebsiйскі Palatinat; там маецца надта шмат гандляроў, і таму маскавіты вядуць моцны гандаль у гэтым напрамку. Цяперашні маскавіцкі вялікі герцаг захапіў гэты горад, які быў у 1655-м безвынікова абкладзены палякамі ў красавіку; і падчас гэтай аблогі, як паведамляе Aug. Limmerus, звыш васьмі тысяч

!старонка 150!

чалавек павінны былі загінуць ад смуроду, голаду і мяча. Таксама 18-га (28-га) ліпеня 1656-га г. з Кёнігсбурга пісалі, што казакі і ў гэтым годзе зноўку забралі Магілёў (які аўтар адносіць да чорнай Русі) у маскавітаў.

Mcislavia, цэнтр іншага Palatinatа ў белай Русі, які мае ад яго сваю назву. У 1386-м г. яго безвынікова абклаў Suentoslaus, герцаг Smolensco, і там загінуў.

Nesuizia, горад таксама ў белай Русі, што належыць да Літвы, які зьмяшчаецца ў Novogrodensiйскім Palatinat і належыць панам Радзівілам; там герцаг Мікалай Хрыстафор Радзівіл заснаваў некалькі кляштараў з вялікімі выдаткамі, таксама будынкі для войска, езуіцкі Collegium, разам з кватэрамі для студэнтаў; як таксама і ратушу, а ў 4-х мілях ад гораду пабудаваў замак Myrh і на яго прыкладзе пасярод Sarmatia пазнаёміў палякаў з Italiam.

Novogrodcum, Novogrodecum, таксама называемы малы Ноўгарад, у параўнаньні з вялікім Ноўгарадам, ці Вялікановаградам, што належыць маскавітам. Гэта менўы ляжыць у белай Русі і ёсьць цэнтр свайго палатынату, там пераменна знаходзіцца палямент, ці камерны суд, усяго Вялікага герцагства Літоўскага. Глядзі вышэй у Minscum. Мае некалькі кляштараў

!старонка 151!

грэцкай і рымскай рэлігіі; і таксама рэзыдэнцыю езуітаў. Калі літоўскі князь Erdivilus, сын Montwilonis, устаў на чале літоўскага войска, падчас свайго паходу на Русь спыніўся на ўзвышаным узгорку; дзе раней стаяў замак пад назвай Навагрудак, які спалілі татары; гэтае месца ўзгаданы Erdivilus загадаў умацаваць, бо яно надта добра пасавала да княскай рэзыдэнцыі і заснаваньня горада, і ён такім чынам стаў першым герцагам Навагрудскім, якому належыла гэтая Novogrodia, Brestia, Grodna і Падляхія. Глядзі ранейшае П. А. p. 152 seq. У 1314-м годзе крыжакі з Прусіі спусташылі край агнём і мячом да гэтага месца і абрабавалі ды спалілі гэты горад; аднак замак выстаяў.

Olika, горад у чырвонай Русі і яе вобласьці, якая называецца Volinia, дзе герцаг Stanislaus Radivillus, вялікі канцлер Літвы, моцна праславіў гэты файны горад з надта моцным замкам і вельмі прыгожай манастырскай царквой, таксама і яе залатымі прыладамі, і вышэйшай школай, і таксама адкрыў там менавы дом. У 1651-м г. гэты горад, які тады належыў пану вялікаму канцлеру герцагу Альбрэхту Радзівілу, быў безвынікова абкладзены казакамі.

Ostrogium, горад разам з замкам, які ляжыць таксама ў Volinia; там у мінулым трымалі двор аднайменныя герцагі.

!старонка 152!

Трошкі далей адтуль ляжыць кляштар Dermanum, які ёсьць вельмі прыгожы, і ў якім знаходзяцца манахі ордэна S. Basilii, што маюць шмат маёмасьці.

Orsza, горад на Dniepr, ці Borysthene, які заўсёды належыў Польшчы, і там маецца езуіцкі Collegium. У 1386-м г. герцаг Suentoslaus з Smolensco безвынікова атакаваў гэта места.

Polocia, Polotzum, цэнтр аднайменнага палатынату ў белай Русі, на рацэ Duna; які вядзе вялікі гандаль, мае 2 кляштара і аднаго рускага арцыбіскупа; там шануюць сьв. Ёзафата, пра яго ніжэй у Vetebsco, які там мусіў рабіць шмат цудаў. Тут таксама ёсьць езуіцкі Collegium, і зусім недалёка адтуль знаходзіцца Usujatum, добры горад разам з замкам. У 1579-м г., 1-га верасьня кароль Стэфан атрымаў Polociam паводле дамовы і заснаваў узгаданы езуіцкі Collegium; і такім чынам увесь Полацкі раён

зноўку трапіў да Польшчы, пасьля таго як ён быў заняты маскавітамі на працягу 17 год.

Præmislia, Пржэмысл, горад у чырвонай Русі, як кажа Starovolscius; іншаыя аднак называюць гэты край Чорная Русь. Гляжхі пра як ў нашым ранейшым тэксьце p. 168 &seqq. Замак ляжыць на скале, і там маецца 2 біскупа, адзін рымскі і адзін рускі. Мае таксама некалькі кляштараў і езуіцкі Collegium, сваёго ваяводу,

!старонка 153!

ці Palatinum; і трымае статныя кірмашы. Piasecius кажа, што ў 1599-м годзе шмат нямецкага народу знаходзілася ў Малдавіі вакол Kutnaria і ў Полськай Русі вакол Пржэмысла і Занока і незьлічоная колькасьць вёсак у тых краях была населеная немцамі, якія трапілі ў палон падчас вайны і пераселеныя туды; яны дагэтуль захоўваюць нямецкую мову і традыцыі. У газетах публікавалі, нібыта кароль Швэцыі ў 1656-м годзе захапіў гэты горад, чаго аднак насамрэч не было.

Resovia, горад ва ўзгаданым Пржэмысьлінскім раёне, ці Castellaney, які мае прыгожы замак і некалькі кляштараш і славуты праз кірмаш, які ладзіцца да дню S. Alberti; тут таксама, ва ўсёй ваколіцы, жывуць немцы, якія былі ўзятыя ў палон Casimiro Magno падчас вайны і з жонкамі і дзецьмі вывезеныя сюды, і якія старанна працуюць з жывёлагадоўляй і льном; як паведамляе Starovolscius.

Sanocum, сталіца раёна ў Чырвонай Русі, які нясе яе назву. Хаця і населеная не лепшым чынам, мае аднак добры замак на скале над ракой Зан, як таксама і іншыя гарады, што ляжаць у гэтай ваколіцы.

Slukum, горад у Белай Русі,які мусіць быць найбольшім ва ўсёй Польшчы, аднак складаецца амаль цалкам з драўляных будынкаў, акрамя цэркваў належных да ремскіх каталікаў і палаца

!старонка 154!

Boguslai Радзівіла, якому належыць горад. Ляжыць у Навагрудскім Palatinat, як таксама і Rozana, што належыць Sapiehis, аднак мае раскошныя будынкі і надта прыгожыя прамыя вуліцы.

Smolenscum, славуты горад, які хаця і знаходзіцца зараз у маскавіцкіх руках, належыць аднак да Літоўскай Русі; таму таксама пра яго трэба трошкі распавесьці тут, акрамя чаго пра яго пісалася ў ранейшым Польскім апісаньнем, p. 179 seqq., і ў дадатку да 2. edition, p. 18 &seqq. Ён ляжыць на Borysthene, ці Dniepr, трошкі на ўзвышшы. Мае мур 6 локцяў таўшчынёй, 52 брамы, варту і крэпасьць у самім горадзе і на высокай гары, таксама прыкладна 4000 дамоў акрамя двароў шляхты і як русінскіх, так сама і каталіцкіх цэркваў і кляштароў, і езуіцкага Collegio, і рэзыдэнцыі рымскага і рускага біскупа, які ў духоўных справах падпарадкаваны арцыбіскупу Polocia; аднак абодва маюць, у часы Starovolscii, сваім галавой рымскага Папу; рымскага біскупа туды паставіў нядаўна памерлы кароль Uladislaus IV. Гэта з Starovolscio. А Paulus Piasecius піша, што Smolenscium і герцагства Severien у мінулым было адарванае ад Літвы і Кіеўшчыны маскавітамі; і кароль Sigismundus III ў 1611-м годзе пасьля

амаль двухгадовай аблогі нарэшце зноўку захапіў яго гвалтам з дапамогай пэтардаў, што ад 80 000 чалавек,

!старонка 155!

якія спачатку прымалі ўдзел у аблозе, засталося не больш 8 000. Але ён кажа, што гарадскі мур мае таўшчыню 8 локцяў, а ўвышыню 15 локцяў ад зямлі зроблены з зямлі, а астатнія 20 локцяў з цэглы; таксама аточаны больверкамі ў слушным парадку; аднак не мае звонку ніякага валу і рвоў. Адтуль да Варшавы налічваецца 220 польскіх міль. Калі тут ў 1614-м (al. 17-м) годзе новы герцаг Маскоўскі заключыў мір з каралём Швэцыі Gustavo Adolpho і перадаў яму некаторыя месцы, разам з пэўнай сумай грошай дзеля кампенсацыі швэдам выдаткаў на падтрымку супраць Польшчы; тады ў 1616-м годзе маскавіты зноўку абклалі Smolenscum, але марна; і польскі князь Uladislaus у 17-м годзе ўвайшоў у Масковію і прасунуўся да Viazma, на 36 маскоўскіх міль ад горада Масква; аднак далей больш не мог рушыць з-за таго, што распачалася зіма; у 1633-м годзе маскавіты зноўку абклалі Smolenscum, які аднак тады быў вызвалены палякамі. Гэта з Piasecius. А Stanislaus à Kobierzycko паведамляе, што найвыбітны замак герцагства Severin Smolenscum у 1514-м г. праз здраду Glinscio адышоў да Moschis. Калі высока ўзгаданы кароль Sigismund абклаў гэтае места, там мусіла быць каля 8000 дамоў, і таму горад было цяжка захапіць,

!старонка 156!

калі б жыхары самі не падпалілі яго і не схаваліся ў замку на другім беразе, які быў не менш за сам горад, меў мур і быў аточаны 38 брамамі ці больверкамі. Усіх, хто быў у замку, налічвалася 200 000 галоваў, і сярод іх 40 000 здольных трымаць зброю, акрамя гарнізона, які таксама быў зусім не маленькі. І нада ім быў пастаўлены Gubernatorn Mich. Borissius Seynius, дасьведчаны ў вайсковых справах чалавек з Масквы. Кароль прыкладна 20 месяцаў стаяў пад замкам, пакуль не захапіў яго; а менавіта з 1-га кастрычніка 1609-га года па 13 чэрвеня 1611-га года, калі пачаўся пажар, што таксама захапіў і зьнішчыў храм, а ў ім вялікі скарб і царкоўныя арнаты; такім чынам, што амаль за 4 гадзіны гэты замак, сьмяротна пабіты і з абрынутымі мурамі, ужо выглядаў зьнішчаным. Сярод палонных знаходзіўся таксама Sergius арцыбіскуп Smolensco, якога адарвалі ад алтара і павялі сьцякаючага крывёй ад атрыманай раны; таксама і вышэй узгаданы губэрнатар Sehinus трапіў у польскія рукі. За ўвесь час аблогі загінула звыш 70 000 чалавек, ваяроў, агульнага народу і перабежчыкаў, ад мяча і хваробаў, якія там жудасна лютавалі. Дагэтуль словы Kobierzickius. Хаця потым маскавіты, зноўку,

!старонка 157!

спрабавалі захапіць гэтую крэпасьць; што нават Continuator Thuani, fol. 374, піша, ніыбта гэтае места было зноўку занятае імі; не кажучы пра тое, што далей прыведзена ў газэтах; аднак гэтая крэпасьць заставалася за палякамі да 1654-га году, калі цяперашні вялікі князь Маскоўскі, Alexius Michaelis, альбо Міхайлавіч, не захапіў яе з accord 3-га кастрычніка.

Sniatinum, горад у Чырвонай Русі і Галіцыі, на рацэ Pruto, які дарэчы зьяўляецца цэнтрам краю Pocuciæ і гандлёвы горад для валахаў, якія вязуць туды на рынак быкоў, воск, мёд і найпародзістых коней.

Socalia, ці Sokalum, горад у Volinia славуты праз выяву Марыі, якая павінна рабіць цуды, туды быў прызначаны францысканскі манах ад Observanz, якіх там звычайна завуць бернардынамі, які на выспе ракі Буг пабудаваў вельмі раскошны храм і надта моцны кляштар, і пазначаную царкву ўпрыгожыў цалкам вельмі прыгожымі выявамі, срэбнымі і залатымі рэчамі, а рызы расшыў каштоўнымі каменьнямі.

Stepanovia, мястэчка ў кіеўскім Palatinat, якое майстэрскі умацавана валам і рвамі.

Uchanie, што ляжыць каля Zamoscie, дзе Nicolaus Danielovicz[249], тагачасны каронны

!старонка 156!

скарбнік, пабудаваў вельмі раскошны храм; там таксама можна ўбачыць прыгожы палац і паркі.

Vinnicza, альбо Winnica, горад у Браслаўскім Palatinat, дзе зьбіраецца шляхта і ладзіцца суд; езуіты маюць у ім таксама славуты Collegium. І да яго адносіцца цэлы раён. Калі ў 1650-м годзе казацкі генерал Chmielnicius, праз сабраны ў Варшаве сойм, быў задаволены пацьверджаньнем раней падпісанага з ім міра, ён хаця і супакоўся, але патаемна вёў перамовы з туркамі асабліва супраць Basilium[250], князя Малдавіі, і таксама настроіў татар супраць яго; аднак праз турэцкую дыпляматыю і абяцаньне аддаць яго сыну Timotheo дачу Basilii, справу ўдалося загладзіць. Пасьля таго ён увесь час шукаў магчымасьць зноўку распачаць вайну з Польшчай, што ён таксама і ажыцьцявіў на пачатку 1651-га году; пры гэтым пачатак паклаў адзін з яго палкоўнікаў, якога звалі Nieczaius[251]; аднак ён паў пры штурме мястэчка Crasna; але іншы палкоўнік, а менавіта Bohunus[252], захапіў узгаданы каралеўскі горад і замак Vinniciam. Аднак каралеўскія войскі, пасьля таго як пераправіліся цераз раку Bohum, альбо Буг, зноўку ўзялі гэтае места.

Vitebscum, Віцебск, раней сталіца трэцага Palatinatа ў Белай Русі. Аднак з-за таго, што

!старонка 157!

жыхары забілі тагачаснага арцыбіскупа Poloczko, Ёзафата, які схіляў іх да уніі з Рымскай царквой, яны згубілі гарадское права і зрабіліся вёскай; хаця каралеўскі замак захаваў падпарадкаваньне. Меў у мінулым уласных

---

[249] Ян Мікалай Даніловіч (па поль. Jan Mikołaj Daniłowicz; 1607 – 06.01.1650) – дзяржаўны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай. Прадстаўнік польска-ўкраінскага шляхетнага роду герба “Сас”. Малодшы сын падскарбія вялікага літоўскага Мікалая Данілавіча і Алены Уханскай. Найзаможны магнат свайго часу. Шмат ахвяраваў каталіцкай царкве, быў фундатарам шматлікім касьцёлаў і кляштараў.

[250] Васілі Лупу (Лупул) (па рум. Vasile Lupu; 1595 – 1661) – гаспадар Малдаўскага княства.

[251] Даніла Нечай (каля 1612 – 10.02.1651) – украінскі палкаводзец, удзельнік паўстаньня Хмельніцкага.

[252] Іван Богун (каля 1618 – 17.02.1664) – палкоўніик Войска Запарожскага, Наказны гетман Войска Запарожскага.

герцагаў, пакуль гэты край не трапіў да літоўскіх герцагаў праз шлюб з Olgerdum; які таксама з любові да сваёй жонкі Ulianæ, хрысьціянкі, пабудаваў там 2 царквы для грэцкай рэлігіі, і жыхары ў будучым засталіся верныя ёй.

Volodimiria, горад у Volinia, дзе мае сваю рэзыдэнцыю рускі біскупа, чыя епархія цягнецца далёка. У 1319-м годзе Gediminus, герцаг Літоўскі, абклаў гэты горад і забіў яго герцага Volodimirum, які хацеў вызваліць горад, а горад, замак і ўвесь край захапіў сабе. У 1351-м годзе кароль Польшчы Casimirus захапіў гэты горад; а Kieystutus, брат пазначанага Olgerdi, трапіў у палон, аднак уцёк ад палякаў і зноўку адняў у іх Volodimiriam.

Zamoscium, Zamoscie, моцны горад у чырвонай Русі, які пабудаваў вялікі канцлер Польскі, Johannes Zamoscius, хутка пасьля таго, як ён разьбіў эрцгерцага Аўстрыйскага Максіміліяна, на яго зямлі і тэрыторыі, і заснаваў там установу канонікаў і вышэйшую школу;

!старонка 158!

да якіх потым жонка яго сына Tomæ Zamoscii[253], таксама вялікага канцлера Польскага, Catharina[254]p, дадала Collegium і Seminarium; што таксама павялічыла колькасьць Professorum і Canonicorum. Глядзі падрабязьней у апісаньні гэтага места ў нашым раней надрукаваным П. А. p. 211 & seqq. Наўкол ляжаць файныя мясьціны, якія па большасьці аднак належаць да яго: тут паўсюль можна ўбачыць таксама прыгожыя сады, добрыя рыбалоўныя мясьціны, зьвярынцы, кузьні. Калі ў узгаданага Johann Zamoscio памерла яго жонка, аднак з Радзівілаў, кароль Стэфан даў яму жонкай дачку свайго брата Christophori Batori, Griselidam; пасьля яе сьмерці, у 1592-м годзе ён ажаніўся з дачкой графа Stanislai[255] Тарноўскага Barbaram і атрымаў у гэтым апошнім шлюбе пазначанага сына Thomam. Ён памёр аднак 3-га чэрвеня 1605-га года, калі яму споўнілася 63 года і некалькі дзён, яго ўзгаданы сын Томаш Замойскі скончыў сваё жыцьцё 5-га студзеня 1638-га г., пасьля таго як у 35-м годзе зрабіўся вялікім канцлерам. Якіх ён пакінуў спадчыньнікаў, я не знайшоў; але знайшоў, што Joannes Zamoscius[256], Præfectus Calussiensis, у 1651-м годзе прымаў удзел у сечы з татарамі і казакамі. У 1648-м годзе ўзгаданы казацкі генэрал, Bogdanus

---

[253] Томаш Замойскі (01.04.1594 – 04.01.1638) – дзяржаўны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай, адзіны сын вялікага гетмана кароннага і вялікага канцлера кароннага Яна Замойскага ад шлюбу з Барбарай Тарноўскай. Высокаадукаваны чалавек свайго часу, падарожнічаў па Францыі Галандыі, Англіі, Італіі, напісаў трактат па фартыфікацыі, прыймаў удзел у бітве на Курукавым возеры.

[254] Катажына (Катырына) Аляксандраў з Астрожскіх Замойская (па поль. Katarzyna Ostrogska; 1602 – 1642) – дачка аднаго з апошніх князёў Астрожскіх, ваяводы валынскага Аляксандра Васільевіча Астрожскага і княгіні Ганны Косткі, з рода магнатаў герба Дамброва.

[255] Станіслаў Ян Тарноўскі гербу Леліва (па поль. Stanisław Jan Tarnowski; каля 1541 – 1618) – граф Тарнова, вайсковы і дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай.

[256] Ян "Собепан" Замойскі (па поль. Jan Sobiepan Zamoyski; 09.04.1627 – 07.04.1665) – сын вялікага канцлера кароннага Томаша Замойскага і Катажыны Астрожскай, апошні прадстаўнік старэйшай галіны Замойскіх.

Chmielnicius, атакаваў пазначаную крэпасьць Zamoscie і на працягу больш чым месяца моцна змагаўся з ёй, аднак нічога не атрымаў, калі потым

!старонка 159!

русінская шляхта накіравалася ў бяспечныя мясціны, а на парозе стаяла зіма. У тагачасных як рукапісных, так сама і друкаваных газэтах, і таксама ў Ляйпцыгскіх Relation, пісалі, што ў 1656-м г. гаспадар гэтага горада перадаў яго дабравольна каралю Швэцыі; што аднак не адбылося; але потым паведамлялася, што тут швэды толькі кінулі некалькі вогненных ядзер, пасьля чаго горад зноўку быў моцна пакінуты.

Zbaravia, горад і моцны замак, які Starovolscius адносіць да Volinia. І наадварот мястэчка Zboraviam referiret да Palatinat чырвонай Русі, сталіцай якога зьяўляецца Leopolis. Калі ў 1649-м г. татары і казакі атачылі польскі лагер пад Zbaras, то кароль Casimirus прыбыў з Любліна сюда да Zboraviam, ці Zborow (якім іншыя называць толькі маленькае паселішча), што знаходзіцца прыкладна ў 6 мілях ад Zbaras, і біўся з ворагам, што той страціў каля 10 тысяч, таксама 9 тысяч памёрлі ад сьмяротных ран. Потым быў заключаны мір, і варожы лагер пад Zbaravia быў зьняты. Joach. Pastorius кажа, што польскае войска стаяла пад Zbarasio, старай спадчынай герцагаў Visniovesiйскіх, якое зьяўляецца мястэчкам і замкам; аднак лагер мусіў хутка быць аточаны самім татарскім ханам і Chmielnicio. Князь Visniovecius у польскім лагеры мужна

!старонка 160!

трымаўся, таксама і каралеўскі харунжы, Alexander Coniecpolscius, рабіў частыя вылазкі, а езуіт Muchavecius, добры стралок з байніц паклаў каля 200 казакаў. Нарэшце ў польскім лагеры паўстаў голад і вялікая нястача. Калі нехта насычваўся ад мёртвага канём, які загінуў ад недахопу ежы, то яго лічылі гурманам; таксама ў абкладзеных пачаўся дэфіцыт пораху. Калі потым надышоў пяты тыдзень ад пачатку аблогі, у рускае мястэчка Zborovio прыбыў кароль, які біўся з татарамі і казакамі, што атакавалі каралеўскі лагер; пасьля чаго быў накіраваны ліст да татарскага хана, на які той адказаў; таксама Chmielnicius напісаў каралю, пасьля чаго адбылося замірэньне; нават Chmielnicius сам прыбыў да караля, і варожае войска было адведзенае ад Zborovo, ці Zbarasio, а кароль зноўку вярнуўся да Glinianum і рушыў далей да Левенбурга. Зыходзячы з акалічнасьцей я лічу абодва вышэй узгаданых пункта Zborow і Zbaras адным горадам, што Starovolscii называў Zboraviam і Zbaraviam, а пемерлага ў 1651-м г. ад ліхаманкі Jeremiam Michaelem de Koributh, герцага Visnoviecz і Lubne, ваяводу на Русі і губернатара Пржэмысла, тым самым вышэй узгаданым герцагам, якому належыў Zbaras.

Zolkuja, горад у чырвонай Русі і

!старонка 161!

Русінскім Palatinat, дзе можна бачыць вельмі прыгожы замак, паркі і храм з усіх бакоў аздоблены мармурам.

Акрамя пералічаных рускіх населеных пунктаў у аўтараў можна знайсьці таксама наступныя: 1) Corsum, альбо Korsum, мястэчка пабудаванае каралём Stephano ў 1581-м г., дзе ў 1648-м г. палякі атрымалі

вялікую паразу ад казакаў. Ляжыць каля Дняпра, пры б. Рус. 2) Lubartova, Lubartow, добра населеннае мястэчка, і таксама добра разьмешчанае, што само ўтрымала сябе пад час казацкай вайны. 3) Orla, Фірлеянскае мястэчка. 4) Pavolocia, мятсэчка, якое належыла Johanni Zamoscio, præfecto Calussieni (пра яго чытаў вышэй адносна Zamoscio). 5) Trilisium, Trilissii, даволі монцы горад, ляжыць таксама ў Русі, у 6 мілях ад Кіева, 24-га жніўня 1651-га г. было захопленае польскім генэралам Прызімскім і спаленае, як пішуць у адной Relation. Joach. Pastorius кажа, што каралеўскія войскі гэтае мястэчка і замак захапілі сілай і не пашкадавалі ніякага ўзросту і полу, паколькі таксама жанчыны нанесьлі вялікія страты абложнікам; і ўсё мястэчка было цалкам спаленае, і паколькі дым быў бачны далёка, то багаты горад біскупа з Kiovia, Chuastovum, праз гэта настолькі спалохаўся, што казакі, якія яго захапілі, уцяклі ўсе разам з жыхарамі, якія звычайна маглі б абараняцца.

!старонка 162!

Аднак пазначаны горад Trilissii, ці Trylesii, ляжыць паблізу ад Biallacerkiew і зусім не далёка ад Pawolocz, ці Pavolocia. 6) У адной Relation пісалі, што ў 1648-м годзе казакі захапілі цудоўную крэпасьць Кудак, якую пабудаваў памерлы палкаводзец Канецпольскі на беразе ракі Дняпро, і х дапамогай якой ён хацеў закрыць казакам выхад ад Дняпра, ці Borysthene, ў мора ці Mare Euxinum, каб яны не давалі туркам ніякай нагоды для вайны. Piasecius называе гэтую крэпасьць Hudak і кажа, што яны была пабудаваная ў 1637-м г. на месьце злучэньня Samaræ і Borysthenem.

VI. Мазовія, Masovia, Мазурыя, разам з Дабрынскім краем.

Край Мазовія ляжыць амаль у цэнтры Польскага Каралеўства, паміж Прусіяй, Літвой, Русьсю і Польшчай. Starovolscius называе ў ім 4 вобласьці, а менавіта Плоцкае ваяводства, Падляшскае, тое, якое асабліва называюць Мазоўскім ці Мазурскім, і потым Дабрынскі край. Іншыя прыводзяць толькі 2 палатыната і адносяць Падляхію да Вялікага Герцагства Літоўскага, як таксама і я прыводзіў тут вышэй. Глядзі ранейшае Польс. Апіс. p. 24, там таксама прыводзіцца Плоцкае і Мазурскае, ці Варшаўскае, ваяводствы

!старонка 163!

разам з Дабрынскім краем, які ляжыць паміж Куявай і Прусіяй і мае тры раёны: Дабрынскі, Рыпінскі і Лібнеўскі; якія названыя паводле сваіх сталіц, і акрамя гэтых 3-х мястэчак там няма аніякага славутага места, за выключэньнем таго, якое агульна завецца Skompe, дзе мінарыта захоўваюць цудадзейную, як яны кажуць, выяву Марыі. Мястэчка Gurzno, што належыць біскупу Плоцкаму (які пануе над усёй гэтай аколіцай), таксама трошкі

вядомае, бо яно мае шмат вёсак пад сабой. Аднак у гэтым крае ёсьць 3 кашталянствы: Дабрынскае, Рыпінскае і Сланенскае.

Паміж Віслай і Прусіяй на ўсходзе ад гэтага Дабрынскага краю ляжыць Плоцкі палатынат, які падзяляецца на 4 раёны: Плоцкі, Заўкрыйскі, Млаўскі і Стэнскі. Мае дрэнныя мястэчкі, акрамя Siepercia (у якім ёсьць выява Марыі, якая мусіць рабіць цуды) і самага горада Ploscum, ці Polotzko. У гэтым палатынаце знаходзяцца 5 дзяржаўных дарадчыкаў, а менавіта біскуп, Palatinus і Castellanus Плоцкі і потым Разіянскі і Сеперчэнсктя кашталяны.

Мазоўскі Palatinat, ці ваяводства, мае свайго ўласнага біскупа, у астатнем, у духоўным сэнсе, знаходзіцца пад біскупам Познаньскім, ві Плоцкім ці з Luceoria. Аднак у гэтым Мазоўскім краі знаходзіцца

!старонка 164!

генэрал Palatinus і 7 Castellani: Cyrnensis, Varsoviensis, Vilnensis, Visogradensis, Zacrocimensis, Ciechanoviensis і Livensis; і гэтае Мазурскае ці Варшаўскае ваяводства падзяляецца на 12 раёнаў: territorium Cyrnense, Visnense, Zembroviense, Varsoviense, Nurense, Visegrodiense, Zacrocimense, Ciechanoviense, Lomzense, Rozanense, Macoviense і Livense; якія ўсе маюць гарады і мястэчкі з адпаведным імя ў якасьці сталіц. Акрамя якіх таксама ёсьць там біскупскі горад Pultovia, ці Pultowsky; Czernienscum, Minscum, Varsa, Vengrovia, Garvolinia (усе гэтыя мястэчкі вельмі славутыя сваім цудоўным півам), Stanislavovia, Vrocum, Viscovia, Seroicza і Lomza, дзе маецца езуіцкі Collegium. У часы Starovolscii ва ўсёй Мазовіі было шмат рыцарскіх родаў, і сярод іх самы старажытны рымски Valeriйскі, які, з яго словаў, мае ворана на гербе.

Цяпер з вышэй узгаданых населенных пунктаў і іншых, што маюцца ў гэтым краі, асабліва славутымі зьяўляюцца наступныя:

Czernienscum, на Вісьле, дзе ёсьць заможнае абацтва regulirваных канонікаў. У адной табліцы гэтае места, што зьмяшчаецца пад Варшавай, названа Чэрвеньск.

Чырско, ці Чэрско, знаходзіцца над узгаданым горадам Варшавай і таксама на Вісьле; і вядомы праз становішча, якое пан

!старонка 165!

Маркграф Фрыдрых фон Бадэн[257], Дурлах, меў тут у сакавіку 1656-га г., і ён рэціраваўся ад польскіх войскаў у тутэйшы замак, у старую, разваленую ратонду, і спаліў там панскі дом, царкву і іншыя будынкі наўкол, якімі вораг мог скарыстацца, а сам са сваімі людзьмі схаваўся ў ратондзе; пакуль вораг ад іх не адчапіўся, і яны маглі, хаця і з вялікай небяспекай, накіравацца да Варшавы; як пра гэта было надрукавана ў адным дакладзе.

Dobrinum, Добрын, на ўзгаданай Вісьле, альбо Vistula, паміж Плоцкам і Уладзіславам, які зьяўляецца сталіцай вышэй узгаданага Добрынскага краю, пра які можна чытаць у нашым ранейшым П.А. p. 106 & seq.

---

[257] у Рэчы Паспалітай.

Plocia, Ploscum, Plozko, які ляжыць трошкі на ўзгорку на Вісьле. У гэтым біскупскім горадземаецца шмат даволі заможных цэркваў, асабліва прыналежныя манахіням S. Maria Magdalena у прадмесьці; і бенедыктынскаму абацтву ў замке; там таксама знаходзіцца і багата абсталяваная біскупская царква, а ў ёй можна бачыць галаву S. Sigismundi, караля, убраную ў чыстае золата і аздобленую пэрлінамі і каштоўнымі каменьнямі. Трымацелі гэтай царквы маюць амаль аднолькавы даход з біскупам, і яе пробашч валодае цэлым раёнам і зьяўляецца галавой тамашней шляхты. Падрабязьней пра гэты горад глядзі ў закарнутым ранейшым нашым П.А. у

!старонка 166!

розных месцах, адпаведна рэгістру. Езуіты маюць там Collegium, аднак у замку яшчэ і Gymnasium, пад наглядам капітула. Плоцкаму біскупу належыць таксама мястэчка Gorzno, пад якім у 1629-м г. швэдскі генэрал цяжка разьбіў палякаў 9-га (19-га) лютага.

Pultovia, Pultowsko, горад і прыдворнае месца раней узгаданага бісупа Полоцкага, ці Плоцкага; які цалкам пануе над ім і належнымі да яго ваколіцамі; і таксама не можа быць appelirt ад яго да караля, але нават шляхта зьяўляецца яго паданымі, як у Varmensiйскага біскупа ў Прусіі, ці ў кракаўскага ў герцагстве Северскам. Тут маюцца кагляныя будынкі, а на скале прыгожа пабудаваны замак, які адначасова знаходзіцца на высьпе багатай караблямі ракі Narew, ці Narvia, дзе таксама знаходзіцца кляштар канонікаў і езуіцкі Collegium. У 1324-м г. Мазовія была спустошаная літоўцамі і гэты горад з 130 вёскамі і 30 цэрквамі быў спалены. У 1656-м г. швэды захапілі Pultowsko, і палякі потым марна абкладалі яго. Адтуль недалёка ляжыць горад Ciechanow, ці Ciechanovia, які разам з узгаданым горадам Pultowsko у 1337-м г. захапіў вялікі герцаг Літоўскі Olgerdus, аднак потым ён быў разьбіты мазурамі, і літоўцы

!старонка 167!

Таксама ў 1367-м г. таксама захапілі і спалілі горад і замак Pultowsko. Потым гэты край Мазовія, як таксама і Добрынскі, шмат пацярпеў ад іх, літоўцаў, таму што яны каля 1285-га года былі паклікаными Conrado[258], герцагам Мазовіі, на дапамогу, і спачатку забралі ў Ladislao[259] з Куявіі яго Gostininum, а потым зрабіліся ворагамі пазначанаму герцагу Конраду і адбілі ў яго Sochaczoviam і вышэй апісаны горад Plociam.

Stezycia, ці Stezycza, над Варшавай, дзе недалёка Вепш упадае ў Віслу. У1606-м і 1607-м г. Rokossiani, ці паўстаўшая супраць караля Жыгімонта шляхта, зьбіралася тут 2 разы на сход і адпраўлялі скаргі каралеўства ў пісьмовым варыянце каралю ў Варшаву.

---

[258] Конрад II Чэрскі (каля 1250 – паміж 23.06. і 21.10.1294) – князь мазавецкі, чэрскі, плоцкі і сандамежскі.

[259] Уладзіслаў Лакетак (па пол. Władysław I Łokietek; паміж 03.03.1260 і 19.01.1261 – 02.03.1333) – герцаг Каралеўства Польскага, князь Польск, кароль Польшчы з 20.01.1320 года (каранацыя ў Кракаве).

Varca, ці Warka, мястэчка на рацэ Pilcza, славутае праз добрае піва, якое там вырабляецца. Адтуль налічваецца 7 міль да Варшавы, таксама сюды прыходзілі швэды, і, як было надрукавана ў адным дакладзе ў 1656-м г., гэтае мястэчка мусіла быць спаленым у той вайне.

Varsavia, Varsovia, Варсаў, Варшава, славуты горад, дзе пэўны час таму зьбіраліся польскія соймы. Яго большае апісаньне можна прачытаць у нашым раней надрукаваным тэксьце, p. 203 seqq. Таму тут хачу прывесьці толькі тое, што я з таго часу новага пра

!старонка 168!

яго знайшоў, і што нядаўна там адбылося. Starovolscius кажа, што гэты горад знаходзіцца ў цэнтры Каралеўства Польскага, на 43 gradu longitud. 52 latit., у 40 мілях ад Кракава і Познані, і мае вялікі чатырохкутны Palatium пабудаваны каралём Sigismundo III і акрамя горада, у Viasdovia, мае яшчэ адзін разьмешчаны над Віслай сярод вельмі маляўнічых садоў палац, раскошныя цэрквы, і сярод іх найвыбітная – сьв. Яна Хрысьціцеля, якая мае сваіх Canonicos. У Кракаўскім прадмесьці, каля Viasdovia, стаіць прыгожа пабудаванная капліцы, у якой пакоіцца былы вялікі герцаг Маскоўскі, Joh. Demetrius Suiscius, які памёр у турме. У тых прадмесьцях знаходзіцца шмат палацаў вялікіх паноў, якія аднак па ўнутранай прагажосьці пераўзыходзіць памесьце караля Uladislai IV; і яго вялікая карціна, якую ён зрабіў для свайго найвысока ўзгаданага пана айца Sigismundo. І гэта ўсё кажа ён. Пры гэтым аднак трэба адзначыць, што Stanislaus à Kobierzycko піша, што гэта Basilius Suyskius (потым ён такім чынам называе яго) ранейшы вялікі герцаг у Маскве разам са сваім братам знаходзіліся ў Гасьціненскім замку ў шаноўным і вялікадушным палоне, і цягам году памёр там ад смутку, як таксама і яго брат Demetrius, чыі целы потым былі перавезеныя ў Варшаву. Калі аднак кароль Uladislaus IV заключыў саюз і вечны мір з

!старонка 169!

вялікім герцагам, то ён мусіў перадаць таксама гэтыя целы паслам, каб яны забралі іх з сабой у Маскву. І таксама Adamus Kisielius, пасол у Маскве, а ў астатнім Castellan і потым Palatinus Кіеўскі, чалавек грэцкай рэлігіі, мусіў атрымаць ад караля Uladislao мармуровую дошку з надпісам, якая стаяўла ў Варшаве, якую ён у 1647-м годзе прэзентаваў сярод шчырых пажаданьняў Alexio Michaeli, які менавіта пасьля сьмерці свайго айца атрымаў Маскоўскую Імпэрыю. Яшчэ ўзгаданы аўтар паведамляе, што італьянскі майстар Dolabella надта прыгожа намаляваў, як кароль Жыгімонт захапіў крэпасьць Smolenscum, а палкаводзец Zolkievius перавёз вышэй узгаданага вялікага герцага Suyscium у вышэй узгаданы палац сюды ў Варшаву на Сойм, і таксама прадставіў пасьляжыцьцёвыя выявы тагачасных паноў рады, прыдворных і шляхетных паноў. Раней тамашні мост праз Віслу лічыўся сярод архітэктурных цудаў Эўропы, аднак у 1603-м годзе ён быў пашкоджаны лёдам на адным пралёце, што адразу магло быць лёгка адрамантавана, калі б дрэва не расьцягнулі на патрэбу замка, нібыта хацелі пабудаваць больш моцны каменны мост; што адзначана

ў нашым ранейшым апісаньні. Таксама тут можна ўбачыць царкву Patrum piarum scholarum, у якую кароль Uladislaus

!старонка 170!

памясьціў парэшткі сьвятых Primi і Feliciani[260], якімі ушанаваў яго папа Urbanus VIII[261] праз кардынала Barberinum падчас яго знаходжаньня ў Рыме. Разам з бернардынскім храмам у прадмесьці. У 1607-м годзе, адразу пасьля заканчэньня сойма, тут нечакана распачаўся пажар, які зьнішчыў вялікую частку горада. У 1647-м годзе шмат шкоды тут прынесла вада. У 1655-м годзе Варшава без бою здалася каралю Швэцыі, які зрабіў сабе кватэру ў памесьці Ястова, што адбылося на самым пачатку верасьня. У Фракфурцкіх веснавых Relation ад 1656-га году стаіць, што замак і дамы гараджан, што ўцяклі, былі абрабаваныя; іншым аднак нічога не было зроблена, і падчас захопу не было страчана аніводнага чалавека. У наступным 56-м годзе палякі зноўку абклалі гэты горад і нават захапілі; а потым каля яго 18, 19 і 20-га ліпеня, па стараму кал., адбылася паміж абодвумя каралямі крывавая сеча, на якой таксама ўласнай персонай прысутнічаў курфюрст Брандэнбурга, і швэды з брандэнбуржцамі атрымалі перамогу, а Варшава пасьля гэтага зноўку стала швэдскай, і была вылішаная імі сваіх умацаваньняў і ператварылася ў адкрытае месца. У якасьці населеннага пункта, каля якога адбылася ўзгаданая сеча, у тых рукапісных і друкаваных дакладах называецца Прага і мястэчка на Вісьле вышэй Варшавы,

!старонка 171!

чыя назва аднак не ўзгадваецца ані польскімі аўтарамі, ані таксама ў краёвых сьпісах, наколькі я іх менавіта чытаў і разглядаў і знойшоў у той аколіца аднак толькі Powaski, Folwarki і Kamien.

VII. Памярэльле, альбо малае
Памор'е.

Гэты край шмат хто адносіць да Прусіі, таксама і жыхароў яго шмат хто заве Прусамі; бо яны і ў традыцыя і ў законах аднолькавыя з імі, і адрозьніваюцца толькі сваёй назвай і адасобленыя ад іх ракой Віслай: менавіта пагэтаму ў дадатку да часткі маёй Topographiæ Germaniæ, дзе ідзе гаворка пра Марк Брандэнбург і вялікае Памор'е, што належыць да Нямецкай Імпэрыі, я прывёў таксама Памярэльскія мясьціны разам з Прускімі. Паколькі аднак гэтая Pomerellia ўжо шмат год належыць да Каралеўства Польскага, таксама і Starovolscius і іншыя асобна апісваюць гэты край пад назвай Pomeraniæ Regiæ; то я хачу таксама тут паведаміць трошкі пра яе, асабліва тое, што не вайшло ў вышэй узгаданы дадатак.

---

[260] Прым і Феліціан (закатаваныя каля 297) – пакутнікі Рымскія.

[261] Урбан VIII (па лац. Urbanus PP. VIII; сьвецкае імя Мафео Барбарыні, Maffeo Barberini; 05.04.1568 – 29.07.1644) – папа рымскі з 06.08.1623 – 29.07.1644.

Аднак шмат разоў узгаданы польскі аўтар Starovolscius прыцягвае сюды Гнаньск у якасьці сталіцы і падзяляе ўвесь край на 7 раёнаў: Sluchoviense, Tucholiense, Suecense, Dersaviense,

!старонка 172!

Zucoviense, Pudense і Mirachoviense. Да якіх таксама далучаюцца файныя мясьціны Cratna і Cassubia, у першым з якіх знаходзіцца Карановенскае абацтва, надта заможнае, а ў другім аднак, у Кашубіі, знаходзяцца некалькі феодаў, ці прысутных месцаў. Найвыбітнымі населеннымі пунктамі тут, у гэтай зямлі, зьяўляюцца: Puckum, Sluchovia, Stargardia, Neimburgum, Meva, Schoinicia, Dersavia, якія ўсе маюць таксама і замкі, астатнія аднак не маюць. Таксама ў гэтай правінцыі маецца шмат заможных абацтваў, як цыстэрыянскае ў Olivia і Peplina; манашак у Zarnovecia на беразе мора і ў Zukovia, ці Зерновіц, і ў Сукаў; картузскае каля Гданьска, такім чынам некаторыя з гэтага ордэна раскіданыя па ўсёй Прусіі. Далей цяпер ідзе апісаньне найвыбітных мясьцін, трошкі большае, чым прыведзена вышэй, разам з некаторымі іншымі пунктамі, а менавіта:

Asterinum, Гамерштайн, мястэчка, якое асабліва праславілася, калі ў 1627-м годзе польскі палкаводзец Koniecpolsky захапіў там 2-і швэдскі полк, забраў у іх зброю і сьцягі і адпусьціў іх на волю, акрамя іх камандзіраў, якіх ён пакінуў у палоне, як кажа Starovolscius.

Bidgostia, Біргаст, замак пра які можна прачытаць у Micrælius lib. 2 Pomer. p. 277. Глядзі, як таксама і пра новае мястэчка Бішмарк, у вышэй узгаданым нашым новым дадатку, p. 9 & seq.

Bitovia, Бітаў, горад у Кашубіі, аднолькава доўга належыў паморскім герцагам, як і быў польскай

!старонка 173!

калоніяй; аднак пасьля сьмерці апошняга герцага Bugislai XIV[262] ў 1637-м годзе зноўку вярнуўся да Польшчы. Зараз адтуль прыходзіць шмат газэт, пакуль гэтае месца занятае швэдскім альбо Кур-Брандэнбурзскім гарнізонам. Таксама пішыцца як Байтаў.

Bromberga, Бромберг, які палякі называюць Bedgosky, ляжыць на рацэ Bro каля Crone і Verdon на мяжы з Куявіяй ці Вялікай Польшчай. Швэды ў 1655-м годзе занялі гэтае месца, аднак у 56-м годзе палякі зноўку вярнулі гэтае мястэчка і жорстка абыйшліся з тамашнімі немцамі. Замак аднак застаўся за швэдамі. І потым з Кольберга пісалі 1-га (10-га траўня), што Бромберг, Нахель, Швэц і іншыя мясьціны, якія палякі адбілі, былі recuperirt швэдамі, усё было зьнішчана і падпалена; тады швэдскі гарнізон у Krzepizo надта люта абыйшоўся з польскімі сялянамі, што штурмавалі гэтае месца. У адным іншым дакладзе прыводзілася, што Бромберг толькі 31-га траўня быў зноўку заняты швэдамі. Limmerus аднак кажа, што 18-га траўня 1656-га году тамашні замак здаўся на discretion генэралу Ўрангелю: то бок таксама і замак мусіў перад тым быць заняты

[262] Богуслаў XIV (па поль. Bogusław XIV; 31.03.1580 – 10.03.1637) – апошні герцан Паморскі. Таксама меў тытулы герцага Шчэцінскага і Кашубскага і прынца Рюгенскага.

палякамі. У лістападзе гэтае месца яшчэ заставалася за швэдамі; аднак пісалі,

!старонка 174!

што іх кароль паклікаў гарнізон да сябе ў поле і зрабіў гэты Бромберг адкрытым месцам.

Conicia, Коніц, горад, што зьмяшчаецца таксама на рацэ Bro, які Cromero называе Choinicia. Швэды часова завалодалі гэтым горадам, і калі палякі, на пачатку траўня 56-га году атакавалі гэты горад і нічога не атрымалі, то яны бязлітасна спапялілі яго прадмесьці. Каліс
ьці тут былі езуіты. Восеньню 56-га года кароль Польшчы Ян Казімір абклаў гэты горад,, у якім знаходзіўся князь Анхальта, і з accord зноўку захапіў яго.

Dautiscum, Данцыг, Гданьск, шырокавядомы горад, чыё падрабязнае апісаньне можна знайсьці ў вышэй узгаданым нашым дадатку да падзелу Topographiæ Germaniæ, дзе йдзе гаворка пра Марк Брандэнбург і Паморʼе, і часткова таксама ў маёй Нямецкай Падарожнай кнізе; там, у пазначаным дадатку, на 21-й старонцы, можна прачытаць пра крэпасьць Мюндэ, ці Вайксэльмюндэ[263], якая ляжыць у адной мілі ад Данцыга і належыць гэтаму гораду; там Вісла, ці Vistula ўпадае ў Балтыйскае мора. Таму хачу паведаміць толькі тое, што іншыя пішуць пра гэты горад, і я толькі нядаўна з гэтым азнаёміўся. Starovolscius кажа аднак, што горад ляжыць на 42 gradu longit. і 54 latit., цалкам зьяўляецца ерэтычным, шкада таксама тамашняга біскупа Officialem, ці Vicarium, перад якім

!старонка 175!

усе ерэтыкі з разнастайных сэкт займаюцца сваімі справамі, асабліва ў пытаньнях шлюбу. То ў духоўным сэнсе горад цалкам знаходзіцца пад біскупа з Uladislau, ці Куявіі, які піша сябе таксама біскупам Паморʼя (Памярэльля) і валодае там не малымі землямі, таксама і вакол Данцыга, дзе езуіты маюць царкву і Collegium, аднак дамініканы, кармеліты і манашкі маюць свае кватэры ў самім горадзе, як таксама і ўзгаданы Vicarius. Гэта ўсё, што кажа гэты паляк. Piasecius p. 501 хоча паведаміць, што жыхары Данцыга маюць свае вольнасьці только ад польскіх каралёў, а на p. 453, што іх паслам ў 1632-м годзе было дазволена, каб яны, як і прадстаўнікі гарадоў Кракаў і Vilna, маглі аддаваць свае галасы на выбарах караля. Той, што пісаў супраць Barclaium, кажа ў Polonia defensa, што яму вядома, што аднойчы у Данцыгу прышвартаваліcь на Вісьле пяць тысяч караблёў і плытоў. У 1361-м годзе літоўцы з гвалтам захапілі тамашні замак. У 1653-м там настолькі моцна лютавала эпідэмія, што напрыканцы месяца верасьня за адзін тыдзен было пахавана 640 чалавек. У 1655-м і 56-м годах гэты горад з жаху перад швэдамі быў яшчэ больш fortificirt і шмат прыгожых будынкаў было зьнішчана. Augustinus Limmerus паведамляе ў розных Relationen, што ў пазначаным 55-м годзе вяліся вялікія працы на зьнешніх умацаваньнях і ў прадмесьцях, у

!старонка 176!

[263] З ням. – Вусьце Віслы.

лістападзе, калі ў Новым Садзе, Шладэлі і Розэнталі былі зраунаваныя каля 50 будынкаў і прыгожых садоў. У 56-м годзе яны спалілі ў біскупскім прадмесьці цалкам Мотлаўскі завулак, з абодвух бакоў, да самой Шатландыі, потым таксама ўсю Шатландыю разам з езуіцкай царквой, і тое самае затым зрабілі з Петэрсхагенам; таксама і іншыя прадмесьці былі зачышчаныя і ruinirt. Дасюль словы аўтара. А з Гамбурга 26-га студзеня пазначанага году пісалі: хаця ў горадзе Данцыг пасьля таго, як яны спапялілі прадмесьці Шатландыя і Петэрсхаген, больш нічога не падпальвалі, аднак усё роўна моцна працавалі над зачысткай прадмесьцяў Шыдліц і Штольцэнберг, і праз гэта таксама ruiniren шмат прыгожых пабудоваў і садоў. Амаль тое самае стаіць у Франкфурцкіх вясеньніх Relation ад 56-га году, p. 76 seq., там далей таксама кажуць, што жыхары Данцыга працягваюць зачыстку Новага Саду і Біскупскай гары. Пасьля таго горад паказаў сябе непрыступным супраць швэдаў і хаця й позна, але адправіў войскі на вызваленьне Марыенбурга; яны зноўку занялі кляштар Olive і захапілі ў палон разьмешчаных там швэдаў, і працягнулі далей выказваць гэткую варожасьць на вадзе і зямлі, што істотна перашкодзіла швэдскім плянам супраць палякаў. Швэды ў сваю чаргу захапілі замак Грэбін, каля горада, разам з акопамі

!старонка 177!

і іншымі ўмацаваньнямі вакол яго; пра гэта сустракаецца ў адной Relation, што замак і лінія ўмацаваньняў Грэбін, каля Данцыга, у траўні перайшоў да швэдаў, як таксама і лінія ўмацаваньняў пад Штыбло (ці Штубелаў), а цэнтр Данцыга застаўся за жыхарамі Данцыга; Штутгоф таксама стаў швэдскім. Вышэй узгаданы Limmerus аднак кажа, што гэта было 13-га траўня, калі моцная данцыгская лінія ўмацаваньняў пад Штыбелаў была штурмам захопленая швэдскім каралём; затым швэды завалодалі ўсім Вердэрам, захапілі замак Дрэбін, цэнтр, гарадскі двор і іншыя месцы і загадалі больш fortificiren Гофат (лінію ўмацаваньняў Говат). 5-га (15-га) лістапада гэтага 56-га году сюды ўвайшоў кароль Польшчы Як Казімір. Глядзі ў Joh. Theod. Sprenger Polonia Nov-antiqua, N 19, пра прыхільнасьць Данцыга да каралёў польскіх, якая цягнецца з даўніх часоў.

Dersavia, Дзіршаў, які палякі называюць Tscozouo, Tisciovum і Tizovia, горад на Вісьле, які ў 1626-м годзе хутка захапіў кароль Швэцыі; а потым польскі палкаводзец Koniecpolsky зноўку трымаў у аблозе на працягу ўсёй зімы. Напрыканцы 1655-га году швэды зноўку завалодалі горадам і дагэтуль добра трымаюць яго за сабой.

Фрыдланд, мястэчка ў Памярэльлі, каля Ландэка, якое палякі ў лістападзе 56-га году з неабачлівасьці самі спалілі.

!старонка 178!

Гэле, мястэчка ў Кашубіі каля Балтыйскага мора, на паўвостраве.

Ландэк, у Памярэльлі ў ваколіцаз Шлохаў, якое таксама мусіць быць мястэчкам.

Лаўэнбург, горад у Кашубіі, у адной мілі шляху ад мястэчка Ланцык, які ўжо добры час належыць герцагам Паморскім, у якасьці феода ад палякаў; аднак у 1637-м годзе пасьля сьмерці апошняга герцага зноўку вярнуўся да Кароны Польскай і нядаўна быў захоплены швэдамі.

Мева, Мевэ, Gnievum, горад у Памярэльлі на рацэ Ферз, ці Fersa, якая там упадае ў Віслу. Часам называецца Меаў. Швэды захапілі яе ў 1655-м годзе. Limmerus кажа, што ў 1656-м г. у красавіку Швэц, Старгарт, Мева, Шонак, Накел, Таўхэль і Бромберг вярнуліся назад да Польшчы. Ранейшы кароль Швэцыі, Gustaphus Adolphus, у 1626-м годзе таксама захапіў Меву, якую палякі ў наступным годзе зноўку вызвалілі.

Nakla, Накель, Naclum, горад і моцны замак пасярэдзіне ракі Notecz у Памярэльлі. Швэды захапілі гэтае месца, аднак палякі яго зноўку вызвалілі. Гл. Мева.

Нойбург, Нойенбург, Neimburgum, Novum таксама памярэльскі горад на Вісьле паміж Данцыгам і Таруньню, які швэды захапілі таксама ў 1655-м годзе.

!старонка 179!

Oiiva, славуты цыстэрыянскі кляштар за межамі Данцыга, які ў 1655-м годзе быў заняты швэдамі, а ў 56-м г. жыхарамі данцыга.

Peplina, Пёлплін, заможна цыстэрыянскі, ці бернардынскі кляштар у 5 мілях ад Данцыга ў Памярэльлі.

Puckum, Puskum, Паўцге, моцнае мястэчка разам з моцным замкам на адной частцы Балтыйскага мора, якая сама называецца Паўцгервік, у Кашубіі, на мяжы Кашубіі і Памор’я. У 1594-м годзе, калі кароль Sigismundus III з 44 караблямі адплыў у Стакгольме са Швэцыі, то ён прыбыў да гэтага польскага марскога порту, адкуль ён рушыў да выйсьця Віслы ў мора і далей да Данцыга. У 1626-м годзе кароль Швэцыі атрымаў Пуцге пад сваю уладу. Аднак у 27-м годзе напрканцы сакавіка польскі палкаводзец Koniecpolski прымусіў швэдскі гарнізон у замку да капітуляцыі, у 1655-м годзе швэды доўгі час трымалі гэтае месца blocquirt, аднак, з-за пачатку суворай зімы, зноўку адступілі і мусілі адвесьці свае караблі ў нейкае іншае месца. У 1656-м годзе спатрэбілася зусім няшмат, каб гэтая крэпасьць праз дамову перайшла да іх, да швэдаў. Аднак жыхары Данцыга, сваечасова, даведаліся пра гэтую справу, і потым пісалі, нібыта кароль Польшчы падараваў гэты Пуцге гораду Данцыгу.

!старонка 180!

Schoinicia, Шонэк, мястэцка і замак, як кажа Starovolsc., у Памярэльлі і ў 5 мілях ад Данцыга. Глядзі Мева.

Sluchovia, Шлохаў, таксама мястэчка і замак у Памярэльлі, як паведамляе пазначаны Autor. Іншыя ўзгадваюць толькі замак, які мусіць не адрозьнівацца ад Марыенбурга. У Франкфурцкіх Веснавых Relation, за 56-ы год, напісана, p. 93, што гэты замак Шлохаў, хаця ён і быў дастаткова моцным і забясьпечаным усім неабходным, перайшоў з accord да швэдаў пасьля 5-і дзённай аблогі. У адной іншай Relation стаяла, што моцны замак Шлохаў у Памярэльлі, які пры гэтым таксама зьяўляецца горадам, у студзені пазначанага 1656-га года быў заняты швэдымі. А ў іншых, што каля кастрычніка потым тут і ў Коніцы князь Анхальта прасіў, каб разам з Коніцам таксама і гэты Шлохаў з accord здаўся каралю Польшчы; што аднак не атрымалася, бо потым паведамлялася, што палякі толькі ў лістападзе пачалі аблогу гэтага месца.

Stargardia, Старгарт, горад і замак таксама ў Памярэльлі на рацэ Ферз, паміж Шонэкам і Меве, які часам называюць па лацінску Starigrodum. У 1655-м і 56-м гадах быў заняты швэдамі і палякамі.

Suecia, Швэц, мястэчка і замак у Памярэльлі, да якога адносіцца ўласны раён. Ляжыць на Вісьле недалёка ад Сартовіца, які швэды

!старонка 181!

у 1655-м годзе на ласку і няласку захапілі ў сьнежні з дапамогай агня, які вецер ад некалькіх падпаленых у мястэчку будынкаў перакінуў на замак, а потым узялі таксама Таўхэль, Коніц, Нойенбург і Меву, як стаіць у Ляйпцэгскіх навагодніх Relation 56-га г. У адным друкаваным дакладзе паведамляецца, што ў наступным 1656-м годзе палякі разьбілі ў Швэцы некалькі швэдскіх атрадаў, аднак швэды ўтрымалі замак.

Таўхэль, мястэчка і замак разам з прыналежным яму раёнам у Памярэльлі на рацэ Bro, якое было занятае швэдамі у 1655-м годзе, аднак затым зноўку захопленае палякамі, і калі 23-га траўня 56-га году швэды зноўку, аднак без пяхоты, атакавалі гэтае месца, то швэдскій палкоўнік Вайсэнштайн быў падстрэлены з адной вежы, хаця і не сьмяротна. Яны падпалілі прадмесьці і зноўку адступілі. У 1623-м годзе гэтае месца належыла польскай каралеве Constantiæ, калі туды прыбыў яе пан і муж, кароль Sigismund.

Verdon, мястэчка ў Памярэльлі, на Вісьле, дзе рака Bro ўпадае ў яе. У адным друкаваным дакладзе называлася Vordon, і там было сказана, што паколькі тамашнія гараджане у 1656-м годзе сталі на абарону, горад быў большай часткай спалены швэдскімі войскамі. Гэта павінна было адбыцца 22-га ліпеня.

!старонка 182!

VIII. Прусія.

Паколькі гэты край апісаны ў дадатку да 13-й часткі маёй Topographiæ Germaniæ, дзе йдзе гаворка пра Марк Брандэнбург і Памор’е, то я хачу тут па-большасьці прывесьці толькі тое, што я з таго часу прачытаў пра яго ў іншых аўтараў, і тое, што там адбылося нядаўна, з прывядзеньнем пераліку найвыбітных мясьцін.

І па-першае піша Simon Starovolscius, што Прусія працягваецца ў шырыню на 50, а ў даўжыню прыкладна на 60 міль. Падзяляецца на каралеўскую і герцагскую, а каралеўская ў сваю чаргу на 3 часткі: Кульмскую, Марыенбурзскую і Варменскую, ці Эрмеландскую. У Кульмскай частцы, ці краі знаходзіцца таксама Міхаловійскі раён. Эрмеландскі край і герцагства належыць біскупу і катэдральнаму капітулу. У Кульмскай частцы, ці раёне, ляжаць мястэчкі Brodnicia, Grudentum, Radinum, Golubia, Rogozna, Brathianum, Covalia, Copriunicza, Lubavia, якія амаль усе аточаныя мурамі і маюць моцныя, добра пабудаваныя замкі. Аднак найвыбітным горадам там мусіць быць Торн, ці Torunia. У другой частцы, краі, ці раёне сталіцай зьяўляецца Марыенбург. Іншыя мястэчкі аднак: Stuma, Gnievum, Novum,

!старонка 183!
Stargardia, Orneta і асабліва Elbinga. Але нкаторыя з пералічаных тут ляжаць у Памярэльлі, як ужо было прыведзена вышэй у апісаньні той зямлі. Найвыбітным горадам трэцей часткі, ці Эрмеланда (якое зьяўляецца біскупствам і княствам, і дзе няма ніякага каралеўскага прадстаўніца, які б уладарыў па-над шляхтай) зьяўляецца Гайльсберг, далей ідуць Брунсберг, Гутштат, Алештайн, Рэсла, Форміт, Мельзак, Фатемберг, Зеберг і іншыя гарады падуладныя капітулу. Прусы большай часткай карыстаюцца правам сваёй зямлі, якое яны агульна называюць Кульмскім, акрамя трох гарадоў: Эльбінга, Брунсберга і Фраўэнберга, у якіх пануе Любекскае права. У герцагскай частцы мусіць знаходзіцца каля 60 гарадоў і мястэчак. Гэта тое, што ён кажа.

Аднак толькі што ўзгаданая герцагская частка належыла ў якасьці феода ад Кароны Польскай цяперашняму пану Прусіі Фрыдрыху Вільгельму, курфюрсту Брандэнбурга да 1656-га году; у якім, хутка пасьля яго пачатку, іх курфюрсцкая Сьветласьць сышлася са швэдскім каралём, панам Carolo Gustavo (які ўторгся ў Прусію з вялікім войскам, у якім прысутнічалі таксама польскія квартысты), каб далей recognosciраваць сваю частку Прусіі як феод ад Яго Швэдскай Каралеўскай Моцы; пра што можна падрабязьней прачытаць у Instrument заключанага ў Januario у Кёнігсбергу і потым у прускім Вартенштайне confirmirte міра, і ў выдвдзенных
!старонка 184!
з гэтай нагоды і ў друку наяўных Курфюрсцкіх паведамленьнях. Глядзі таксама Joh. Th. Sprengerum in Polonia Nov-Antiqua N 18, хаця потым пісалі, што былі створаныя новыя трактаты, каб паводле іх зрабіць герцагства Прусію цалкам незалежным, Paulus Piasecius, fol. 4, кажа, што каралём Польшчы Sigismundo III у 1609-м і 11-м годах з нагоды перадачы Прускага феода курфюрсту Яну Жыгімонту Брандэнбурзскаму была зробленая Formul, такім чынам, каб у яго былі succedirаваны толькі яго, курфюрста, і яго кроўнага брата, Johannis Georgii, герцага Йегерндорфа ў сілезіі, разам з Ernesti і Christiani Wilhelmi, арцыбіскупаў Магдэбурга, законным сынам, за выключэньне кульмбахскіх, аншпрахскіх і іншых франконскіх, якія не закранаюцца першай, складзенай паміж каралём Sigismundi I і Alberto Ansprachio дамовай. Глядзі аднак, што піша на гэты конт Joh. Limneus, tom. 4 de Jure publ. Imp. Rom Germ. з 776 да 813 старонкі.

Узгаданы польскі біскум паведамляе таксама, fol. 460, у 1633-м годзе, што герцагі Прусіі уласнай асобай прынялі прысягу каралю. Паколькі аднак кароль Uladislaus IV праз стан свайго здароўя і паводле прадпісаньня дактароў не мог у цьвярозым розуме ўзняцца з ложку і прысесьці, і паказваўся на публіке толькі, калі ён слухаў імшу ў пакоі,
!старонка 185!
і гутарыць зь ім было вельмі цяжка, і калі ён ляжаў у ложку, да яго падыходзілі толькі давераныя людзі, праз якіх прыходзілася вырашаць нават надта важныя рэчы, яны аднак з атрыманьнем гэтага доступа да караля перанялі такім чынам на сябе і дзеля свёй карысьці ўсе справы, таму таксама з-за гэтага герцаг Прускі прысягаў каралю праз пасрэдніка з іх

дапамогай. Аднак цяперашні пан курфюрст 17-га кастрычніка 1641-м г. атрымаў феод ад вышэй узгаданага караля Uladislao асабіста. І хаця прускія герцагі выступалі як першыя князьзя і як пасьля караля найшаноўныя incorporirte суб'екты Кароны Польскай, аднак яны ніколі не маглі патрабаваць атрыманьня месца ў Сойме і голаса на выбарах караля. Як у каралеўскай так сама і ў герцагскай частках маецца шмат шляхты, і ў каралеўскай асабліва славутымі зьяўляюцца паны Вайгеры, якія паходзяць ад Ernesto Weihero, палкоўніка некалькіх нямецкіх палкоў пад началам караля Жыгімонта Другога, ці Sigismundo Augusto, і караля Stephano, які праз свае мужныя ваенныя ўчынкі значна павысіў свой ранейшы шляхетны стан і здабыў славу ў Польшчы, потым асеў у Прусіі і там ажаніўся з адной жанчынай з вельмі старажытнага і высакародана роду Мортэсцье, ад якой нарадзіў сыноў Ludovicum, Johannem,

!старонка 186!

Melchiorem, Demetrium і Martinum; апошні з якіх, пад началам Sigismundo III, быў застрэлены ў Маскавіцкай вайне.

Пра старажытных жыхароў гэтай зямлі, пра іх войны, і як яны нарэшцэ былі падпарадкаваныя немцамі, таксама якія цяжкія войны мусіў потым весьці Нямецкі Ордэн з суседзямі, і асабліва з Польшчай і Літвой, пакуль вышэйшы магістр, маркграф Альбрэхт фон Брандэнбург, не зрабіў вышэй узгаданага караля Польшчы Жыгімонта Першага герцагам Прусіі, пра гэта можна прачытаць у Cromerus, Hennenberger, Chytræus, Schützius і ў шматлікіх іншых; з якіх я не мала прывёў у маёй Itinerarium Germaniæ і ў вышэй азначанай Topographiam. Хачу толькі дадаць тут з надрукаванай у 1650-м г. Historia Lituana новага Autoris, Alberti Kojalowicii, акрамя таго, што ўжо было прыведзена вышэй у падзеле пра Літву, наступнае, а менавіта тое, што Nadrovitæ, пасьля таго як амаль усе прускія народы трапілі пад уладу крыжакоў, альбо Нямецкага Ордэна, а самі яны пацярпелі паразу ў сечы, пажадалі лепш жабраваць, чым прыслужваць, і таму разам з жанчынамі і дзецьмі уцяклі ў Літву ў 1270-м г., бо з-за Судаўскіх прусаў жамойты спусташылі прускі край, а потым з іх дапамогай судаўцы зноўку ўзьнялі бунт, і хаця яны спачатку пацярпелі паразу ад крыжакоў,

!старонка 187!

потым аднак яны люта адпомсіцлі апошнім. Каля 1279-га году гарады Lubavia і Culmigeria былі спаленыя літоўцамі. У 1285 г. атрутныя чэрві падобныя ракам ці скарпіёнам прынесьлі вялікую шкоду адначасова ў Прусіі, Жамайціі і Курляндыі. Хто быў ужалены імі, не пражываў і тры дні, і ніякія лекі не ратавалі ад гэтага. У настыпны час, Vitenes, літоўскі герцаг, павёў падвойнае войска супраць крыжакоў і дабрынцаў і спаліў горад Добрын, а ў той сечы таксама загінуў вышэйшы магістр з 30 рыцарамі. У 1311-м г. Vitenes люта спусташыў Эрмеланд і спаліў мястэчкі, гарады і цэрквы; а ў 1328-м Gediminus, герцаг літоўскі, хаця і быў паганцам але аказаў дапамогу супраць крыжакоў князю Польшчы Ladislao, хрысьціяніну, і спусташыў Прусіі, крыжакі заключылі мір з Ladislao і атакавалі Літву і Samogitia, і вынішчылі замак Velona на Nemeno. Gediminis хацеў вызваліць Velonam і абклаў пагэтаму Fridburgum і Bejerum, аднак быў падстрэлены там у 29-м

г., калі ў той час у прусаў упершыню зьявіліся гарматы. У 1342-м г. Прусія была люта спустошаная літоўцамі, а затым таксама і Літва ў 43-м г. была, хаця і са стратамі, атакаваная нямецкімі князьямі з дапамогай венграў, багемцаў і датчан.

!старонка 188!

У 1346-м г. аднак прусы спусташылі ўсю Жамайцію і Літву, і таксама перамаглі ў адной сечы супраць літоўцаў. У 48-м г. Літва зноўку пацярпела ад прусаў, а затым прускі край ад літоўцаў і русінаў. У 49-м г. літоўцы былі разьбітыя прусамі і пакінулі на полі боя 18 тысяч сваіх ваяроў. У 1354-м, 55-м, 56-м, 60-м, 61-м гг. бесперапынна ішла вайна паміж літоўцамі і прусамі, што таксама адбывалася і ў наступныя годы. У 1370-м г. літоўцы люта пабілі Прускі край, аднак у адной сечы атрымалі паразу; хаця пры гэтым прусы страцілі свайго вышэйшага магістра і шмат рыцараў. І вайна таксама і потым увесь час цягнулася, пакуль Літва не прыйшла да Польшчы і потым вышэйшыя магістры Прусіі атрымалі праблемы з каралямі Польшчы, як пра гэта можна падрабязна прачытаць у вышэй прыведзеных Autoribus.

А я цяпер накіруюся да найвыбітных прускіх мяьсцін, зь якіх тут маюцца:

Аленбург, мястэчка паміж Гердавенам і Вэлаўн аточанае трымя рэкамі: Омэт, Ала і Швэнэ.

Аленштайн, па польску Ольсцінек, мястэчка пабудаванае ў 1367-м г., мае замак і панства, якое мусіць мець 70 (ці 77) азёраў і такую самую колькасьць вёсак. Гэтае места належыць біскупам Фраўэнбурга.

!старонка 189!

Альтгаўз, ці Starigrodum, горны замак каля Кульма.

Ангербург, мястэчка і замак у Бартэнладзе, які зьяўлляецца герцагскім. У 1365-м г. князь Kieystutus, з Літвы, захапіў гэтае места: яго брат Olgerdus аднак разбурыў замкі Tilzam і Ragnetam і некалькі мястэчак.

Balga, герцагскі замак каля новай гавані паміж Гайлігпайлям і Брандэнбургам.

Бартэн, герцагскае мястэчка і замак у Бартэналандзе.

Бартэнштайн, мястэчка ў тым самым рэгіёне, у 1½ мілі ад Шліпенбайля, дзе ў 1656-м годзе кароль Швэцыі некалькі дзён вёў перамовы з панамі курфюрстамі Брандэнбурга і прыйшоў да пагадненьня.

Брандэнбург, адкрытае мястэчка і прыгожы герцагскі замак, якое ляжыць далей пасьля новай гавані ў 2½ мілях ад Кёнігсберга.

Браўнсберг, Брунсперг, файны горад у Эрмеландзе каля ракі Пасерг, умацаваны і належыць біскупу Эрмеланда, ці Varmia. Martinus Cromerus, польскі Historicus, які памёр у 1589-м г., быў туташнім біскупам, як таксама і кардынал Stanislais Hosius, які пабудаваў там для езуітаў Collegium. Paulus Piasecius піша, што кароль Швэцыі, Gustavus Adolphus, у 1626-м г. каля Пілаў, быў прыняты герцагскімі людзьмі без аніякага гвалту, якія вывелі прускі герцагскі

!старонка 190!

гарнізон, а на яго месца пусьцілі швэдскі. У іншы дзень ён прывёў свае ваенныя караблі на гэты заліў, які называецца новай гаваньню і адзьдзяляецца ад мора, Балтыйскага, выспай Нерынг, а з іншых бакоў

закранае біскупства Эрмеланд і Эльбінгійскія палі, і паставіў іх пасярод гэтага заліва на якар. 8-га ліпеня з гэтай гавані ён высадзіў войскі на бераг ракі Passeria, моцна накіраваўся да Браўэнсберга і без цяжкасьцей захапіў гэты горад, а потым таксама Фраўэнберг, Эльбінг, а на трэці дзень Марыенбург, які быў без гарнізона, і авалодаў таксама Діршаў і Мевай. Аднак некалькі месяцаў перад тым у Браўнсберзе абрынулася частка гарадскога мура, так сама як і ў Магдэбурзе перад той вайной абрынулася з аднаго боку сто локцяў мура. Гл. ніжэй у Пілаў.

Лавернік, мястэчка на Дрыбенцы каля Брэтхема, належыць біскупу Лёбаў.

Крыстбург, паміж Кульмам і Зальфельдам, замак, каля якога мусіць ляжаць мястэчка. У 1626-м г. швэды захапілі таксама і гэтае места.

Крэнтэн, маленькае герцагскае мястэчка на Прэгелі вышэй Кёнігсберга; паводле паведамленьняў.

Кройцбург, мястэчка, якое ўзбунтаваўшыеся прусы ў 1261-м годзе аднялі у Нямецкага Ордэна.

!старонка 191!

У 1414- м яго занялі пад сваю уладу палякі разам з Ніобургам, Гоэнштайнам, Алештайнам, Ціргонам, Бішофсфердэнам, Рызэмбургам і Гутштатам.

Кульм, Colmia, Chelmum, сталіца Culmigeria, ці Кольмскага краю ў тым каралеўскім кавалку Прусіі і ў 5-ці мілях ад Торна, на Вісьле; аднак у параўнаньні са сваім памерам не лепшым чынам населеная. Належыць, як кажа Starovolscius, свайму біскупу. Мае надта прыгожыя цэрквы і вельмі заможны жаночы кляштар, ubi casula tota diamantibus maximis preciocissimisque exornata, circumducta autem circumcirca catenâ aureâ, pulcherrimis gemmis distincta[264]; як узгаданы Starovolscius кажа пра свае часы, ня ведаючы, ці ва ўсіх цэрквах тут захаваліся падобныя каштоўныя casula.

Кульмензээ, горад, дзе часьцей за ўсё трымае свой двор кульмскі біскуп, які называецца таксама біскупам Лёбаў, паколькі часам ён квартыруецца там.

Домнаў, Домпнаў, мястэчка ў правінцыі Натанген, якое належыць панам курфюрстам Брандэнбурга у якасьці прускіх герцагаў, наколькі мне вядома.

Эльбінг, сталіца ў Гокерландзе і прыемны, прыгожы, з дагледжанымі завулкамі, вежамі, новымі валамі і больверкамі, добра абараняемы каралеўскі і дзеля гандлю выгадна разьмешчаны на рацэ Эльбінг паміж новай гаваньню і возерам Драўзэн

!старонка 192!

горад, які ў 1626-м годзе лёгка, а ў 55-м годзе дабравольна перайшоў да швэдаў; прычыну гэтага трошкі адлюстроўвае польскі біскуп Piasecius, тым што піша пра 1618 год, p. 311, наступнае: Elbinga civitas, proscriptione Regiâ adacta, Ecclesiam parochialem ritui catholico restituit; sed altâ mente reposita illâ offensâ, exinde

[264] Дзе памяшканьне было цалкам ўпрыгожанае дыямантамі найвялікшай каштоўнасьці, цалкам аточанае наўкол залатымі ланцугамі з прыгожымі каштоўнымі каменьнямі.

à Rege & Regno Poloniæ, alienatiori animo esse coepit[265]. Калі ў 1635-м годзе паводле заключанага паміж Польшчай і Швэцыяй міру гэты горад зноўку вярнуўся да Польшчы, то было падкрэсьлена, што ён захавае свае старыя вольнасьці і эвангельскую рэлігію; аднак большая, ці фарная, царква была перададзеная каталікам на выкарыстаньне. Пра пункты дамовы, паводле якой Эльбінг 12-га сьнежня пазначанага 1655-га году здаўся цяперашняму каралю Швэцыі, можна прачытаць у August. Limmero, у вялікодніх Ляйпцыгскіх Relation 56-га году, pag. 4 і 5.

Айлаў, прускі і нямецкі Айлаў у Натангіі і Памор'і, і абодва мястэчка, наколькі мне вядома, герцагскія; і ў ваколіцах прускага Айлаў растуць прыгожыя і моцныя цісы.

Фішгаўзэн, маленькае герцагскае мястэчка на Новай гавані ў 5-ці мілях ад Кёнігсберга, якое мае замак.

Фраўэнберг, Фраўэнбург, які Cromero па лацінску назвае Varmia, маленькі горад у Гокерляндзе,

!старонка 193!

каля новай гавані, які належыць біскупству Эрмеланд, альбо Гайльсберг. Катэдра стаіць на гары, а наўкол жывуць канонікі, якія зьяўляюцца нямецкімі і польскімі арыстакратамі, і маюць пад сваёй уладай 70 вёсак, 70 рыбных прудоў і 2 замка. У 1656-м годзе кароль Швэцыі, пан Carolus Gustavus, са сваёй каралеўскай супругай, знаходзіліся тут на доўгі час з-за здаровага паветра, бо ў Марыенбурзе, Эльбінге, Торне і іншых мясьцінах Прусіі лютавала чума.

Фрайштат, герцагскае мястэчка ў Pomesamia.

Фрыдэк, па польску Wambrisna, мястэчка ў Кольмійскім краі.

Фрыдланд, мястэчка ў Натангіі, у герцагскай частцы, паводле абставін; як таксама і мястэчка Гардэнзэе, ці Schlemmo, у Pomesamien, і замак Георгенбург у Nadravia, на Прэгелі.

Гардаўэн, герцагскі замак і мястэчка ў Бартэнляндзе.

Гільгенбург, наколькі вядома, таксама герцагскае мястэчка, якое палякі называюць Даброўна.

Гольба, Голуп, Goluba, замак, каля якога павінна быць мястэчка, паміж Страсбургам і Торнам у каралеўскай частке; дзе дагэтуль жыла сястра караля Польшчы Sigismundi III, паненка Анна са Швэцыі, паколькі ёй належыла гэтая пасада; там таксама яе наведваў яе найвысока узгаданы

!старонка 194!

пан брат у 1623-м годзе. Глядзі ў падзеле пра Страсбург.

Гольдап, герцагскае мястэчка ў Судавіі, на рацэ Гольдорп.

Граўдэнц, Grudentum, горад і замак на Вісьле і Ошы, нібыта на высьпе; у астатнем аднак знаходзіцца ў Кольмінскім краі і каралеўскай частке Прусіі, і палякамі называецца Грудшыянц; сюды ў сьнежні 1655-га году праз заключаную дамову ўпусьцілі швэдаў, якія потым пабудавалі акопы вакол яго і яшчэ ў лістападзе 56-га году трымалі яго пад сваёй уладай.

---

[265] Жыхары Эльбінга, даведаўшыся пра каралеўскую забарону, аднавілі ў прыходскіх цэрквах каталіцкі рытуал, аднак захавалі ў глыбіні крыўду, у выніку чаго пачалі ў сэрцы адыходзіць ад караля і Кароны Польскай.

Гутштат, мястэчка ў краі Глотаў, належыць біскупу Эпмеланда ці Гайльсберг. У 1626-м годзе швэды захапілі гэтае места, палякі аднак зноўку выгналі іх адтуль.

Гайлігенпайл, маленькае мятэчка на тэрыторы Натангіі, паміж Браўнсбергам і Брандэнбургам, недалёка ад новай гавані.

Гайльсберг, горад, замак і рэзыдэнцыя эрмеландскага ці вармійскага біскупа, на рацэ Але, паміж Гутштатам і Бартэнштайнам.

Хоэнштайн, па польску Meloelstineck, мястэчка паміж Остэродам і Пасэнгаймам.

Голанд, герцагскі горад у Гокерландзе, у баку Эьлбінга. У 56-м годзе 18-га і 19-га чэрвеня

!старонка 195!

тут сустракаліся кароль Швэцыі і курфюрст Брандэнбурга.

Ёгансбург, палякамі назваецца Пыш, таксама герцагскае мястэчка, разам з прыгожым і моцным замкам, у Судавіі.

Інстэрбург, месцамі называецца Юстэрбург, таксама герцагскае мястэчка і замак у краі Nardavia, разам з яго падуладнымі тэрыторыямі, якія цягнуцца на 13 міль у даўжыню і 8 у шырыню; там, у часы Генэнбергера, пражывалі амаль толькі літоўцы, і звыш 15 000 былі шаўцамі. У 1366-м годзе прусы нанесьлі страты Літве, а літоўцы ў сваю чаргу спалілі горад Інстэрбург і зраўнялі з зямлёй Вілавіенскі і Тапіавіенскі раёны. У 1377-м годзе Vitoldus, сын літоўскага князя Kieystuti, разабраў тамашні замак.

Кёнігсберг, Regius mons, Regimontum, сталіца гэрцагскай часткі і рэзыдэнцыя пана курфюрста Брандэнбурзскага ў якасьці герцага Прусіі, ляжыць на 54-м gradu latit. і 43-м long.; яго падрабязнае апісаньне можна знайсьці ў вышэй прыведзеным дадатку да 13-й часткі маёй Topographiæ Germaniæ, fol. 31 &seqq. Тут яшчэ толькі трэба дадаць, пра гэта можна прачытаць ў тым самым творы на fol. 32-а на 5-м радку, што ён мае прыгожыя глыбокія сутарэньні працягласьцю 199 футаў. Таксама, што тут у 1649-м годзе са 100 студэнтаў, што харчаваліся ў Communitet, за некалькі дзён памёрла 76; як пазначана ў 6-й частке Theatri

!старонка 196!

Europæi. Таксама і тое, што ў пазначаным 49-м годзе, 1-га траўня, тут памёр магістр Ульрых Шойнбергер, Philosophus і знаўца сямі моваў, ураджэнец горада Вайдэн, у Верхнім Пфальцы; які, калі яму было ўсяго 2½ гады, цалкам страціў зрок праз воспу, альбо вятранку, і пры гэтым усё роўна стаў настолькі разумным, што навучаў іншых мовам і філасофіі, трымаў Collegia Arithmetica, граў на арганах і іншых інструментах і нават сам рабіў музычныя існтрументы, і ўмеў карыстацца гарматамі, агнястрэльбамі і арбалетамі. У 1653-м годзе тут за адзін тыдзень ад чумы загінула каля 490 чалавек. У 1656-м годзе падчас сьвяточных дзён пяцідзесятніцы тут адбыўся пагром супраць палякаў; частка пагромшчыкаў параспранала палякаў у папскіх цэрквах да сподняга, а кабет да кашуль, з іх шый зьдзіралі ланцугі і каралі, плюндравалі цэрквы, зьбівалі сьвятароў; а потым таксама ўрываліся ў польскія хаты і г.д.; пасьля чаго некаторыя з пагромшчыкаў былі павешаныя паводле курфюрсцкага загаду. Надалёка ад Кёнігсберга ляжыць вёсачка Рудоў, там, як паведамляе M.H. Sebaldus у сваім Breviario

historico, на старонцы 638, у 1614-м годзе адзін пастар заўважыў у чашы вену, якая, падчас раздачы сьвятой вячэры сачылася ружовай крывёй. Ён прыціснуў яе альтарным покрывам, якое стала чырвоным,

!старонка 197!

і паводле патрабаваньня пана маркграфа Яна Жыгімонта было адпраўленае ў Берлін разам з адкрытым лістом.

Лабяў, замак на рацэ Дэме, каля Курляндскай гавані.

Ландсберг, мястэчка ў Натангіі паміж Бартэнштайнам і Цынтэнам.

Лесэн, па польску Лясцын, мястэчка ў Памезаніі, якое цяпер аднак адносіцца да Кольмійскага краю, і адпаведна да каралеўскай часткі.

Лойненбург, мястэчка каля Бартэна, дзе адбылася гісторыя са шляхціцам; пра гэта ў 19-й жалобнай гісторыі.

Лецэн, мястэчка і замак у Гокерладзе.

Лібмюль, па польску Міломлын, мястэчка ў Памезаніі паміж Морунгам і Остэродам у герцагскай частцы.

Лібна, мястэчка ў Міхелаў, недалёка ад Голупа.

Лібштат, мястэчка ў Гокерландзе паміж Моругам і Вормдітам.

Ліцк, мястэцка ў Судавіі, герцагскай, і дзе ў 1588-м годзе быў усталяваны княскі сталец.

Лобаў, горад і замак, дзе кульмскі біскуп дагэтуль трымае двор. Навакольныя землі называюцца Lobovia.

Маркграфштат, ці Маркграбова, новы герцагскі горад.

!старонка 198!

Марыенбург, агульна Маргенбург, сталіца каралеўскай часткі Прусіі, якая зьмяшчаецца ў 6-ці мілях ад Данцыга на адным рукаве Віслы, што называецца Nogatum, ці Ногат, і цячэ да новай гавані. У 1648-м годзе тут на працягу чатырох дзён была бачная камета, хвост якой цягнуўся на поўнач. У 1651-м годзе паміж Граўдэнцам і Марыенбургам у Вэрдэры на 2 мілі шляху разьлілася вада, што людзям і быдлу паўсюль былі нанесеныя вялікія страты. Пад Граўдэнцам да жалю патанула 500 чалавек, а пад Марыенбургам і Эльбінгам, у Вэрдэры, каля 1000 чалавек; таксама дзьве вёскі, з хатамі, падворкамі, быдлам і людзьмі, былі змытыя, што потым немагчыма было распазнаць, што тут наогул калісь стаялі вёскі, ці хаты. У 1655-м годзе швэды захапілі гэты горад, аднак замак, у якім знаходзіліся паны Якаб і Людвіг Вайгеры, як таксама і барон Гульдэнштэрн, абараняўся да 2-га сакавіка 56-га году, калі здаўся з accord, а потым пан Людвіг Вайгер памёр раптоўнай сьмерцю; я лічу, што гэта быў той пан Людвіг Вайгер, які ў 1629-м годзе са сваім гувернёрам спыняўся ў Падуі.

Марыенвердэр, які Cromero называе Quizinum, горад, замак і ўмацаваная катэдра ў Pomesamia на рацэ Nogot, ці Nagot, дзе ў яе ўпадае Лібэ. У 1655-м годзе ў

!старонка 199!

сьнежні, гэтае места было захопленае швэдамі.

Мельзак, мястэчка і замак ў Эрмеландскім біскупстве на рацэ Вальша.

Мемель, Мемельбург, па курляндску Cleupeda, а Cromero называе яго Troipes, надта моцны замак і горад на рацэ Танге, дзе яна ўпалае ў Курляндскую гавань ў салёнае Балтыйскае мора, які належыць панам

курфюрстам Брандэнбурга, як герцагам Прусіі, разам з яго гаваньню, альбо портам і ляжыць у 16 ці 18 мілях ад Кёнігсберга каля Жамайцаіі і Курляндыі. У 1323-м г. Замланд у Прусіі быў спустошаны літоўцамі, якія люта абыйшліся з гарадком Мемель, ці Memelo; замак аднак выстаяў.

Морунг, мястэчка і замак у Памезаніі, паміж Гутштатам і Зальфельдам.

Мюльгаўзэн, мястэчка ў Pogesamia, ці Гокерландзе, паміж Эльбінгам і Мельзакам, і зьяўляецца герцагскім. Таксама маецца іншы Мюльгаўзэн у Натангіі.

Нойдэнбург, мястэчка і горны замак у землях Галіндыі.

Ноймаркт, па польску Новамясто, мястэчка на рацэ Дрыбенц у каралеўскай частке, умацаванае. Іншы Ноймаркт ляжыць каля Крыстбурга.

Нойтайх, мястэчка ў вялікім Вэрдэры, на рацэ Швэнтэ.

Нордэнбург, мястэчка і замачак,

!старонка 200!

разам з належнымі да яго надзеламі, у герцагскай частке.

Oletzko, Olescum, мястэчка блізка ад літоўскай мяжы, таксама герцагскае; у 2-х мілях шляху ад яго ў 1656-м г. шведы і брандэнбуржцы 22-га кастрычніка разьбілі палякаў і татар, а захопленага сярод татак князя Bogislaum Radzivil зноўку вызвалілі.

Ортэльсбург, герцагскі замак у Galindia, на рацэ Вальпуш, каля Пасэнгайма, які па польску называецца Жытно.

Остэродэ, мястэчка і замак на Дрыбенцы.

Пасенгайм, мястэчка ў Галіндскім краі, каля возера Шобэн.

Пілаў, вёска і крэпасьць, разам з шырокавядомым і панам курфюрстам Брандэнбурга, як герцагам Прусіі, належнай марской гаваньню, ці портам; куды з Кёнігсберга па Прэгелю плыць 7 міль. Глядзі пра гэтае места, і як Борн, ці Агтштайн, былі пабудаваныя ва ўсёй гэтай вакліцы на ўзьбярэжжы Балтыйскага мора, пра што падрабязна прыведзена ў вышэй закранутым нашым першым дадатку да 13-й часткі Topographiæ Germaniæ; там таксама можна прачытаць у якім стане кароль Швэцыі Gustavus Adolphus заняў пазначаную крэпасьць, акопы, ці блокгаўз у 1626-м г.; а што пра гэта паведамляюць у сваю чаргу палякі,

!старонка 201!

пазначана вышэй у апісаньні Браўнсберга. У замірэньні, якое заключылі швэды і палякі ў 1635-м г., каралева Швэцыі Крысьціна таксама зноўку адняла гэты Піллаў, альбо Пілаў, у паноў курфюрстаў Брандэнбурга.

Пройшмарк, мястэчка і надзелы, што знаходзіцца большай часткай у возеры, адкуль выцякае Сіргуна.

Рагніт, альбо Рангніт, на рацэ Мемель, у Шалаўнах, альбо Schalavonia, славуты горад, альбо замак.

Растэнбург, мястэчка і замак у Бартэнландзе, герцагскае.

Рэдэн, мястэчка і замак у Кольмійскім краі, паміж Граўдэнцам і Фрыдэкам, якое палякі называюць Радзімі.

Райн, па польску Torino, славуты замак.

Рэсель, мястэчка і замак на возеры Цайн.

Рызэнбург, Prabutha, мястэчка і замак у Pomesamia, паміж Крыстбургам і Фрайштатам, стаіць каля азёр Сарген і Лібеніц і ракі Лібы; у пазначанай Памезаміі ляжыць таксама мястэчка Розэнберг.

Салаў, на Прэгелі, паміж Таплаўканам і Георгенбургам, вышэй Кёнігсберга, у Надравіі, мусіць быць мястэчкам.

Зальфельд, мястэчка ў Pomesamia, каля возера Мэблінг, паміж Рызэнбургам і Морунгам, і адносіцца да Кёнігсберга.

Шыпэнпайль, герцагскае мястэчка

!старонка 202!

паміж Бартэнам і Бартэнштайнам, якое амаль цалкам аточанае ракой Ала, а з іншых бакоў да яго падыходзіць возера Цайн. У студзені 1656-м г. тут зьмяшчаўся штаб караля Швэцыі.

Шонзэе, Covalovia, мястэчка і замак, чыё месца па рознаму ўзгадваецца ў гісторыях.

Зэебург, мястэчка і замак паміж Гайльсбергам і Вартэнбургам.

Зэнсбург, таксама мястэчка ў Галіндыйскім краі, каля возера Шос і ў адной мілі ад Зэстэна, ці Шчэсно.

Солдаў, па польску Дзялдоф, мястэчка і замак у Lobovia і на мазоўскай мяжы.

Страсбург, Brodnicia, горад і замак на Дрыбенцы ў Кульмійскім краі. Разам з феодам на працягу часу належыў паненцы Анне, швэдскай Infantin і сястры караля Польшчы Sigismundi III, якая ўстойліва трымаючыся сваёй эвангельска-люцеранскай рэлігіі памёрла тут у 1625-м г. І пакуль яе пан брат адцягваў з яе пахаваньне, швэды аднак захапілі гэты горад, і палякі зноўку адбілі, а яе цела ляжала непахаваным некалькі год, пакуль новы кароль Uladislaus, якога яна вельмі любіла, а ён у сваю чаргу заўсёды высока шанаваў яе, як сястру свайго пана бацькі, не загадаў з пашанай перавезьці яе ў Торн і пахаваць яе там

!старонка 203

у велічна аздобленай магіле. Яна валодала, з шчодрасьці караля Sigismundi і з дазволу саслоўяў, 2 надзеламі: Страсбург і Голуп; якія потым кароль без ведама саслоўяў перадаў сваёй супружніцы; за што яго моцна кпіла рыцарства, бо яны памылкова лічылі іх за князем Uladislao. Нарэшце аднак саслоўі выказалі свой дазвол, калі між тым у 1631-м годзе ўзгаданы Uladislaus атрымаў ад караля штогадовую выплату ў 40 тысяч гульдэнаў, якія ён раней звычайна даваў ад сябе пазначанай паненке Annæ. У 1298-м годзе на дзень сьв. Міхаіла гэты Страсбург быў разрабаваны літоўцамі. У 1628-м г. 5-га кастрычніка па новаму календару швэды (як кажа Piasecius, праз здраду Montaigne, фрацуза, які кіраваў гарнізонам і таму быў абезгалоўлены) захапілі гэты Страсбург, іх апошні атрад пад началам фон Баудіса быў атакаваны польскім палкаводцам Koniecpolscius пад мястэчкам Ostroda, якое ляжыць у шасьці мілях ад Страсбурга і належыць герцагамі Прусіі, Баудіс быў паранены і ўзяты ў палон. У 29-м г. палякі адбклалі горад і замак, аднак швэдскі генэрал Ёган Врангель вызваліў іх і перамог палякаў 9-га (19-га) лютага каля мястэчка Gorzno, якое належыць

плоцкаму біскупу. Затым генэрал Арнгайм прывёў з Нямеччыны 5 тысяч пяхоты і 2 тысячы вершнікаў

!старонка 204!

на дапамогу палякам; таму кароль Швэцыі у сечы пад пад Trzciana пацярпеў паразу ад палякаў, а ў іншай наступнай сечы трапіў у палон, аднак быў вызвалены адным немцам, які яго ведаў, і пад пакровам ночы ўцёк да Марыенбурга, а яго людзі ўцяклі ў Штум; як Piasecius зноўку піша і распавядае пра тое, што адбывалася пасьля таго, пакуль не было зробленае замірэньне на 6 год. У 1655-м годзе швэдскі імпэрскі генэрал артылерыі, граф Штайнбок, захапіў 18-га лістапада гэты ключ зямлі Прускай, Страсбург, як гэтае места называе Limmerus.

Штум, мястэчка і замак каля Крыстбурга і зусім недалёка ад Марыенбурга, якое ў 1626-м і 56-м гг. займалі швэды. У Франкфурцкіх данясеньнях стаіць, што гэта адбылося напрыканцы студзеня, і гэты Штум ляжыць у 2-х мілях ад Марыенбурга.

Тапьяў, прыгожо герцагскі замак вышэй Кёнігсберга каля Прэгеля і Дэме.

Таплаўкен, таксама герцагскі замак каля Прэгеля вышэй Кёнігсберга ў Надравіі.

Тыльза, альбо Тыльзіт, мястэка і замак у Шалаўнах, дзе маецца шмат лясных гарэхаў.

Толкеміт, мястэчка ў Гокерландзе каля новай гавані.

Торн, Thorunium, Torunia, славуты, каралеўскі, ў 24-х мілях ад Данцыга, на Вісьле

!старонка 205!

разьмешчаны горад, чыё апісаньне можна знайсьці ў шмат разоў ўзгаданым нашым дадатку, p. 50 & seqq. Starovolscius кажа, што гэты горад ляжыць на 41 gradu longit. і 32 latit. і не адрозьніваецца паводле прыгажосьці, умацаванасьці і багацьця ні ад якога горада ў Нямеччыне. Там маецца шмат каталіцкіх цэркваў і езуіцкая школа, аднак купцы агульна, як таксама і вярхушка, ерэтыкі, якія маюць сваю школу і добра забяспечаную бібліятэку, у якой захоўваюцца 2 пасьланьня Ciceronis напісаныя на васкавых табліцах. Ратуша, што стаіць у цэнтры на рынкавай плошчы, таксама надта прыгожая, і нідзя не ўбачыць падобнай ёй. У 1629-м годзе швэды нічога не дабіліся пад гэтым горадам. У 1645-м г. кароль Uladislaus зладзіў тут дыскусію наконт рэлігіі. Пра тое, у якім выглядзе гэты горад перайшоў да швэдаў у 1655-м г., піша Aug. Limmerus у сваіх Ляйпцыгскіх данясеньнях новага года, p. 55, наступнае: 26-га сьнежня Торн у Прусіі здаўся Іх Швэдскай Каралеўскай Моцы на пэўных умовах. Гарадская рада выйшла насустрач Іх Кар. Моцы да брамы і solenniter[266] ўпусьціла яго. Тая gratulation[267], якая была зробленая Іх К.М. ад імя рады з далучэньнем найпакорлівага завярэньня іх непахіснай вернай devotion[268], доўжылася цэлыя паўгадзіны. Пасьля чаго

[266] Solenniter (лат.) – урачыста.

[267] Gratulation (лат.) – вітаньне.

[268] Devotion (лат.) – адданасьць.

пан рэйхсканцлер Эрык Орэнштырн стоячы насупраць Іх К.М. вельмі прыгожа адказаў, і пасьля гэтага
!старонка 206!
адказу ўсе паны рады пацалавалі руку Іх К.М. Пад час гэтага прыбыцьця двойчы стрэлілі з 80 гармат, вакол усяго гораду. Потым Іх К.М. у суправаджэньні ўсёй рады і некаторых найшаноўных месьцічаў, якія ўсе ў вельмі выбітна вялікай Comitat з непакрытымі галовамі сьледуючы за Іх К.М. спачатку накіраваліся да царквы і чакалі там службы, і з увагай слухалі прапаведніка, пад час чаго было прыгожа musicirt. Па заканчэньні службы Іх К.М. быў праведзены да ратушы і панамі рады вельмі знатна tractiret і regalirt; там былі præsentirt 6 Compagnien добра падрыхтаваных лёкаяў; а грамадства разам з жаўнерамі ўвесь час прастаялі караулам. Затым у горад marchiret 3 палка швэдскай пяхоты, якімі былі занятыя брамы і валы, а генэрал Major Мардофельд быў прызначаны камендантам. Дагэтуль кажа Limmerus. У 1656-м г. ў страсны тыдзень тут ветліва прымалі езуітаў; як прыводзіцца ў адным дакладзе; у гэтым годзе тут надзвычайна моцна лютавала чума.

Уладаў, вышэй Кёнігсберга на Прэгелі, мусіць быць герцагскім мястэчкам.

Вартэнбург, мястэчка і замак у Галіндскім краі на рацэ Бісе.
!старонка 207!
Вайсэнбург, па пруску Валевон, замак у Бартэнскім краі.

Вэлаў, мястэчка каля Прэгеля недалёка ад Тапьяў, якое напрыканца сьнежня 1655-га года было занятае швэдамі, калі пан курфюрст Брандэнбурга, якому гэтае месца належыць, яшчэ не дамовіўся з іх каралём.

Вормдыт, Orneta, Vormitha, горад і замак у Эрмеландскім біскупстве на рацэ Пасерг, паміж Гутштатам і Мельзакам, які ў 1626-м г. стаў швэдскім, аднак хутка зноўку польскім, і потым у 27-м г. зноўку швэдскім.

Цынтэн, мястэчка ў Натангіі на рацэ Стрэтге, паміж Гайліхпайлям і прускім Айлаў.

Заключэньне.

Акрамя апісаных вышэй зямель палякам належыць таксама Ліфляндыя, ці Livoniam: якая ёсьць вялікая зямля і з ўсзоду закранае Маскву, ад якой яна адасабляецца толькі ракой Nervam; з поўначы суседнічае з каралеўствам Швэцыя і княствам Фінляндыя праз бухту Балтыйскага мора; з захаду трошкі мяжуе з Прусіяй; з поўдня аднак упіраецца ў Жамайцію і Літву;
!старонка 208!
і, як кажа Starovolscius, у даўжыню працягваецца на 90, а ў шырыню на 50 міль шляху: там спачатку, пакуль туды не трапілі немцы, мусіў жыць сармацкі народ. Пакольки аднак ужо ў 1625-м годзе у Польша ня засталося ў Ліфляндыі анічога акрамя крэпасьці Дзюнабург, з яе раёнам, а потым і яна была ў яе таксамааднятая, то здаецца не мае сэнсу нешта паведамляць тут пра Ліфляндыю; як потым і той, хто пераклаў на латынь маё апіснье

каралеўства Швэцыі, нават без майго ўхваленьня і папярэджаньня далучыў туды Ліфляндскае, што можна знайсьці ў маім Itinerario Germaniæ, і часткова таксама ў іншым дадатку да 13-й часткі Topographiæ Germaniæ. Аднак я хачу ўзгадаць некаторыя мясьціны і таксама падзеі, што адбыліся між тым, пра якія я з таго часу прачытаў, і якія не пазначаныя ва ўзгаданых крыніцах; то бок наступныя:

Дэрпт, Derbatum, Torpatum, выбітны горад і адзінае вышэйшая школа ва ўсёй Ліфляндыі, разам з надта моцным і на ўзорку разьмешчаным замкам, каля маскавіцкай мяжы; там у 1655-м г. пан Бенэдыкт Скытэ, барон фон Дудэргоф, пан у Grônsio, Morby, Скытэгольме і Срёмсруме, рыцар, дзяржаўны డарадца ў Швэцыі, уладар у Эстэне, палкоўнік бургграф крэпасьці Рэвал і Вітэнштайн і г.д. быў

!старонка 209!

канцлерам пазначанай вышэйшай школы. У 1604-м годзе польскі палкаводзец Carolus Chodkiewicz забраў гэты горад у швэдаў, пасьля таго як ён разьбіў іх, калі яны абклалі Вайсэнштайн; аднак кароль Швэцыі ў 1625-м г. зноўку захапіў яго. Таксама польскі вялікі канцлер Joh. Zamoscius, калі падчас уладараньня караля Stephano гэты горад упершыню перайшоў ад маскавітаў да Польшчы, пакінуў яго жыхарам, што налыжылі да аўгсбурзскай Confession, адну царкву, дзеля exercitio іх рэлігіі; аднак найвыбітную царкву там перадаў рымскім католікам, і яна заставалася польскай да 1601-га году, калі горад заняў швэцкі кароль Карл. Калі ў 1322-м годзе крыжакі з Прусіі і немцы цалкамі вынішчылі Вайкенскі-Росіянскі-Цырагаланскі і Клогензійскі раёны ў Жамайціі, але замак Бістэн марна атакавалі, то Gediminus, герцаг Літвы, у сваю чаргу зраўняў з зямлёй гэты Дэрпт, што ўжо на той час меў уласнага біскупа, і таксама іншыя замкі ў Ліфляндыі. У 1656 г. маскавіты моцна абклалі гэты горад, у якім нават жанчыны мусілі стаць на абарону разам з гараджанамі, без сумневу памятаючы пра 1558-ы і 71-ы гады, калі гэты горад быў так жудасна выразаны маскавітамі. Алнак ці ўзялі яго нарэшце маскавіты ў тым пазначаным 56-м годзе? Пра гэта на сёняшні дзень, нічога не вядома;

!старонка 210!

паколькі паведамленьні пра гэта, нават з самой Рыгі, супярэчаць адно аднаму.

Дзінэбург, Дунабург, умацаванае места на рацэ Дуна, альбо Дзвіна, ў напрамку да Літвы і Масквы, якое палякі, як паведамлялася вышэй, яшчэ трымаюць у Ліфляндыі; і якое аднак у 1655-м г. доўгі час было абкладзенае маскавітамі; пакуль не прыбыў швэдскі генэрал, граф фон Лёвенгаўпт, і яны істотна адступілі. Але тамашні польскі Commandant спачатку настроіўся таксама і супраць швэдаў, што праз гэта трошкі пацярпела мястэчка і езуіцкі Collegium, якія палякі самі падпалілі; аднак нарэшце 2-га ліпеня ён здаў замак швэдам і падчас свайго сыходу пакінуў ім гарматы і таму падобнае. У наступным 56-м годзе вялікі князь маскоўскі Аляксей Міхайлавіч сам прыбыў пад Дзюнабург і, як паведамляе Aug. Limmerus, за 7 гадзін узяў штурмам гэтае места, як таксама і Какенгаўзэн. У абоіх населенных пунктах усе людзі былі люта забітыя, не былі пашкадаваныя нават дзеці ў калысках. У адным надрукаваным у Рыге дакладзе напісана, ад 7-га (17-га) лістапада ўзгаданага

56-га году, што маскавіты падчас адступленьня да Рыгі захапілі гэты Дзюнабург, у 30 мілях ад Рыгі, і моцны замак Кокенгаўзэн, у 12 мілях адтуль, хаця і са стратай 2000 ці нават больш ваяроў. Калі нямецкія ліфляндцы будавалі пазначаны замак,

!старонка 211!

літоўцы хацелі перашкодзіць гэтаму; і ў 1279-м г. дайшло да сутычкі, у якой ліфляндцы былі разьбітыя і страцілі свайго вышэйшага магістра і 67 рыцараў.

Вышэй узгаданы Какен, альбо Кокенгаўзэн, сталая рэзыдэнцыя арцыбіскупа Рыгі, якая стаіць на Дзьвіне і ў 1601-м годзе была польскай. Калі аднак Georgius Фарэнсбах[269], які мусіў у адзіночку бараніць межы польскай Ліфляндыі ад швэдаў, напаў на Эстонію, то кароль Швэцыі Карл захапіў Парнаў і іншыя мясьціны ў Ліфляндыі, і яго войскі разьбілі пад гэтым Кокенгаўзэнам часткова атрады пазначанага Фарэнсбаха, а ў астатнем пана Крыштофа Радзівіла, роднага сына ўзгаданага караля Caroli. Калі аднак кароль Карл прыбыў з 20 тысячамі чалавек, то ён захапіў усё, акрамя Рыгі, Дзюнамунда і Кокенгаўзэна; у той час той край пакутваў ад жудаснага голаду, пра што я ўзгадваў у нейкім іншым месцы. І Sebaldus піша ў сваім Breviario historico, cap. 6, p. 202 & 203, што бедныя людзі, калі іх быдла памірала ад эпідэміі і было асьвежаванае, накідваліся на мёртвую тушу; яны жэрлі мёртвых сьвіней, сабак і катоў, нават бацькі сваіх дзяцей, калі тыя памiралі, і адзін аднаго забівалі і жэрлі. Адзін сусед паслаў свайго дзіцёнка да другога, каб нешта прынесьці, а той яго зарэзаў; таму бацька пайшоў, бо надта доўга не мог дачакацца свайго дзіцёнка,

!старонка 212!

якому ўзгаданы сусед быў майстрам, забіў яго і зьеў таксама разам з дзіцём.

Картуз, замак, які калісьці належыў вышэй узгаданаму палкоўніку Георгу Фарэнсбаху, бо быў дадзены яму каралём польскім Стэфанам. Vitenes, герцаг літоўскі, захапіў гэты горад, калі быў закліканы ў 1298-м г. горадам Рыгай на дапамогу супраць вышэйшага магістра Ліфляндыі.

Кірхгольм, замак у 2-х мілях вышэй Рыгі, на Дзьвіне. У 1605-м н. швэдскі генэрал, граф фон Мансфельд, заняў вусьце Дзюнамунд каля Рыгі, які быў пакінуты літоўцамі. Кароль Карл потым conjugirt з фон Мансфельдам і абклаў Рыгу, супраць якіх каля Iskel, у 3х мілях ад Рыгі, выступіў польскі палкаводзец Carolus Chodkievicius. Кароль Карл зьняў аблогу Рыгі і 27-га верасьня рушыў сюды, на Кірхгольм, і тут яго лагер сутыкнуўся з польскім, пасьля чаго адбылася сеча, пад час якой у швэдаў 9000 чалавек загінулі на месцы, акрамя тых, якія былі забітыя сялянамі падчас уцёкаў, альбо загінулі ад атрыманых ранаў. І кароль Карл, параненны, уцякаючы ледзь дабраўся да свайго карабля, аднак 2 князя, Браўншвайзскі і Люнэбурзскі загінулі; той фон

!старонка 213!

Мансфельд таксама ўцёк паранены, 500 швэдаў былі схопленыя ў палон, лагер быў абрабаваны, захоплена было 60 сьцягоў і 11 гармат, пры чым у палякаў у сваю чаргу загінула не больш за 80 чалавек; шмат аднак было

---

[269] Георг Вольмар фон Фарэнсбах (ням. Georg Wolmar von Fahrensbach; 09.02.1586 – 19.05.1633) – польскі губернатар Ліфляндыі, удзельнік Трыццацігадовай вайны.

паранена і таксама шмат коней было застрэлена; як паведамляе біскуп Paul. Piasecius у сваёй Польскай Хроніке, fol. 227, і таксама Stanislaus Kobierzickius пагаджаецца з ім у Жыцьцяапісаньні Uladislai IV, ст. 811, што пазначаны Chodkievicius з 3300 людзьмі разьбіў тады 16000 немцаў, французаў, нідэрландцаў і швэдаў, пры гэтым страціў толькі трошкі больш за 80 сваіх і захапіў больш 60 сьцягоў, зноўку захапіў Парноў, абараніў Рыгу, Дзюнамунд, Дэрпт і Файзэнштэрн (Вайсэнштайн), узяў Вольмар і падпаліў швэдам іх караблі ў моры. У Рыме, у Фларэнтыйскіх садах, яму быў усталяваны бюст.

Мітаў, горад, замак і прыдворны лагер пана Якуба, герцага Курляндыі і Семігаліі. З Historia Lituana Alberti Kojalowicii можна даведацца, што ў 1315-м годзе, альбо каля таго часу, ліфляндцы аднялі ў літоўцаў гэтую частку Samogitien, якая цяпер называецца Курляндыя, альбо Curonia. Калі ў наступны час ліфляндцы шукалі паратунку ад Масквы ў Каралеўстве Польскім, кароль Sigismundus Augustus зрабіў там апошняга магістра Тэўтонскага Ордэна,

!старонка 214!

пана Готхарта Кетлерна фон Нэсельрота, герцагам Курляндыі і Семігаліі, які памёр у 1587-м годзе і пакінуў Вільгельма і Фрыдэрыка, першы з якіх, пан бацька вышэй узгаданага пана Якуба, быў вылішаны сваёй часткі каралём Польшчы Sigismundo III, паколькі яго трабанты забілі тут у Мітаў у 1613-м годзе Magnum Noldam, курляндскага шляхціча, што зрабіла герцагу дрэнную паслугу і настроіла курляндскую шляхту супраць яго. За яго аднак пасьля сьмерці пазначанага караля ў 1632-м годзе прасіў яго брат, герцаг Фрыдэрык, які здабыў вялікія заслугі перад Польшчай у Ліфляндскай вайне; і нарэшце кароль Uladislaus IV перадаў феоды яго, герцага Вільгельма, сыну; як паведамляе Piasecius, пра што можна даведацца ў нашым узгаданым дадатку.

Нарва, Нэрва, славуты і моцны горад з замкам. У 1590-м годзе пасьля цяжкай аблогі яго разам з суседнімі мястэчкамі захапіў вялікі князь Маскоўскі, Тэадор, і прагнаў адтуль швэдскі гарнізон. Швэды аднак зноўку захапілі Нарву ў 1599-м годзе, калі ў часы караля Stephani яго адняў у маскавітаў Pontus de Guardia, ці de la Gardie, з Францыі.

Парнаў, Пернаў, горад і моцны

!старонка 215!

замак. У 1609-м годзе вышэй узгаданы Карл Ходкевіч, пасьля таго як ён спаліў добрую частку швэдскіх ваенных караблёў праз здраду некаторых ангельскіх маракоў, што былі падкупленыя за грошы, а астатнія прывёў да ўцёкаў, захапіў гэты горад і марскі порт, які адзін толькі з Ліфляндскіх гарадоў у той час яшчэ заставаўся ў караля Швэцыі, з дапамогай пэтарды, якую запусьціў Вільгельм Барберый, француз. Аднак у 1617-м годзе гэты горад зноўку перайшоў да швэдаў праз хітрасьць і пасрэдніцтва Георгія Фарэнсбаха, ліфляндца (пра якога таксама ўзгадвалася вышэй).

Пильтэн, Пыльтэн, горад і таксама сталіца колішняга Курляндскага біскупства, якую ў 1655-м годзе пан Jacobus della Gardie, граф Leckoë, перадаў пад уладу герцага Курляндскага; калі ён, герцаг, імкнуўся пад

шведскую апеку, а гэты горад хацеў быць вольным; як паведамляе Augustinus Limmerus.

Рэвель, Revalia, моцны і славуты партовы горад на Ліфляндскім моры ў Эстландыі, які каля 1601-га года трапіў у рукі Шведскай Кароны і дагэтуль застаецца шведскім. А што трошкі блізка да сэрца ўзгадвае нехта пра тамашняе піва супраць таго, што прыводзіцца ў continuation да Itinerarii Germaniæ з тэкстаў пакінутых адным паважаным чалавекам, які наведаў большасьць краін Europæ, таксама частку Asiæ і Africæ, і ў 1586-м годзе быў тут, у Рэвелі,

!старонка 216!

пра тое ўжо адказвалася ў іншым месцы.

Рыга, некалі арцыбіскупскі, а цяпер аднак каралеўскі шведскі горад і сталіца Ліфляндыі; ва ўзгаданым нашым дадатку да 13-й часткі Topograph. Germaniæ, p. 22 & seqq, можна падрабязна прачытаць пра яго і таксама пра крэпасьць Дзюнамунд, што стаіць каля месца ўпадзеньня ракі Дзюны, альбо Дзьвіны, у мора, у 2-х мілях ніжэй Рыгі, p. 26 і 27. Таму я тут хачу прывесьці толькі словы Starovolscii, якія ён у сваёй Polonia піша наступным чынам:

Riga totius Livonæ metropolis, quam fluvius Duina ampliss unà cum arce alluit. Urbs ipsa muro firmissimo, propugnaculisq, & turribus densis undiq; munita; item vallo inexcusso, tribus ordinibus tormentorum apto, fossisq; 2 ex utraq; parte circumducta & stipitibus acutis circumsepta; Instrumentisq; insuper bellicis, ac tormentis æneis & commeatu copioso, tùm militibus stipendiariis, pacis & belli tempore benè provisa. Distat 2 mill. à mari, naves tamen omnigenæ facillimè de mari sub ipsa urbis moenia deveniunt &

!старонка 117!

redeunt. Ubi verò fluvius mari illabitur, est arx Dunæmunda inexpugnabilis naturâ, oportunitateq; loci 2 milliaribus ubi naves telonia persolvere coguntur; iterumq; excutiuntur in Blokaus, munitione sita medio loco inter Rigam & Dunamundam[270].

Пра суворую аблогу, што прадпрыняў супраць гэтага горада вялікі герцаг Маскоўскі ў 1656-м годзе з 23-га жніўня да 5-га кастрычніка, у друк трапілі некаторыя даклады і таксама пералік ядраў і гранат, якія былі выпушчаныя за час аблогі, і што пры гэтым адбылося вартага ўспаміну,

[270] Рыга, сталіца усёй Лівоніі, якую атачае рака Дзьвіна разам з замкавымі водамі. Сам горад мае вельмі моцны мур, абарназдольны, і з бакоў замкнёны вежамі; умацаваны таксама і непрабіўнымі бастыёнамі, кожны адпаведна з трымя камандамі артылерыі, траншэямі, па дзьве з кожнага боку амаль па ўсяму перыметру, і аточанымі вострымі каламі; забясьпечаны, перад усім зброяй і гарматамі, і шматлікімі прыпасамі, і таксама добра ахоўваецца наёмнымі жаўнерамі ў мірныя і ваенныя часы. Знаходзіцца ў 2х мілях ад мора, аднак кожнаму тыпу судоў лёгка падплываць з мора пад самыя сьцены горада і вяртацца. А там, дзе рака ўпадае ў мора, стаіць непрыступная крэпасьць Дзюнамунд, абсталяваная, у 2-х мілях ад таго месца, дзе караблі мусяць плаціць збор пошліны; і таксама маецца блокгаўз па сярэдзіне фартыфікацый паміж Рыгай і Дзюнамуднам.

таксама і пра знакі, што зьяўляліся напярэдні; то кожны можа сам прачытаць пра гэта; сярод іншага пра нястачу вады, што паўстала тут у 1649-м г.; гранат і вогненных ядраў, якія магчыма было прыкладна падлічыць, было скарыставана 1875 штук, і важылі яны 163175 і да 200 тысяч фунтаў. Найбольшыя гарматныя ядры, якімі абстрэльваліся і дзіравіліся бастыёны і будынкі, важылі прыкладна 40, 63 і 70 фунтаў, а меншыя 12, 20 і да 30 футнаў. Акрамя пана графа Magni Gabrielis de la Garde, тамашняга камендатнта, там быў таксама і пан Сымон Грюндэль фон Гельмфельд, генэрал-маёр і Gouverneur. Да 1617-га года гэты горад таксама мужна процістаяў Георгію

!старонка 218!

Фарэнсбаху, які яго атакаваў; хаця горад і атрымаў вялікія страты на сваіх зямельных надзелах; як можна знайсьці у Piasecio пра той год; які таксама распавядае на p. 347 і 348, як кароль Швэцыі ў 1621-м годзе захапіў у свае рукі гэты горад разам з узгаданай крэпасьцю Дзюнамунд.

Велін, альбо Felin, мястэчка і замак у Эстландыі, які захапіў швэдскі кароль Карл, аднак у у сакавіку 1602-га году яго абклаў польскі вялікі канцлер Zamoyscius, пасьля таго як ён напярэдні захапіў мястэчкі Anzelmum, Ermezum і Helmet, і таксама некалькі замкаў. Аднак Фелін аточаны мурам і рвамі і ляжыць на рацэ Moldara, якая ад маскавіцкай мяжы праз шматлікія азёры вялікімі хвалямі бяжыць ў мора. У пазначанай аблозе загінуў камандзір замкавага гарнізону, таму астатнія здаліся.

Вайсэнштайн, які польскія аўтары называюць Vaisensteinum, велізарнай моцы крэпасьць у Эстландыі, якую таксама захапіў Zamoyscius у 1602-м г., хаця да замка, які ляжыць на раўніне, і аточаны багнамі, і таксама умацаваны больверкамі, мурамі, валам і рвамі, цяжка дабрацца. Аднак швэдскі кароль Карл зноўку атрымаў гэты замак праз капітуляцыю ў 1607-м годзе, хаця замак меў дастаткова правіянту і зброі, але мала людзей (бо камандзір гарнізона з 300 салдатамі былі ўзятыя ў палон швэдамі за сьценамі замка).

!старонка 219!

Венда, Фенда, па польску Kies, горад і замак, дзе ў мінулым меў сваю рэзыдэнцыю вышэйшы магістр; аднак кароль Стэфан, з Польшчы, прызначыў тут біскупства і паставіў на яго чале Joh. Demetr. Solikovium, якому, калі ён стаў арцыбіскупам Lepoli, succedirt Alexander Milenscius. Аднак, калі гэты горад быў заняты швэдамі, біскуп разам з езуітамі мусілі пакінуць яго, і такім чынам цяпер у Ліфляндыі няма больш наогул аніякага біскупа. Езуіты накіраваліся назад у Літву, біскуп аднак атрымаў ад Караля моцны кляштар цыстэрыянаў у Малай Польшчы.

Вольмар, Volmaria, мястэчка і замак каля Аа, вышэй пазначанага горада Вендэн, кароль Стэфан перадаў яго разам з іншымі ўладаньнямі таму самаму біскупу. У 1601-м годзе польскі вялікі-канцлер Zamoiscius захапіў гэтае места і адправіў кроўнага сына швэдскага караля Caroli, Carolusinum, разам з Ponto de la Gardia і найвыбітнымі камандзірамі, палоннымі ў Польшчу.

І на гэтым ўсё пра Ліфляндыю, дзе пан Magnus Gabriel de la Gardie, граф Лекё і Арансборга, барон Экгольма, пан Габзаля, Магнусгофа і

!старонка 220!

Хоенторпа, дарадца і скарбнік шведскай Карал. Моцы і дзяржавы, камендант Рыгі, і таксама ваенна-дзяржаўны-vicarius Ліфляндыі, Эстыі і Інгерманланда, а ў Швэцыі аднак канцлер Universität Упсаля, і таксама судзьдзя ў Вест-Готыі і Даліі, у гэты час зьяўляецца генэраламі-камендантам.

К А Н Е Ц.

